Г. А. Космач, У. С. Кошалеў, М. А. Краснова

# Сусветная гісторыя Навейшага часу, 1945 г. — пачатак XXI ст.

Вучэбны дапаможнік
для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

Пад рэдакцыяй Г. А. Космача

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Мінск
«Адукацыя і выхаванне»
2012

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

УДК 94(100)«1945/20»(075.3=161.3)
ББК 63.3(0)6я721
К71

Р э ц э н з е н т ы:
кафедра ўсеагульнай гісторыі ўстановы адукацыі
«Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна»
(кандыдат гістарычных навук, загадчык кафедры *В. Р. Швайко*);
настаўнік гісторыі і грамадазнаўства вышэйшай катэгорыі
дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 24 г. Мінска» *І. Р. Дрыгавоз*; дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі ўстановы адукацыі
«Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»,
кандыдат гістарычных навук *А. Г. Усцюгова*;
дацэнт кафедры гуманітарных дысцыплін
прыватнай установы адукацыі
«Інстытут прадпрымальніцкай дзейнасці» *П. М. Гламбоцкі*

Пераклад з рускай мовы
*М. Н. Гальпяровіча*

**Космач, Г. А.**
К71 Сусветная гісторыя Навейшага часу, 1945 г. — пачатак XXI ст. : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / Г. А. Космач, У. С. Кошалеў, М. А. Краснова; пад рэд. Г. А. Космача; пер. з рус. мовы М. Н. Гальпяровіча. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2012. — 264 с. : іл.

ISBN 978-985-471-552-0.

**УДК 94(100)«1945/20»(075.3=161.3)**
**ББК 63.3(0)6я721**

**ISBN 978-985-471-552-0**

© Космач Г. А., Кошалеў У. С., Краснова М. А., 2012
© Гальпяровіч М. Н., пераклад на беларускую мову, 2012
© Афармленне. РУП «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”», 2012

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

# АД АЎТАРАЎ

Паважаныя адзінаццацікласнікі!

У гэтым годзе вы прадоўжыце вывучэнне гісторыі Навейшага часу. Вам давядзецца разгледзець этап развіцця свету, які пачаўся пасля Другой сусветнай вайны.

Вучэбны дапаможнік складаецца з уводзін і чатырох раздзелаў. Ва «Уводзінах» даецца агульная характарыстыка развіцця пасляваеннага свету, якая дазваляе ўбачыць агульныя праблемы і тэндэнцыі, што вызначаюць сучасны этап яго гісторыі. У першых трох раздзелах разглядаецца развіццё асобных рэгіёнаў свету: ЗША і краін Еўропы; СССР і Расійскай Федэрацыі; краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Улічваючы ўзрослую глабальную ўзаемазалежнасць усіх рэгіёнаў свету, у апошнім, чацвёртым раздзеле, разглядаюцца міжнародныя адносіны і праблемы, якія закранаюць увесь свет у цэлым.

Кожны параграф вучэбнага дапаможніка пачынаецца рубрыкай **«Успомніце»**. Пашырае і дапаўняе вучэбны матэрыял параграфа інфармацыя, прадстаўленая ў рубрыках **«Гістарычны дакумент»**, **«Гістарычны партрэт»** і **«Гістарычная даведка»**. У рубрыцы **«Прапануем абмеркаваць»** прадстаўлены заданні, якія акцэнтуюць увагу на дыскусійных праблемах, што не маюць адназначнага адказу. Кожны раздзел заканчваецца ўрокам абагульнення, мэта якога — абагульніць і сістэматызаваць вывучаны матэрыял.

Асноўныя даты, імёны і тэрміны выдзелены **тлустым** шрыфтам, другарадныя — *курсівам*. Тлумачэнне новых тэрмінаў даецца непасрэдна ў параграфе, а таксама ў **«Гістарычным слоўніку»** ў канцы вучэбнага дапаможніка. Таксама там змешчаны **«Храналагічная табліца»** і **«Спіс рэкамендаванай літаратуры»**.

Жадаем поспехаў!



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

# Уводзіны

## § 1. АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ КРАІН СВЕТУ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

**Успомніце:** *Як складваліся ўзаемаадносіны паміж СССР і ЗША ў гады Другой сусветнай вайны? Калі і з якой мэтай упершыню была выкарыстана ядзерная зброя?*

**Пачатак «халоднай вайны».** Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны найбольшы ўплыў у свеце мелі дзве вялікія дзяржавы — СССР і ЗША. Сфарміравалася сістэма міжнародных адносін, якая характарызавалася расколам свету на варагуючыя грамадска-палітычныя сістэмы — сацыялістычную і капіталістычную. Супрацьстаянні і канфлікты паміж імі ўвайшлі ў гісторыю пад назвай **«халоднай вайны»**, якая завяршылася распадам СССР і ўсёй сацыялістычнай сістэмы.

Яшчэ падчас Патсдамскай канферэнцыі 1945 г. у антыгітлераўскай кааліцыі праявіліся рознагалоссі. ЗША сур'ёзна асцерагаліся росту магутнасці Савецкага Саюза, які фактычна кантраляваў развіццё такіх краін Еўропы як Польшча, Чэхаславакія, Балгарыя, Югаславія, Румынія, Венгрыя, Усходняя Германія (з 1949 г. — Германская Дэмакратычная Рэспубліка (ГДР), Албанія. Захад імкнуўся не дапусціць пранікнення сацыялістычных ідэй за межы ўсходнееўрапейскіх дзяржаў. У **1946 г.** у г. Фултан (ЗША) былы прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі У. Чэрчыль выступіў з прамовай, якая, як лічыцца, і паклала пачатак «халоднай вайны». Ён заклікаў да стварэння саюза краін, у першую чаргу Вялікабрытаніі і ЗША, для барацьбы з уплывам СССР. Манаполія ЗША на ядзерную зброю ў той час была важным фактарам міжнароднай знешняй палітыкі. СССР імкнуўся парушыць гэтую



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ



*У. Чэрчыль выступае са сваёй знакамітай прамовай у г. Фултан. 1946 г.*

манаполію і разгарнуў актыўную дзейнасць па стварэнні атамнай бомбы.

У 1947 г. пачынаецца кансалідацыя сіл Захаду ў барацьбе з пашырэннем сферы ўплыву СССР. **«План Маршала»,** які быў прыняты ў той час у ЗША, прадугледжваў дапамогу ў эканамічным аднаўленні Еўропы на ўмовах доўгатэрміновых крэдытаў. Аднак прадстаўленне дапамогі агаворвалася і некаторымі палітычнымі патрабаваннямі. У выніку ЗША атрымалі магчымасць уплываць на палітыку краін Заходняй Еўропы. Іх уплыў асабліва ўзмацніўся пасля афармлення ў **1949 г.** ваенна-палітычнага блока — **Арганізацыі Паўночнаатлантычнага Дагавора (НАТО).**

У 1949 г. СССР правёў выпрабаванне першай савецкай атамнай бомбы. Манаполія ЗША на ядзерную зброю была ліквідавана. **У 1955 г.** сацыялістычныя краіны Еўропы аб'ядналіся ў ваеннапалітычны саюз — **Арганізацыю Варшаўскага Дагавора (АВД).** Супрацьстаянне дзвюх варагуючых сістэм — капіталістычнай і сацыялістычнай — стала адкрытым і надзвычай небяспечным для ўсяго свету. Пачалася гонка ўзбраенняў, якая вымотвала сілы абодвух бакоў і нярэдка прыводзіла да надзвычай вострых міжнародных канфліктаў.

Самым вострым і небяспечным з іх быў *Карыбскі крызіс 1962 г.* Пагроза сусветнай ядзернай вайны ніколі яшчэ не была такой рэальнай, як у той час. Карыбскі крызіс стаў паваротным пунктам у гісторыі сучаснага свету. На павестку дня міжнароднай палітыкі было пастаўлена пытанне аб прадухіленні пагрозы ядзернай вайны.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Разрадка міжнароднай напружанасці.** Успышкі «халоднай вайны» паміж Усходам і Захадам чаргаваліся з перыядамі **разрадкі міжнароднай напружанасці.** Самы працяглы перыяд разрадкі меў месца ў 1970-я гг., калі СССР і ЗША заключылі шэраг важных дагавораў аб абмежаванні ўзбраенняў. Упершыню абодва бакі прызналі парытэт (роўнасць) сваіх стратэгічных сіл і неабходнасць яго захавання як асновы ўстойлівых мірных адносін. Заключаныя дагаворы дэкларавалі недапушчальнасць ядзернай вайны, абмяжоўвалі развіццё сістэм супрацьракетнай абароны, стратэгічных узбраенняў, устанаўлівалі для абодвух бакоў максімальна дапушчальную колькасць носьбітаў ядзернай зброі.

Кульмінацыяй перыяду разрадкі стала **Нарада па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе,** у якой прымалі ўдзел прадстаўнікі ЗША, Канады і ўсіх еўрапейскіх дзяржаў, акрамя Албаніі. Вынікам іх работы стала падпісанне ў **1975 г.** у Хельсінкі **Заключнага акта Нарады.** Краіны Еўропы, ЗША і Канада давалі ўзаемныя абавязацельствы паважаць цэласнасць існуючых межаў дзяржаў, іх суверэнітэт, правы чалавека, прымаць меры па ўмацаванню міжнароднай бяспекі.

Нягледзячы на паляпшэнне міжнароднага становішча, прычыны «халоднай вайны» не былі ліквідаваны. Спробы змяніць суадносіны сіл у глабальным маштабе не спыняліся. Асаблівае месца ў супрацьстаянні двух ваенна-палітычных блокаў занялі лакальныя канфлікты.

**Паварот ад разрадкі да канфрантацыі.** На мяжы 1970-х — 1980-х гг. у міжнародных адносінах зноў адбыўся паварот да **канфрантацыі** паміж СССР і ЗША. Абвастрыліся супярэчнасці ў розных рэгіёнах свету. Пала сусветная сістэма каланіялізму і прыкметна вырасла роля краін Азіі і Афрыкі, ці, як іх яшчэ называлі, краін «трэцяга свету», на міжнароднай арэне.

У правале разрадкі адыграла сваю ролю жорсткасць палітычнага курсу тагачаснага кіраўніцтва СССР. Яна праявілася ў фарсіраваным развіцці ваенных праграм, у размяшчэнні ў краінах-членах АВД новых савецкіх ракет сярэдняй далёкасці, у накіраванні ваеннай дапамогі шэрагу краін «трэцяга свету». Паварот да канфрантацыі ў міжнародных адносінах на мяжы 1970-х — 1980-х гг. быў абумоўлены шэрагам знешнепалітычных акцый СССР, у прыватнасці, уводам савецкіх войск у Афганістан у снежні 1979 г.,



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

а таксама абвяшчэннем у снежні 1981 г. ваеннага становішча ў Польшчы. У краінах Захаду была разгорнута злосная антысавецкая кампанія, пачалася новая фаза гонкі ўзбраенняў, у якой прымалі ўдзел абодва ваенныя блокі. У канцы 1983 г. урады Вялікабрытаніі, ФРГ і Італіі далі згоду на размяшчэнне амерыканскіх ракет на тэрыторыі гэтых краін.

Пераход да канфрантацыі стаў вызначальнай тэндэнцыяй у знешняй палітыцы ЗША. Гэты курс знайшоў адлюстраванне ў знешнепалітычнай праграме, прапанаванай прэзідэнтам ЗША Дж. Картэрам у **студзені 1980 г.**, так званай **«дактрыне Картэра»**. У адпаведнасці з ёй багаты нафтавымі рэсурсамі рэгіён Персідскага заліва абвяшчаўся зонай амерыканскіх інтарэсаў, для аховы якой ад «замахаў звонку» ЗША былі гатовы выкарыстоўваць любыя сродкі, уключаючы ўзброеныя сілы. З прыходам да ўлады ў ЗША ў 1981 г. прэзідэнта Р. Рэйгана яго адміністрацыяй была прынята буйнамаштабная праграма гонкі ўзбраенняў, якая ўключала вытворчасць нейтроннай зброі, новых балістычных ракет і інш. У **1983 г.** ЗША пачалі рэалізоўваць праграму па распрацоўцы новых відаў ядзернай зброі з вывадам яе ў космас, якая атрымала назву **«стратэгічнай абароннай ініцыятывы» (САІ).** Яе ажыццяўленне азначала б падрыў усёй сістэмы пагадненняў аб прадухіленні ядзернай вайны.

Такім чынам, для першай паловы 1980-х гг. быў характэрны паварот ад разрадкі міжнароднай напружанасці да канфрантацыі. Цэлы шэраг дасягненняў перыяду разрадкі быў ліквідаваны.

**Канец варожага супрацьстаяння.** Змены міжнароднай сітуацыі ў лепшы бок адбыліся толькі ў другой палове 1980-х гг. У СССР пачалася *перабудова*, мэтай якой была пабудова «сацыялізму з чалавечым тварам». Кіраўніцтва СССР на чале з М. С. Гарбачовым узяло курс на ўсталяванне атмасферы даверу і ўзаемаразумення з заходнімі краінамі. **19 — 21 лістапада 1990 г.** у Парыжы ўпершыню пасля міжнароднай сустрэчы ў Хельсінкі адбылася Нарада кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў 32 еўрапейскіх дзяржаў, ЗША і Канады. На Нарадзе была дасягнута дамоўленасць аб маштабным скарачэнні ўзброеных сіл АВД і НАТО. Выніковы дакумент сустрэчы — **Парыжская хартыя для новай Еўропы** — пацвердзіў вернасць дзяржаў-удзельніц Нарады 10 прынцыпам Заключнага акта, прынятага ў Хельсінкі ў 1975 г., вызначыў праграму міжнароднага супрацоўніцтва, паказаў прыхільнасць краін-



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

удзельніц да дэмакратыі, заснаванай на павазе правоў чалавека і забеспячэнні ўсеагульнага росквіту пры гарантаванні эканамічнай свабоды і сацыяльнай справядлівасці. Яго падпісанне сведчыла пра заканчэнне варожага супрацьстаяння ў Еўропе.

**Распад сацыялістычнага лагера.** Буйнейшымі падзеямі канца XX ст. сталі **дэмакратычныя рэвалюцыі** ва Усходняй Еўропе і распад СССР. Рэвалюцыі не толькі выклікалі кардынальныя ўнутраныя змены ў краінах усходнееўрапейскага рэгіёна. Яны прадвызначылі новую расстаноўку сіл у Еўропе, новую структуру міжнародных эканамічных і палітычных адносін. Надышоў канец канфрантацыі паміж Усходам і Захадам, паміж СССР і ЗША. Закончылася працяглая і знясільваючая «халодная вайна».

Усходнееўрапейскія рэвалюцыі 1989 г. не адбыліся б без перабудовы ў СССР. Новыя адносіны кіраўніцтва СССР да суседзяў як да роўных партнёраў — адмаўленне ад палітыкі «абмежаванага суверэнітэту» — стварылі ўмовы для дэмакратычнай перабудовы ўсходнееўрапейскіх краін. Кардынальныя змены знешнепалітычнага курсу СССР пачаліся ў 1988 — 1989 гг. Унутры краіны ўлады паступова адмаўляліся ад ранейшай савецкай ідэалогіі. У выніку, як лічыла кіраўніцтва СССР, знікалі прычыны для супрацьстаяння з Захадам. СССР паслядоўна адмаўляўся ад усіх ранейшых прынцыпаў сваёй знешняй палітыкі.




*Берлінская сцяна падчас святочных мерапрыемстваў з нагоды аб'яднання Германіі. 1989 г.*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Першым з такіх прынцыпаў была нязменнасць становішча ва Усходняй Еўропе. Цяпер тут пачаліся сур'ёзныя змены. У 1989 г. у краінах Усходняй Еўропы адбыўся шэраг дэмакратычных рэвалюцый, у выніку якіх былі адхілены ад улады камуністычныя партыі. Кіраўніцтва СССР не толькі не перашкаджала гэтым зменам, але нават падтрымлівала іх. У **лістападзе 1989 г.** спыніла існаванне **Берлінская сцяна** — сімвал палітычнага падзелу Еўропы. **1 ліпеня 1991 г.** была распушчана Арганізацыя Варшаўскага Дагавора. Савецкія войскі пакінулі Венгрыю, Чэхаславакію, Польшчу, а ГДР аб'ядналася з ФРГ. Канчаткова распаліся ўсе міждзяржаўныя структуры, якія раней увасаблялі сацыялістычную садружнасць.

Да канца **1991 г.** усе рэспублікі, што ўваходзілі ў склад СССР, абвясцілі незалежнасць. Такім чынам, узнікла 15 незалежных дзяржаў, якія сталі суб'ектамі міжнародных адносін. Развал СССР рэзка змяніў геапалітычную сітуацыю ў свеце на карысць ЗША і іх саюзнікаў.

Усталяванне ліберальна-дэмакратычных рэжымаў у Албаніі, Балгарыі, Венгрыі, Польшчы, Румыніі, Чэхаславакіі, а таксама аб'яднанне Германіі змянілі сітуацыю ў Еўропе. Сярод прыярытэтаў у знешняй палітыцы ўрады гэтых дзяржаў выбралі курс на самасцвярджэнне ў сістэме міжнародных адносін і на інтэграцыю ў той ці іншай форме ў еўрапейскія рэгіянальныя арганізацыі.

**Паглыбленне інтэграцыі і працэсы дэзінтэграцыі.** Для міжнароднага становішча пачатку 1990-х гг. характэрным стала далейшае паглыбленне эканамічнай інтэграцыі ў Заходняй Еўропе і Паўночнай Амерыцы, развіццё інтэграцыйных працэсаў у Лацінскай Амерыцы, Паўднёва-Усходняй Азіі і Афрыцы. Адначасова ў СССР і краінах Усходняй Еўропы абвастрыліся цэнтрабежныя працэсы, узніклі міжнацыянальныя канфлікты.

Такім чынам, у свеце адбываліся два разнанакіраваныя працэсы: інтэрнацыяналізацыя, інтэграцыя эканамічных сувязей у капіталістычным свеце і адначасова распад шматнацыянальных дзяржаў і ўтварэнне нацыянальных дзяржаў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. Дэзінтэграцыя ў сацыялістычных краінах прывяла да распаду ранейшых міжнародных арганізацый, якія іх аб'ядноўвалі. Пад пагрозу была пастаўлена цэласнасць некаторых дзяржаўных утварэнняў (Югаславіі, Чэхаславакіі). Аднак гэ-


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

тыя дзве тэндэнцыі — **інтэграцыя** і **дэзінтэграцыя** — два бакі аднаго працэсу. Дэзінтэграцыя, якая адбывалася ў краінах Усходняй Еўропы і ў СССР, стварала ўмовы для новага этапу ў развіцці глабальных працэсаў інтэрнацыяналізацыі эканамічных і іншых міждзяржаўных сувязей.

Важнейшым фактарам сучасных міжнародных адносін стаў уплыў ЗША, роля якіх значна ўзрасла пасля распаду СССР. Кіруючыя колы гэтай краіны разам са сваімі заходнееўрапейскімі саюзнікамі імкнуцца да ўсталявання кантролю над энергетычнымі рэсурсамі планеты. Пад living рознымі падставамі (барацьба з міжнародным тэрарызмам і распаўсюджваннем зброі масавага знішчэння, урэгуляванне лакальных і міжнародных канфліктаў і г. д.) ЗША ўмешваюцца ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў, развязваюць войны супраць непажаданых для іх рэжымаў (Афганістан, Ірак, Лівія і іншыя краіны).

### Пытанні і заданні:

1. Выдзеліце асноўныя перыяды ў міжнародных адносінах у другой палове XX стагоддзя. Дайце кароткую характарыстыку кожнага з іх. Даныя аформіце ў выглядзе табліцы.
2. Ахарактарызуйце міжнародныя адносіны ў гады «халоднай вайны». Якія ваенна-палітычныя блокі, што супрацьстаялі адзін аднаму, склаліся ў гэты перыяд? Якую ролю ў развіцці міжнародных адносін адыграў Карыбскі крызіс?
3. Чаму перыяды напружанасці ў міжнародных адносінах змяняліся перыядамі разрадкі? Якімі былі дасягненні перыяду разрадкі міжнароднай напружанасці? Якія падзеі канца 1970-х — пачатку 1980-х гг. прывялі да новай канфрантацыі паміж СССР і ЗША?
4. Чаму ў канцы 1980-х — пачатку 1990-х гг. сталі магчымымі дэмакратычныя рэвалюцыі ў краінах Усходняй Еўропы? Вызначыце значэнне распаду СССР і сацыялістычнага лагера ў развіцці ўзаемаадносін Захаду і Усходу.
5. Як праяўляюцца інтэграцыйныя і дэзінтэграцыйныя працэсы ў розных рэгіёнах свету? Прывядзіце прыклады. Чаму інтэграцыю і дэзінтэграцыю можна разглядаць як два бакі адзінага працэсу?



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**6.** Чаму пасля распаду сістэмы каланіялізму ўзрасла роля краін Азіі і Афрыкі?

**Прапануем абмеркаваць.** Пасля Другой сусветнай вайны сфарміравалася двухполюсная сістэма ўладкавання свету. Як змянілася геапалітычная сітуацыя ў свеце пасля распаду СССР? Як бы вы ахарактарызавалі сучасную міжнародную сітуацыю?

## Гістарычны дакумент

### З прамовы У. Чэрчыля «Мускулы свету»

*Фултан (ЗША), 5 сакавіка 1946 г.*

Ні адзін чалавек ні ў адной краіне на нашай зямлі не пачаў спаць горш па начах ад таго, што сакрэт вытворчасці атамнай зброі, а таксама адпаведная тэхналагічная база і сыравіна засяроджаны сёння галоўным чынам у амерыканскіх руках. Але я не думаю, што ўсе мы спалі б гэтак жа спакойна, калі б … манаполіяй на гэты жахлівы сродак масавага знішчэння завалодала — хоць бы на час — якая-небудзь камуністычная ці неафашысцкая дзяржава. Аднаго толькі страху перад атамнай бомбай было б дастаткова, каб яны змаглі навязаць свабоднаму, дэмакратычнаму свету адну са сваіх таталітарных сістэм…

Мне цяжка ўявіць, каб забеспячэнне эфектыўных мер па прадухіленню новай вайны… было магчыма без стварэння таго, што я б назваў брацкім саюзам англамоўных краін. Пад гэтым я маю на ўвазе асаблівыя адносіны паміж Вялікабрытаніяй і Брытанскай Садружнасцю нацый, з аднаго боку, і Злучанымі Штатамі Амерыкі, з другога…

Сёння на сцэну пасляваеннага жыцця, якая яшчэ зусім нядаўна ззяла ў яркім святле саюзніцкай перамогі, лёг чорны цень. Ніхто не можа сказаць, чаго можна чакаць у бліжэйшай будучыні ад Савецкай Расіі і кіруемай ёю міжнароднай камуністычнай супольнасці і якія межы… іх экспасіяніcцкіх імкненняў і настойлівых спроб схіліць увесь свет у сваю веру…

Працягнуўшыся праз увесь кантынент ад Шчэціна на Балтыцы і да Трыеста на Адрыятыцы, на Еўропу апусцілася «жалезная заслона». Сталіцы дзяржаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы… трапілі… у сферу савецкага ўплыву… Больш за тое, гэтыя краіны падпадаюць пад усё больш адчувальны кантроль, а нярэдка і непасрэдны ціск з боку Масквы.

*Што выклікала непакой У. Чэрчыля? Якія меры па прадухіленню вайны ён прапаноўваў? Пра якую «жалезную заслону» гаворыць У. Чэрчыль? Чаму гэтую прамову часта разглядаюць як пачатак «халоднай вайны»?*



АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

# Раздзел I

# АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ ЗША І КРАІН ЕЎРОПЫ

## § 2. ФАРМІРАВАННЕ І КРЫЗІС «ГРАМАДСТВА ЎСЕАГУЛЬНАГА ДАБРАБЫТУ» Ў КРАІНАХ ЗАХАДУ

**Успомніце:** *Якія краіны ў гады Другой сусветнай вайны ваявалі на баку нацысцкай Германіі, а якія ўваходзілі ў склад антыгітлераўскай кааліцыі?*

**Аднаўленне эканомікі і пачатак еўрапейскай інтэграцыі.** Пасля Другой сусветнай вайны эканоміка ЗША і Заходняй Еўропы ўвайшла ў перыяд аднаўлення і рэканструкцыі. Да 1946 г. аб'ём прамысловай вытворчасці буйнейшых краін Еўропы склаў каля 70 % ад даваеннага ўзроўню. Аднак у некаторых дзяржавах, асабліва ў пераможаных, не хапала харчавання, жылля, прамысловых тавараў, масавы характар набыло беспрацоўе. З 1946 г. у заходніх краінах хуткімі тэмпамі стала праводзіцца **рэканструкцыя** народнай гаспадаркі, г. зн. яе перавод на мірныя рэйкі і фарміраванне новай эканамічнай мадэлі развіцця. ЗША аказалі значную дапамогу ў справе аднаўлення эканомікі краін Заходняй Еўропы. У адпаведнасці з «планам Маршала» 17 дзяржаў Еўропы да 1951 г. атрымалі больш за 13 млрд долараў крэдытаў. Вялікую ролю ў эканамічным развіцці Захаду адыгралі створаныя ў канцы вайны *Міжнародны валютны фонд (МВФ)* і Міжнародны банк рэканструкцыі і развіцця (МБРР), а таксама падпісанае ў 1947 г. *Генеральнае пагадненне па тарыфах і гандлю (ГАТТ)*. У выніку была сфарміравана новая валютна-фінансавая сістэма, якая замацавала панаванне долара ЗША ў эканоміцы заходняга свету.

Для пасляваеннай мадэлі эканамічнага развіцця краін Захаду сталі характэрнымі дзяржаўнае рэгуляванне эканомікі, утварэнне



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

буйнога дзяржаўнага сектара, у тым ліку шляхам нацыяналізацыі некаторых прадпрыемстваў. Дзяржава выкарыстоўвала прынцып планавання развіцця эканомікі, праводзіла гнуткую бюджэтную і фінансавую палітыку з мэтай недапушчэння інфляцыі, надавала значную ўвагу вырашэнню сацыяльных праблем. У выніку ў краінах Захаду была створана змешаная эканоміка, заснаваная на функцыянаванні дзяржаўнага і прыватнага сектараў, развіцці дзяржаўнага і прыватнага прадпрымальніцтва ў рамках адносна свабодных рынайчных адносін.

У пачатку 1950-х гг. асноўныя задачы па аднаўленню і рэканструкцыі эканомікі былі паспяхова выкананы. Гэтаму ў значнай ступені садзейнічала эканамічная і палітычная інтэграцыя краін Заходняй Еўропы. У **1949 г.** для садзеяння інтэграцыйным працэсам, асабліва ў галіне абароны правоў чалавека, была створана міжнародная арганізацыя — **Савет Еўропы (СЕ).** У **1951 г.** Францыя, ФРГ, Італія, Бельгія, Нідэрланды і Люксембург заснавалі **Еўрапейскае аб'яднанне вугля і сталі (ЕАВС).** У **маі 1957 г.** у Рыме гэтыя краіны падпісалі пагадненне аб стварэнні **Еўрапейскай эканамічнай супольнасці (ЕЭС),** ці **Агульнага рынку.** ЕЭС ставіла сваёй мэтай стварэнне адзінай эканамічнай прасторы, у якой гарантаваўся свабодны рух капіталаў, рабочай сілы, выраўноўванне ўзроўню эканамічнага і сацыяльнага развіцця краін супольнасці.

**Фарміраванне «грамадства ўсеагульнага дабрабыту».** У 1950-я — 1960-я гг. у перадавых краінах Захаду склалася ідэя *«дзяржавы ўсеагульнага дабрабыту»,* у адпаведнасці з якой дзяржава павінна была гарантаваць грамадзянам высокі ўзровень сацыяльнага забеспячэння і імкнуцца падтрымліваць устойлівы эканамічны рост. Ідэалагічнай асновай «дзяржавы ўсеагульнага дабрабыту» стала дактрына сацыяльнага лібералізму, якая разам з развіццём рыначных адносін прызнавала дзяржаўнае рэгуляванне эканомікі і высокі ўзровень сацыяльнай абароны і сацыяльнага забеспячэння у якасці асноўных фактараў сацыяльна-эканамічнага развіцця. Вялікі ўклад у развіццё дактрыны сацыяльнага лібералізму зрабіў англійскі эканаміст *Дж. М. Кейнс.* Яшчэ да вайны ён прапанаваў стымуляваць рост эканомікі шляхам павелічэння спажывецкай здольнасці насельніцтва, заахвочвання дзелавой актыўнасці грамадзян, аказання дапамогі бедным і павышэння ўзроўню сацыяльнага страхавання.


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Рэалізацыя кейнсіянскай мадэлі эканамічнага і сацыяльнага развіцця ў краінах Захаду пасля вайны прывяла да нябачанай раней вытворчасці тавараў масавага спажывання і росту попыту на іх. Гэтаму садзейнічаў так званы «адкладзены попыт» насельніцтва, якое падчас вайны не магло задаволіць усе свае патрэбы ў таварах. Пасля вайны пачаўся спажывецкі бум, паступова склалася грамадства спажывання з высокім узроўнем жыцця і сацыяльных гарантый. Каля $^2/_3$ насельніцтва краін Захаду належала да новага сярэдняга класа, які складаўся з высокакваліфікаваных рабочых («сініх каўнерыкаў»), а таксама служачых, інжынерна-тэхнічных кадраў і менеджараў («белых каўнерыкаў»). У шэрагу дзяржаў, асабліва ў Германіі, Італіі, скандынаўскіх краінах, высокія тэмпы эканамічнага развіцця сталі называць «эканамічным цудам».

Для **«грамадства ўсеагульнага дабрабыту»** былі характэрныя нізкі ўзровень беспрацоўя, значны попыт на тавары масавага спажывання, вырашэнне жыллёвай праблемы, высокі ўзровень арганізацыі вольнага часу, рост сферы паслуг, удасканаленне сістэмы аховы здароўя і адукацыі. Дзяржава аказвала шырокую дапамогу бедным слаям насельніцтва, моладзі, забяспечвала высокі ўзровень пенсій і іншай сацыяльнай дапамогі. У Швецыі, Даніі і Нарвегіі ў перыяд знаходжання ва ўладзе сацыял-дэмакратаў дзяржава накіроўвала на сацыяльнае забеспячэнне да 50 % расходаў дзяржаўнага бюджэту. Гэтую мадэль развіцця дзяржавы і грамад-



*Адна з першых ЭВМ. ЗША, 1946 г.*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

ства пачалі называць *шведскай*, ці *скандынаўскай мадэллю дэмакратычнага сацыялізму*.

Вялікую ролю ў фарміраванні «грамадства ўсеагульнага дабрабыту» адыграла **навукова-тэхнічная рэвалюцыя (НТР),** якая пачалася на мяжы **1940-х — 1950-х гг.** Яна азначала карэннае якаснае пераўтварэнне вытворчых сіл. Навука ператварылася ў вядучы фактар грамадскай вытворчасці. Пачатак НТР звязваюць, у першую чаргу, з выдатнымі дасягненнямі ў галіне ядзернай фізікі, электронікі, кібернетыкі і генетыкі. Асаблівае значэнне мела вынаходніцтва электронна-вылічальных машын (ЭВМ), ці камп'ютараў. Адна з першых ЭВМ, створаных у 1946 г. у ЗША, важыла 30 т і займала плошчу 150 м$^2$. Развіццё электронікі і кібернетыкі абумовіла з'яўленне станкоў з праграмным кіраваннем і аўтаматызаваных вытворчых сістэм. Выяўленне структуры ДНК паклала пачатак геннай інжынерыі і новых біятэхналогій.

Складанай часткай НТР стала асваенне космасу. У **1957 г.** СССР запусціў першы штучны спадарожнік Зямлі. **12 красавіка 1961 г.** савецкі лётчык Ю. А. Гагарын стаў першым чалавекам, які ажыццявіў палёт у космас. ЗША ўдалося запусціць свой штучны спадарожнік толькі ў 1958 г.



*Першы штучны спадарожнік Зямлі. СССР, 1957 г.*



*Запуск карабля «Усход» з Ю. А. Гагарыным на борце. 12 красавіка 1961 г.*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

А першы амерыканец ажыццявіў палёт у космас у 1962 г. У 1969 г. амерыканскія астранаўты высадзіліся на Месяц. Касмічныя палёты ў многім абумовілі бурнае развіццё ракетнай тэхнікі.

НТР змяніла ўяўленні чалавека аб навакольным свеце, сфарміравала новую сацыяльную структуру грамадства, змяніла лад жыцця людзей, для чалавека найбольш важнай стала сфера навукі, адукацыі і інфармацыі.

**Сусветны эканамічны крызіс 1974—1975 гг. і яго наступствы.** У пачатку 1970-х гг. «грамадства ўсеагульнага дабрабыту» апынулася на мяжы крызісу. Эканамічны рост у краінах Захаду запаволіўся з-за вялікіх затрат на развіццё сацыяльнай сферы, бюракратызацыі сістэмы кіравання, карупцыі і г. д. Дзяржаўнае рэгуляванне эканомікі абмяжоўвала развіццё рынку, расла інфляцыя, павялічваўся ўзровень беспрацоўя. Унутраныя рынкі былі перанасычаны таварамі працяглага карыстання. На Захадзе выйшла з ужытку форма экстэнсіўнага (затратнага) тыпу эканамічнага росту. Рост інфляцыі прывёў да таго, што ў 1972 г. ЗША адмянілі залатое забеспячэнне долара, нацыянальныя валюты краін Захаду пусціліся ў «свабоднае плаванне». Нарастанню крызісу садзейнічала рэзкае павышэнне цэн на нафту ў 1973 г. Час таннай энергіі і таннай сыравіны скончыўся. У **1974—1975 гг.** выбухнуў *сусветны эканамічны крызіс,* які закрануў амаль усе капіталістычныя краіны. Прамысловая вытворчасць скарацілася на 15 %, а ўзровень беспрацоўя вырас у 2—3 разы. Крызіс паказаў, што кейнсіянская мадэль сацыяльна-эканамічнага рэгулявання вычарпала сябе.

У канцы 1970-х — пачатку 1980-х гг. у шэрагу краін Захаду да ўлады прыйшлі партыі кансерватыўнага кірунку. Яны правялі неакансерватыўную мадэрнізацыю эканомікі, галоўным тэарэтыкам якой быў амерыканскі эканаміст *М. Фрыдман.* Ён лічыў, што асноўную ўвагу варта надаць не пераразмеркаванню выпрацаванага прадукта, а забеспячэнню ўмоў яго пастаяннага росту і заахвочвання дзелавой актыўнасці, асабліва ў сферы малога і сярэдняга бізнесу. У сувязі з гэтым, неакансерватары аслабілі дзяржаўнае рэгуляванне эканомікі, перасталі датаваць нерэнтабельныя прадпрыемствы, зменшылі расходы на сацыяльныя патрэбы. Яны правялі **прыватызацыю** — перадачу ў прыватную ўласнасць часткі дзяржаўнага сектара эканомікі, забяспечылі, знізіўшы падаткі, умовы для развіцця малога і сярэдняга бізнесу. Гэта прывяло да



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

эканамічнага росту і абнаўлення тэхналагічнай базы вытворчасці. Найбольш глыбокія рэформы прайшлі ў ЗША і Вялікабрытаніі, а таксама ў Францыі і ФРГ. Неакансерватыўная мадэрнізацыя ў эканоміцы і палітыцы заходніх краін прывяла да фарміравання новай эканамічнай і сацыяльнай мадэлі развіцця грамадства. Рэзка ўзрасло значэнне навукі, інфармацыйных тэхналогій ва ўсіх сферах грамадскага жыцця.

### Пытанні і заданні:

1. Ахарактарызуйце становішча краін Захаду і ЗША пасля Другой сусветнай вайны. Якія асноўныя праблемы неабходна было вырашыць?
2. Раскрыйце змест паняцця «грамадства ўсеагульнага дабрабыту». На якіх ідэалагічных і эканамічных ідэях яно заснавана? Чаму ў 1970-я гг. «грамадства ўсеагульнага дабрабыту» апынулася ў стане крызісу?
3. Якія змены ў сацыяльна-эканамічным развіцці прапанавалі неакансерватары? Чаму гэтую палітыку называюць неакансерватыўнай рэвалюцыяй?
4. Чаму пасля Другой сусветнай вайны ўзмацнілася эканамічнае і палітычнае супрацоўніцтва паміж краінамі Заходняй Еўропы? Якія фактары садзейнічалі інтэграцыйным працэсам у Заходняй Еўропе? Пачніце складанне табліцы «Інтэграцыя краін Заходняй Еўропы»:

| Дата | Назва арганізацыі | Краіны-удзельніцы | Мэты аб'яднання |
|---|---|---|---|
| | | | |

5. Савет Еўропы — адна са старэйшых у Еўропе міжнародных арганізацый. Падрыхтуйце паведамленне пра яе структуру і дзейнасць. Выкарыстайце дадатковыя крыніцы інфармацыі.
6. Раскрыйце змест паняцця «навукова-тэхнічная рэвалюцыя». Якія з'явы яе характарызуюць?

**Прапануем абмеркаваць.** Пасля Другой сусветнай вайны ў краінах Заходняй Еўропы сфарміравалася канцэпцыя сацыяльна-арыентаванай рынкавай эканомікі. Гэта дало шэрагу даследчыкаў права зрабіць вывад



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

пра тое, што Захад рухаецца ў бок сацыялізму. Чаму пытанням сацыяльнай палітыкі стала надавацца вялікае значэнне? Як змянялася роля дзяржавы ў правядзенні сацыяльна-эканамічнай палітыкі?

### Гістарычны дакумент

**З прамовы дзяржаўнага сакратара ЗША Джорджа Маршала ў Гарвардскім універсітэце**

*5 чэрвеня 1947 г.*

…Калі гавораць пра патрэбы аднаўлення Еўропы, то правільна ацэньваюць маштабы людскіх страт, відавочнае разбурэнне гарадоў, заводаў, шахт і чыгунак…

Праўда ў тым, што на наступныя тры ці чатыры гады патрэбы Еўропы ў замежным харчаванні і іншых важнейшых прадуктах — у асноўным з Амерыкі — настолькі перавышаюць яе цяперашнюю плацёжную здольнасць, што ёй трэба аказаць значную дадатковую дапамогу, ці яна сутыкнецца з вельмі сур'ёзным абвастрэннем сітуацыі ў эканамічнай, сацыяльнай і палітычнай галінах…

Акрамя дэмаралізуючага эфекту для свету ў цэлым і магчымасцей беспарадкаў, якія ўзнікнуць у выніку адчаю бядотных народаў, усім павінны быць відавочны наступствы для эканомікі Злучаных Штатаў. … Ніякі ўрад, які манеўруе з мэтай заблакіраваць аднаўленне іншых краін, не можа чакаць ад нас дапамогі. Больш за тое, урады, палітычныя партыі ці групы, якія спрабуюць увекавечыць чалавечае жабрацтва для таго каб атрымаць палітычныя ці іншыя дывідэнды, сутыкнуцца з супрацьдзеяннем Злучаных Штатаў…

*Якія палітычныя мэты праследавалі ЗША, прымаючы «план Маршала»?*

## § 3. ПОСТІНДУСТРЫЯЛЬНАЕ ГРАМАДСТВА Ў РАЗВІТЫХ КРАІНАХ ЗАХАДУ

**Успомніце:** *Што такое навукова-тэхнічная рэвалюцыя? Якія наступствы яна мела? Калі і з якой мэтай была створана Арганізацыя Аб'яднаных Нацый?*

**Асноўныя рысы постіндустрыяльнага (інфармацыйнага) грамадства.** У 1980-я — 1990-я гг. у развітых краінах Захаду сфарміравалася **постіндустрыяльнае,** ці **інфармацыйнае грамадства.**



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Галоўным сектарам эканомікі становіцца вытворчасць ведаў і інфармацыі, а сам вытворчы працэс заснаваны на высокіх тэхналогіях і навейшых дасягненнях НТР. У сувязі з гэтым адбываецца пераразмеркаванне рабочай сілы з вытворчай сферы ў сферу паслуг. У сярэдзіне 1990-х гг. у перадавых краінах Захаду ў сферы паслуг было занята каля 70 % рабочай сілы. Характэрнымі рысамі інфармацыйнага грамадства з'яўляюцца: першараднае значэнне навукі і вытворчасці інфармацыі, развіццё новых інфармацыйных тэхналогій (інфарматыкі, мікраэлектронікі, тэлекамунікацый), укараненне ў эканоміку і жыццё грамадства новых тэхналогій, матэрыялаў, стварэнне глабальнай інфармацыйнай прасторы. З'яўленне ў канцы 1970-х гг. мікрапрацэсараў выклікала рэвалюцыю ў электроніцы і стварэнне новых відаў камп'ютарнай тэхнікі. Персанальныя камп'ютары і сусветная камп'ютарная сетка Інтэрнэт змянілі не толькі якасць і хуткасць камунікацыі паміж людзьмі, але і характар гаспадарчых і працоўных адносін. Камп'ютарызацыя выклікала інфармацыйную рэвалюцыю і з'яўленне новых тэхналогій. Многія вытворчыя працэсы сталі цалкам аўтаматызаванымі ці робатызаванымі. Дзякуючы пераважнаму развіццю сфер інфармацыі, навукі, ведаў, паслуг і вольнага часу быў забяспечаны новы рост прадукцыйнасці працы. У пачатку XXI ст. якасна змяніўся вобраз жыцця людзей, галоўнымі стымуламі для іх сталі творчая праца, адукацыя, гнуткі працоўны графік, актыўны адпачынак, самарэалізацыя.

**Глабалізацыя сусветнай эканомікі. Праблемы інтэграцыі.** Глабалізацыя азначае фарміраванне адзінай эканамічнай сістэмы ў глабальным сусветным маштабе. **Глабалізацыя** — гэта рух капітала, тавараў, паслуг і рабочай сілы, а таксама засяроджанне кіравання эканомікай у руках *транснацыянальных кампаній (ТНК)* і *транснацыянальных банкаў (ТНБ)*, якія ахопліваюць усю планету. У выніку глабалізацыі ствараюцца сусветны фінансавы рынак, сусветны рынак тавараў і паслуг і агульнапланетарная інфармацыйная прастора. Рашаючую ролю ў працэсе глабалізацыі адыгралі НТР і ТНК. Дзякуючы міжнароднаму падзелу працы ўжо ў 1980-я гг. ТНК кантралявалі больш за 40 % прамысловай вытворчасці, больш за 60 % знешняга гандлю і больш за 80 % тэхналагічных распрацовак у развітых краінах. Буйнейшымі ТНК



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

сталі такія карпарацыі як «Макдоналдс», «Панасонік», «Пепсіко», «Самсунг» і інш. ТНК працуюць практычна ва ўсіх навейшых галінах эканомікі, у тым ліку ў аўтамабілебудаванні, электроніцы, нафтахіміі, інфармацыйных тэхналогіях.

У 1990-я гг. змянілася і геаграфія фінансавых патокаў. У цяперашні час большую частку інвестыцый выдзяляюць ЗША, Заходняя Еўропа і Японія. Глабалізацыю зведаў і гандаль. **У 1995 г.** была створана **Сусветная гандлёвая арганізацыя (СГА),** якая стала пераемніцай ГАТТ. Яе членамі з'яўляюцца больш за 150 дзяржаў. СГА вызначае агульныя прынцыпы гандлю, рэгулюе пытанні аб зняцці мытных бар'ераў і скарачэнні імпартных пошлін. Адначасова з сусветным фінансавым рынкам фарміруецца глабальны рынак тавараў і паслуг. Значная іх частка цяпер прадаецца і купляецца праз Інтэрнэт. Ствараецца сусветны спажывецкі рынак і адзіныя стандарты якасці тавараў і паслуг. Больш за $^2/_3$ ад аб'ёму сусветнага гандлю выпадае на долю ТНК.


*Сцяг Еўрапейскага Саюза.*

Значная роля ў працэсе глабалізацыі належыць эканамічнай інтэграцыі. У 1990-я гг. пачаўся новы этап еўрапейскай інтэграцыі. Важнейшай яго падзеяй стала падпісанне ў **1992 г.** у горадзе *Маастрыхт* (Нідэрланды) дагавора аб стварэнні палітычнага і эканамічнага аб'яднання еўрапейскіх дзяржаў — **Еўрапейскага Саюза (ЕС).** Маастрыхцкія пагадненні ўступілі ў сілу ў 1993 г. і забяспечылі ўвядзенне адзінага еўрапейскага грамадзянства, правядзенне ўзгодненай эканамічнай палітыкі. Яшчэ раней была створана так званая Шэнгенская зона, у якой уведзены адзіны памежны кантроль для ўсіх дзяржаў, што ў яе ўваходзяць. Ён адсутнічае ўнутры краін, што ўваходзяць у гэту зону. У 1995 г. былі ўведзены агульныя для грамадзян шэрага краін ЕС шэнгенскія візы. **У 1999 г.** у безнаяўных разліках стала выкарыстоўвацца адзіная еўрапейская валюта — *еўра*. З 2002 г. еўра замяніла нацыянальныя валюты большасці дзяржаў ЕС. Пераход да еўра амаль ва ўсіх краінах суправаджаўся ростам кошту жыцця. У 2004 — 2007 гг. пасля ўваходжання ў ЕС



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"




*Еўрапейскі Саюз у 2012 г.*

шэрага былых сацыялістычных краін колькасць яго членаў дасягнула 27. Еўрапейскі Саюз ператварыўся ў магутны эканамічны і палітычны саюз дзяржаў, які выпрабляе больш за 21 % сусветнага валавага прадукта і на тэрыторыі якога пражывае каля 500 млн чалавек.

**Крызісныя з'явы ў постіндустрыяльным грамадстве ў пачатку XXI ст.** У пачатку XXI ст. у постіндустрыяльным грамадстве пачалі наспяваць крызісныя з'явы. Найбольш важнай прычынай эканамічнага спаду і фінансавага крызісу стала нежыццяздольнасць неакансерватыўнай мадэлі развіцця эканомікі. Яна дапускала занадта вялікую ступень свабоды рынкавых адносін і аслабляла рэгулюючыя функцыі дзяржавы ў эканамічным жыцці грамадства.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Буйныя кампаніі, карпарацыі і банкі нярэдка займаліся фінансавымі спекуляцыямі і махінацыямі, ствараючы так званыя «піраміды», якія не былі забяспечаны рэальным рухам капіталаў, паслуг і тавараў. Разам з карупцыяй гэта выклікала праблемы функцыянавання сусветнай фінансавай сістэмы. Яе дэстабілізацыі садзейнічалі беспадстаўна высокія спажывецкія расходы і танныя крэдыты.

Эканамічны рост у канцы ХХ ст. быў у многім абумоўлены будаўнічым бумам, велізарнымі ўкладаннямі капіталу ў будаўнічую галіну. У той жа час іншыя сферы эканомікі адчувалі недахоп капіталу. Гэта прывяло да зніжэння прадукцыйнасці працы і падзенню рэальных заробкаў. Пачаўся спад дзелавой актыўнасці, выраслі цэны, павысіўся ўзровень беспрацоўя.

Сусветны эканамічны і фінансавы крызіс пачаўся ў **верасні 2008 г.** у ЗША. Амерыканская эканоміка апынулася ў стане глыбокага заняпаду. Гэта было прадвызначана тым, што многія амерыканскія прадпрыемствы і сама дзяржава жылі не па сродках. Яны мелі велізарныя даўгі і аказаліся фінансава нежыццяздольнымі. Мільёны амерыканцаў не змаглі выплачваць крэдыты на будаўніцтва жылля. Усё гэта прывяло да фінансавай катастрофы асобных банкаў, а потым і ўсёй фінансавай сістэмы.

У верасні 2008 г. разарыўся адзін з вядучых банкаў ЗША «Леман Бразэрз». Пасля гэтага ў ЗША і Заходняй Еўропе пачалася ланцуговая рэакцыя банкруцтва буйнейшых банкаў і рэзкі спад узроўню вытворчасці. Кошт акцый буйнейшых кампаній да лістапада 2008 г. знізіўся прыкладна на 40 %. У ЗША за першыя 5 месяцаў крызісу страцілі працу каля 3 млн чалавек. На працягу 2009 г. у сярэднім у месяц пазбаўляліся працы 700 000 амерыканцаў. Да канца 2009 г. узровень беспрацоўя ў ЗША вырас да 10 %. За год было страчана 13 трлн долараў набытку амерыканскіх гаспадарак у акцыях, пенсійных фондах, кошту дамоў. Крызісныя з'явы і цяжкасці ў развіцці буйнейшай у свеце эканомікі ЗША, а таксама залежнасць многіх дзяржаў свету ад курса долара, глабальны характар эканамічных сувязей прывялі да таго, што эканамічны крызіс у ЗША хутка перакінуўся на іншыя краіны і набыў сусветныя маштабы.

Многія буйныя амерыканскія і еўрапейскія прадпрыемствы і фірмы мелі вострую патрэбу ў фінансавых сродках. Яны звярнуліся


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

за дапамогай да дзяржавы, якая была вымушана ратаваць ад разарэння многія банкі і кампаніі, укладваючы ў іх велізарныя капіталы.

Выратаваць эканоміку і фінансы заходніх краін ад поўнай катастрофы была ў стане толькі дзяржава. Ва ўмовах крызісу рэзка ўзрасла яе рэгулюючая роля ў эканоміцы і фінансах, а таксама ў сферы сацыяльнай палітыкі. Падчас сусветнага эканамічнага і фінансавага крызісу выявілася, што некаторыя еўрапейскія дзяржавы апынуліся ў становішчы буйных даўжнікоў, практычна на мяжы банкруцтва. У гэтых умовах Еўрапейскі Саюз аказаў дапамогу Грэцыі, Іспаніі, Партугаліі і некаторым іншым дзяржавам Еўропы з мэтай стабілізацыі іх фінансаў. Многія краіны Захаду пачалі аздараўленне сваіх фінансавых сістэм і пошуку шляхоў вырашэння сацыяльных праблем. Напрыклад, у канцы 2009 г. урад ЗША знізіў падаткі на малы бізнес, а таксама пашырыў падатковыя льготы для сярэдняга і буйнога бізнесу. Былі выдзелены і дадатковыя сродкі на выплату дапамогі па беспрацоўю. Аднак да цяперашняга часу вядучым краінам Захаду не ўдалося дасягнуць поўнай фінансавай і эканамічнай стабілізацыі.

### Пытанні і заданні:

1. Калі сфарміравалася постіндустрыяльнае грамадства? Выдзеліце асноўныя яго рысы. Чаму постіндустрыяльнае грамадства часта называюць інфармацыйным?
2. Растлумачце значэнне паняцця «глабалізацыя». Якія прычыны глабалізацыі сусветнай эканомікі?
3. Сфармулюйце азначэнне паняццяў «транснацыянальная карпарацыя» і «транснацыянальны банк». Якую ролю яны адыгрываюць ў сучасным свеце?
4. Прадоўжыце складанне табліцы «Інтэграцыя краін Заходняй Еўропы». Якія станоўчыя і адмоўныя бакі мае еўрапейская інтэграцыя? Растлумачце сэнс дэвізу Еўрапейскага Саюза: «Згода ў разнастайнасці».
5. Падрыхтуйце кароткі агляд інстытутаў і эканамічнага патэнцыялу Еўрапейскага Саюза. Выкарыстайце дадатковую літаратуру і рэсурсы Інтэрнэта.
6. Якія прычыны эканамічнага спаду і сусветнага фінансавага крызісу, што пачаўся ў 2008 г.? У чым ён праявіўся?



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Прапануем абмеркаваць.** Ва ўмовах глабалізацыі супрацоўніцтва паміж дзяржавамі стала важнейшай перадумовай іх паспяховага развіцця. Аднак у 1990-я гг. у развітых краінах Захаду склаўся масавы рух антыглабалістаў, якія выказваюць пратэст супраць паглыблення інтэграцыі, кантролю ТНК і ТНБ над сусветнай эканомікай. Як вы можаце растлумачыць супярэчнасці, якія склаліся?

## Гістарычны дакумент

### З Дагавора аб Еўрапейскім Саюзе

*Маастрыхт (Нідэрланды), 7 лютага 1992 г.*

Яго Вялікасць Кароль Бельгійцаў, Яе Вялікасць Каралева Даніі, Прэзідэнт Федэратыўнай Рэспублікі Германія, Прэзідэнт Грэчаскай Рэспублікі, Яго Вялікасць Кароль Іспаніі, Прэзідэнт Французскай Рэспублікі, Прэзідэнт Ірландыі, Прэзідэнт Італьянскай Рэспублікі, Яго Каралеўская Высокасць Вялікі Герцаг Люксембурга, Яе Вялікасць Каралева Нідэрландаў, Прэзідэнт Партугальскай Рэспублікі, Яе Вялікасць Каралева Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі… дамовіліся аб наступным.

**Артыкул А.** Згодна сапраўднаму Дагавору Высокія Дагаворныя Бакі засноўваюць Еўрапейскі Саюз…

**Артыкул В.** Саюз ставіць перад сабой наступныя мэты:

— садзейнічаць устойліваму і гарманічнаму эканамічнаму і сацыяльнаму прагрэсу, асабліва шляхам стварэння прасторы без унутраных межаў, эканамічнага і сацыяльнага аб'яднання і стварэння эканамічнага і валютнага саюза, які ў канчатковым выніку ўключае ўвядзенне адзінай валюты…;

— спрыяць зацвярджэнню яго індывідуальнасці на міжнароднай арэне, асабліва шляхам ажыццяўлення агульнай знешняй палітыкі і агульнай палітыкі бяспекі, уключаючы магчымае афармленне ў далейшым агульнай абарончай палітыкі, якая магла б прывесці з часам да стварэння агульных сіл абароны;

— узмацніць абарону правоў і інтарэсаў грамадзян дзяржаў-членаў пры дапамозе ўвядзення грамадзянства Саюза;

— развіваць цеснае супрацоўніцтва ў галіне правасуддзя і ўнутраных спраў…

*Якая арганізацыя была заснавана ў Маастрыхце? Якія краіны заключылі Маастрыхцкія пагадненні? З якой мэтай аб'ядналіся гэтыя дзяржавы?*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

# § 4. ЗЛУЧАНЫЯ ШТАТЫ АМЕРЫКІ

**Успомніце:** *Якую ролю адыгралі ЗША ў пасляваенным аднаўленні краін Заходняй Еўропы? Якія асноўныя палітычныя партыі вядуць барацьбу за ўладу ў ЗША?*

**Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё ЗША ў 1945—1950-я гг.** Пасля Другой сусветнай вайны ЗША канчатковаператварыліся ў сусветную звышдзяржаву. Да 1949 г. доля прамысловай вытворчасці ЗША ў сусветнай эканоміцы сярод капіталістычных краін склала больш за 55 %. ЗША валодалі (да лета 1949 г.) манаполіяй на ядзерную зброю і мелі магутныя ўзброеныя сілы.

У першыя пасляваенныя гады ЗША перажывалі эканамічны ўздым. Была паспяхова вырашана праблема **рэканверсіі,** г. зн. пераводу эканомікі на мірныя рэйкі. Быў задаволены «адкладзены попыт» насельніцтва на тавары масавага спажывання. У канцы 1940-х — пачатку 1950-х гг. у ЗША раней, чым у іншых краінах, пачалася навукова-тэхнічная рэвалюцыя. У 1950-я гг. значна палепшылася сацыяльнае становішча амерыканцаў. Сярэдняя пагадзінная заработная плата з 1950 па 1960 г. вырасла з 1,4 да 2,2 долара. Ішло масавае будаўніцтва жылля, удасканальвалася сістэма адукацыі і аховы здароўя. Разам з тым да канца 1950-х гг. узровень беспрацоўя вырас да 6,5 %.

У гэты перыяд адміністрацыя прэзідэнта *Гары Трумэна* праводзіла так званы *«справядлівы курс»*, спрабуючы ажыццявіць некаторыя сацыяльныя рэформы і абмежаваць уплыў левых сіл у краіне. У *1947 г.* былі прыняты закон, які значна абмяжоўваў правы прафсаюзаў, і пастанова аб праверцы лаяльнасці дзяржаўных служачых. Пасля прэзідэнцкіх выбараў 1948 г., на якіх перамогу атрымаў дэмакрат Г. Трумэн, у палітычным жыцці ЗША пачаўся зрух управа. Па ініцыятыве сенатара-рэспубліканца *Джозэфа Макарці* ў ЗША з *1950 г.* пачалася палітычная кампанія па масавай чыстцы дзяржаўнага апарата ад «камуністычных агентаў» і «нядобранадзейных асоб», так званы **макартызм.**

У лістападзе 1952 г. да ўлады прыйшлі рэспубліканцы. Новы прэзідэнт *Дуайт Эйзенхаўэр* у пачатку свайго кіравання супрацоўнічаў з макартыстамі, аднак, калі яны пачалі абвінавачваць яго і Міністэрства абароны ЗША ў «мяккіх» адносінах да ворагаў дзяржавы, прэзідэнт выступіў з асуджэннем паводзін



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ



*М. Л. Кінг падчас маршу пратэсту. 1964 г.*

Дж. Макарці. У снежні 1954 г. лідар макартыстаў быў вымушаны пайсці ў адстаўку.

У гэтыя гады актывізавалася і барацьба афраамерыканцаў супраць расавай дыскрымінацыі. Яе лідар, святар **Марцін Лютар Кінг,** арганізаваў шэраг буйных выступленняў чарнаскурых амерыканцаў на поўдні краіны. Пад уплывам негрыцянскага руху Кангрэс ЗША ў 1957 і 1960 гг. прыняў законы аб ахове некаторых грамадзянскіх правоў афраамерыканцаў.

У перыяд прэзідэнцтва Г. Трумэна і Д. Эйзенхаўэра ЗША праводзілі актыўны знешнепалітычны курс, накіраваны на супрацьстаянне з СССР. Менавіта ў прысутнасці Г. Трумэна ў сакавіку 1946 г. у Фултане У. Чэрчыль абвінаваціў СССР ва ўсталяванні «жалезнай заслоны» ў Еўропе і заклікаў Захад аб'яднацца ў барацьбе супраць «сусветнага камунізму». Асновай знешняй палітыкі ЗША ў гады кіравання Г. Трумэна стала яго знешнепалітычная праграма, якая прадугледжвала палітыку «стрымлівання» СССР, так званая **«дактрына Трумэна»**. У сакавіку 1947 г. прэзідэнт заявіў аб неабходнасці тэрмінова дапамагчы Грэцыі і Турцыі ў барацьбе супраць «камуністычнай пагрозы». Гэта дазволіла ЗША размясціць у Турцыі амерыканскія ракетныя базы. ЗША прымалі меры і па аслабленню ўплыву камуністаў і выдаленню іх з урадаў некаторых заходнееўрапейскіх краін. У чэрвені 1947 г. дзяржсакратар ЗША *Дж. Маршал* прапанаваў план дапамогі еўрапейскім краінам у справе аднаўлення эканомікі. У 1948 — 1952 гг., павод-



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

ле *«плана Маршала»*, было выдзелена каля 17 млрд долараў. Гэта ўмацавала пазіцыі ЗША ў Заходняй Еўропе. Падчас блакады Заходняга Берліна з боку СССР ЗША адыгралі рашаючую ролю ў наладжванні паветранага моста з горадам. У красавіку 1949 г. ЗША ўзначалілі ваенна-палітычны блок НАТО.

У гады прэзідэнцтва ЗША Д. Эйзенхаўэра ў ЗША была прынята дактрына «масіраванай адплаты» ў адносінах СССР і яго саюзнікаў, якая прадугледжвала магчымасць нанясення апераджальнага ядзернага ўдара па Савецкаму Саюзу. Разам з тым у сярэдзіне 1950-х гг. адміністрацыя Д. Эйзенхаўэра пайшла на перамовы з СССР у Жэневе ў межах сустрэч на вышэйшым узроўні. Гэта часова змякчыла адносіны паміж Усходам і Захадам. Аднак другі Берлінскі крызіс, які пачаўся ў лістападзе 1958 г. вакол статуса Заходняга Берліна, зноў прывёў да абвастрэння адносін паміж ЗША і СССР. 1 мая 1960 г. у Свярдлоўску быў збіты амерыканскі самалёт-разведчык «У-2», пілот якога трапіў у палон. Гэты інцыдэнт сарваў сустрэчу ў вярхах у Парыжы, таму што Д. Эйзенхаўэр адмовіўся выконваць умовы М. С. Хрушчова па ўрэгуляванні канфлікту.

**ЗША на «новых рубяжах». Крызісныя з'явы ў 1970-я гг.** На прэзідэнцкіх выбарах 1960 г. перамог дэмакрат **Джон Кенэдзі.** Ён абаснаваў праграму дасягнення *«новых рубяжоў»* у гісторыі ЗША, г. зн. пад'ёму ўзроўню жыцця за кошт развіцця сацыяльна-арыентаванай рыначнай эканомікі. Яго пераемнік *Ліндан Джонсан,* прадаўжаючы курс «новых рубяжоў», прапанаваў праграму стварэння *«вялікага грамадства»* ў ЗША, якая таксама была накіравана на забеспячэнне эканамічнага росту і дабрабыту насельніцтва. У хуткім часе былі павышаны заработныя платы, прадоўжаны выплаты дапамогі па беспрацоўю, прадастаўлена дадатковая дапамога фермерам, павялічаны выдаткі на сістэму адукацыі і аховы здароўя, зніжаны падаткі і г. д. У ЗША была створана «дзяржава дабрабыту», у якой большасць насельніцтва мела прымальны ўзровень жыцця. Аднак не ўсе слаі насельніцтва ЗША былі задаволены сітуацыяй у краіне. Значная частка моладзі падтрымлівала «новы левы» рух, які не прымаў каштоўнасці буржуазнага грамадства. Працягвалася барацьба афраамерыканцаў за свае правы, падчас якой у красавіку 1968 г. расісты забілі М. Л. Кінга.

Незадаволенасць амерыканцаў уступленнем ЗША ў вайну ў В'етнаме ў 1965 г. прывяла да таго, што ў 1968 г. на прэзідэнцкіх выбарах перамогу атрымаў кандыдат ад Рэспубліканскай партыі



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

*Рычард Ніксан.* Ён абвясціў «новую эканамічную палітыку», што прадугледжвала скарачэнне шэрага сацыяльных праграм. У гэты час эканамічнае становішча ЗША пагоршылася з-за сусветнага эканамічнага крызісу 1974 — 1975 гг. Абвастрылася і ўнутрыпалітычная сітуацыя ў сувязі з так званай «уотэргейцкай справай». У 1972 г. на прэзідэнцкіх выбарах перамогу зноў атрымаў Р. Ніксан. Пазней стала вядома, што ў перыяд выбарчай кампаніі ў гатэлі «Уотэргейт», дзе знаходзілася штаб-кватэра Дэмакратычнай партыі, пры спробе ўсталяваць падслухоўваючую апаратуру было арыштавана некалькі чалавек, звязаных з рэспубліканцамі. У ходзе расследавання былі таксама выяўлены шматлікія парушэнні законнасці адказнымі супрацоўнікамі Белага дома. У выніку Р. Ніксан у 1974 г. быў вымушаны абвясціць аб сваёй адстаўцы. У адпаведнасці з Канстытуцыяй ЗША новым прэзідэнтам стаў віцэ-прэзідэнт *Джэральд Форд.* У 1977 г. прэзідэнцкі пост заняў лідар Дэмакратычнай партыі *Джымі Картэр.* Яго адміністрацыя, нягледзячы на асобныя поспехі, не змагла вырашыць многія сацыяльна-эканамічныя і знешнепалітычныя праблемы. Таму на чарговых прэзідэнцкіх выбарах 1980 г. дэмакраты пацярпелі паражэнне.

У галіне знешняй палітыкі асноўнай праблемай для ЗША сталі адносіны з Савецкім Саюзам. Саперніцтва паміж дзвюма дзяржавамі не раз ставіла свет на мяжу ядзернай катастрофы. Так было падчас **Карыбскага крызісу** восенню **1962 г.** Падставай для гэтага канфлікту паслужыла размяшчэнне савецкіх ракет на Кубе. Тэрыторыя ЗША апынулася ў межах дасягальнасці гэтых ракет. Дж. Кенэдзі патрабаваў ад СССР ліквідаваць на востраве савецкія базы, прыбраць ракеты і абвясціў марскую блакаду Кубы. Узброеныя сілы ЗША і СССР апынуліся на мяжы сутыкнення. Аднак лідары абедзвюх краін — Дж. Кенэдзі і М. С. Хрушчоў праявілі вытрымку, што дазволіла ўтрымаць свет ад вайны. Савецкія ракеты былі выведзены з Кубы, а ЗША адмовіліся ад спроб уварвання на Востраў Свабоды. У гэты перыяд Кенэдзі заявіў, што ЗША не імкнуцца да сусветнага панавання. Такі палітычны курс прэзідэнта выклікаў незадавальненне рэакцыйных колаў ЗША. У лістападзе 1963 г. падчас знаходжання ў г. Даласе Дж. Кенэдзі быў забіты.

Пасля смерці Кенэдзі ўзаемаадносіны паміж СССР і ЗША заставаліся напружанымі, асабліва ў 1965 — 1973 гг., падчас вайны ЗША ў В'етнаме. Кароткачасовы перыяд разрадкі ў савецка-амерыканскіх


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

### Гістарычны партрэт



**Джон Фіцжэралд Кенэдзі** (1917 — 1963) — 35-ы прэзідэнт ЗША (1961 — 1963 гг.). Выхадзец з заможнай сям'і, якая належыць да інтэлектуальнай і палітычнай эліты ЗША. Закончыў з адзнакай Гарвардскі ўніверсітэт. У гады Другой сусветнай вайны ваяваў, быў цяжка паранены і двойчы ўзнагароджаны за адвагу. З 1947 па 1953 г. прадстаўляў акругу Бостан у Кангрэсе ЗША як дэпутат ад Дэмакратычнай партыі. Пазней стаў сенатарам. У лістападзе 1960 г. быў абраны прэзідэнтам ЗША. Адміністрацыя Кенэдзі прыняла і рэалізавала праграму па стабілізацыі эканомікі. Былі зроблены сур'ёзныя крокі па ўраўнаванню ў правах афраамерыканцаў, пачалася рэалізацыя касмічнай праграмы «Апалон» (1961 г.), падпісаны Маскоўскі дагавор аб забароне выпрабаванняў ядзернай зброі ў атмасферы, у касмічнай прасторы і пад вадой (1963 г.). Забіты 22 лістапада 1963 г. падчас перадвыбарнай паездкі па краіне ў г. Далас (Тэхас). Гэта забойства, названае злачынствам стагоддзя, да гэтага часу застаецца нераскрытым.

---

адносінах у пачатку і сярэдзіне 1970-х гг. змяніўся іх абвастрэннем, асабліва пасля ўводу савецкіх войск у Афганістан у 1979 г.

**ЗША ў 1980 — 2012 гг.** Сусветны эканамічны крызіс 1974 — 1975 гг. і ўдзел у гонцы ўзбраенняў абвастрылі сацыяльныя праблемы ў ЗША. Наспелыя праблемы ў развіцці краіны паспрабаваў вырашыць новы прэзідэнт ЗША **Рональд Рэйган,** абраны ў 1980 г. ад Рэспубліканскай партыі. Яго палітыка атрымала ў гісторыі назву **«рэйганомікі»**. Яна заключалася ў змяншэнні дзяржаўнага ўмяшальніцтва ў эканоміку, зніжэнні падаткаў на прыбытак прадпрыемстваў і даходы насельніцтва. Змяншэнне даходаў дзяржавы, выкліканае зніжэннем падаткаў, кампенсавалася за кошт скарачэння выдаткаў на медыцыну, адукацыю, падтрымку беспрацоўных. У той жа час урад ЗША не шкадаваў сродкаў на распрацоўку новых высокапрадукцыйных і рэсурсазберагаючых тэхналогій. Былі прыняты таксама меры па абароне ўнутранага рынку ад канкурэнцыі з боку замежных тавараў — японскіх, паўднёвакарэйскіх. Падтрымліваўся малы і сярэдні бізнес. Рэйганоміка прывяла да станоўчых зрухаў у эканоміцы, а разам з тым і да скарачэння беспрацоўя, павышэння жыццёвага ўзроўню амерыканцаў.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

У галіне знешняй палітыкі адміністрацыя Рэйгана пачала сваю дзейнасць з заявы аб новым «крыжовым паходзе» супраць камунізму, а СССР назвала «імперыяй зла». У пачатку 1980-х гг. ваенныя расходы ЗША хутка павялічваліся, а разам з імі і дзяржаўны доўг. Значную частку сродкаў паглынала распрацоўка **стратэгічнай абароннай ініцыятывы (САІ)** — праграмы стварэння сістэмы супрацьпаветранай абароны, якая прадугледжвала вывад ядзернай і лазернай зброі ў космас. Гонка ўзбраенняў вымотвала эканоміку ЗША, але яшчэ ў большай ступені знясільвала і эканоміку СССР, што разумеў і савецкі кіраўнік М. С. Гарбачоў. Таму ў 1985 — 1991 гг. кіраўнікі дзвюх дзяржаў правялі серыю сустрэч. У выніку было прызнана, што ў ядзернай вайне не можа быць пераможцаў, і яна ніколі не павінна быць развязана.

У 1989 — 1993 гг., у перыяд прэзідэнцтва рэспубліканца *Джорджа Буша (старэйшага)*, знешняя палітыка ЗША не змянілася. Але да гэтага часу з-за ваенных выдаткаў вытворчасць прадукцыі ў грамадзянскіх галінах стала скарачацца. Адпаведна ў краіне змяншалася колькасць рабочых месцаў, павялічваўся разрыў ва ўзроўні даходаў паміж багатымі і беднымі.

У такіх умовах на прэзідэнцкіх выбарах 1992 г. пераканаўчую перамогу атрымаў кандыдат ад Дэмакратычнай партыі *Біл Клінтан*. У сваёй перадвыбарчай кампаніі Клінтан рабіў упор на неабходнасць эканамічнага пад'ёму і стварэння ўмоў для паспяховага развіцця сярэдняга класу. Гэта было забяспечана шляхам скарачэння ваенных выдаткаў і зніжэння падаткаў на малыя даходы, а таксама дзякуючы рэалізацыі праграмы дапамогі моладзі ў атрыманні адукацыі і працаўладкаванні. На прэзідэнцкіх выбарах 2000 і 2004 гг. з нязначнай перавагай перамог рэспубліканец *Джордж Буш (малодшы)*. Яго адміністрацыя імкнулася знізіць падаткі, палепшыць якасць жыцця амерыканцаў, забяспечыць канкурэнтаздольнасць эканомікі ЗША ва ўмовах глабалізацыі.

На мяжы XX і XXI стст. абвастрыліся супярэчнасці паміж ЗША і ісламскімі тэрарыстамі. **11 верасня 2001 г.** ісламскія экстрэмісты ажыццявілі тэрарыстычную атаку на ЗША. Самалёты з тэрарыстамі-смяротнікамі знішчылі адзін з сімвалаў ЗША — будынкі Сусветнага гандлёвага цэнтра ў Нью-Ёрку і разбурылі частку будынка Міністэрства абароны. У выніку загінула каля 3 тыс. амерыканскіх грамадзян. ЗША абвясцілі вайну тэрарызму, узначалілі міжнародную антытэрарыстычную кааліцыю, якая ліквідавала ісламскі тэрары-



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



*Памятны знак на месцы будынкаў Сусветнага гандлёвага цэнтра ў Нью-Ёрку, разбураных падчас тэракта 11 верасня 2001 г.*

стычны рэжым у Афганістане. Пад сцягам барацьбы з тэрарызмам ЗША імкнуцца ўсталяваць сваю гегемонію ў свеце. Вясной **2003 г.** войскі ЗША і іх саюзнікаў без санкцый ААН акупіравалі Ірак і звергլі рэжым С. Хусейна. Абапіраючыся на новую праамерыканскую ўладу ў Іраку, ЗША спрабуюць кантраляваць багаты нафтай рэгіён Персідскага заліва. Але ў саміх ЗША ўзмацнялася крытыка знешнепалітычнага курса рэспубліканскай адміністрацыі. На прэзідэнцкіх выбарах 2008 г. незадавальненне насельніцтва ўнутранай і знешняй палітыкай адміністрацыі Дж. Буша абумовіла перамогу кандыдата ад Дэмакратычнай партыі *Барака Абамы.* Ён імкнецца праводзіць буйныя сацыяльныя рэформы. Аднак сусветны эканамічны крызіс, які пачаўся ў 2008 г., ускладніў іх правядзенне. У знешняй палітыцы быў скарэкціраваны курс барацьбы з тэрарызмам. У канцы 2011 г. войскі ЗША былі выведзены з Ірака. У 2011 г. Б. Абама выступіў за звяржэнне рэжыму М. Кадафі ў Лівіі і адобрыў ваенную аперацыю НАТО ў гэтай краіне. У маі 2011 г. кіраўніцтва ЗША заявіла аб ліквідацыі амерыканскім спецназам кіраўніка «Аль-Каіды» У. бен Ладэна (на тэрыторыі Пакістана). У апошні час абвастрыліся адносіны ЗША з Іранам і Сірыяй.

### Пытанні і заданні:

1. Чаму пасля Другой сусветнай вайны ЗША змаглі заняць вядучае становішча ў заходнім свеце?



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

2. Ахарактарызуйце ўнутраную палітыку ЗША ў другой палове XX — пачатку XXI ст. Параўнайце палітыку «новых рубяжоў» і «рэйганоміку».
3. З якімі ўнутранымі праблемамі сутыкнуліся ЗША ў другой палове XX — пачатку XXI ст.?
4. Чаму пасля вайны ў ЗША ўзмацняецца рух за грамадзянскія правы афраамерыканцаў? Які палітычны дзеяч зрабіў найбольшы ўклад у гэты рух? Складзіце яго палітычны партрэт.
5. Якія фактары аказваюць уплыў на правядзенне знешняй палітыкі ЗША? У чым выражаецца роля ЗША як «сусветнага паліцэйскага»?
6. Складзіце абагульняючую табліцу «ЗША ў другой палове XX — пачатку XXI ст.».

| Гады | Прозвішча прэзідэнта | Партыйная прыналежнасць | Асноўныя напрамкі ўнутранай палітыкі | Асноўныя напрамкі знешняй палітыкі |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

7. Хто з палітычных дзеячаў адыграў, на вашу думку, найбольш значную ролю ў пасляваеннай гісторыі ЗША? Сваю думку аргументуйце.

**Прапануем абмеркаваць.** У ЗША ў пасляваенны перыяд быў прыняты шэраг законаў, якія ўшчамлялі правы рабочых, стала больш жорсткай сістэма дзяржаўнага рэгулявання працоўных адносін, узмоцнены кантроль за ўнутранымі справамі прафсаюзаў, разгорнута маштабная кампанія супраць кампартыі, дэмакратычных і левapадыкальных арганізацый. Чаму ў адрозненне ад большасці еўрапейскіх краін, дзе пасляваенная сітуацыя характарызавалася паваротам налева, у ЗША мела месца наступленне правых і кансерватыўных сіл?

## Гістарычны дакумент

### З прамовы М. Л. Кінга «У мяне ёсць мара»

*28 жніўня 1963 г.*

Сто гадоў таму вялікі амерыканец… падпісаў Праклямацыю аб вызваленні неграў. Гэты важны ўказ стаў велічным маяком святла надзеі для мільёнаў чорных рабоў, апаленых полымем спапяляючай несправядлівасці…



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Але праз сто гадоў мы вымушаны прызнаць трагічны факт, што негр усё яшчэ не свабодны… жыццё негра, на жаль, па-ранейшаму калечыцца кайданамі сегрэгацыі і ланцугамі дыскрымінацыі… негр жыве на пустынным востраве беднасці пасярод велізарнага акіяна матэрыяльнага росквіту… негр па-ранейшаму пакутуе на задворках амерыканскага грамадства і аказваецца ў ссылцы на сваёй уласнай зямлі…

Я кажу вам сёння, сябры мае, што, нягледзячы на цяжкасці і расчараванні, у мяне ёсць мара…

У мяне ёсць мара, што прыйдзе дзень, калі наша нацыя ўздымецца і дажыве да сапраўднага сэнсу свайго дэвіза: «Мы лічым самавідавочным, што ўсе людзі створаны роўнымі»…

У мяне ёсць мара, што на чырвоных пагорках Джорджыі прыйдзе дзень, калі сыны былых рабоў і сыны былых рабаўладальнікаў змогуць сесці разам за сталом братэрства…

У мяне ёсць мара, што прыйдзе дзень, калі чацвёра маіх дзяцей будуць жыць у краіне, дзе пра іх будуць меркаваць не па колеру іх скуры, а па таму, што яны сабой уяўляюць…

У мяне ёсць мара, што прыйдзе дзень, калі… маленькія чорныя хлопчыкі і дзяўчынкі змогуць узяцца за рукі з маленькімі белымі хлопчыкамі і дзяўчынкамі і ісці разам, як браты і сёстры…

*Выясніце значэнне паняццяў «сегрэгацыя» і «дыскрымінацыя». Успомніце, калі ў ЗША было адменена рабства. Чаму афраамерыканцам даводзілася змагацца за свае правы? Што вы можаце сказаць пра становішча афраамерыканцаў у цяперашні час?*

## § 5. ФЕДЭРАТЫЎНАЯ РЭСПУБЛІКА ГЕРМАНІЯ І ГЕРМАНСКАЯ ДЭМАКРАТЫЧНАЯ РЭСПУБЛІКА

**Успомніце:** *Як было вырашана пытанне пра лёс Германіі на канферэнцыях у Ялце і Патсдаме? Якія ўнутраныя праблемы неабходна было вырашыць у Германіі пасля заканчэння Другой сусветнай вайны?*

**Раскол Германіі.** 8 мая 1945 г. вайна для Германіі закончылася, але трагедыя нямецкага народа прадаўжалася. З кожным днём усё больш ясным станавіўся кошт прыходу нацыстаў да ўлады: больш за 13 млн загінуўшых, тых, хто трапіў у палон, і пакалечаных, разбураная эканоміка, пагроза голаду. Большасць насельніцтва



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Германіі адчувала прыгнечанасць, многія чакалі помсты з боку пераможцаў. У такіх абставінах неабходна было пачынаць новае пасляваеннае жыццё.

На Крымскай (Ялцінскай) і Патсдамскай канферэнцыях адказнасць за лёс пасляваеннай Германіі ўзялі на сябе краіны-пераможцы. Кожная з іх абавязвалася ў сваёй зоне акупацыі забяспечыць правядзенне *дэнацыфікацыі* (выкараненне ідэй нацызму і пакаранне нацысцкіх ваенных злачынцаў), *дэмакратызацыі, дэмілітарызацыі* і *дэкартэлізацыі* (драбленне манаполій).

Кіраўніцтва СССР было ўпэўнена ў тым, што гэтыя задачы могуць быць вырашаны з дапамогай левых сіл Германіі, здольных правесці антыкапіталістычныя пераўтварэнні. Таму яно падтрымлівала аднаўленне Камуністычнай партыі Германіі, а потым яе аб'яднанне з сацыял-дэмакратамі ў савецкай зоне акупацыі. У выніку была створана *Сацыялістычная адзіная партыя Германіі (САПГ)*. У англійскай і амерыканскай зонах акупацыі ўзмацняўся ўплыў *Хрысціянска-дэмакратычнага саюза (ХДС)* і *Хрысціянска-сацыяльнага саюза (ХСС)*, створаных у гэты час. Утварэнне гэтых партый адлюстроўвала натуральнае ўзмацненне інтарэсу шырокіх мас насельніцтва да рэлігіі ва ўмовах той глыбокай катастрофы, якая напаткала нямецкі народ. Акрамя таго, іх заснавальнікі разлічвалі, што адраджэнне хрысціянскіх прынцыпаў у палітычным жыцці Германіі дапаможа яе прымірэнню з Захадам. У той жа час была створана і ліберальная партыя — *Свабодная дэмакратычная партыя (СвДП)*.

У першыя пасляваенныя гады надзённымі сталі пытанні аднаўлення эканомікі і забеспячэння насельніцтва самым неабходным. Але вырашаць іх ва ўмовах падзелу краіны на чатыры зоны было складана. Спасылаючыся на неабходнасць аднаўлення адзінай эканомікі, англійскія і амерыканскія ўлады ў снежні 1946 г. аб'ядналі свае зоны ў адну пад назвай Бізонія. У красавіку 1949 г. да яе далучылася і французская зона, а аб'яднаную зону назвалі Трызонія. Летам 1949 г. у заходніх зонах акупацыі была праведзена грашовая рэформа, накіраваная на замену абясцэненых марак новымі, і адменены кантроль дзяржавы над цэнамі. Гэтыя меры азначалі рашучы курс на развіццё рынкавай эканомікі ў Германіі. Савецкая адміністрацыя ў сваёй зоне не магла гэтага дапусціць. У савецкую зону быў забаронены ўвоз як старых,



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

так і новых марак, што ўскладняла тавараабмен. Для Заходняга Берліна, які знаходзіўся ў цэнтры савецкай зоны, гэтыя меры азначалі эканамічную блакаду. Тады адміністрацыя заходніх зон наладзіла забеспячэнне заходніх сектараў Берліна па паветраным мосце. Толькі ў маі 1949 г. закончылася блакада Заходняга Берліна. **Берлінскі крызіс 1948 — 1949 гг.** прывёў да рэзкага абвастрэння адносін паміж СССР і заходнімі краінамі і фактычнага раскола Германіі.

**23 мая 1949 г.** была абнародавана канстытуцыя новай заходнегерманскай дзяржавы, якая атрымала назву **Федэратыўная Рэспубліка Германія (ФРГ). 7 кастрычніка 1949 г.** у процівагу ёй у савецкай зоне акупацыі была створана **Германская Дэмакратычная Рэспубліка (ГДР).**

Канстытуцыя 1949 г. абвясціла ФРГ федэрацыяй асобных зямель са сваімі ўрадамі. Агульнадзяржаўнымі (федэральнымі) органамі ўлады сталі *двухпалатны парламент, прэзідэнт* і *ўрад* на чале з *канцлерам*. Устанаўлівалася, што члены адной з палат парламента — *бундэстага* — выбіраюцца, а члены другой — *бундэсрата* — прызначаюцца ўрадамі зямель. Канцлер выбіраецца бундэстагам і валодае ў адпаведнасці з канстытуцыяй вялікімі паўнамоцтвамі. Як і любая дэмакратычная канстытуцыя, канстытуцыя ФРГ абвяшчала асабістыя і палітычныя правы грамадзян. Артыкул 23-і прадугледжваў магчымасць распаўсюджвання канстытуцыі на нямецкія землі, якія не ўваходзілі ў той час у склад ФРГ. На першых выбарах у бундэстаг, што адбыліся ў 1949 г., перамогу атрымаў блок партый ХДС/ХСС на чале з *Конрадам Адэнаўэрам.*

**«Эканамічны цуд» у ФРГ.** Прыняты ў ФРГ варыянт развіцця эканомікі атрымаў назву **«сацыяльнай рыначнай эканомікі»**. Ён адрозніваўся тым, што разам з дзеяннем рыначных механізмаў у эканоміцы дзяржава пакідала за сабой актыўную ролю ў сацыяльнай галіне: распрацоўвала і праводзіла ў жыццё законы аб працы і пенсійным забеспячэнні, удзельнічала ў будаўніцтве жылля і развіцці адукацыі.

Прадастаўленне свабоды прыватнаму капіталу ўжо на мяжы 1940-х — 1950-х гг. прывяло да рэзкага росту капіталаўкладанняў у вытворчасць. Гэта стала галоўнай прычынай германскага «эканамічнага цуду», г. зн. паскоранага развіцця краіны. «Эканамічнаму цуду» таксама садзейнічала дапамога, атрыманая паводле



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

«плана Маршала», сканцэнтраванасць у Заходняй Германіі асноўных запасаў сыравіны (жалезная руда, каменны вугаль) і высокая кваліфікацыя рабочых кадраў. Іх колькасць пастаянна папаўнялася за кошт перабежчыкаў з ГДР. Паскоранаму развіццю ФРГ садзейнічала таксама і тое, што аднаўленне вытворчасці адбывалася на сучаснай тэхнічнай аснове. Акрамя таго, у пасляваенны перыяд Заходняя Германія даволі доўга не мела ваенных расходаў, за выключэннем расходаў на ўтрыманне акупацыйных войск. Нельга не ўлічваць уласцівыя нямецкаму народу працавітасць і дысцыплінаванасць. У выніку ў канцы 1950-х гг. ФРГ выйшла на другое месца ў заходнім свеце пасля ЗША па ўзроўню прамысловай вытворчасці.

**«Эра Адэнаўэра».** З верасня 1949 г. па кастрычнік 1963 г. канцлерам ФРГ быў лідар ХДС Конрад Адэнаўэр. У першыя гады свайго існавання ФРГ не была раўнапраўнай у адносінах з іншымі краінамі. ЗША, Вялікабрытанія і Францыя размясцілі на яе тэрыторыі свае войскі і мелі права ўмешвацца ў яе ўнутраную і знешнюю палітыку. У **1955 г.** ФРГ дабілася прыняцця ў НАТО, пасля чаго ёй было дазволена стварыць свае ўзброеныя сілы колькасцю да 500 тыс. чалавек. Удзел у НАТО значна ўмацоўваў міжнароднае становішча краіны. У адказ на гэты крок сацыялістычныя краіны Еўропы ў 1955 г. падпісалі ў Варшаве дагавор аб супрацоўніцтве і калектыўнай бяспецы і стварылі Арганізацыю Варшаўскага Дагавора, у якую ўвайшла і ГДР.



*Берлінская сцяна. 1961 г.*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Уступленне ФРГ у НАТО прывяло да паскоранай мілітарызацыі краіны. Яе ўзброеныя сілы забяспечваліся самай сучаснай зброяй. У гэтых умовах пачаўся новы Берлінскі крызіс. Яго асноўнай прычынай былі ўцёкі часткі насельніцтва з ГДР у заходнія сектары Берліна. У лістападзе 1958 г. патрабаванне М. С. Хрушчова ператварыць Заходні Берлін у дэмілітарызаваны горад і самастойную палітычную адзінку паклала пачатак **другому Берлінскаму крызісу.** **13 жніўня 1961 г.** улады ГДР устанавілі строгі кантроль на мяжы з Заходнім Берлінам і пачалі будаваць сцяну, якая падзяліла Берлін на дзве часткі. Яна стала сімвалам расколу Германіі і «халоднай вайны» паміж Усходам і Захадам. Гэта азначала крах палітыкі ФРГ, накіраванай на ліквідацыю ГДР. Восенню 1963 г. К. Адэнаўэр пайшоў у адстаўку.

**«Новая ўсходняя палітыка».** Неабходнасць перагляду знешняй палітыкі ўзмацнялася ў сувязі з тым, што ў свядомае жыццё ўступала пакаленне, якое не ведала вайны і не хацела бачыць на ўсходзе Еўропы сваіх праціўнікаў. Выказваючы інтарэсы значнай часткі насельніцтва, *Сацыял-дэмакратычная партыя Германіі (СДПГ)* прапанавала ідэю **«новай усходняй палітыкі».** Гэта палітыка была накіравана на прызнанне існуючых межаў і супрацоўніцтва з усходнееўрапейскімі краінамі, уключаючы ГДР. У 1969 г. СДПГ у саюзе з СвДП перамагла на выбарах у бундэстаг, а яе лідар Вілі Брант узначаліў урад.



*Канцлер ФРГ В. Брант каля помніка ахвярам Варшаўскага гета. 1970 г.*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Урад В. Бранта ў **1970 г.** падпісаў *Маскоўскі дагавор* з СССР, у якім абедзве дзяржавы прызналі непарушнасць існуючых у Еўропе межаў і абавязаліся вырашаць усе свае спрэчкі толькі мірнымі сродкамі. Затым такія ж дагаворы былі заключаны з Польшчай і Чэхаславакіяй. Дагавор з Чэхаславакіяй прызнаваў незаконным і несапраўдным Мюнхенскае пагадненне 1938 г. У 1972 г. быў заключаны Дагавор аб асновах адносін паміж ФРГ і ГДР, у якім прызнаваўся факт існавання ў Еўропе дзвюх германскіх дзяржаў.

З сярэдзіны 1970-х гг. у краіне пачалі нарастаць эканамічныя цяжкасці, з якімі СДПГ з яе метадамі дзяржаўнага ўмяшальніцтва ў вытворчасць і размеркаванне прадукцыі не змагла справіцца. Частка яе выбаршчыкаў перайшла на бок руху «зялёных» (абаронцаў навакольнага асяроддзя), які ўзнік у гэты час. У 1982 г. да ўлады прыйшла кааліцыя ХДС/ХСС — СвДП, а лідар ХДС **Гельмут Коль** стаў канцлерам і прыступіў да фарміравання ўрада.

**ФРГ у 1980-я гг. Аб'яднанне Германіі.** Кабінет Г. Коля садзейнічаў развіццю сацыяльнай рыначнай эканомікі ў межах неакансерватыўнага курсу. Поспехі, якіх дасягнула эканоміка ФРГ, рабілі ўсё больш прывабным заходнегерманскі вобраз жыцця для насельніцтва ГДР. У гэты час савецкае кіраўніцтва адмовілася ад жорсткага кантролю над усходнееўрапейскімі краінамі. Таму САПГ, што знаходзілася ва ўладзе ў ГДР, на чале з *Эрыхам Хоне-*

**Гістарычны партрэт**



**Гельмут Коль** (нар. 1930) — нямецкі дзяржаўны і палітычны дзеяч, член ХДС, федэральны канцлер ФРГ (1982 — 1998). Вучыўся ў Франкфурцкім і Гейдэльбергскім універсітэтах. У якасці канцлера праводзіў мадэрнізацыю эканомікі Германіі, выкарыстоўваючы неакансерватыўныя метады, прадоўжыў палітыку еўрапейскай інтэграцыі і ўмацавання НАТО. Пасля таго як СССР адмовіўся ад кантролю над Усходняй Еўропай, выступіў з ініцыятывай аб аб'яднанні Германіі, якое адбылося 3 кастрычніка 1990 г. Наладзіў партнёрскія адносіны з кіраўніцтвам СССР і Расіі М. С. Гарбачовым і Б. М. Ельцыным. У 1999 г. быў абвінавачаны ў незаконным фінансаванні ХДС і быў вымушаны пайсці ў адстаўку з паста лідара партыі.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

*керам,* пазбавілася падтрымкі з боку СССР. Акрамя таго, выявілася яе няздольнасць забяспечыць насельніцтву ва ўсходняй частцы Германіі той жа ўзровень жыцця, што і ў заходняй.

**Асноўныя эканамічныя паказчыкі ФРГ і ГДР на 1989 г.**

| Паказчыкі | ФРГ | ГДР |
|---|---|---|
| Тэрыторыя (тыс. кв. км.) | 249 | 108 |
| Насельніцтва (млн чал.) | 62,5 | 16,4 |
| Валавы нацыянальны прадукт (ВНП) (млрд зах.-герм. мар.) | 2265 | 400 |
| ВНП на душу насельніцтва (тыс. зах.-герм. мар.) | 36,2 | 24,4 |
| Экспарт (млрд зах.-герм. мар.) | 176,5 | 90,2 |
| Імпарт (млрд зах.-герм. мар.) | 131,1 | 87,2 |
| Сярэднемесячная заработная плата (зах.-герм. мар.) | 3300 | 1100 |

У такіх умовах жыхары ГДР працягвалі «галасаваць нагамі» супраць сацыялізму: яны збягалі ў ФРГ, якую лічылі часткай агульнай радзімы. У ГДР пачаліся масавыя антыўрадавыя выступленні. Э. Хонекер быў вымушаны пайсці ў адстаўку. **9 лістапада 1989 г.** новае кіраўніцтва ГДР паведаміла пра намер змякчыць кантрольна-прапускны рэжым у Берліне. Гэта выклікала стыхійную радасць берлінцаў, якія ў той жа дзень вымусілі ўлады адкрыць пераходы ў Заходні Берлін. Берлінская сцяна перастала падзяляць горад на дзве часткі, і пазней была дэманціравана. У сакавіку 1990 г. адбыліся свабодныя выбары ў парламент ГДР, на якіх перамаглі партыі, што выступалі за аб’яднанне Германіі. У жніўні таго ж года парламент ГДР прыняў рашэнне аб уваходжанні ў склад ФРГ.

Пад уплывам падзей у ГДР чатыры дзяржавы-пераможцы ў Другой сусветнай вайне арганізавалі ў маі — кастрычніку 1990 г. перагаворы па формуле «2+4». Дзве нямецкія дзяржавы — ФРГ і ГДР — дамаўляліся з ЗША, СССР, Францыяй і Вялікабрытаніяй



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

аб умовах аб'яднання Германіі. Затым быў падпісаны *Дагавор аб аб'яднанні* дзвюх дзяржаў на аснове распаўсюджвання канстытуцыі ФРГ на тэрыторыю ГДР. **3 кастрычніка 1990 г.** ён уступіў у сілу, і Германія стала адзінай. Такім чынам, германскае пытанне было канчаткова вырашана.

Напярэдадні знікнення з палітычнай карты Еўропы дзвюх раз'яднаных германскіх дзяржаў СССР, ЗША, Вялікабрытанія і Францыя падпісалі з імі Дагавор аб канчатковым урэгуляванні ў адносінах Германіі. Ён пацвярджаў недатыкальнасць межаў аб'яднанай Германіі, правядзенне ёю міралюбівай палітыкі, захаванне яе членства ў НАТО. Сталіцай аб'яднанай Германіі (ФРГ) стаў Берлін.

**Адзіная Германія на мяжы стагоддзяў.** Аб'яднанне дзвюх дзяржаў не магло прывесці да неадкладнага і гарманічнага аб'яднання дзвюх эканомік, двух розных ладаў жыцця і мыслення людзей. Адсталая арганізацыя і тэхналогія вытворчасці ў былой ГДР не магла забяспечыць такой жа прадукцыйнасці працы, як у Заходняй Германіі. Таму намаганні ўрада ФРГ былі накіраваны на тэхналагічнае абнаўленне гаспадаркі ўсходніх зямель і ўключэнне іх у адзіную нямецкую эканоміку.

Імклівыя палітычныя і эканамічныя працэсы выклікалі змены ў структуры насельніцтва і настроях розных яго груп. Адразу пасля аб'яднання ў былой ГДР у сувязі з ростам прадукцыйнасці працы і скарачэннем арміі ўзровень беспрацоўя дасягнуў 15 %. Каб атрымаць работу, жыхарам былой ГДР прыйшлося перавучвацца, пераязджаць у заходнія землі краіны. Не ўсе прынялі гэтыя перамены. Таму ва Усходняй Германіі захоўваўся ўплыў левай партыі — Партыі дэмакратычнага сацыялізму (ПДС), а ў другіх рэгіёнах аднавілі свае пазіцыі СДПГ і партыя «зялёных».

На выбарах у бундэстаг у 1998 і 2002 гг. перамога дасталася сацыял-дэмакратам. Іх лідар *Герхард Шродэр* сфарміраваў правячую кааліцыю, куды ўвайшлі прадстаўнікі СДПГ і партыі «зялёных». Аднак гэты ўрад не змог справіцца з эканамічнымі цяжкасцямі, якія ўзніклі ў пачатку новага стагоддзя, і асабліва з праблемай беспрацоўя. Восенню 2005 г. былі праведзены датэрміновыя выбары ў бундэстаг, але яны не выявілі перавагі якой-небудзь партыі. Быў сфарміраваны ўрад «вялікай кааліцыі» з удзелам як ХДС/ХСС, так і сацыял-дэмакратаў. Яго ўпершыню ў гісторыі Германіі ўзначаліла жанчына, лідар ХДС *Ангела Меркель*. У верасні 2009 г. СДПГ пацярпела паражэнне на выбарах у



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

бундэстаг, і ў новы кааліцыйны ўрад пад кіраўніцтвам А. Меркель увайшлі ХДС/ХСС і СвДП. Гэты ўрад імкнецца пераадолець наступствы сусветнага эканамічнага крызісу як унутры ФРГ, так і ў межах Еўрапейскага Саюза.

### Пытанні і заданні:

1. Чаму пасля Другой сусветнай вайны Германія была падзелена на дзве дзяржавы? Ахарактарызуйце дзяржаўны лад ФРГ.
2. Якія палітычныя партыі ўзніклі ў ФРГ у пасляваенны перыяд? Якія з гэтых партый існуюць у цяперашні час?
3. Які варыянт развіцця эканомікі быў рэалізаваны ў ФРГ у пасляваенны перыяд? У чым сутнасць гэтай палітыкі? Чаму ў ФРГ актыўную ролю ў эканоміцы адыгрывае дзяржава?
4. Якія прычыны абумовілі паскоранае эканамічнае развіццё ФРГ у 1950-я — 1960-я гг.?
5. Калі адбыліся Берлінскія крызісы? Чым яны былі выкліканы? Які быў іх вынік?
6. У чым сутнасць «новай усходняй палітыкі»? Якія дагаворы былі заключаны ў рамках гэтай палітыкі? Якія наступствы яна мела?
7. З чыім імем звязана правядзенне неакансерватыўнай палітыкі ў ФРГ? У чым яе сутнасць? Што забяспечыла ўраду Г. Коля магчымасць знаходзіцца ва ўладзе працяглы перыяд?
8. Апішыце працэс аб'яднання ФРГ і ГДР. Складзіце гістарычны каляндар «Аб'яднанне Германіі». Якія праблемы паўсталі перад ФРГ пасля аб'яднання Германіі?

**Прапануем абмеркаваць.** Якое сучаснае становішча ФРГ? Якую ролю адыгрывае ФРГ у сучасным свеце?

### Гістарычны дакумент

**З даклада Міністэрства дзяржбяспекі ГДР**
**пра матывы выезду з краіны грамадзян ГДР**

*Верасень 1989 г.*

Пераважная частка гэтых асоб ацэньвае праблемы і недахопы ў грамадскім развіцці, у першую чаргу ў асабістым акружэнні, выходзячы з асабістых умоў жыцця, а таксама ў плане так званых «паўсядзённых нястач».


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Шляхам параўнання жыцця з сітуацыяй у ФРГ і Заходнім Берліне яны прыходзяць, па сутнасці, да негатыўнай ацэнкі развіцця ў ГДР.

Перавагі сацыялізму, такія, напрыклад, як упэўненасць і бяспека, прызнаюцца, але ў параўнанні са з'явіўшыміся праблемамі і недахопамі [тавараў народнага спажывання] яны не разглядаюцца больш у якасці рашаючых…

У якасці галоўных прычын/падстаў імкнення да выезду на пастаяннае жыхарства ці да незаконнага пакідання ГДР… прыводзяцца наступныя:

— незадавальненне забеспячэннем таварамі і паслугамі;

— раздражненне па прычыне недахопаў сферы паслуг;

— недастатковы ўзровень медыцынскага абслугоўвання;

— абмежаваныя магчымасці для паездак унутры ГДР і за мяжу;

— нездавальняючыя ўмовы працы і адсутнасць узгодненасці ў вытворчым працэсе;

— недастатковасць/непаслядоўнасць у прымяненні прынцыпу здзельнай аплаты працы, а таксама незадавальненне развіццём памераў заработнай платы і акладаў;

— раздражненне бюракратызмам кіраўнікоў і супрацоўнікаў дзяржаўных органаў, прадпрыемстваў і ўстаноў, а таксама бессардэчнымі адносінамі да грамадзян;

— нязгода з інфармацыйнай палітыкай у ГДР.

*Чаму частка грамадзян ГДР імкнулася пакінуць краіну?*

## § 6. ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ

**Успомніце:** *Хто ўзначаліў урад Вялікабрытаніі ў гады Другой сусветнай вайны? Якія краіны з'яўляліся калоніямі Вялікабрытаніі?*

**Сітуацыя пасля Другой сусветнай вайны.** Вялікабрытанія панесла значныя страты ў гады вайны. Загінула каля 370 тыс. англічан, нямецкая авіяцыя нанесла велізарныя матэрыяльныя страты гарадам Вялікабрытаніі. Вайна аслабіла эканамічныя і палітычныя пазіцыі краіны ў свеце. У пасляваенны час паступова ўзмацнялася фінансавая і палітычная залежнасць Вялікабрытаніі ад ЗША.

У жніўні 1947 г. Вялікабрытанія была вымушана пайсці на падзел сваёй калоніі Індыя на два незалежных дамініёны — Індыйскі саюз і Пакістан. У 1948 г. незалежнасць атрымала рэспубліка Бірма (М'янма). У 1949 г. статус незалежнай рэспублікі набыла Ірландыя.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

У палітычным жыцці Вялікабрытаніі пасля вайны захоўвалі свае вядучыя пазіцыі Лейбарысцкая і Кансерватыўная партыі. Выбары летам 1945 г. прынеслі перамогу лейбарыстам. Створаны імі ўрад *Клемента Этлі* выступіў за ўзмацненне ролі дзяржавы ў эканоміцы і сацыяльным жыцці. Ён правёў нацыяналізацыю Англійскага банка, шэрага галін прамысловасці, транспарту і сувязі. Нацыяналізацыя праводзілася на ўмовах кампенсацыі ўладальнікам кошту іх уласнасці. Па сутнасці, гэта азначала, што дзяржава бярэ на ўтрыманне малаэфектыўныя, але важныя для ўсёй краіны галіны. Такая мера садзейнічала пераадоленню пасляваенных цяжкасцей. Развіццю эканомікі спрыяла таксама дапамога, атрыманая паводле «плана Маршала».

У хуткім часе, аднак, стала відавочнай невысокая эфектыўнасць брытанскай эканомікі. Для падтрымкі дзяржсектара ўрад быў вымушаны пайсці на павышэнне падаткаў, скарачэнне расходаў на сацыяльныя патрэбы. Большасць выбаршчыкаў расчаравалася ў палітыцы лейбарыстаў.

**Вялікабрытанія ў 1950—1960-я гг.** З 1951 па 1964 г. ва ўладзе ў Вялікабрытаніі знаходзілася Кансерватыўная партыя, лідарам якой доўгі час быў **Уінстан Чэрчыль.** У 1951 — 1955 гг. ён з'яўляўся прэм'ер-міністрам краіны.

Эканамічная палітыка кансерватараў была накіравана на скарачэнне дзяржаўнага сектара эканомікі. У гэтыя гады тэмпы прамысловай вытворчасці ў Вялікабрытаніі крыху павысіліся. Аднак па агульнаму аб'ёму вытворчасці яе абагналі ФРГ, пазней Японія і Францыя, дзе хутчэй укараняліся дасягненні НТР.

Асабліва адчувальнай стратай для Вялікабрытаніі стаў распад яе каланіяльнай імперыі, прадухіліць які ўлады краіны былі не ў сілах. Восенню 1956 г. брытанскі ўрад, імкнучыся перашкодзіць нацыяналізацыі Егіптам Суэцкага канала, уцягнуў краіну ў вайну супраць гэтай дзяржавы. Гэта выклікала масавы рух пратэсту ў Вялікабрытаніі і за яе межамі.

Гэта вайна паставіла на мяжу развалу *Брытанскую Садружнасць нацый* (з 1947 г. — *Садружнасць*), звязаную з Вялікабрытаніяй дагаворамі групу яе былых калоній. Парламент Вялікабрытаніі, які пераканаўся ў бесперспектыўнасці палітыкі сілы, у **1959 г.** быў вымушаны прызнаць распад Брытанскай Імперыі.


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Ольстэрская і іншыя праблемы 1970-х гг.** Адной з самых вострых для Вялікабрытаніі стала праблема *Ольстэра,* ці Паўночнай Ірландыі. Ольстэр (шэсць паўночных графстваў) пасля стварэння Ірландскай Рэспублікі застаўся ў складзе Вялікабрытаніі, хоць і атрымаў аўтаномію. Адну трэць насельніцтва складалі каталікі, карэнныя ірландцы, дзве трэці — пратэстанты, нашчадкі перасяленцаў — англійскіх каланізатараў. Ольстэр быў у той час эканамічна адсталым рэгіёнам Вялікабрытаніі. Узровень жыцця католікаў быў нізкі, іх неахвотна прымалі на працу, яны былі ўшчэмлены ў грамадзянскіх правах. Каталікі звязвалі такую сітуацыю са спадчынай каланіяльнага мінулага і патрабавалі прадастаўлення ім роўных правоў з іншымі брытанскімі падданымі. Але пратэстанцкая большасць не жадала ісці на саступкі. Тады радыкальна настроеныя прадстаўнікі каталіцкага насельніцтва Ольстэра стварылі для абароны сваіх інтарэсаў ваенізаваную арганізацыю *Ірландская Рэспубліканская Армія (ІРА).* Падраздзяленні ІРА займаліся падрыхтоўкай і правядзеннем тэрарыстычных актаў як у Ольстэры, так і на тэрыторыі Вялікабрытаніі. Так утварыліся два лагеры католікаў і пратэстантаў, якія супрацьстаялі адзін аднаму і ўступілі ў жорсткую крывапралітную барацьбу. Для пагашэння канфлікту ў 1969 г. у Паўночную Ірландыю былі ўведзены брытанскія войскі, а ў 1972 г. — прыпынена дзейнасць паўночнаірландскага парламента і ўведзена прамое кіраванне з Лондана.

Сярод іншых праблем, якія ўзніклі ў 1970-я гг., трэба назваць энергетычны і сыравінны крызіс. З яго паспрабавалі выйсці, пачаўшы здабычу нафты ў англійскім сектары Паўночнага мора. Але гэта не прывяло да станоўчых змен у эканоміцы. Вытворчасць скарачалася, рос узровень беспрацоўя. У такіх умовах на выбарах 1979 г. большасць выбаршчыкаў аддалі свае галасы Кансерватыўнай партыі. Незадоўга да выбараў упершыню ў гісторыі Вялікабрытаніі гэтую партыю ўзначаліла жанчына — **Маргарэт Тэтчэр,** якая і сфарміравала кабінет міністраў.

**Вялікабрытанія ў канцы ХХ — пачатку ХХІ ст.** У адрозненне ад палавінчатых мер 1950-х гг., кансерватары на гэты раз рашуча пайшлі на прыватызацыю шэрага галін прамысловасці — нафтавай, авіякасмічнай, суднабудаўнічай. Адначасова дзяржава стала расходаваць менш сродкаў на сацыяльную сферу: адукацыю, ахову



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

здароўя, жыллёвае будаўніцтва, быў скарочаны штат дзяржаўных служачых.

Урад заахвочваў закрыццё старых неэфектыўных прадпрыемстваў, нягледзячы на тое, што гэта павялічвала рост беспрацоўя. Восенню 1981 г. колькасць беспрацоўных дасягнула небывалых маштабаў — 3 млн чалавек. Нягледзячы на гэта, кансерватарам удалося выйграць парламенцкія выбары 1983 і 1987 гг.

Гэтыя поспехі часткова можна звязаць з асобай прэм'ер-міністра М. Тэтчэр. «Жалезная лэдзі», як празвалі яе журналісты, была ўмелым палітыкам і валодала многімі выдатнымі якасцямі: высокім узроўнем адукацыі, добрым разуменнем эканамічнай сітуацыі, талентам арганізатара, нязломнай воляй і настойлівасцю, талентам перакanання і велізарным асабістым абаяннем. М. Тэтчэр эфектыўна абараняла нацыянальныя інтарэсы Вялікабрытаніі на міжнароднай арэне. Яна кардынальна змяніла ўнутраную палітыку Вялікабрытаніі. Прынятыя яе ўрадам меры па заахвочванню малога і сярэдняга бізнесу, зніжэнню падаткаў, скарачэнню расходаў на сацыяльныя патрэбы, продажу ў прыватную ўласнасць дзяржаўных прадпрыемстваў атрымалі назву палітыкі **«тэтчэрызму»**. Гэта быў брытанскі варыянт неакансерватыўнай палітыкі ў сацыяльна-эканамічнай сферы. Фінансавая палітыка кабінета М. Тэтчэр

### Гістарычны партрэт



**Маргарэт Хільда Тэтчэр** (нар. 1925) — брытанскі дзяржаўны і палітычны дзеяч, прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі (1979—1990). Закончыла Оксфардскі ўніверсітэт. У 1959 г. выбрана ў парламент, у 1970—1974 гг. займала пасаду міністра адукацыі. З 1975 г. — лідар Кансерватыўнай партыі. Пасля таго як стала прэм'ер-міністрам, актыўна ўзялася за рэфармаванне брытанскай эканомікі неакансерватыўнымі метадамі. У 1982 г. у час Фалклендскага канфлікту ўрад Тэтчэр правёў рашучую ваенную кампанію для аднаўлення суверэнітэту Вялікабрытаніі над астравамі. У адносінах СССР падтрымлівала жорсткі курс адміністрацыі Р. Рэйгана. Цвёрдасць і паслядоўнасць у адстойванні сваіх поглядаў, жорсткасць пры правядзенні ў жыццё прынятых рашэнняў замацавалі за Тэтчэр мянушку «жалезнай лэдзі». Атрымала пажыццёвае пэрства і ў якасці баранесы заняла месца ў палаце лордаў.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

прывяла да ўмацавання фунта стэрлінгаў, зніжэнню цэн, павышэнню дзелавой ініцыятывы і прадукцыйнасці працы. Асабліва хутка развіваліся галіны вытворчасці, якія актыўна выкарыстоўвалі дасягненні НТР.

Шырокія масы насельніцтва Вялікабрытаніі адабралі і знешнюю палітыку ўрада М. Тэтчэр. У **1982 г.** Вялікабрытанія атрымала перамогу ў ваенным канфлікце з Аргенцінай з-за *Фалклендскіх астравоў,* якія належалі Вялікабрытаніі, але размяшчаліся непадалёку ад Аргенціны. Перамогу ў Фалклендскай вайне прывяла да росту патрыятычных настрояў і садзейнічала перамозе кансерватараў на выбарах у парламент у 1983 г. У 1985 г. для вырашэння Ольстэрскага крызісу ўрад Вялікабрытаніі пайшоў на пагадненне з Ірландскай Рэспублікай. Бакі дамовіліся садзейнічаць развіццю эканамічных сувязей паміж дзвюма часткамі вострава і сумесна змагацца з тэрарызмам у Ольстэры. Гэта змягчыла сітуацыю, хоць праблема Ольстэра да канца не вырашана і сёння.

Умацаванню ўплыву ўрада М. Тэтчэр у многім садзейнічалі змены ў структуры насельніцтва, якія адбыліся ў выніку НТР. Яны праявіліся ў першую чаргу ў змяншэнні долі рабочага класа і павелічэнні колькасці служачых, работнікаў, занятых у сферы паслуг. Вырасла і колькасць уласнікаў. Да 1990 г. 9 млн англічан сталі акцыянерамі, $^2/_3$ сем'яў — уладальнікамі дамоў і кватэр. Разам з тым, урад М. Тэтчэр звяртаўся да жорсткай сацыяльнай палітыкі. Супраціўленне прафсаюзаў і забастоўкі шахцёраў падаўляліся.



*Пасяджэнне палаты абшчын англійскага парламента.*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Аднак на мяжы 1980-х — 1990-х гг. папулярнасць М. Тэтчэр пачала падаць. Унутры Кансерватыўнай партыі наспяваў раскол. Многія не падзялялі стрыманую палітыку М. Тэтчэр у адносінах да перспектывы стварэння Еўрапейскага Саюза. У гэтых умовах «жалезная лэдзі» ў лістападзе 1990 г. пакінула пост лідара партыі і прэм'ер-міністра свайму пераемніку — *Джону Мэйджару*. Урад Мэйджара прадоўжыў палітыку «тэтчэрызму», але ў знешняй палітыцы імкнуўся да больш цеснага супрацоўніцтва з краінамі Еўропы. У 1992 г. Вялікабрытанія падпісала Маастрыхцкі дагавор аб стварэнні Еўрапейскага Саюза, аднак не ўступіла ў Шэнгенскую зону і адмовілася ўвесці агульнаеўрапейскую валюту еўра.

На парламенцкіх выбарах 1997 г. кансерватары пацярпелі паражэнне. Урад узначаліў лідар Лейбарысцкай партыі, якая перамагла на выбарах, *Тоні Блэр*. Поспеху лейбарыстаў садзейнічала прынятая партыяй канцэпцыя *«новага лейбарызму»*, якая прадугледжвала адмову ад ідэі стварэння грамадства, заснаванага на грамадскай уласнасці. Лейбарысты таксама абяцалі правесці рэформы, накіраваныя на дэмакратызацыю дзяржаўнага ладу, на што не пагаджаліся кансерватары. Паступовая рэалізацыя гэтых рэформ забяспечыла партыі падтрымку сярэдніх слаёў грамадства. У гэты ж час быў дасягнуты прагрэс у вырашэнні Ольстэрскай праблемы (у прыватнасці, адменена прамое кіраванне Лондана). У 1997 — 1999 гг. ва Уэльсе, Шатландыі і Паўночнай Ірландыі былі створаны мясцовыя парламенты.



*Каралеўская сям'я Вялікабрытаніі. У цэнтры — каралева Лізавета II. 2011 г.*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"
АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

У чэрвені 2007 г. урад лейбарыстаў узначаліў *Гордан Браўн*. Яго кабінет не змог праводзіць эфектыўную сацыяльную палітыку ва ўмовах сусветнага эканамічнага крызісу, які наступіў у 2008 г. На парламенцкіх выбарах у маі 2010 г. лейбарысты пацярпелі паражэнне. Кааліцыйны ўрад узначаліў лідар Кансерватыўнай партыі *Дэвід Кэмеран*. У кабінет упершыню ўвайшлі прадстаўнікі партыі Ліберальных дэмакратаў. Новы ўрад імкнецца змягчыць наступствы сусветнага эканамічнага крызісу для Вялікабрытаніі.

## Пытанні і заданні:

1. Ахарактарызуйце становішча Вялікабрытаніі пасля Другой сусветнай вайны. Якая праблема была для краіны найбольш вострай у першыя пасляваенныя гады?
2. У чым сутнасць Ольстэрскай праблемы? Як брытанскі ўрад вырашаў гэтую праблему ў розныя перыяды?
3. Ахарактарызуйце неакансерватыўную палітыку М. Тэтчэр. Якія дасягненні і пралікі палітыкі «тэтчэрызму»?
4. Што садзейнічала прыходу да ўлады лейбарыстаў? Чаму ўрад Т. Блэра практычна не змяніў эканамічную стратэгію кансерватараў?
5. Прааналізуйце статыстычныя даныя эканамічнага развіцця Вялікабрытаніі ў канцы 1990-х гг. і зрабіце вывад:

| Сферы вытворчасці | ВУП (%) | Колькасць занятых (%) |
|---|---|---|
| Прамысловасць і будаўніцтва | 31,4 | 26,4 |
| Сельская гаспадарка | 1,8 | 2,1 |
| Сфера паслуг | 66,8 | 71,5 |

**Прапануем абмеркаваць.** Не адвяргаючы ідэю еўрапейскай інтэграцыі, Вялікабрытанія актыўна выступала супраць шэрага інтэграцыйных праектаў. У прыватнасці, яна выступіла супраць далучэння да Шэнгенскіх пагадненняў, адмовілася ад увядзення еўра. Чым вы можаце растлумачыць такую пазіцыю Вялікабрытаніі?



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Гістарычны дакумент**

**М. Тэтчэр. Інтэрв'ю газеце «Известия» 30 красавіка 1989 г.**

Гэта [рост дабрабыту] дасягнута дзякуючы прадпрымальніцтву, талентам і здольнасцям народа… Мы акуратна кіравалі фінансамі, не абяцалі болей, чым маглі зрабіць. Калі вы траціце больш, чым зарабляеце, у вас будуць непрыемнасці. Таму значна лепш цвёрда і разумна весці фінансы, няўхільна паляпшаць сітуацыю, чым спрабаваць дасягнуць скачкападобнага велізарнага росту вытворчасці, што часта затым прыводзіць да яго скарачэння. Людзі павінны выбіраць, што купляць, і, калі яны вырашылі нешта не купляць, гэтая рэч так і застанецца на паліцы. А яе вытворчасць апынецца ў цяжкім становішчы.

*Як М. Тэтчэр тлумачыла сутнасць палітыкі кансерватараў?*

## § 7. ФРАНЦЫЯ

**Успомніце:** *Якім было становішча Францыі ў гады Другой сусветнай вайны? Хто ўзначаліў барацьбу французскага народа супраць акупантаў?*

**Становішча краіны пасля Другой сусветнай вайны.** Летам 1944 г. на вызваленых тэрыторыях Францыі быў створаны часовы ўрад на чале з адным з кіраўнікоў руху Супраціўлення генералам *Шарлем дэ Голем*. Ва ўрадзе былі прадстаўлены ўсе палітычныя сілы, якія ўдзельнічалі ў руху Супраціўлення, у тым ліку і камуністы. Іх аб'яднала імкненне аднавіць сваю краіну, вярнуць ёй статус вялікай дзяржавы.

У выніку выбараў ва Устаноўчы сход восенню 1945 г. быў сфарміраваны кааліцыйны ўрад з удзелам левых партый, у тым ліку камуністаў. Важнейшай задачай новага ўрада стала аднаўленне эканомікі. Рэалізаваць гэтую задачу ўрад вырашыў шляхам стварэння дзяржаўнага сектара эканомікі. Па рашэнню парламента Францыі былі нацыяналізаваны буйнейшыя французскія банкі, прадпрыемствы вугальнай, газавай, электраэнергетычнай прамысловасці, а таксама іншыя прадпрыемствы, уладальнікі якіх супрацоўнічалі з акупантамі. У выніку на долю дзяржаўнага сектара прыходзілася да 20 % прамысловай вытворчасці. У 1947 г. аб'ём прамысловай вытворчасці ў Францыі дасягнуў даваеннага ўзроўню.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

У галіне палітыкі асноўная ўвага грамадства была звернута на распрацоўку новай канстытуцыі. Яна была адобрана на рэферэндуме і ўступіла ў сілу ў **1946 г.** Так пачалася гісторыя **Чацвёртай рэспублікі** ў Францыі. Гэта канстытуцыя аказалася самай дэмакратычнай з усіх французскіх канстытуцый, але дзейнічала яна ўсяго 12 гадоў. Для вырашэння існуючых у краіне праблем была неабходна большая цэнтралізацыя ўлады. За гэта выступалі прыхільнікі Ш. дэ Голя, якія стварылі ў *1947 г.* партыю *Аб'яднанне французскага народа (РПФ).* У 1947 г. пад ціскам правых сіл і ЗША камуністы былі выключаны з урада. Пасля гэтага ў палітычным жыцці краіны адбыўся зрух управа.

**Распад каланіяльнай імперыі.** Каланіяльная праблема стала адной з галоўных у Францыі ў пасляваенныя гады. У канстытуцыі Францыі ўтрымлівалася палажэнне «не прадпрымаць ніякіх войнаў з мэтай заваявання і ніколі не выкарыстоўваць сваіх сіл супраць свабоды якога-небудзь народа». Французская каланіяльная імперыя пераўтваралася ў Французскі Саюз. У яго склад разам з усімі калоніямі, якія атрымлівалі цяпер унутраную аўтаномію, увайшлі і В'етнам, Камбоджа і Лаос, што атрымалі незалежнасць.

Але ў хуткім часе камуністычны ўрад В'етнама абвясціў аб выхадзе з Французскага Саюза. У **1946 г.** Францыя пачала вайну супраць *Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам.* Яна была працяглай і цяжкай, але перамогі французам так і не прынесла. Летам **1954 г.** Францыя падпісала пагадненне аб спыненні агню. Восенню **1954 г.** Францыя пачала вайну ў *Алжыры.* Становішча ў Алжыры ў многім адрознівалася ад сітуацыі ў В'етнаме. Алжыр знаходзіўся побач з Францыяй і быў адной з самых старых і багатых французскіх калоній. Каля 1 млн чалавек (11 % насельніцтва ўсёй краіны) з'яўляліся выхадцамі з Францыі. Многія французы лічылі Алжыр французскай зямлёй. Акрамя таго, у 1956 г. Францыя была вымушана прызнаць незалежнасць Марока і Туніса. Баючыся страты Алжыра, мясцовыя жыхары, прыхільнікі захавання французскай каланіяльнай імперыі, у 1958 г. паднялі мяцеж супраць урада. Яны патрабавалі вяртання да ўлады генерала Ш. дэ Голя і захавання Алжыра як часткі французскай тэрыторыі. Падзеі ў Алжыры кінулі Францыю ў глыбокі грамадска-палітычны крызіс. Ш. дэ Голь, які адышоў ад палітычнай дзейнасці ў 1955 г., вярнуўся ў палітыку і 1 чэрвеня 1958 г. быў прызначаны кіраўніком


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

урада. На наступны дзень Нацыянальны сход надаў Ш. дэ Голю надзвычайныя паўнамоцтвы і даручыў распрацаваць новую канстытуцыю. Гэтыя падзеі паклалі канец гісторыі Чацвёртай рэспублікі ў Францыі.

**Унутраная і знешняя палітыка Ш. дэ Голя.** Генерал Ш. дэ Голь заўсёды быў прыхільнікам моцнай выканаўчай улады. У **1958 г.** была прынята новая канстытуцыя, якая значна пашырала ўладу прэзідэнта і ўрада, звужала паўнамоцтвы парламента, але пры гэтым захоўвала ўсе правы грамадзян, абвешчаныя канстытуцыяй 1946 г. Восенню 1958 г. адбыліся выбары ў Нацыянальны сход. Па іх выніках адносную большасць месцаў атрымала новая партыя галістаў (прыхільнікаў Ш. дэ Голя) — **Саюз у абарону новай Рэспублікі** (пазней яна была перайменавана ў **Аб'яднанне ў падтрымку Рэспублікі — АПР).**

У канцы **1958 г.** Ш. дэ Голь быў абраны прэзідэнтам краіны. Наступны перыяд увайшоў у гісторыю Францыі пад назвай **Пятай рэспублікі.** Ш. дэ Голь дамогся спынення ў **1962 г.** вайны з Алжырам і садзейнічаў прызнанню яго незалежнай дзяржавай. Заканчэнне вайны ўмацавала ўнутрыпалітычную сітуацыю ў краіне і дазволіла Францыі праводзіць больш незалежную знешнюю палітыку. У **1966 г.** краіна выйшла з ваеннай арганізацыі НАТО, застаўшыся толькі ў складзе яе палітычных структур. Змяншэнне залежнасці Францыі ад ЗША суправаджалася стварэннем уласнай

### Гістарычны партрэт



**Шарль дэ Голь** (1890 — 1970) — французскі ваенны, палітычны і дзяржаўны дзеяч, заснавальнік і першы прэзідэнт Пятай рэспублікі. Нарадзіўся ў дваранскай сям'і. Удзельнічаў у Першай сусветнай вайне. У гады Другой сусветнай вайны ўзначаліў у Лондане камітэт «Змагарная Францыя». Прэм'ер-міністр (1944 — 1946), прэзідэнт Францыі (1958 — 1969). Імкнуўся да аднаўлення прэстыжу Францыі як вялікай дзяржавы. У 1966 г. прыняў рашэнне аб выхадзе Францыі з ваеннай арганізацыі НАТО і аб ліквідацыі амерыканскіх ваенных баз на французскай тэрыторыі. Выступаў за разрадку міжнароднай напружанасці, надаваў вялікае значэнне ўмацаванню супрацоўніцтва з СССР.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

ядзернай зброі і паляпшэннем адносін з Савецкім Саюзам. У 1966 г. Ш. дэ Голь наведаў СССР з афіцыйным візітам. Менавіта ў гады прэзідэнцтва Ш. дэ Голя Францыя змагла аднавіць сваё становішча вялікай краіны, стала ядзернай і касмічнай дзяржавай.

Росту прэстыжу Францыі ў свеце садзейнічалі і поспехі ў галіне эканомікі і навуковых тэхналогій. Дасягненні ў галіне эканомікі, звязаныя ў асноўным з укараненнем у вытворчасць дасягненняў НТР, прывялі да важных змен у структуры насельніцтва. Удзельная вага работнікаў, занятых у сельскай гаспадарцы, зменшылася, адначасова павялічылася доля працоўных у сферы паслуг. Да сярэдзіны 1970-х гг. у сферы фінансаў, гандлю і паслуг было занята больш насельніцтва, чым ва ўсіх галінах прамысловасці. У краіне значна павялічылася колькасць высокакваліфікаваных рабочых і служачых.

**Францыя ў 1970 — 1980-я гг.** Для новага пакалення французаў былі характэрны і новыя інтарэсы: атрымаць адукацыю, павысіць сваю кваліфікацыю, удзельнічаць у кіраванні краінай на ўсіх узроўнях. Гэтыя людзі ў сваёй масе не маглі прыняць аўтарытарны стыль кіраўніцтва, уласцівы Ш. дэ Голю.

У маі **1968 г.** студэнты Сарбонскага ўніверсітэта ў Парыжы — аднаго са старэйшых у Еўропе — выступілі з патрабаваннямі дэмакратызацыі сістэмы адукацыі. Іх падтрымалі рабочыя, якія пачалі ўсеагульную забастоўку. У ёй удзельнічала каля 10 млн ча-




*Хваляванні ў Парыжы. Май 1968 г.*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

лавек. Але ўзначальвалі майскія выступленні «новыя левыя» — левацрадыкальныя экстрэмісцкія групы анархісцкага кірунку, якія практыкавалі палітычны тэрор супраць уладаў. Выступленні студэнтаў і забастоўкі рабочых і служачых суправаджаліся беспарадкамі і сутыкненнямі з паліцыяй. Краіну ахапіў глыбокі грамадска-палітычны крызіс.

У 1969 г. па ініцыятыве Ш. дэ Голя быў праведзены рэферэндум па пытанню аб рэформе сістэмы самакіравання ў краіне з мэтай цэнтралізацыі ўлады. Больш за палову ўдзельнікаў рэферэндума не падтрымалі прэзідэнта, і ён пайшоў у адстаўку.

З сярэдзіны 1970-х гг. Францыя ўступіла ў паласу эканамічных і палітычных цяжкасцей, якія былі шмат у чым абумоўлены сусветным эканамічным крызісам. Каб зменшыць залежнасць краіны ад знешніх крыніц энергіі, урад заняўся распрацоўкай энергазберагаючых тэхналогій і развіццём атамнай энергетыкі. Палітыка «жорсткай эканоміі» выклікала незадавальненне большай часткі насельніцтва, якое прывыкла да таго, што дзяржава ў Францыі нясе значную частку сацыяльных расходаў. Гэта садзейнічала перамозе на прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбарах 1981 г. левых партый — сацыялістаў і камуністаў, якія заўсёды выступалі за павышэнне ролі дзяржавы ў размеркаванні даходаў.

Прэзідэнтам краіны стаў лідар Сацыялістычнай партыі *Франсуа Мітэран*. Адначасова быў сфарміраваны ўрад левых сіл, у які ўпершыню пасля 1947 г. увайшлі камуністы. Аднак ён не змог справіцца з эканамічнымі цяжкасцямі. Нягледзячы на тое, што на парламенцкіх выбарах 1986 г. левыя сілы пацярпелі паражэнне, Ф. Мітэран быў перавыбраны на прэзідэнцкі пост у 1988 г. У знешняй палітыцы Францыя разам з ФРГ актыўна ўдзельнічала ў працэсах еўрапейскай інтэграцыі. Мітэран садзейнічаў ратыфікацыі французскім парламентам Маастрыхцкага дагавора аб стварэнні Еўрапейскага Саюза.

**Францыя на мяжы стагоддзяў.** Палітычная сітуацыя ў Францыі ў канцы 1980-х —пачатку 1990-х гг. характарызавалася паступовым ростам уплыву правых партый і аслабленнем пазіцый левых партый.

У 1993 г. правыя партыі, аб'яднаўшыся ў выбарчы блок, перамаглі на парламенцкіх выбарах і сфарміравалі ўрад. А ў 1995 г. прэзідэнтам краіны стаў лідар правых *Жак Шырак*. Ён выступаў за вызваленне французскай эканомікі і грамадства ў цэлым ад



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

празмернага кантролю дзяржавы, праводзіў палітыку неакансерватызму, падобную на курс Р. Рэйгана ў ЗША, М. Тэтчэр у Вялікабрытаніі і Г. Коля ў ФРГ.

На прэзідэнцкіх выбарах 2002 г. Ж. Шырак зноў атрымаў перамогу, апярэдзіўшы лідара крайне правага Нацыянальнага фронту Ж.-М. Ле Пэна. Нацыянальны фронт выступаў за ўсталяванне рэжыму «моцнай улады» ў краіне, супраць глабалізацыі і нелегальнай іміграцыі. Восенню 2005 г. прыгарады Парыжа і іншых гарадоў ахапілі масавыя беспарадкі, абвастрылася праблема імігрантаў з былых калоній. Значна менш рознагалоссяў выклікала знешняя палітыка дзяржавы, хоць Францыя ў *1996 г.* вярнулася ў ваенную арганізацыю НАТО. У 2002 г. Францыя ўвяла ў краіне агульнаеўрапейскую валюту еўра, але адвергла Канстытуцыю ЕС на рэферэндуме ў 2005 г.

На хвалі сацыяльных канфліктаў і выступленняў часткі моладзі і імігрантаў у маі 2007 г. прэзідэнцкія выбары выйграў *Нікаля Сарказі,* лідар партыі *Саюз за народны рух*. Н. Сарказі — чалавек правакансерватыўных поглядаў — лічыўся моцнай асобай і папулярным палітыкам. На пэўны час ён змог стабілізаваць становішча ў краіне і нейтралізаваць маладзёжны рух. Аднак ва ўмовах сусветнага эканамічнага крызісу ў Францыі ў 2009—2010 гг. зноў прайшлі масавыя выступленні моладзі і імігрантаў, адбыліся буйныя забастоўкі. Знешняя палітыка Н. Сарказі, у прыватнасці, актыўны ўдзел Францыі ў аперацыі НАТО супраць Лівіі ў 2011 г., выклікала негатыўную рэакцыю апазіцыйных сіл. На прэзідэнцкіх выбарах 2012 г. перамогу атрымаў лідар Сацыялістычнай партыі *Франсуа Аланд*. Ён разам з канцлерам ФРГ А. Меркель імкнецца вырашыць вострыя фінансавыя і эканамічныя пытанні, якія ўзніклі ў ЕС у выніку сусветнага эканамічнага крызісу.

**Пытанні і заданні:**

1. Ахарактарызуйце становішча Францыі пасля Другой сусветнай вайны. Якім шляхам вырашалася праблема аднаўлення эканомікі?
2. У чым заключалася супярэчлівасць палітыкі Францыі ў каланіяльным пытанні? Чаму падзеі ў Алжыры прывялі да падзення Чацвёртай рэспублікі?
3. Калі была ўсталявана Пятая рэспубліка? Якія змены адбыліся ў форме дзяржаўнага ўладкавання?



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

4. У сваіх мемуарах Ш. дэ Голь пісаў: «Ці змагу я зрабіць так, каб з’явілася магчымасць вырашыць жыццёва важную праблему дэкаланізацыі, пачаць эканамічнае і сацыяльнае пераўтварэнне нашай краіны ў эпоху навукі і тэхнікі, аднавіць незалежнасць нашай палітыкі і нашай абароны, пераўтварыць Францыю ў прыхільніка аб’яднання ўсёй Еўропы, вярнуць Францыі яе арэол і ўплыў у свеце?». Якія задачы ставіў перад сабою Ш. дэ Голь, уступаючы на пост прэзідэнта Францыі? Што ім было зроблена для дасягнення гэтых мэт?
5. Што выклікала беспарадкі ў Францыі ў 1968 г.? Якія наступствы яны мелі?
6. Што садзейнічала прыходу да ўлады ў Францыі ў пачатку 1980-х гг. левых партый? Чым характарызуецца ўнутраная палітыка Ф. Мітэрана?
7. Чаму ў пачатку 1990-х гг. узмацніўся ўплыў правых партый? Якую сацыяльна-эканамічную палітыку яны праводзілі?
8. Вызначыце асаблівасці знешняй палітыкі Францыі пасля Другой сусветнай вайны.
9. Ахарактарызуйце сучаснае становішча Францыі. Выкарыстайце інфармацыю са СМІ і Інтэрнэта.

**Прапануем абмеркаваць.** Паведамляючы пра смерць Ш. дэ Голя па тэлебачанні, яго пераемнік Ж. Пампіду сказаў: «Генерал дэ Голь памёр, Францыя аўдавела». Чаму і ў нашы дні французы лічаць Ш. дэ Голя нацыянальным героем?

## Гістарычны дакумент

### З успамінаў аднаго з лідараў маладзёжнага руху ў Францыі ў маі 1968 г. *(дадзена ў пачатку 1990-х гг.)*

Самае дакладнае вызначэнне — бунт пакалення… Марксізм, ленінізм, анархізм — усе гэтыя словы ўваходзілі… у наш палітычны інструментарый, з дапамогай якога мы спрабавалі растлумачыць сутнасць таго, што адбываецца… Наша пакаленне проста хацела сказаць грамадству, у якім мы жылі, — ці ў Францыі, ці ў Германіі, у Англіі ці Амерыцы: мы не хочам, каб нас вучылі жыць. Мы імкнуліся выпрацаваць свае формы жыцця…

*Чаму, нягледзячы на стабільны рост эканомікі ў пасляваенны перыяд, у Францыі расло незадавальненне існуючымі парадкамі?*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

# § 8. ІТАЛІЯ

**Успомніце:** *Чаму ў Італіі ў 1920-я гады стаў магчымым прыход фашыстаў да ўлады? Які палітычны рэжым існаваў у Італіі ў гады Другой сусветнай вайны?*

**Пераўтварэнні 1945 — 1947 гг.** Італія была адной з краін, якія пацярпелі паражэнне ў Другой сусветнай вайне. Аднак у адрозненне ад Германіі значная частка італьянскага народа на заключным этапе вайны прыняла актыўны ўдзел у вызваленні сваёй Радзімы ад фашызму. Яшчэ ў 1943 г. Італія перайшла на бок антыгітлераўскай кааліцыі. У канцы красавіка 1945 г. на поўначы Італіі, дзе папранейшаму кіравалі фашысцкія лідары, пачалося паўстанне, якое прывяло да вызвалення гэтай часткі краіны ад фашыстаў яшчэ да падыходу войскаў саюзнікаў. Б. Мусаліні быў схоплены і пакараны смерцю. Найбольш уплывовай сілай у раёнах, ахопленых паўстаннем, стала *Італьянская камуністычная партыя (ІКП)*. Яна супрацоўнічала з *Італьянскай сацыялістычнай партыяй (ІСП)* і іншымі антыфашысцкімі сіламі.

Створаная ў 1944 г. *Хрысціянска-дэмакратычная партыя (ХДП)* таксама прымала ўдзел у антыфашысцкай барацьбе. Партыя выказвала інтарэсы шырокіх пластоў каталіцкага насельніцтва, але асаблівай падтрымкай карысталася сярод сялянства Поўдня. Яна заклікала адмовіцца ад класавай барацьбы, прапаведавала хрысціянскія духоўныя каштоўнасці, выказвалася за дэмакратычныя пераўтварэнні.

Пасля 1945 г. усе фашысцкія арганізацыі ў краіне былі забаронены. Большасць італьянцаў чакалі дэмакратычных пераўтварэнняў. Аднак частка насельніцтва ўспрымала паражэнне ў вайне як нацыянальную знявагу. Гэта стварыла ўмовы для адраджэння фашысцкага руху, які атрымаў назву *неафашызм* (новы фашызм). Узнікла неабходнасць прадаўжаць супрацоўніцтва антыфашысцкіх сіл і ў пасляваенны час.

У такіх умовах быў створаны кааліцыйны ўрад, у склад якога ўвайшлі прадстаўнікі хрысціянскіх дэмакратаў, камуністаў і сацыялістаў. Кіраўніком урада стаў лідар ХДП *Альчыдэ дэ Гаспery*. Важнай праблемай пасляваеннай Італіі стала вызначэнне будучай формы кіравання. Кароль Італіі, Віктар Эмануіл III,



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"
АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

дыскрэдытаваў сябе супрацоўніцтвам з рэжымам Б. Мусаліні і страціў падтрымку шырокіх пластоў насельніцтва Італіі. Урад А. дэ Гасперы вырашыў правесці рэферэндум па пытанню аб форме дзяржаўнага кіравання. На ім большасць італьянцаў выказалася за рэспубліку, якая была абвешчана ў **1946 г.** У адпаведнасці з прынятай у **1947 г.** канстытуцыяй вышэйшым органам заканадаўчай улады стаў двухпалатны парламент. Прэзідэнт з'яўляўся кіраўніком дзяржавы, але рэальная ўлада засяроджвалася ў руках прэм'ер-міністра. Канстытуцыя абвяшчала недатыкальнасць прыватнай уласнасці і ўсталёўвала роўнасць грамадзянскіх правоў мужчын і жанчын. Асноўны закон Італіі зафіксаваў адмову краіны ад вайны як сродку вырашэння міжнародных канфліктаў. У красавіку 1948 г. былі праведзены выбары ў парламент, якія прынеслі ўпэўненую перамогу ХДП. Новы ўрад узначаліў А. дэ Гасперы.

**Эканамічнае развіццё. Праблема Поўдня.** Эканоміка Італіі паступова выходзіла з пасляваеннага крызісу. Як і ў іншых краінах, для гэтага быў задзейнічаны «адкладзены попыт» насельніцтва, перавод капіталаў з ваенных галін у грамадзянскія, дзяржаўная падтрымка малаэфектыўных, але важных для ўсёй краіны галін. У 1948 г. Італія атрымала ад ЗША бязвыплатную дапамогу паводле «плана Маршала». У *1957 г.* яна ўступіла ў ЕЭС, што аблегчыла збыт яе прадукцыі на еўрапейскіх рынках.

Разам з тым у Італіі ўсё яшчэ востра стаяла праблема Поўдня. Тут пражывала 35 % насельніцтва краіны. Большая яго частка займалася сельскай гаспадаркай. Даход на душу насельніцтва быў амаль у два разы ніжэй, чым на Поўначы. Гэта стрымлівала развіццё эканомікі ўсёй краіны, абмяжоўваючы яе ўнутраны рынак.

Каб пераадолець адсталасць і беднасць Поўдня, урад зрабіў шэраг захадаў. У пачатку 1950-х гг. пачалося ажыццяўленне аграрнай рэформы. У адпаведнасці з ёй дзяржава выкупала частку буйной зямельнай уласнасці і прадавала ў растэрміноўку сялянам, якім на яе набыццё выдаваліся крэдыты. Павялічыліся дзяржаўныя капіталаўкладанні ў эканоміку Поўдня, што прывяло да павышэння ў ёй долі прамысловасці і сферы паслуг. У 1950 г. быў створаны дзяржаўны фонд дапамогі паўднёвым раёнам — Каса Поўдня. Паступова поўдзень краіны ператварыўся ў аграрна-індустрыяльны раён.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Выраўноўванне ўзроўню развіцця Поўдня і Поўначы мела бясспрэчныя станоўчыя бакі: умацоўвалася эканамічнае адзінства краіны, прамысловасць Поўначы атрымлівала з Поўдня танную рабочую сілу, якая вызвалялася ў сувязі з мадэрнізацыяй сельскай гаспадаркі. Але гэты працэс прывёў і да сур’ёзных сацыяльных і палітычных ускладненняў. Працэс мадэрнізацыі суправаджаўся ростам беспрацоўя. На Поўдні яго ўзровень быў у два разы вышэй, чым на Поўначы. У пошуках працы жыхары Поўдня імкнуліся на Поўнач, але вельмі часта не маглі знайсці працу і там. У краіне пачыналася НТР, што прывяло да скарачэння патрэбы ў некваліфікаваных рабочых. У такіх умовах выхадцы з Поўдня, нярэдка непісьменныя, на Поўначы адчувалі сябе адрынутымі. Нярэдка яны траплялі ў сеткі **мафіі** — таемнай тэрарыстычнай арганізацыі, што займалася злачынным бізнесам (наркабізнес, ігральныя дамы, гандаль людзьмі і зброяй і г. д.) і часта звязанай з карумпіраванымі палітыкамі.

З канца 1950-х гг. Італія, як і ФРГ, уступіла ў паласу імклівага эканамічнага росту. Гэтая з’ява атрымала назву «італьянскага эканамічнага цуду». З 1950 па 1963 г. аб’ём прамысловай вытворчасці краіны павялічыўся ўтрая. Значную дапамогу развіццю эканомікі аказалі дзяржаўныя інвестыцыі. У гэтыя гады імкліва расло гарадское насельніцтва Італіі, асабліва ў паўночнай частцы краіны.

**Палітычнае развіццё Італіі.** Знешняя палітыка Італіі ў пасляваенныя гады апынулася зарыентаванай на ЗША. У *1949 г.* краіна ўвайшла ў НАТО, а праз год ЗША атрымалі права выкарыстоўваць у сваіх ваенных мэтах італьянскія порты і аэрадромы. Важным напрамкам знешняй палітыкі Італіі стаў яе ўдзел у працэсах еўрапейскай інтэграцыі.

У гэты перыяд у палітычным жыцці Італіі вялікую ролю працягваў адыгрываць **Ватыкан** — горад-дзяржава, на чале якога стаяў Папа Рымскі. Рашэнні II Ватыканскага сабору (1962 — 1965 гг.) садзейнічалі абнаўленню каталіцкай царквы і яе прыстасаванню да свету, які змяніўся. Пантыфікат *Яна Паўла II (1978 — 2005 гг.)* змяніў адносіны да Ватыкана ва ўсім свеце ў лепшы бок. Папа прызнаў памылковымі дзеянні каталіцкай царквы ў часы крыжовых паходаў і інквізіцыі. Ян Павел II дэманстраваў паважлівыя адносіны да іншых сусветных рэлігій, першым з рымскіх пап



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

наведаў мячэць і сінагогу. У час яго пантыфікату Ватыкан заклікаў сусветную грамадскасць адмовіцца ад войнаў і кровапраліцця як сродку вырашэння міжнародных праблем.

У пасляваенныя гады змяняліся і погляды камуністаў па некаторых ключавых пытаннях. У прыватнасці, яны прыйшлі да вывады аб магчымасці мірнага пераходу да сацыялізму, што дазволіла ім у 1960-я гг. наладзіць супрацоўніцтва з сацыялістамі. Аднак гэта выклікала незадавальненне з боку крайне левых сіл, якія лічылі, што такі курс вядзе ўбок ад камунізму, і неафашыстаў, якія сцвярджалі, што супрацоўніцтва з сацыялістамі адкрывае камуністам дарогу да ўлады. Гэтыя палітычныя сілы ўзялі на ўзбраенне тактыку *тэрору*. У выніку пацярпелі сотні ні ў чым не вінаватых людзей. Меры ўлад супраць злачынцаў былі малаэфектыўнымі з-за карумпіраванасці дзяржаўнага апарату.

Становішча ўскладніў эканамічны крызіс 1974 — 1975 гг., які прывёў да масавага беспрацоўя сярод моладзі. Пачаліся стыхійныя студэнцкія выступленні, якія нярэдка перарасталі ў пагромы. Рост напружанасці ў краіне сведчыў пра тое, што італьянскае грамадства знаходзіцца ў глыбокім грамадска-палітычным крызісе. З боку правых сіл актыўны палітычны тэрор праводзілі неафашысты на чале з Нацыянальным фронтам і партыяй Італьянскі сацыяльны рух — Нацыянальныя правыя сілы (ІСР-НПС). З другога боку, дзейнічалі левыя экстрэмісты, якія абвяшчалі сябе

### Гістарычны партрэт



**Альда Мора** (1916 — 1978) — дзяржаўны і палітычны дзеяч Італіі. Прафесар крымінальнага права, аўтар прац па розных аспектах юрыдычнай навукі. Пасля абвяшчэння Італьянскай Рэспублікі (1946 г.) уваходзіў у камісію па распрацоўцы новай канстытуцыі. У 1948 г. выбраны ў парламент. Займаў пасаду намесніка міністра замежных спраў, міністра юстыцыі, міністра адукацыі. Лідар ХДП. У 1970-х гг. быў аўтарам так званага «гістарычнага праекта», у межах якога камуністам прапаноўвалася ўвайсці ва ўрад. Прэм'ер-міністр Італіі (1963 — 1969, 1974 — 1976). Быў выкрадзены групоўкай «Чырвоныя брыгады». Праз 54 дні пасля выкрадання А. Мора быў забіты.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

змагарамі супраць сусветнай капіталістычнай сістэмы. У 1978 г. члены тэрарыстычных левацкіх арганізацый «Чырвоныя брыгады» выкралі лідара ХДП *Альда Мора* і забілі яго. Гэта жорсткая акцыя ўскалыхнула ўсю краіну: 18 млн італьянцаў правялі ўсеагульную забастоўку супраць тэрору і насілля. Але толькі ў пачатку 1980-х гг. забойцы А. Мора былі знойдзены, а «Чырвоныя брыгады» ліквідаваны.

Італьянскае грамадства напружана шукала шляхі выхаду з палітычнага крызісу. Кіраўніцтва ІКП яшчэ ў пачатку 1970-х гг. прыйшло да вываду аб неабходнасці абнаўлення марксізму і згуртавання народа для адпору рэакцыі і леваму экстрэмізму. Кампартыя зыходзіла з таго, што шлях Італіі да сацыялізму праходзіць праз дэмакратыю, а не праз дыктатуру пралетарыяту. Такая тэорыя пабудовы сацыялізму ў Заходняй Еўропе стала называцца **«еўракамунізмам»**. З'езд ІКП у **1975 г.** прапанаваў **палітыку «гістарычнага кампрамісу»** — адзінства дзеянняў камуністаў, сацыялістаў і католікаў, г. зн. нацыянальнага адзінства. Гэта палітыка атрымала шырокую падтрымку з боку італьянцаў. Аднак у пачатку 1980-х гг. кампартыя вярнулася да палітыкі супрацьстаяння ХДП і пачала хутка губляць свой уплыў. У 1991 г. на аснове ІКП, якая заявіла пра спыненне сваёй дзейнасці, узнікла новая арганізацыя, што практычна парвала з камуністычнай ідэалогіяй, — *Дэмакратычная партыя левых сіл (ДПЛС)*.

**Палітычныя перамены ў Італіі ў 1990-я гг. — пачатку XXI ст.** У пачатку 1990-х гг. у Італіі склалася новая палітычная сітуацыя. Пайшла з палітычнай сцэны адна з буйнейшых партый — ІКП. Глыбокі крызіс ахапіў палітычную сістэму, у цэнтры якой знаходзілася ХДП. Партыя, якая доўгія гады знаходзілася ва ўладзе, пагразла ў карупцыі і паступова страчвала падтрымку выбаршчыкаў. Разам з тым у краіне разгарнулася масавая кампанія па барацьбе з карупцыяй пад назвай «Чыстыя рукі». У выніку ў хабарніцтве былі абвінавачаны дэпутаты, лідары партый, некаторыя міністры, мэры гарадоў. У 1990-я гг. актывізавалася барацьба з мафіяй. З гэтай мэтай на востраве Сіцылія, гістарычнай радзіме італьянскай мафіі, была створана антымафіёзная партыя «Сетка».

Вясной 1993 г. у Італіі адбыўся рэферэндум, большасць удзельнікаў якога выказалася за рэформу выбарчай сістэмы. Выбары ў парламент, праведзеныя па новай сістэме ў 1994 г.,



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



*На аўтамабільным заводзе «Фіат».*

прынеслі перамогу новай палітычнай партыі «Наперад, Італія!» на чале з *Сільвіа Берлусконі*, якая прадстаўляла правыя сілы. Новай палітычнай сілай 1990-х гг. стала палітычная партыя «Ліга Поўначы». Яе лідары выступалі за аддзяленне ад Італіі найменш развітых паўднёвых раёнаў, паколькі яны тармозяць эканамічнае развіццё краіны. Актывізаваліся і неафашысты — прыхільнікі Б. Мусаліні стварылі партыю «Новы альянс». У Італіі стала складвацца новая палітычная сітуацыя. Палітычная сістэма краіны пачала паступова змяняцца ў бок двухпартыйнасці. Вялікі ўплыў мелі два блокі партый — правацэнтрысцкі на чале з партыяй «Наперад, Італія!» і левацэнтрысцкі «Аліва». На выбарах 1996 г. перамогу атрымаў блок левых партый «Аліва», прэм'ер-міністрам стаў прафесар-эканаміст *Рамана Продзі*. Але з 2001 г. урад Італіі ўзначаліў С. Берлусконі, а ўжо вясной 2006 г. да ўлады зноў прыйшоў блок левых сіл на чале з Р. Продзі. Аднак у красавіку 2008 г. левыя сілы прайгралі парламенцкія выбары. Да ўлады зноў прыйшла кааліцыя на чале з С. Берлусконі, які ўзначаліў правую партыю «Народ свабоды». Неадназначную ацэнку ў краіне выклікаў удзел Італіі ў ваеннай аперацыі НАТО супраць Лівіі, якая пачалася вясной 2011 г. Эканамічныя праблемы, пагроза банкруцтва фінансавай сістэмы, рознагалоссі ўнутры правячай кааліцыі прывялі ў канцы 2011 г. да адстаўкі С. Берлусконі і прыходу да ўлады новага ўрада на чале з Марыа Монці. Ён спрабуе правесці рэфармаванне фінансавай сістэмы краіны і вывесці Італію з эканамічнага крызісу.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## Пытанні і заданні:

1. Калі і чаму ў Італіі была абвешчана рэспубліка? Якія змены адбыліся ў яе дзяржаўным уладкаванні?
2. Растлумачце, у чым заключалася праблема Поўдня? Ці вырашана гэтая праблема ў цяперашні час?
3. Якія палітычныя партыі афарміліся ў Італіі пасля заканчэння Другой сусветнай вайны? Якія новыя палітычныя партыі склаліся ў канцы XX ст.?
4. Якую ролю ў палітычным жыцці Італіі адыгрывае Ватыкан? Складзіце кароткую гістарычную даведку пра Ватыкан.
5. У 1970-х гг. узрос уплыў неафашысцкай партыі Італьянскі сацыяльны рух. Хто такія неафашысты? Растлумачце, чаму гэтая партыя масавую падтрымку знайшла сярод жыхароў Поўдня Італіі, дзе за яе галасавала каля $^{1}/_{3}$ выбаршчыкаў?
6. Растлумачце значэнне паняццяў «мафія» і «карупцыя». Чаму гэтыя негатыўныя з'явы былі шырока распаўсюджаны ў палітычным і эканамічным жыцці Італіі? Як дзяржава змагаецца з гэтымі негатыўнымі з'явамі?

**Прапануем абмеркаваць.** Растлумачце, чаму палітычны рэжым Італіі часам называюць «стабільнай нестабільнасцю».

## Гістарычная даведка

**Мафія** (італьянскае mafia, maffia), спецыфічная для в. Сіцылія (Італія) сістэма сацыяльных адносін, якая склалася ў канцы XVIII — пачатку XIX ст. Яе тэрарыстычныя метады — шантаж, насілле, забойства — выкарыстоўваліся падчас аховы зямель, садоў, у рыначным гандлі і г. д. Мафія валодае асаблівымі арганізацыйнымі і рытуальнымі формамі, мае больш ці менш строгую іерархічную структуру; закон, у адпаведнасці з якім пад страхам смерці ніхто не можа выдаваць паліцыі яе членаў. Гэта робіць яе амаль недатыкальнай. У XX ст. дзейнасць мафіі перамясцілася ў гарады, пранікла ў сферу будаўніцтва, гандлю, забаўляльнай індустрыі, укаранілася ў палітычнае жыццё. Яна выкарыстоўваецца падчас выбараў для мабілізацыі галасоў на карысць таго ці іншага кандыдата, які, пасля абрання, робіць ёй паслугі. Мафія мела цесныя сувязі з паліцыяй, судовымі чыноўнікамі, з пэўнымі палітычнымі коламі ў Рыме. У 1950-х — 1960-х гг. італьянскі ўрад пачаў афіцыйную барацьбу з мафіяй, якая прадаўжаецца да сённяшняга дня.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

# § 9. КРАІНЫ ПАЎНОЧНАЙ ЕЎРОПЫ

**Успомніце:** *Якія краіны адносяцца да паўночнаеўрапейскіх? Якім было іх становішча ў гады Другой сусветнай вайны?*

**Месца ў сучасным свеце.** Пасля Другой сусветнай вайны краіны Паўночнай Еўропы захавалі форму дзяржаўнага кіравання, якая склалася ў іх гістарычна: *Фінляндыя* засталася прэзідэнцкай рэспублікай, *Нарвегія, Швецыя і Данія* — канстытуцыйнымі манархіямі. *Ісландыя* абвясціла сваю незалежнасць у *1944 г.* у форме парламенцкай рэспублікі.

Паўночнаеўрапейскія краіны здолелі заняць прыкметнае месца ў еўрапейскай палітыцы, эканоміцы і культуры. Па вытворчасці прадукцыі прамысловасці і сельскай гаспадаркі на душу насельніцтва сёння яны адны з лідараў у Еўропе. Сімваламі поспеху гэтых краін сталі шведскі аўтамабільны канцэрн «Вольва», фінскае прадпрыемства па вытворчасці мабільных тэлефонаў «Нокіа», нарвежскі рыбалавецкі флот, дацкая сельская гаспадарка.

**Эканамічнае развіццё пасля Другой сусветнай вайны.** Нарвегія, Данія і Фінляндыя пацярпелі ў гады вайны менш, чым іншыя еўрапейскія краіны, а Швецыя, якая захавала нейтралітэт, зусім не панесла страт. Таму і стартавыя пазіцыі гэтых краін для пасляваеннага эканамічнага развіцця былі лепшыя. Дзяржавам Паўночнай Еўропы ўдалося ўжо да 1947 г. аднавіць даваенны ўзровень прамысловай вытворчасці, а Швецыя нават перавысіла яго амаль у 1,5 раза.

З 1948 г. усе гэтыя краіны, акрамя Фінляндыі, атрымлівалі дапамогу ад ЗША паводле «плана Маршала». Паколькі вытворчасць ужо была адноўлена, то дапамога накіроўвалася на яе абнаўленне і на развіццё галін вытворчасці, якія пастаўлялі прадукцыю на экспарт. Дзякуючы гэтаму была забяспечана перабудова структуры вытворчасці на карысць новых галін, транспарту, суднаходства і сферы паслуг.

У выніку да пачатку 1970-х гг. доля сельскай, лясной гаспадаркі і рыбалоўства ў нацыянальным даходзе ва ўсіх краінах Паўночнай Еўропы скарацілася да 10 %. Пры гэтым сельская гаспадарка заставалася высокаразвітай, тэхнічна добра забяспечанай. Для яе было характэрна шырокае развіццё спецыялізацыі і перапрацоўчай кааперацыі на аснове прыватнай уласнасці. У найбольшай ступені аграрную накіраванасць сваёй гаспадаркі захавала Данія. Яна



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

з'яўляецца адным з буйнейшых у Еўропе пастаўшчыком мясамалочнай прадукцыі. А Нарвегія займае адно з вядучых месцаў у свеце па ўзроўню развіцця гандлёвага і рыбалоўнага флоту і вылаве рыбы.

**Занятасць насельніцтва Нарвегіі (у %)**

| Сферы эканомікі | 1950 | 1960 | 1970 | 1980 |
|---|---|---|---|---|
| Сфера паслуг | 37,3 | 44,9 | 49,9 | 61,9 |
| Сфера вытворчасці | 62,7 | 55,1 | 50,1 | 38,1 |

Сярод прычын паспяховага эканамічнага росту паўночнаеўрапейскіх краін варта назваць гнуткую эканамічную палітыку дзяржавы. У адрозненне ад заходнееўрапейскіх краін тут не праводзілася шырокая нацыяналізацыя вытворчасці, аднак адбывалася дзяржаўнае рэгуляванне эканомікі. У першыя пасляваенныя гады яно ў асноўным ажыццяўлялася шляхам укладання дзяржаўных капіталаў у важнейшыя галіны, а з канца 1940-х гг. — з дапамогай прадастаўлення прадпрыемствам падатковых ільгот і дзяржаўных крэдытаў. Значная частка расходаў дзяржаўнага бюджэту прыходзілася на будаўніцтва і адукацыю. Гэтыя меры садзейнічалі росту пакупной здольнасці насельніцтва. Але, з іншага боку, яны вымушалі падтрымліваць высокі ўзровень падаткаў як на даходы грамадзян, так і на прыбыткі прадпрыемстваў. У найбольшай ступені такая палітыка характэрная для Швецыі.

Важнае значэнне мела наладжванне рэгіянальнага супрацоўніцтва паміж краінамі Паўночнай Еўропы. У **1952 г.** быў створаны **Паўночны савет,** які складаецца з дэпутатаў нацыянальных парламентаў. Па яго ініцыятыве сфарміраваны агульны рынак рабочай сілы, распрацавана агульнае працоўнае заканадаўства.

**Сацыяльна-палітычнае развіццё.** Палітычнае развіццё краін рэгіёна ў пасляваенныя гады праходзіла больш спакойна, чым у многіх дзяржавах Заходняй Еўропы. Хоць яны і не змаглі ізалявацца ад «халоднай вайны», што разгарнулася ў свеце, і гонкі ўзбраенняў, але апынуліся ў баку ад эпіцэнтра барацьбы двух палітычных блокаў і сканцэнтраваліся на ўнутраным развіцці дзяржаў.

Ва ўнутранай палітыцы краін Паўночнай Еўропы пераважала лінія па падтрыманню сацыяльнага міру, правядзенню паступовых


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

рэформ. Ва ўладзе знаходзіліся ці правячыя сацыял-дэмакратычныя партыі (часцей у Швецыі), ці кааліцыйныя ўрады з удзелам сацыял-дэмакратаў. Ідучы такім палітычным курсам, дзяржавам Паўночнай Еўропы ўдалося правесці дэмакратызацыю выбарчых сістэм, пашырыць мясцовае самакіраванне. Данія прызнала незалежнасць Ісландыі, дала шырокую аўтаномію Фарэрскім астравам і Грэнландыі.

Сацыяльная сфера таксама зведала вялікія змены. На працягу 1950-х — 1960-х гг. ва ўсіх краінах Паўночнай Еўропы склалася надзейная сістэма сацыяльнай абароны грамадзян. Яна ўключае роўную аплату працы для мужчын і жанчын, усеагульнае страхаванне на выпадак хваробы і беспрацоўя, чатырохтыднёвыя аплачваемыя водпускі, дапамогу на дзяцей, пенсіі па старасці і за выслугу гадоў. У гэтыя ж гады была ўведзена бясплатная абавязковая дзевяцігадовая адукацыя.

Сацыял-дэмакратычныя ўрады праводзілі ў жыццё прынцып «дэмакратыя на вытворчасці — шлях да сацыялізму» праз стварэнне на прадпрыемствах вытворчых камітэтаў з удзелам рабочых і служачых. Прадпрымальнікі прыслухоўваліся да іх меркавання па пытаннях арганізацыі вытворчасці, аховы працы і яе аплаты. Абапіраючыся на ўласны вопыт, сацыял-дэмакратычныя партыі краін Паўночнай Еўропы ў 1960-я гг. адмовіліся ад праграмных палажэнняў марксізму аб непазбежнасці класавай барацьбы і неабходнасці абагулення сродкаў вытворчасці для пераходу да сацыялізму. Гэты вопыт часта называюць **«шведскай мадэллю сацыялізму»**. Адным з яркіх палітычных лідараў Швецыі і ідэолагаў «шведскага сацыялізму» 1960-х — 1980-х гг. з'яўляўся Улаф Пальме.

### Гістарычны партрэт



**Улаф Пальме** (1927 — 1986) — шведскі палітык, лідар Сацыял-дэмакратычнай партыі Швецыі (СДПШ). Па адукацыі — юрыст і эканаміст. У 1956 г. быў абраны ў рыксдаг ад СДПШ. У 1963 г. увайшоў у склад кабінета ў якасці міністра без партфеля; на працягу наступных шасці гадоў займаў розныя міністэрскія пасады. Стаў вядомы сваімі выступленнямі супраць вайны ЗША ў В'етнаме. У 1969 г. абраны старшынёй СДПШ. Займаў пасаду прэм'ер-міністра ў 1969 — 1976 і 1982 — 1986 гг. Узначальваў камісію па вывучэнню магчымасцей стварэння ў Еўропе зон, свабодных ад ядзернай зброі. Забіты ў Стакгольме 28 лютага 1986 г.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Структура ВУП Швецыі (2005)**

| | |
|---|---|
| Сельская гаспадарка | 1,5 % |
| Прамысловасць | 28,9 % |
| Сфера паслуг | 69,6 % |

**Знешняя палітыка.** Знешняя палітыка дзяржаў Паўночнай Еўропы мае, відаць, больш адрозненняў, чым унутраная. Швецыя пасля вайны пажадала захаваць свой нейтралітэт. Фінляндыя, якая пацярпела паражэнне ў Другой сусветнай вайне, была вымушана каардынаваць пасляваенную палітыку са сваім усходнім суседам — СССР. Яна падпісала з СССР Дагавор аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе. У адпаведнасці з гэтым дагаворам, Фінляндыя актыўна выкарыстоўвала велізарны савецкі рынак для свайго эканамічнага развіцця. Данія, Нарвегія і Ісландыя ўступілі ў НАТО. Аднак членства ў Паўночнаатлантычным альянсе абмяжоўвалася толькі пытаннямі нацыянальнай бяспекі. Так, напрыклад, краіны Паўночнай Еўропы не падтрымалі агрэсію ЗША ў В'етнаме.

Прызнаннем аўтарытэту краін Паўночнай Еўропы было правядзенне ў **1975 г.** у сталіцы Фінляндыі Хельсінкі **Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе** з удзелам 35 краін, у тым ліку ЗША і Канады. Нарада выпрацавала асновы міждзяржаўных адносін: суверэнітэт і роўнасць, узаемная адмова ад прымянення сілы, непарушнасць межаў, мірнае ўрэгуляванне спрэчак, неўмяшання ва ўнутраныя справы, захаванне правоў чалавека. Працэс наладжвання нармальных узаемаадносін паміж дзяржавамі з розным палітычным ладам атрымаў назву *хельсінкскага працэсу*.

**Краіны Паўночнай Еўропы ў канцы XX — пачатку XXI ст.** Дзяржавы гэтага рэгіёна не пазбеглі тых праблем, з якімі ў сярэдзіне 1970-х гг. сутыкнуўся ўвесь заходні свет. Эканоміка ўжо не магла вынесці значнага цяжару сацыяльных расходаў. Аслабленне сусветных гаспадарчых сувязей, якое адбылося ў выніку сусветнага энергетычнага крызісу, ударыла па вытворчасці ў гэтых краінах, у значнай ступені арыентаванай якраз на знешні рынак. Узровень жыцця ў Даніі і Швецыі перастаў расці. У асабліва цяжкім становішчы апыну-



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

лася Швецыя. Тут прадпрымальнікі на працягу многіх гадоў былі вымушаны адлічваць значную частку сваіх прыбыткаў у бюджэт на сацыяльныя расходы, замест таго каб выкарыстоўваць іх для абнаўлення вытворчасці. У такіх умовах прадпрымальнікам нялёгка было канкурыраваць на сусветных рынках. У краінах Паўночнай Еўропы пачаў расці ўзровень беспрацоўя. Нарвежскай эканоміцы пераадолець энергетычны крызіс дапамагло адкрыццё вялікіх запасаў нафты ў Паўночным моры. Фінляндыя змагла падтрымаць сваю эканоміку ў добрым стане дзякуючы актыўным гандлёвым сувязям з СССР. Але ўсё ж на працягу пэўнага часу ва ўсіх краінах назіралася зніжэнне аб'ёмаў вытворчасці, а пасля выхаду з крызісу тэмпы яе росту ў большасці краін заставаліся невысокімі. Адпаведна знізіліся паступленні сродкаў у бюджэт, многія расходы на сацыяльныя праграмы былі скарочаны.

У 1990-я гг. у эканамічнай палітыцы краін Паўночнай Еўропы адбывалася барацьба дзвюх тэндэнцый. Адна з іх — сацыял-дэмакратычная, якая прадстаўляла шырокі пакет сацыяльных гарантый і льгот, другая — кансерватыўная, якая выступала за скарачэнне сацыяльных расходаў, за развіццё асноў свабоднага рынку. У 1990 г. урад сацыял-дэмакратаў у Швецыі пайшоў на беспрэцэдэнтны для гэтай краіны крок: ён правёў праз парламент законы аб замарожванні заработнай платы і аб забароне стачак на два гады. Гэта выклікала абурэнне шведаў, многія з іх расчараваліся ў «шведскай мадэлі сацыялізму». Краіна сутыкнулася з неабходнасцю правядзення эканамічнай палітыкі неакансерватыўнага характару. Каб забяспечыць перабудову вытворчасці на аснове дасягненняў НТР, неабходна было вызваліць яго ад невыноснага цяжару сацыяльных расходаў. У гэтых умовах на парламенцкіх выбарах 1991 г. шведы выказаліся за прыход да ўлады кансерватыўных партый. Такая сітуацыя назіралася і ў іншых краінах рэгіёна. У выніку, каб захаваць лідзіруючае становішча ў сучасным постіндустрыяльным свеце, дзяржавам Паўночнай Еўропы давялося пераадолець сур'ёзныя цяжкасці. У **1995 г.** Фінляндыя і Швецыя сталі членамі ЕС, Данія прыняла такое рашэнне яшчэ ў **1972 г.** Нарвегія выказалася супраць членства ў Еўрапейскім Саюзе. Ісландыя праводзіць перамовы аб уступленні ў ЕС.

У пачатку XXI стагоддзя ў Швецыі і Нарвегіі ўзмацніўся ўплыў правых і нацыяналістычных сіл. У 2010 г. на парламенцкіх выбарах у Швецыі перамог правацэнтрысцкі «Альянс за Швецыю».


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

У 2011 г. у Нарвегіі радыкальны нацыяналіст А. Брэйвік, які выступаў за выгнанне імігрантаў з еўрапейскіх краін, ажыццявіў тэрарыстычны акт, у выніку якога загінула 77 чалавек. «Справа Брэйвіка» прыцягнула ўвагу ўсёй сусветнай грамадскасці.

## Пытанні і заданні:

1. Чаму ў адозненне ад Італіі ў некаторых дзяржавах Паўночнай Еўропы захаваліся манархіі?
2. Якія асаблівасці мела аднаўленне эканомікі ў краінах Паўночнай Еўропы пасля Другой сусветнай вайны? Падумайце, чаму Фінляндыя не атрымала дапамогу паводле «плана Маршала».
3. Ахарактарызуйце «шведскую мадэль сацыялізму». Вызначыце яе вартасці і недахопы.
4. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце паведамленне аб сацыяльнай палітыцы ў адной з паўночнаеўрапейскіх краін (на ваш выбар).
5. Якія фактары ўплываюць на правядзенне знешняй палітыкі краін Паўночнай Еўропы? У якіх пытаннях гэтыя краіны выступаюць разам, у якіх — праводзяць самастойную знешнюю палітыку?
6. Калі была праведзена Нарада па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе? Чаму для яе правядзення была выбрана Фінляндыя? Якія дзяржавы прынялі ў ёй удзел? Якія асноўныя пытанні абмяркоўваліся на гэтай Нарадзе?

**Прапануем абмеркаваць.** У цяперашні час у сувязі з крызіснымі з'явамі, якія сталі праяўляцца ў «шведскай мадэлі сацыялізму» ў 1980-я гг., дыскусійным застаецца пытанне: захаваюцца яе станоўчыя рысы ў будучым ці гэта мадэль адпавядала асаблівым умовам пасляваеннага часу. А як лічыце вы?

## Гістарычны дакумент

### З Хельсінскага дагавора

*23 сакавіка 1962 г.*

Урады Даніі, Фінляндыі, Ісландыі, Нарвегіі і Швецыі,

жадаючы падтрымаць і ўмацаваць цесныя сувязі, існуючыя паміж паўночнымі народамі... і пашырыць рамкі супрацоўніцтва паміж паўночнымі краінамі;



АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

жадаючы надаць найбольшую аднастайнасць рэгуляванню ў паўночных краінах паўсюдна;

жадаючы дасягнуць па магчымасці адпаведнага падзелу працы паміж паўночнымі краінамі ў гэтых сферах;

жадаючы прадоўжыць значныя намаганні па супрацоўніцтву паўночных краін, якія ажыццяўляюцца ў рамках Паўночнага Савета і іншых органаў супрацоўніцтва, згадзіліся з наступнымі палажэннямі:

**Артыкул 1.** Высокія дагаворныя бакі імкнуцца да ўсталявання і развіцця далейшага супрацоўніцтва паміж паўночнымі краінамі ў прававой, культурнай, сацыяльнай і эканамічнай сферах, а таксама ў сферах транспарту, камунікацыі і аховы навакольнага асяроддзя.

**Артыкул 2.** Пры распрацоўцы законаў і падзаконных актаў у любой з паўночных краін грамадзяне ўсіх іншых паўночных краін атрымліваюць роўныя правы з грамадзянамі гэтай краіны…

**Артыкул 3.** Высокія дагаворныя бакі імкнуцца да аблягчэння набыцця грамадзянамі адной паўночнай краіны грамадзянства іншай паўночнай краіны…

*З якой мэтай быў створаны Паўночны савет? Якія асноўныя напрамкі супрацоўніцтва краін Паўночнай Еўропы?*

## § 10. КРАІНЫ УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ

**Успомніце:** *Якія еўрапейскія краіны былі вызвалены Чырвонай Арміяй у гады Другой сусветнай вайны?*

**У савецкай арбіце ўплыву.** На працягу стагоддзяў краіны Усходняй Еўропы развіваліся ў цені больш буйных дзяржаў. Да 1914 г. большая частка рэгіёна ўваходзіла ў склад Аўстра-Венгерскай, Германскай, Расійскай і Асманскай імперый. Толькі пасля Першай сусветнай вайны многія з гэтых краін набылі незалежнасць, але праз дваццацігоддзе былі захоплены нацысцкай Германіяй.

У 1945 г. савецкія войскі вызвалілі ад нацысцкай акупацыі большую частку Усходняй Еўропы. У выніку Савецкі Саюз усталяваў свой уплыў над гэтым рэгіёнам. З дапамогай СССР у краінах Усходняй Еўропы да ўлады прыйшлі камуністычныя партыі, якія ў хуткім часе абвясцілі курс на пабудову асноў сацыялізму. Камуністычныя лідары Усходняй Еўропы фактычна



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

ліквідавалі прыватную ўласнасць, увялі цэнтралізаванае эканамічнае планаванне, гвалтоўна ўкаранялі марксісцкую ідэалогію, разгарнулі антырэлігійную кампанію. Нягледзячы на палітычны ўплыў СССР, усходнееўрапейскія краіны захоўвалі сваю нацыянальную самабытнасць. Польшча, Венгрыя, Румынія, ГДР і іншыя краіны мелі адносна высокі ўзровень эканамічнага развіцця і матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва. У 1989 г. у выніку мірных дэмакратычных рэвалюцый усходнееўрапейскія дзяржавы выйшлі з-пад кантролю СССР і набылі незалежнасць, якая на самой справе азначала пераход пад пераважны ўплыў Заходняй Еўропы і ЗША.

**Крызісы і ўзрушэнні.** Па меры нарастання «халоднай вайны» СССР усё больш узмацняў свой уплыў на саюзнікаў. Ва Усходняй Еўропе базіраваўся значны кантынгент савецкіх войск. Нягледзячы на пэўны эканамічны прагрэс, частка насельніцтва ўсходнееўрапейскіх дзяржаў пачала адкрыта праяўляць сваё незадавальненне ўладай. У некаторых краінах справа дайшла да забастовак і ўзброеных сутыкненняў.

Трагічныя падзеі адбыліся ў Венгрыі. У **1956 г.** урад гэтай краіны ўзначаліў рэфармісцкі настроены *Імрэ Надзь*. Ён адмяніў аднапартыйнае кіраванне і запатрабаваў вываду савецкіх войск з Венгрыі, заявіўшы аб выхадзе сваёй краіны з Арганізацыі Варшаўскага Дагавора. У адказ кіраўніцтва СССР увяло на тэрыторыю



*Савецкія танкі на вуліцах Будапешта. 1956 г.*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"




*На вуліцах Прагі. 1968 г.*

Венгрыі войскі. Венгерскія «змагары за свабоду» супрацiўляліся і прасілі дапамогі ў Захада. Аднак яе не атрымалі. Пазіцыя лідараў заходніх краін у гэтай сітуацыі сведчыла пра тое, што яны лічылі Усходнюю Еўропу сферай савецкага ўплыву.

Вясной **1968 г.** ліберальныя рэформы, вядомыя як «пражская вясна», пачаліся ў Чэхаславакіі. Галоўным іх ініцыятарам быў першы сакратар ЦК Камуністычнай партыі Чэхаславакіі *Аляксандр Дубчак.* Імкнучыся аслабіць партыйны кантроль над усімі сферамі жыцця, ён заклікаў да пабудовы «сацыялізму з чалавечым тварам». Палітыка рэфарматараў выклікала занепакоенасць Савецкага Саюза, які баяўся страціць кантроль над Чэхаславакіяй. У жніўні 1968 г., спаслаўшыся на імкненне абараніць сацыялізм, войскі 5 краін-членаў Арганізацыі Варшаўскага Дагавора (СССР, Польшчы, ГДР, Венгрыі і Балгарыі) перайшлі межы краіны. А. Дубчак і яго прыхільнікі былі зняты з пасад, якія займалі, а рэформы ў Чэхаславакіі згорнуты.

З усіх краін сацыялістычнага лагера толькі Югаславія (з 1963 г. — Сацыялістычная Федэратыўная Рэспубліка Югаславія (СФРЮ) была практычна адзінай, на якую не распаўсюджваўся савецкі ўплыў. Лідарам краіны з канца Другой сусветнай вайны да 1980 г. з’яўляўся **Іосіп Броз Ціта** (прэзідэнт краіны з 1953 г.). Камуністычная партыя Югаславіі (Саюз камуністаў Югаславіі) на чале з Ціта супрацьстаяла ідэалагічнаму і палітычнаму ціску СССР і прапанавала ўласную мадэль будаўніцтва сацыялістычнага



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

грамадства. Ціта лічыў, што не знешнія сілы, а сама дзяржава павінна вызначаць шляхі пабудовы камунізму. За ўвесь перыяд яго кіравання Югаславія праводзіла палітыку недалучэння і не ўдзельнічала ў СЭУ і АВД, прытрымлівалася нейтралітэту ў «халоднай вайне».

**Барацьба за дэмакратыю ў Польшчы.** Ледзь не самым праблемным саюзнікам СССР з'яўлялася Польская Народная Рэспубліка (ПНР). Таксама як венгры і чэхі, палякі імкнуліся да большай свабоды ў сацыялістычным лагеры. Адной з вядучых сіл польскай апазіцыі існуючаму рэжыму была польская Рымска-каталіцкая царква.

У 1956 г. эканамічныя цяжкасці прывялі да масавых выступленняў працоўных. Каб іх спыніць, польскі ўрад правёў некаторыя рэформы. Аднак незадавальненне грамадзян становішчам у краіне па-ранейшаму захоўвалася. У 1980 г. выбухнула масавая забастоўка рабочых на суднаверфі імя Леніна ў Гданьску. Падчас забастовачнага руху быў створаны незалежны прафсаюз *«Салідарнасць»*, на чале якога стаў электрык **Лех Валенса.** «Салідарнасць» ператварылася ў масавае антыкамуністычнае грамадскае аб'яднанне, у якое ўвайшлі самыя розныя палітычныя сілы, у тым ліку каталіцкія клерыкалы і лявацкія групоўкі.

Кіраўніцтва ПНР прыняло жорсткія меры ў адносінах да «Салідарнасці». Яно аб'явіла арганізацыю па-за законам і арышта-




*Мітынг «Салідарнасці» ў Варшаве. 1980-я гг.*



Адукацыя і выхаванне
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## Гістарычны партрэт



**Лех Валенса** (нар. 1943) — польскі палітычны і дзяржаўны дзеяч. Працаваў электрыкам на Гданьскай суднаверфі. У 1980 г. стварыў першы ва Усходняй Еўропе свабодны, непадкантрольны дзяржаве прафсаюз — «Салідарнасць». У канцы 1981 г. «Салідарнасць» была аб'яўлена па-за законам, а Валенса заключаны ў турму амаль на год. На прэзідэнцкіх выбарах 1990 г. пасля значнай перамогі абраны прэзідэнтам Польшчы, набраў у другім туры 74,25 % галасоў. У 1995 г. прайграў выбары А. Кваснеўскаму. Лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру (1983) за дзейнасць у падтрымку правоў рабочых.

---

вала яе лідараў. Але хваляванні ў Польшчы прадаўжаліся. Сусветная супольнасць аказвала ўсё большы ціск на ўрад ПНР.

У канцы 1980-х гг. савецкае кіраўніцтва адмовілася ад умяшання ва ўнутраныя справы краін Усходняй Еўропы. Польшча пачала праводзіць радыкальныя эканамічныя рэформы накшталт перабудовы ў СССР. Была легалізавана «Салідарнасць» і ў 1989 г. упершыню за 50 гадоў праведзены свабодныя выбары, у выніку якіх яна атрымала перамогу. На прэзідэнцкіх выбарах 1990 г. Л. Валенса быў абраны прэзідэнтам Польшчы. Новы ўрад пачаў складаны пераход ад каманднай да рыначнай эканомікі. Гэта было пачаткам канца савецкага дамінавання ва Усходняй Еўропе.

**«Аксамітныя рэвалюцыі».** Тэрмін **«аксамітная рэвалюцыя»** упершыню быў выкарыстаны для абазначэння бяскроўнага пераходу ад сацыялістычнай сістэмы да ліберальнай спачатку ў Чэхаславакіі, а затым у іншых краінах Усходняй Еўропы ў канцы 1980-х — пачатку 1990-х гг. У хуткім часе гэты тэрмін сталі выкарыстоўваць для абазначэння ненасільнай рэвалюцыі наогул.

Хваля дэмакратычнага абнаўлення пачалася з Польскай Народнай Рэспублікі. За ёй надышлі дэмакратычныя рэвалюцыі, як правіла, мірныя, у ГДР, Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспубліцы, Венгерскай Народнай Рэспубліцы і Народнай Рэспубліцы Балгарыя. Сацыялістычная Рэспубліка Румынія стала адзінай краінай, дзе змена ўлады адбылася з прымяненнем сілы. Былы кіраўнік дзяржавы *Нікалае Чаўшэску* быў расстраляны.

Адукацыя і выхаванне



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

У выніку «аксамітных рэвалюцый» ва ўсходнееўрапейскіх дзяржавах былі адноўлены значныя дэмакратычныя свабоды. Яны выйшлі з Арганізацыі Варшаўскага Дагавора і патрабавалі вываду савецкіх войск са сваёй тэрыторыі. Аслаблены да гэтага часу Савецкі Саюз вымушаны быў саступіць.

**Праблемы пераходнага перыяду.** Таксама як і былыя постсавецкія рэспублікі, усходнееўрапейскія дзяржавы распачалі пабудову дэмакратычнай сістэмы кіравання і рыначнай эканомікі. Хоць кожная дзяржава мела ўласны вопыт рэформ, тым не менш усе яны сутыкнуліся з падобнымі праблемамі.

Для прыцягнення інвестыцый ім давялося стаць на шлях радыкальных эканамічных рэформ. Новыя дэмакратычныя рэжымы правялі прыватызацыю і перасталі стрымліваць рост цэн на асноўныя прадукты спажывання і паслугі. Гэтыя рэформы, вядомыя таксама пад назвай **«шокавая тэрапія»**, прывялі да высокага ўзроўню беспрацоўя, росту цэн і злачыннасці. Тавараў народнага спажывання стала больш, але многія людзі проста не маглі дазволіць сабе іх набыць.

Да сярэдзіны 1990-х гг. урады былых сацыялістычных краін ліквідавалі многія ранейшыя льготы, напрыклад, працяглыя дэкрэтныя водпускі ці бясплатную адукацыю ў вышэйшых навучальных установах. Значная частка насельніцтва расчаравалася ў рэформах.

Стагоддзі міграцыі і заваёў прывялі да таго, што насельніцтва большасці усходнееўрапейскіх краін стала шматнацыянальным па свайму складу. Амаль у кожнай дзяржаве разам з тытульнай нацыяй пражываюць таксама этнічныя меншасці, якія адстойваюць уласную ідэнтычнасць. Нацыяналізм гістарычна садзейнічаў яднанню такіх краін, як Польшча і Венгрыя, але таксама ён з'яўляўся і раз'яднальнай сілай. Чэхаславакія, сутыкнуўшыся з этнічнай напружанасцю, мірна падзялілася ў 1993 г. на дзве дзяржавы — Чэшскую Рэспубліку і Славакію. А вось этнічны канфлікт, які выбухнуў у 1991 г. у Югаславіі, разарваў гэтую краіну на асобныя суверэнныя часткі падчас працяглай і трагічнай грамадзянскай вайны.

**Грамадзянская вайна ў Югаславіі (1991 — 1995).** Югаславія была шматнацыянальнай і шматканфесійнай федэратыўнай дзяр-



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

жавай, у якой пражывалі сербы (праваслаўныя), славенцы, македонцы, чарнагорцы, харваты (усе каталікі), баснійцы (мусульмане), а таксама албанцы і венгры. У склад федэратыўнай дзяржавы ўваходзіла 6 рэспублік: Боснія і Герцагавіна, Македонія, Сербія, Славенія, Харватыя, Чарнагорыя.

Пасля перамогі «аксамітнай рэвалюцыі» і развалу СССР у Югаславіі ўзмацніліся сепаратысцкія тэндэнцыі. У рэспубліках да улады пачалі прыходзіць нацыяналістычныя партыі. У выніку рэвалюцыйныя працэсы прывялі да міжнацыянальных і міжэтнічных канфліктаў.

У чэрвені 1991 г. аб сваёй незалежнасці абвясцілі Харватыя і Славенія. Гэта прывяло да дзесяцідзённай вайны ў Славеніі і значна больш разбуральнай вайны ў Харватыі. Выхад Македоніі са складу Югаславіі быў бяскроўным. Сербія і Чарнагорыя пасля распаду СФРЮ 27 красавіка 1992 г. стварылі Саюзную Рэспубліку Югаславія.

**Распад Югаславіі**




АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Найбольш трагічныя падзеі адбыліся ў былой Сацыялістычнай Рэспубліцы Боснія і Герцагавіна, у якой жылі галоўным чынам баснійцы (мусульмане), сербы (праваслаўныя) і харваты (каталікі). Пасля абвяшчэння незалежнасці Рэспублікі Боснія і Герцагавіна (1992 г.) паміж гэтымі этнічнымі супольнасцямі разгарэлася вайна. Баявыя дзеянні ішлі на тэрыторыі ўсёй рэспублікі і суправаджаліся этнічнымі чысткамі. Сотні тысяч людзей сталі бежанцамі. Баснійскія сербы атрымлівалі падтрымку ад урада Сербіі, а баснійцы і харваты, якія падчас грамадзянскай вайны аб'ядналіся супраць сербаў, — ад краін Захаду.

Баснійскую вайну спыніла *Дэйтанскае пагадненне,* падпісанае *14 снежня 1995 г.* у Парыжы прэзідэнтам Босніі і Герцагавіны *А. Ізетбегавічам,* прэзідэнтам Сербіі *С. Мілошавічам* і прэзідэнтам Харватыі *Ф. Туджманам.*

Для выканання дасягнутых дамоўленасцей у Боснію і Герцагавіну былі накіраваны войскі НАТО. Рэалізацыя пагадненняў ішла павольна і часта выклікала незадавальненне і баснійцаў, і сербаў, і харватаў.

Шэраг міжэтнічных канфліктаў і грамадзянская вайна прывялі ў 1999 г. да ваеннага ўмяшальніцтва Захаду ва ўнутраныя справы Саюзнай Рэспублікі Югаславія. Югаславія была бамбардзіравана авіяцыяй НАТО. Пасля гэтага ў 2000 г. быў звергнуты яе прэзідэнт Слабадан Мілошавіч. Да ўлады ў Белградзе прыйшлі празаходнія палітычныя сілы, і ў 2003 г. Саюзная Рэспубліка Югаславія была перайменавана ў Дзяржаўны Саюз Сербіі і Чарнагорыі. У 2006 г. Чарнагорыя абвясціла сваю незалежнасць, пасля чаго Югаславія канчаткова спыніла сваё існаванне.

**«Вяртанне ў Еўропу».** У 1990-я гг. усходнееўрапейскія краіны чакалі ад Захаду дапамогі. Многія з іх спадзяваліся ўступіць у ЕС і НАТО. Аднак не ўсе палітычныя сілы ў свеце былі згодны з гэтай ідэяй. Па-першае, Расія не жадала пашырэння ўплыву НАТО на рэгіён, які некалі знаходзіўся пад кантролем СССР. Па-другое, на Захадзе некаторыя палітычныя дзеячы не хацелі адказваць за бяспеку ўсходнееўрапейскіх краін. Тым не менш у 1999 г. у НАТО былі прыняты Польшча, Венгрыя і Чэхія. Запрашэнне іншых усходнееўрапейскіх краін адбылося пазней. У склад Еўрапейскага Саюза цяпер уваходзяць 27 краін, у тым


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

ліку Польшча, Чэхія, Венгрыя, Балгарыя, Румынія, Славенія, Славакія.

## Пытанні і заданні:

1. Выдзеліце асноўныя этапы пасляваеннага развіцця краін Усходняй Еўропы і дайце ім кароткую характарыстыку.
2. Чаму з магчымых варыянтаў грамадскага развіцця ў краінах Усходняй Еўропы рэалізавалася савецкая мадэль сацыялізму? Растлумачце значэнне паняцця «савецкая мадэль сацыялізму».
3. Назавіце праявы крызісу сацыялістычнай сістэмы ў краінах Усходняй Еўропы ў 1950-я — 1960-я гг.
4. Вызначыце ўнутраныя і знешнія фактары краху сацыялізму ва Усходняй Еўропе. Чаму крах сацыялістычнай сістэмы адбыўся ў ходзе скарацечных і бяскроўных «аксамітных рэвалюцый»? Назавіце імёны новых палітычных лідараў краін Усходняй Еўропы, якія вылучыліся ў гады дэмакратычных пераўтварэнняў 1980-х гг.
5. Эканамічную стратэгію постсацыялістычных пераўтварэнняў ва ўсіх краінах Усходняй Еўропы склала праграма «шокавай тэрапіі». У чым сутнасць гэтай праграмы? Якія эканамічныя праблемы былі вырашаны падчас яе рэалізацыі? Якія негатыўныя наступствы «шокавай тэрапіі»?
6. Чаму ў краінах Усходняй Еўропы адной з найбольш вострых і балючых праблем постсацыялістычнага развіцця стала нацыянальнае пытанне? Як яно было вырашана ў Германіі, Чэхаславакіі?
7. Якія прычыны югаслаўскага крызісу? Які ўдзел прымалі краіны Захаду ў вырашэнні гэтага канфлікту? Як можна ацаніць дзеянні НАТО ў гэтым рэгіёне?
8. Ахарактарызуйце палітычную карту Усходняй Еўропы ў пачатку XXI ст. Якія краіны Усходняй Еўропы ў цяперашні час з'яўляюцца членамі ЕС, якія — НАТО?

**Прапануем абмеркаваць.** Пасля завяршэння «халоднай вайны» былі выпрацаваны праекты пашырэння НАТО на Усход. Абмяркуйце магчымыя аспекты гэтай праблемы.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

## Гістарычны дакумент

**З заявы дзяржаў-удзельніц**
**Арганізацыі Варшаўскага Дагавора**

*Будапешт, 25 лютага 1991 г.*

Краіны Еўропы вызваляюцца ад спадчыны мінулага, звязанага з эрай канфрантацыі і расколу кантынента. Парыжская хартыя абвясціла новую эпоху дэмакратыі, міру і адзінства ў Еўропе. Дзяржавы-ўдзельніцы агульнаеўрапейскага працэсу будуюць сяброўскія адносіны пры павазе да дзесяці прынцыпаў хельсінскага Заключнага акта і на аснове агульнай прыхільнасці дэмакратыі, вяршэнства права і правам чалавека.

... Спыненне расколу Еўропы адкрывае гістарычную магчымасць надаць новую якасць адносінам у сферы бяспецы пры поўнай павазе да свабоды выбару, якая захоўваецца за кожнай дзяржавай.

... удзельнікі Варшаўскага дагавора, якія дзейнічаюць як суверэнныя і раўнапраўныя дзяржавы, вырашылі скасаваць яго ваенныя органы і структуры да 31 сакавіка 1991 г.

Удзельнікі нарады адзначылі, што гэтае рашэнне заклікана садзейнічаць далейшаму зніжэнню ваенных патэнцыялаў у Еўропе і пераходу ад блокавых да агульнаеўрапейскіх структур бяспекі...

У новых абставінах развіццё адносін паміж дзяржавамі... будзе паслядоўна пераводзіцца на двухбаковую аснову. Гэта адпавядае як узаемнай зацікаўленасці ў партнёрскіх, сяброўскіх адносінах, так і сучасным еўрапейскім рэаліям.

*Якія прычыны ліквідацыі АВД названы ў дакуменце?*

# § 11—12. КУЛЬТУРА КРАІН ЗША І ЕЎРОПЫ. ЛАД ЖЫЦЦЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

**Успомніце:** *Што такое мадэрнізм? Якія найбольш важныя навуковыя адкрыцці і дасягненні былі зроблены ў міжваенны перыяд?*

**Літаратура.** У ЗША і ў іншых краінах Захаду ў пасляваенны перыяд склаліся дзве разнавіднасці культуры. Гэта **элітарная,** «высокая» культура, якая захоўвала класічныя традыцыі і ідэалы, і



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**масавая культура**, для якой характэрны пэўныя стандарты, арыентацыя на інтарэсы масавага спажыўца, спрошчанасць, відовішчнасць і даступнасць. У адрозненне ад элітарнай, масавая культура стала своеасаблівым сродкам забавы людзей і адначасова рэкламай заходняга ладу жыцця.



Эрнэст Хемінгуэй.

У пасляваеннай літаратуры ЗША паранейшаму развіваўся рэалістычны напрамак. Гуманістычныя ідэалы асабліва яскрава праявіліся ў творчасці двух яго вядучых прадстаўнікоў — *У. Фолкнера* і *Э. Хемінгуэя*. У. Фолкнер у раманах «Прытча», «Горад», «Асабняк» паказаў падзенне нораваў белых амерыканцаў — жыхароў Поўдня. Пісьменнік падкрэсліваў адказнасць новых пакаленняў амерыканцаў за злачынствы, здзейсненыя іх продкамі-рабаўладальнікамі і сучаснымі расістамі. Аповесць-прытча Э. Хемінгуэя «Стары і мора» прысвечана пошуку сэнсу чалавечага жыцця.

Амерыканскі пісьменнік *Дж. Сэлінджэр* у аповесці «Над безданню ў жыце» асудзіў атмасферу хлусні і крывадушнасці, якая панавала ў пэўных колах амерыканскага грамадства. *Дж. Стэйнбек* развянчаў часовыя каштоўнасці «грамадства спажывання». Сямейныя драмы, супярэчнасці паміж грэшнасцю чалавека і пошукамі духоўных ідэалаў, асабістая і калектыўная адказнасць людзей за зло, што адбываецца ў свеце, — усё гэта знайшло адлюстраванне ў багатай творчай спадчыне драматурга *А. Мілера* (п’есы «Смерць комівояжора», «Гэта здарылася ў Вішы»). Крызіс традыцыйнай маралі, жорсткасць паўсядзённага жыцця сталі асноўным матывам п’есы «Хто баіцца Вірджыніі Вулф?» драматурга *Э. Олбі*. Дзякуючы дынамічнаму сюжэту і рэалістычнаму адлюстраванню жыцця дзелавой Амерыкі сталі бестселерамі вытворчыя раманы *А. Хейлі* «Атэль», «Аэрапорт» і інш., а таксама вострасюжэтны раман пра амерыканскае тэлебачанне і міжнародны тэрарызм «Вячэрнія навіны».

У пасляваеннай літаратуры ЗША былі шырока прадстаўлены і розныя авангардысцкія плыні. Пісьменнікі-авангардысты шукалі



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

новыя, незвычайныя сродкі для свайго творчага самавыяўлення. Так, паэтычныя творы тэарэтыка амерыканскага мадэрнізму *Э. Паўнда* напоўнены імітацыямі, наследаваннем паэтам Антычнасці і Сярэдневякоўя і адлюстроўваць пратэст супраць «ліхвярскай» заходняй цывілізацыі. Пісьменнік *Дж. Барт* мае схільнасць да прозы «чорнага гумару», якая перадае ў гратэскавай форме светаадчуванне абсурду жыцця. Выдатны драматург *Т. Уільямс* у сваіх псіхалагічных п'есах («Трамвай «Жаданне» і інш.), раскрывае пакуты натхнёных паэтычных асоб у бяздушным, нецярпімым акружэнні.

З 1950-х гг. у ЗША распаўсюдзілася масавая літаратура, асноўнае месца ў якой занялі, з аднаго боку, творы, што апяваюць культ пачуццёвай асалоды (раманы Г. Мілера), з іншага — трылеры і дэтэктывы (творчасць Дж. Чэйза).

У пасляваеннай англійскай літаратуры былі адлюстраваны складаныя грамадскія працэсы і супярэчнасці эпохі. Драматургі «новай хвалі» і пісьменнікі групы «раззлаваныя маладыя людзі» ўнеслі ў літаратуру дэмакратычны вострасацыяльны змест («Азірніся ў гневе» *Дж. Осбарна,* «Смак мёду» *Ш. Дылэні* і інш.). Яны пратэставалі супраць улады грошай, ханжаства і ставілі вострыя палітычныя пытанні. Так, у раманах *Д. Б. Прыстлі* «Сэр Майкл і сэр Джордж», «Лонданскі тупік» паказана падзенне нораваў англійскай бюракратыі і заможных абывацеляў. *Ч. П. Сноў* у шматтомнай эпапеі «Чужыя і браты» раскрыў супярэчлівы шлях англійскай навуковай інтэлігенцыі на фоне важнейшых гістарычных падзей. *Г. Грын* у сваёй творчасці востра ставіў праблемы маральнага і палітычнага выбару чалавека. Пісьменнік прыходзіць да вываду, што насілле і тэрарызм у наш час прадстаўляюць сабой «ні што іншае, як спадчыну гітлерызму, менавіта гэтай заражанай крывёй Еўропа падзялілася з астатнім светам». Сацыяльна-псіхалагічныя карані фашызму, збядненне душы і страта духоўнасці, жорсткасць жыцця, пошукі творчай інтэлігенцыі складаюць галоўныя тэмы творчасці пісьменнікаў *М. С. Спарка* і *Дж. Фаўлза.*

Новай з'явай у літаратуры стаў свет чароўнай казкі, міфа і фантазіі. Трылогія *Дж. Р. Толкіена* «Валадар кольцаў» прасякнута ідэяй велізарнага ўплыву на ход гісторыі зла і насілля, перамога над якім каштуе вялікіх намаганняў і ахвяр. У канцы 1990-х гг. з'явіліся інтэлектуальныя казкі пра Гары Потэра пісьменніцы *Дж. Роўлінг,* якія сталі папулярнымі ва ўсім свеце.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

У Вялікабрытаніі, як і ў іншых краінах Захаду, выдавалася шмат дэтэктываў, раманаў пра шпіёнаў і іншай прадукцыі масавай культуры. Сярод іх былі і таленавітыя творы: дэтэктывы *А. Крысці* пра сышчыкаў-аматараў міс Марпл і Эркюля Пуаро, а таксама раманы *Я. Флемінга* аб прыгодах «агента 007» Джэймса Бонда.

Перыяд уздыму дэмакратычнага руху пасля 1945 г. зрабіў велізарны ўплыў на развіццё французскай культуры. Сацыялістычны рэалізм яскрава праявіўся ў творах *Л. Арагона* (раман «Камуністы»). Крытычны рэалізм таксама з'яўляўся ўплывовай мастацкай плынню. Вядомым яго прадстаўніком быў аўтар шматлікіх раманаў, у тым ліку і гістарычных, *М. Друон*. Рэалістычныя матывы ўласцівы таксама творчасці *Ж. Сіменона,* аўтара серыі дэтэктыўна-псіхалагічных раманаў пра паліцэйскага камісара Мегрэ. Французская літаратура зведала прыкметны ўплыў розных філасофскіх плыняў, у тым ліку *экзістэнцыялізму* і марксізму. Гэта ў значнай ступені вызначала тэматыку і ідэйную накіраванасць творчасці многіх пісьменнікаў. Філосаф і пісьменнік *Ж. П. Сартр* у сваіх ранніх працах крыніцай зла ў грамадстве называў індывідуальную прыроду чалавека. Пісьменніца *С. дэ Бавуар* у сваёй творчасці выступала супраць фактычнага нераўнапраўя жанчын. Гэтай тэме прысвечаны таксама раманы *Ф. Саган.* Лаўрэата Нобелеўскай прэміі *А. Камю* хвалявала праблема свабоды духоўнага выбару чалавека, пошуку сэнсу жыцця.

У 1950-я — 1970-я гг. у французскай літаратуры ўзнік жанр «новага рамана», або «антырамана», у якім не было сюжэта, а апісваліся толькі пэўныя з'явы і прадметы, напрыклад, раманы *Н. Сарот.* У заходнееўрапейскай драматургіі і тэатры ў 1950-я — 1960-я гг. з'явілася новая плыня — драма абсурду. Яе зачынальнікамі сталі *Э. Іанеска* (Францыя) і *С. Бекет* (Ірландыя). Іх творы напоўнены адчуваннем кашмару, бессэнсоўнасці і хаосу сучаснага жыцця.

Працэс адраджэння нямецкай літаратуры звязаны, у першую чаргу, з утварэннем у 1947 г. «Групы 47», куды ўваходзілі *Г. Грас, З. Ленц* і іншыя заходнегерманскія пісьменнікі. Яны бязлітасна крытыкавалі фашызм, раскрывалі яго злачынную сутнасць. *Г. Бёль* у раманах «Вачыма клоуна», «Групавы партрэт з дамай» і



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

інш. рэзка асуджаў недахопы сацыяльна-палітычнага жыцця ФРГ, крытыкаваў каталіцкую царкву.

У 1970-я — 1980-я гг. у літаратуры ФРГ адбыўся паварот да апісання асабістага жыцця і ўнутранага свету чалавека, з'явілася «жаночая літаратура» і дэтэктыўна-шпіёнскія раманы.

У ГДР сфарміравалася літаратура сацыялістычнага рэалізму, у рамках якой было створана шмат «вытворчых» раманаў (напрыклад, «Рашэнне» і «Давер» *Г. Зэгерс*). У ГДР працавалі многія вядомыя нямецкія пісьменнікі, якія вярнуліся з эміграцыі. Гэта, у першую чаргу, *Л. Фейхтвангер, Б. Брэхт* і *І. Бехер*, якія адыгралі важную ролю ў развіцці культурнага жыцця Усходняй Германіі.

Ярка праявіўся неарэалізм і ў італьянскай літаратуры. Антыфашысцкая тэма і сацыяльныя праблемы занялі цэнтральнае месца ў творчасці пісьменнікаў *В. Праталіні, П. П. Пазаліні, А. Маравія* і паэта *С. Квазімада*. Рэалістычнымі матывамі і зваротам да рабочай аўдыторыі прасякнуты п'есы драматурга і акцёра *Д. Фо*. Складаныя творы, якія сумяшчаюць дэтэктыўныя і рэлігійна-філасофскія сюжэты, стварае сучасны італьянскі пісьменнік-мадэрніст *У. Эка*.



*Э. Уорхал. Таматны суп «Кэмпбэл».*

**Выяўленчае мастацтва.** Рэалістычны кірунак у амерыканскім выяўленчым мастацтве звязаны з імёнамі мастакоў, якія ў цэнтр сваёй творчасці ставілі праблемы простага чалавека *(Р. Кент і інш.)*. Актыўна развіваліся розныя **авангардысцкія** кірункі і плыні, такія як *абстракцыянізм* і *поп-арт (папулярнае мастацтва)*. Мастакі гэтай мадэрнісцкай плыні, адмаўляючыся ад звычайных метадаў жывапісу і скульптуры, выкарыстоўваюць нечаканыя спалучэнні гатовых бытавых прадметаў, механічных копій (фатаграфій, плакатаў) і г. д., ператвараючы гэтыя рэчы ў творы мастацтва. Напрыклад, адзін з


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

заснавальнікаў поп-арта *Дж. Джонс* ствараў свае мастацкія работы з кансервавых бляшанак і сцягоў ЗША. *Э. Уорхал,* які праславіўся дзякуючы серыйным партрэтам амерыканскай кіназоркі Мэрылін Манро і карціне-копіі 32 бляшанак супа «Кэмпбэл», выказаў сутнасць новага кірунку ў мастацтве так: «Поп-арт — гэта любіць рэчы».

У 1960-х гг. у амерыканскім выяўленчым мастацтве з'явіліся такія неаавангардысцкія кірункі, як *оп-арт (аптычнае мастацтва); бодзі-арт (мастацтва чалавечага цела); кінетычнае мастацтва,* заснаванае на руху карцін ці іх частак; *гіперрэалізм* (дакладнае капіраванне аб'ектаў) і г. д. На Захадзе набывалі папулярнасць і творы *псіхадэлічнага* мастацтва, якія нярэдка ствараліся пад уздзеяннем наркотыкаў.

У 1960-я — 1970-я гг. абстракцыянізм развіваўся ў асноўным у выглядзе *канцэптуальнага* мастацтва. Яго прадстаўнікі лічылі, што твор можа не мець матэрыяльнага ўвасаблення і існаваць у выглядзе ідэі або знака. Захоўваў свой уплыў сюррэалізм, прадстаўлены ў карцінах іспанскага мастака *С. Далі,* які пасля 1945 г. некаторы час жыў у ЗША.

Для англійскага выяўленчага мастацтва гэтага перыяду характэрна з'яўленне розных авангардысцкіх кірункаў. У Вялікабрытаніі ўзнікла мадэрнісцкая мастацкая плынь — поп-арт. Яе родапачынальнікамі лічацца *Э. Паалоццы* — аўтар калажа «Я была цацкай багацея» і *Р. Гамільтан,* які стварыў праграмны твор — калаж-карціну «Што ж робіць нашы сучасныя дамы такімі асаблівымі, такімі прываблівымі?». Хутка поп-арт распаўсюдзіўся ў многіх краінах Захаду, і ў першую чаргу ў ЗША.

У ФРГ у галіне выяўленчага мастацтва пераважалі авангардысцкія кірункі — абстракцыянізм, поп-арт, оп-арт. У канцы XX ст. сталі папулярнымі галаграфічныя карціны, створаныя з дапамогай камп'ютара.

Вялікі ўплыў на італьянскае і сусветнае выяўленчае мастацтва зрабіла творчасць антыфашыста, удзельніка руху Супраціўлення мастака *Р. Гутуза.* На яго палотнах адлюстраваны сцэны народнага жыцця і рэвалюцыйнай барацьбы.

**Музыка.** У другой палове XX ст. адбыліся якасныя змены ў музычнай культуры ЗША, звязаныя перш за ўсё са з'яўленнем **рок-музыкі.** Яна адлюстроўвала настроі значнай часткі моладзі як у ЗША, так і ў іншых заходніх краінах, якая не прымала «са-



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



*Элвіс Прэслі.*

старэлых» каштоўнасцей старэйшага пакалення. У маладзёжным асяроддзі вылучаліся бітнікі і хіпі. Першыя крытыкавалі амерыканскія ідэалы, імкнуліся да свабоды самавыражэння, у тым ліку і ў знешнім выглядзе, асуджалі багацце і агульнапрызнаную мараль, ужывалі наркотыкі і алкаголь. Хіпі не прызнавалі прыватную ўласнасць, сям'ю, традыцыйнае хрысціянства і заходні лад жыцця. Большасць з іх выступала супраць вайны і любых формаў насілля. Жылі яны, як правіла, абшчынамі і выдзяляліся сваімі яркімі і незвычайнымі ўборамі. Многія хіпі актыўна ўжывалі наркотыкі.

Рок-музыка ўзнікла на аснове аб'яднання афраамерыканскіх мелодый, у першую чаргу стылю «рытм энд блюз» і народнай музыкі белых жыхароў Амерыкі (кантры). Першым кірункам рок-музыкі стаў рок-н-рол (літаральна «гайдацца і круціцца»). Яго своеасаблівым гімнам з'явілася песня ў выкананні *Б. Хейлі* «Рок круглыя суткі». Прызнаным каралём рок-н-рола лічыўся *Э. Прэслі*, які з сярэдзіны 1950-х гг. стаў кумірам моладзі. Яго лірычная балада «Кахай мяне пяшчотна» доўгі час узначальвала амерыканскія хіт-парады.

У 1960-я — 1970-я гг. з'явілася шмат новых кірункаў у рок-музыцы. Найбольш вядомыя — *фолк-рок*, або народны рок, (Б. Дзілан і інш.); *хард-рок*, або жорсткі рок (група «Кіс»); *хэві-метал*, або цяжкі рок, *псіхадэлічны* рок (група «Дорз» і інш.). *Панк-рок* адлюстроўваў дрэнныя густы (у тым ліку пропаведзь насілля) часткі моладзі. Спалучэнне класічнай і рок-музыкі прывяло да з'яўлення жанру *рок-оперы* і *арт-року*. У сярэдзіне 1970-х гг. узнік рэп, пад які выконваўся папулярны танец *брэйк-данс*. У ЗША праводзіліся рок-фестывалі, буйнейшы з якіх прайшоў у *Вудстаку ў 1969 г.* і сабраў каля 300 тыс. гледачоў.

Актыўна развівалася і папулярная музыка. У ЗША была створана магутная шоу-індустрыя (шоу-бізнес). Сусветную вядомасць набылі такія выканаўцы папулярнай музыкі, як *Ф. Сінатра, Л. Мінелі, Ц. Цёрнер, М. Джэксан, Мадонна, У. Х'юстан і інш.*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



Рок-група «Бітлз».

У 1940-я — 1960-я гг. у ЗША была створана вялікая колькасць мюзіклаў — музычна-сцэнічных твораў, якія спалучаюць у сабе элементы эстрады, аперэты і балета.

У рамках масавай культуры развівалася і англійская рок-музыка. У пачатку 1960-х гг. на Захадзе пачалася сапраўдная «бітламанія», звязаная з творчасцю рок-групы *«Бітлз»*. Вялікі ўклад у развіццё рок-музыкі зрабіла група *«Ролінг Стоўнз»*. Класікай хард-року стала творчасць трох вядомых англійскіх груп — *«Лед Зепелін»*, *«Дып Пёпл»* і *«Блэк Сэбет»*. Разнастайнай была музыка рок-групы *«Куін»*.

Музычная культура Францыі гэтага перыяду была прадстаўлена творчасцю вядомых *шансанье* (эстрадных спевакоў) *Э. Піаф, М. Шэвалье, С. Адамо, Ш. Азнавура, С. Генсбура, М. Мацьё, Дж. Дасэна, П. Каас* і інш. Яркі след у эстрадным мастацтве пакінула творчасць *П. Марыа* і яго аркестра.

Разнастайнасцю вылучалася музычная культура ФРГ. Нямецкая класічная музыка выконвалася ў першую чаргу на *Бетховенскім фестывалі* ў Боне і *Вагнераўскім фестывалі* ў Байройце, якія маюць міжнародны статус. У нямецкай рок і поп-музыцы вядомыя «панк-лэдзі» *Н. Хаген*, спявак *У. Ліндэнберг* і такія папулярныя групы, як *«Скорпіёнз»*, *«Рамштайн»* і *«Модэрн Токінг»*.

У галіне музычнай культуры Італіі традыцыйна належалі многія вядучыя пазіцыі ў Еўропе. Знакаміты міланскі оперны тэатр *«Ла Скала»* з канца XVIII ст. застаецца цэнтрам сусветнай



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

опернай культуры. Імя опернага спевака *Л. Павароці* шырока вядома аматарам гэтага віду мастацтва ва ўсім свеце. У Італіі штогод праводзяцца шматлікія музычныя фестывалі і конкурсы. Найбольш папулярнымі спевакамі і музыкантамі сталі *А. Чэлентана, Т. Кутуньё, дуэт Аль Бана і Раміны Паўэр,* група *«Рычы Э Поверы»* і інш.




*Сімвал Галівуда, велізарныя літары, усталяваныя на адным з пагоркаў Лос-Анджэлеса.*

**Кіно.** У кінематаграфіі ЗША панаваў Галівуд з яго праслаўленнем амерыканскага ладу жыцця і культам кіназорак. Разам з тым некаторыя кінарэжысёры і акцёры адлюстроўвалі ў сваёй творчасці вострыя сацыяльныя праблемы і асуджалі палітыку афіцыйных улад. У 1952 г. *Ч. Чаплін,* які не прымаў макартызму, пакінуў ЗША. У Еўропе ён зняў некалькі фільмаў, у тым ліку «Агні рампы», «Кароль у Нью-Ёрку», у якіх выказаў надзеі і трывогі простых людзей. Шырокі грамадскі рэзананс атрымалі фільмы рэжысёра С. Крамера, якія закраналі вострыя сацыяльна-эканамічныя праблемы («Не схіліўшыя галавы», «Нюрнбергскі працэс», «Гэты вар'яцкі, вар'яцкі, вар'яцкі свет»).

У 1960-я — 1970-я гг. многія кінарэжысёры і акцёры кінулі выклік галівудскай «фабрыцы мараў». З'явіліся фільмы, якія асуджалі культ долара, бездухоўнасць і падымалі актуальныя праблемы моладзі («Злыя вуліцы» *М. Скарсезе,* «Паўночны каўбой» *Дж. Шлезінгера,* «Загнаных коней прыстрэльваюць, ці не так?» *С.Полака*). На экране з'явіўся новы тып героя — «чалавека з вуліцы», прадстаўлены работамі акцёраў *Дж. Фонды, Г. Фонды, Д. Хофмана* і інш.

Вайна ў В'етнаме выклікала водгук і ў галіне кіно. Адны кінастужкі апраўдвалі або гераізавалі агрэсію ЗША («Зялёныя берэты» *Д. Уэйна*), іншыя — асуджалі в'етнамскую вайну («Вяртанне дадому» *Х. Эшбі,* «Узвод» *О. Стоўна* і інш.).

Асноўную масу амерыканскіх фільмаў складаюць баевікі, меладрамы, дэтэктывы, трылеры, фільмы жахаў. Сусветнымі бест-



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

селерамі сталі фільмы пра «агента 007» Джэймса Бонда. Гэтак жа вядомы кінастужкі пра гангстэраў і мафію («Хросны бацька» *Ф. Копалы*), фантастычныя фільмы («Зорныя войны» *Дж. Лукаса*), фільмы жахаў («Сківіцы» *С. Спілберга*) і інш.

Сярод амерыканскіх кіназорак сусветную вядомасць заваявалі акцёры *М. Манро, Э. Тэйлар, К. Іствуд, А. Пачына, Р. дэ Ніра, Дж. Нікалсан, М. Дуглас, Б. Уіліс, Ш. Стоўн, Дж. Робертс, А. Шварцэнегер, М. Стрып і інш.*

Велізарны ўклад у развіццё брытанскага кінематографа і тэатра зрабіў акцёр і рэжысёр, кіраўнік Нацыянальнага тэатра ў Лондане *Л. Аліўе*, а таксама актрыса *В. Лі*. Як таленавіты выканаўца шэкспіраўскіх роляў у тэатры, а таксама як кінаакцёр праславіўся *Р. Бартан*. *Дж. Гілгуд* атрымаў вядомасць як рэжысёр, які ўмела спалучае прыёмы англійскага традыцыйнага сцэнічнага мастацтва з элементамі сістэмы К. С. Станіслаўскага, а таксама як акцёр рэалістычнага кіно. Адным з заснавальнікаў жанру фільмаў жахаў стаў англа-амерыканскі рэжысёр *А. Хічкок*.

Французскае кіно пасля 1945 г. паспяхова сапернічала з амерыканскім. Сусветнае прызнанне атрымалі такія французскія акцёры, як *І. Мантан, Л. дэ Фюнес, Ж. П. Бельмандо, А. Дэлон, К. Дэнёў, Ж. Дэпардзьё*. Адной з самых вядомых актрыс краіны, якую лічылі другім па папулярнасці чалавекам пасля Шарля дэ Голя, стала кіназорка 1950-х — 1960-х гг. *Б. Бардо*.

У ФРГ у галіне кіно найбольшую вядомасць атрымаў нямецкі рэжысёр *Р. Фасбіндэр*. У яго фільмах «Замужжа Марыі Браўн», «Берлін, Александэрплац» і інш. здымалася вядомая нямецкая кінаактрыса *Х. Шыгула*. «Залатую пальмавую галіну» ў Канах і «Оскара» ў ЗША атрымала экранізацыя рамана Г. Граса «Бляшаны барабан» кінарэжысёра *Ф. Шлендарфа*. Гісторыі Другой сусветнай вайны прысвечаны фільм «Сталінград» *І. Фільсмаера*. Праблемы аб'яднання Германіі адлюстраваны ў кінастужках «Учэпістая піла» і «Тэрор 2000» рэжысёра *К. Шлінгезіра*. Папулярным стала творчасць акцёра і рэжысёра *Ц. Швайгера*, які ўздымае праблемы сучаснага нямецкага грамадства.

У італьянскім кінематографе і літаратуры пад уплывам ідэй Супраціўлення і пасляваеннага дэмакратычнага ўздыму склаўся цэлы кірунак — **неарэалізм**. Мастацкім маніфестам неарэалізму стаў фільм рэжысёра *Р. Раселіні* «Рым — адкрыты горад». Работы



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



Ф. Феліні на здымачнай пляцоўцы.

выдатных прадстаўнікоў гэтага кірунку хвалююць мільёны людзей у свеце да гэтага часу. Гэта фільмы *П. Джэрмі* «Дарога надзеі», «Развод па-італьянску», *Дж. дэ Сантыса* «Няма міру пад алівамі», *В. дэ Сіка* «Сланечнікі», «Шлюб па-італьянску» і інш. У іх на поўную сілу раскрыўся талент выдатных акцёраў *С. Ларэн* і *М. Мастраяні*, а таксама *Дж. Лалабрыджыды* і *К. Кардынале*. Адыход ад неарэалізму намеціўся ў творчасці італьянскага кінарэжысёра *Ф. Феліні*, чые фільмы «Салодкае жыццё», «Восем з паловай» і інш., якія атрымалі прэмію амерыканскай Акадэміі кінамастацтва «Оскар», сталі выдатнай з'явай сусветнай культуры.

**Архітэктура.** Вядучыя пазіцыі ў свеце займае сучасная амерыканская архітэктура. Пасля вайны прадаўжала развівацца *арганічная архітэктура*, у якой будынак разглядаецца як арганізм, звязаны з прыродным асяроддзем. Заснавальнік арганічнай архітэктуры *Ф. Л. Райт* у 1950-я гг. праектаваў сусветна вядомы будынак *Музея Гугенхейма* ў Нью-Ёрку. Тэхніцызм характэрны для творчасці



Будынак Музея Гугенхейма ў Нью-Ёрку.



Адукацыя і выхаванне
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

*Л. Міс ван дэр Роэ*, які стварыў новы тып будынка — паралелепіпед са стальным каркасам і суцэльным шкленнем навясных сцен. Новымі формамі адрозніваюцца будынкі, узведзеныя па праектах *Э. Саарынена*, напрыклад, комплекс будынкаў кампаніі «Джэнерал Мотарз» ва Уорыне. У ЗША прадаўжалася традыцыя пабудовы небаскробаў. У 1971 — 1973 гг. у Нью-Ёрку былі ўзведзены дзве вежы Цэнтра міжнароднага гандлю (110 паверхаў вышынёй 412 м), у Чыкага — будынак фірмы «Сірс і Робак» вышынёй 422 м.

Французскі архітэктар *Ш. Э. Ле Карбюзье* распрацаваў канструктыўныя прыёмы будаўніцтва «жылых блокаў», якія прадугледжвалі каркасную канструкцыю будынкаў, іх свабодную, не звязаную з вонкавымі сценамі планіроўку, размяшчэнне суцэльных вокнаў па фасадзе, плоскі дах. Будынак *Нацыянальнага цэнтра мастацтва і культуры імя Ж. Пампіду*, узведзены ў Парыжы ў 1977 г., стаў прыкладам стылю *хай-тэк* (скарочанае англійскае словазлучэнне «высокая тэхналогія»), які аб'ядноўвае перадавыя будаўнічыя тэхналогіі з дасягненнямі мастацтва.

У архітэктуры ФРГ панаваў *постмадэрнізм*, прыкладам якога сталі будынкі канцэрна БМВ у Мюнхене, Берлінскай філармоніі і ўрадавыя будынкі ў Берліне.

## Гістарычны партрэт



**Шарль Эдуар Ле Карбюзье** (сапр. прозвішча Жанерэ-Гры) (1887 — 1965) — французскі архітэктар і тэарэтык архітэктуры. У 1922 г. заснаваў архітэктурную майстэрню. Сваю канцэпцыю сучаснай архітэктуры ўпершыню выклаў у 1920 — 1925 гг. Сфармуляваў «пяць адпраўных кропак сучаснай архітэктуры»: узняты на апорах-слупах будынак, плоскі дах-сад, свабодная ўнутраная планіроўка, стужкавае акно, ненясучая фасадная сцяна. Для пабудоў характэрны простыя геаметрычныя формы, белыя плоскасці фасадаў, шырокія зашклёныя паверхні. Горадабудаўнічыя праекты развівалі ідэю «вертыкальнага» горада-сада з высокай шчыльнасцю насельніцтва і вялікай азелененай прасторай, дыферэнцыяцыяй шляхоў руху пешаходаў і транспарту, раздзяленнем зон жылля, дзелавой актыўнасці і прамысловасці.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Змены ў ладзе жыцця.** Фарміраванне грамадства спажывання і дзяржавы «ўсеагульнага дабрабыту» змяніла грамадскую свядомасць і сістэму каштоўнасцей заходняга свету. На першае месца выйшлі ўтылітарныя каштоўнасці, звязаныя з задавальненнем матэрыяльных патрэб, масавым спажываннем тавараў і паслуг. Для многіх вызначальным фактарам у жыцці стаў культ грошай і рэчаў, на другое месца адышлі гуманістычныя каштоўнасці і духоўныя ідэалы.

У грамадстве спажывання вырасла значэнне сферы паслуг і адукацыі. Гэта было звязана не толькі з эканамічнымі фактарамі, але і са змяншэннем працоўнага часу. У большасці краін Захаду ў 1950-я — 1960-я гг. зацвердзіўся 35 — 40-гадзінны працоўны тыдзень, а таксама завяршыўся пераход да абавязковай сярэдняй адукацыі. Значнае месца ў жыцці людзей занялі адпачынак, заняткі спортам, фізкультурай, захапленне якой-небудзь спецыфічнай дзейнасцю (хобі), наведванне дыскатэк, клубаў, казіно, масавых канцэртаў. Маладзёжнае асяроддзе захапіла «сексуальная рэвалюцыя», у ходзе якой перагляда́ліся традыцыйныя ўяўленні аб сям'і і шлюбе.

У сацыяльнай структуры заходняга грамадства галоўную ролю пачаў адыгрываць сярэдні клас, які ў многім увасабляў сабой грамадства спажывання. Яго прадстаўнікі маглі сабе дазволіць мець уласны дом, аўтамабіль, дарагую бытавую тэхніку, добры гардэроб, правесці водпуск за мяжой, атрымаць добрую адукацыю і г. д. На лад жыцця сярэдняга класа паўплывала таксама навукова-тэхнічная рэвалюцыя і яе дасягненні.

Другая якасная змена ў заходнім ладзе жыцця пасля Другой сусветнай вайны звязана з пераходам грамадства ў стадыю постіндустрыяльнага развіцця. Інфармацыйная рэвалюцыя, фарміраванне новай інфармацыйнай эканомікі і ў цэлым інфармацыйнага грамадства значна змянілі менталітэт і паўсядзённае жыццё людзей, у тым ліку сярэдняга класа. З'явіўся так званы «новы сярэдні клас», да якога пачалі адносіць у першую чаргу работнікаў інтэлектуальнай працы і шырокі слой кіруючых работнікаў (адміністратараў, менеджараў і г. д.). У інфармацыйным грамадстве інтэлектуальны капітал пачаў пераважаць над прамысловым і фінансавым. Змянілася і шкала жыццёвых каштоўнасцей. На першае месца выйшлі патрэбы ў атрыманні вышэйшай аду-


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

кацыі, у авалоданні інфармацыяй і высокімі тэхналогіямі, рэалізацыі індывідуальных патрэб асобы, павышэнні якасці жыцця. Разам з задавальненнем матэрыяльных патрэбнасцей вялікае значэнне набылі нематэрыяльныя каштоўнасці — рэлігійныя ідэалы, пачуццё абавязку, салідарнасці, адказнасці за лёсы іншых людзей і планеты наогул. Для значнай часткі заходняга грамадства характэрна разуменне значнасці агульначалавечых каштоўнасцей і глабальных праблем, у тым ліку экалагічнай, дэмаграфічнай, энергетычнай, праблемы міжнароднага тэрарызму і г. д.

У канцы XX ст. інфармацыйная рэвалюцыя карэнным чынам змяніла паўсядзённае жыццё. Галоўную ролю ў гэтым адыгралі персанальныя камп'ютары і глабальная сетка Інтэрнэт, а таксама розныя віды электроннай тэхнікі — ксеракс, факс, сканер, сотавыя тэлефоны і г. д.

Яшчэ большае значэнне набылі заняткі спортам. Футбол, хакей, тэніс, бокс і іншыя віды спорту сталі часткай шоу-бізнесу і значным сектарам эканомікі Захаду. Вырасла папулярнасць Алімпійскіх гульняў і алімпійскага руху. Гэта ж можна сказаць і пра высокую моду, якая стала важным элементам шоу-індустрыі. Найбольш яркімі прадстаўнікамі гэтага шоу-бізнесу сталі французскія мадэльеры, якія па праву лічацца заканадаўцамі сучаснай моды. Мадэльеры *Г. Шанель, К. Дзіёр, П. Кардэн* і інш. вядомы ўсяму свету. Выраб адзення і яго рэклама прыносяць ім ці іх дамам моды вялізарныя прыбыткі.

### Пытанні і заданні:

1. Якія асноўныя мастацкія кірункі атрымалі развіццё ў краінах Захаду ў другой палове XX — пачатку XXI ст.?
2. Растлумачце значэнне паняццяў «элітарнае мастацтва», «масавая культура». Як суадносяцца паміж сабой элітарная і масавая культура? Ці заўсёды можна правесці дакладнае размежаванне паміж імі? Прывядзіце прыклады.
3. Якія асноўныя праблемы сучаснага грамадства знайшлі адлюстраванне ў мастацтве? Як вы можаце растлумачыць з'яўленне новых сродкаў уздзеяння на гледача/слухача?
4. Складзіце абагульняючую табліцу «Культура краін Захаду ў другой палове XX — пачатку XXI ст.».



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

5. Падрыхтуйце паведамленне на адну з тэм: «Рок і класіка: супрацьстаянне і сінтэз», «Функцыянальнае і арганічнае, нацыянальнае і інтэрнацыянальнае ў архітэктуры другой паловы XX ст.», «Інтэрнэт як глабалізацыя інфармацыйнай прасторы».
6. Чым характарызуецца жыццё чалавека ў сучасным заходнім грамадстве? Як звязаны паміж сабой навукова-тэхнічны прагрэс, развіццё культуры і паўсядзённае жыццё чалавека?

**Прапануем абмеркаваць.** У апошні час часта гавораць пра тое, што кіно, камп'ютар, Інтэрнэт выцiснуць з жыцця такія традыцыйныя віды мастацтва як тэатр і літаратуру. Ці згодны вы з гэтым пунктам гледжання? Свой адказ аргументуйце.

**Гістарычная даведка**

Шведская група **«АББА»** была заснавана ў 1970 г. у Стакгольме. Вясной 1974 г. «АББА» з трыумфам перамагла на конкурсе «Еўрабачанне», выканаўшы песню «Ватэрлоа», якая ўжо летам узначаліла хіт-парады большасці краін Еўропы. У 1970-х гг. «АББА» была самай паспяховай еўрапейскай групай. Агульны тыраж яе пласцінак перавысіў 350 млн. У сябе на радзіме, у Швецыі, калектыў стаў нацыянальным гонарам, а па рэнтабельнасці ён займаў другое месца пасля Стакгольмскай фондавай біржы, абагнаўшы нават аўтамабільны канцэрн «Вольва». У 1982 г. група распалася, але яе папулярнасць захоўваецца да гэтага часу.



## УРОК АБАГУЛЬНЕННЯ

**1.** У цяперашні час сярод большасці гісторыкаў, сацыёлагаў, палітолагаў прынята трохстадыйная тэорыя развіцця чалавечага грамадства. Закончыце складанне табліцы «Этапы грамадскага развіцця»:


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"
АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

| Этапы | З'ява, якая паслужыла пераходам да новай стадыі | Прыкладны час пачатку пераходу да новага этапу | Вызначальная сфера эканомікі |
|---|---|---|---|
| Аграрнае грамадства | Аграрная (неалітычная) рэвалюцыя | IV тыс. да н. э. | Сельская гаспадарка |
| Індустрыяльнае грамадства | Прамысловая рэвалюцыя | Канец XVIII ст. | Прамысловасць |
| Постіндустрыяльнае грамадства | | | |

**2.** Якімі рысамі характарызуецца постіндустрыяльнае грамадства? Прааналізуйце даныя аб развіцці сферы паслуг у ВУП (у %) асобных краін свету і зрабіце вывады.

| ЗША | Еўрапейскі Саюз | Мексіка | Кітай | Індыя | Японія | Расія | Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 79,4 (2004) | 69,4 (2004) | 68,0 (2002) | 39,3 (2006) | 54,9 (2009) | 72,0 (2007) | 48,6 (2007) | 62,0 (2005) |

**3.** Ахарактарызуйце Еўрапейскі Саюз па плану:
— мэты стварэння;
— асноўныя вехі гісторыі стварэння і пашырэння;
— дзяржавы-заснавальніцы, інстытуты і сімвалы;
— колькасць дзяржаў, якія ўваходзяць у ЕС у цяперашні час;
— дасягненні і праблемы развіцця ЕС.

**4.** Ахарактарызуйце пасляваеннае аднаўленне і сацыяльна-эканамічную мадэрнізацыю заходніх краін пасля Другой сусветнай вайны. Выдзеліце асноўныя тэндэнцыі і этапы сацыяльна-


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

эканамічнага развіцця, дайце ім абагульненую характарыстыку, прывядзіце прыклады з гісторыі заходніх краін. Выкарыстайце паняцці: «план Маршала», «эканамічны цуд», «дзяржава ўсеагульнага дабрабыту», сацыяльна-арыентаваная рыначная эканоміка, неакансерватыўная хваля, «шведская мадэль сацыялізму».

**5.** Якія краіны Усходняй Еўропы пасля Другой сусветнай вайны пайшлі па сацыялістычнаму шляху развіцця? Пакажыце гэтыя краіны на карце. Вызначыце асаблівасці сацыялістычнай мадэлі і знешнепалітычнага развіцця кожнай з краін.

**6.** У якіх краінах Усходняй Еўропы адбыліся выступленні грамадзян супраць існуючага рэжыму? Якія агульныя прычыны краху сацыялістычных рэжымаў? Ахарактарызуйце палітычнае развіццё Усходняй Еўропы ў цяперашні час. Выкарыстайце карту.

**7.** Назавіце найбольш выдатных, на ваш погляд, палітычных дзеячаў заходніх краін пасляваеннага перыяду. Свой адказ аргументуйце.

**8.** Растлумачце значэнне паняцця «навукова-тэхнічная рэвалюцыя». Якія напрамкі навукова-тэхнічнай рэвалюцыі былі асноўнымі ў 1950-я — 1960-я гг. і 1980-я — 1990-я гг.? Якія асноўныя дасягненні сучаснай навукі? З якімі праблемамі сутыкнулася чалавецтва ў выніку навукова-тэхнічнага прагрэсу?

**9.** Мастацтва другой паловы XX ст. характарызуецца, з аднаго боку, разнастайнасцю стыляў і жанраў, з другога боку, суіснаваннем двух асноўных кірункаў: развіваючага традыцыйныя рэалістычныя прынцыпы і авангардысцкага. У творчасці многіх дзеячаў мастацтва прасочваюцца абодва кірункі. Чым вы можаце растлумачыць гэтыя факты? Прывядзіце прыклады.

**10.** Растлумачце значэнне паняцця «глабалізацыя». Як працэсы глабалізацыі праяўляюць сябе ў галіне палітыкі, эканомікі, культуры? Абмяркуйце пытанні аб вартасцях і праблемах глабалізацыі.

Адукацыя і выхаванне



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

# Раздзел II

# ГІСТОРЫЯ СССР І РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ

## § 13. СССР у 1945—1953 гг.

**Успомніце:** *Як складваліся ўзаемаадносіны паміж СССР, з аднаго боку, і ЗША і Вялікабрытаніяй, з другога, у гады Другой сусветнай вайны? Што такое «халодная вайна»?*

**Аднаўленне народнай гаспадаркі.** СССР выйшаў з Другой сусветнай вайны звышдзяржавай. Савецкая сфера ўплыву распаўсюдзілася ад Балтыкі да Балкан. Галоўнай задачай, якая стаяла перад краінай у першыя пасляваенныя гады, было аднаўленне разбуранай вайной народнай гаспадаркі. У гады Вялікай Айчыннай вайны СССР панёс велізарныя людскія і матэрыяльныя страты. На франтах вайны, у палоне і на акупіраваных тэрыторыях загінула амаль 27 млн чалавек, уключаючы мірнае насельніцтва. З ліку мужчын першага ваеннага прызыву (1923 г. нараджэння) у жывых засталося толькі 3 %. За гады вайны колькасць насельніцтва краіны значна скарацілася.



*Жыхары Мінска разбіраюць руіны на вуліцах горада. 1944 г.*



АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Незлічонымі былі матэрыяльныя страты. У руінах ляжала 1700 гарадоў, больш за 70 тыс. сёл і вёсак. Засталіся без прытулку больш за 25 млн чалавек. Былі разбураны амаль 32 тыс. прамысловых прадпрыемстваў, якія напярэдадні вайны давалі 70 % усёй вытворчасці сталі і 60 % вугля. Падчас вайны са строю выведзены 65 тыс. км чыгуначных шляхоў. З акупіраваных тэрыторый нямецкімі ўладамі было выведзена 17 млн галоў буйной рагатай жывёлы. Прадукцыя сельскай гаспадаркі ў 1945 г. складала каля 60 % ад даваеннага ўзроўню.

Цяжкасці аднаўлення народнай гаспадаркі ўзмацняліся засухай 1946 г., якая прывяла да голаду і людскіх страт у асобных рэгіёнах еўрапейскай часткі СССР. У гэты ж час, ва ўмовах нарастання «халоднай вайны», нядаўнія саюзнікі па антыгітлераўскай кааліцыі перасталі пастаўляць у СССР сыравіну, тэхніку і прамысловае абсталяванне. Савецкаму народу прыходзілася разлічваць толькі на свае сілы.

На Захадзе прадказвалі, што СССР спатрэбіцца не менш за 25 гадоў, каб аднавіць разбураную вайной эканоміку і дасягнуць даваеннага ўзроўню. Аднак з гэтай задачай удалося справіцца значна хутчэй. Коштам велізарных намаганняў былі адноўлены старыя і сталі ў строй новыя магутныя прамысловыя прадпрыемствы. Як і ў 1930-я гг., асноўная ўвага надавалася развіццю сталеліцейнай, вугальнай прамысловасці і цяжкага машынабудавання, а таксама навукі, тэхналогій і ўзбраенняў.

Працай савецкіх людзей у кароткія тэрміны былі падняты з руін Днепрагэс, шахты Данбаса, уведзены машынабудаўнічыя гіганты на Урале, адбудаваны металургічныя заводы «Запарожсталь», «Азоўсталь», трактарныя заводы ў Сталінградзе і Мінску, уведзены ў строй Куйбышаўская ГЭС, Нарыльскі металургічны камбінат і інш. Усяго за гады **чацвёртай пяцігодкі (1946 — 1950)** былі адноўлены і нанава пабудаваны 6200 буйных прадпрыемстваў. Па афіцыйных даных, узровень прамысловай вытворчасці ў 1950 г., уключаючы рэпарацыі і прадук-



*Першы савецкі аўтобус ЗІС-154. 1946 г.*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

цыю сумесных савецка-ўсходнегерманскіх прадпрыемстваў, перавысіў даваенныя паказчыкі на 73 %.

Адраджэнне народнай гаспадаркі шло камандна-адміністрацыйнымі метадамі і ў многім адбывалася за кошт аграрнага сектара. Сродкі з сельскай гаспадаркі ў прамысловасць паступалі шляхам неэквівалентнага абмену паміж горадам і вёскай. Цэны на прамысловую прадукцыю штучна завышаліся, а дзяржаўныя закупачныя цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю штучна заніжаліся і мелі сімвалічны характар. Шырока прымяняліся метады масавай мабілізацыі працоўнай сілы — праца ваеннапалонных і зняволеных.

Побыт савецкіх людзей у першыя пасляваенныя гады мала адрозніваўся ад побыту ў ваенны час: пастаянны недахоп прадуктаў, цяжкія ўмовы працы, высокі ўзровень захворванняў і смяротнасці. Многія рабочыя і сялянскія сем'і жылі ў зямлянках і бараках. Калгаснікі амаль нічога не атрымлівалі за работу ў калгасе, жылі ў асноўным за кошт падсобнай гаспадаркі і прысядзібных участкаў. Пры гэтым кожная сялянская гаспадарка абкладалася падаткам. За карыстанне зямельным участкам сяляне абавязаны былі здаваць дзяржаве мяса, малако, яйкі, воўну. Калгаснікі не маглі свабодна перамяшчацца, бо не мелі пашпартоў, ім не плацілі пенсіі па ўзросце. Памеры іх прысядзібных гаспадарак і агародаў скарачаліся. У пачатку 1950-х гг. з дапамогай прымусовых мер і цаной напружанай працы мільёнаў сялян сельская гаспадарка краіны выйшла на даваенны ўзровень.

У снежні 1947 г. была прынята пастанова Савета і ЦК ВКП(б) аб правядзенні грашовай рэформы і адмене картачнай сістэмы. Гэтыя меры адыгралі станоўчую ролю ў развіцці эканомікі СССР. Аднак пагроза ядзернай вайны і гонка ўзбраенняў аказвала адмоўны ўплыў на развіццё народнай гаспадаркі. Па прычыне моцнай мілітарызацыі эканомікі ў краіне недастаткова выраблялася тавараў народнага спажывання. Падтрымліваць высокія тэмпы развіцця можна было толькі за кошт няўхільнага вычарпання ўсіх унутраных рэсурсаў.

**Палітычнае развіццё краіны.** У галіне ўнутранай палітыкі савецкае кіраўніцтва вымушана было лічыцца з тым уплывам, які аказала Вялікая Айчынная вайна на настрой думак і пачуцці савецкіх людзей. Многія з іх пабывалі за мяжой, пабачылі



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

іншы свет. У савецкага народа з’явілася годнасць народа-пераможцы.

У пасляваенны перыяд зменшыліся маштабы рэпрэсій у адносінах да простых грамадзян, людзі сталі больш свабодна выказвацца. У першыя гады пасля Вялікай Айчыннай вайны (да 1948 г.) праводзілася палітыка частковага адраджэння рэлігійнага жыцця ў краіне, якая пачалася яшчэ ў гады вайны. У 1947 г. было адменена смяротнае пакаранне. Аднак праз тры гады яно зноў пачало прымяняцца. У краіне вызначыўся паступовы адыход ад прынцыпаў дыктатуры пралетарыяту. Найбольш яскрава гэты працэс праявіўся ў адмаўленні ад грамадска-палітычных тэрмінаў, уведзеных бальшавікамі, і вяртання да агульнапрынятых у сусветнай практыцы. І. В. Сталін лічыў, што пасля перамогі ў вайне завяршыўся пераходны стан савецкага грамадства і таму неабходна адмовіцца ад такіх азначэнняў, як «народны камісар» ці «камісарыят». У *1946 г.* Савет народных камісараў СССР быў пераўтвораны ў **Савет Міністраў.** На XIX з’ездзе Усесаюзнай камуністычнай партыі (бальшавікоў), які адбыўся ў *1952 г.*, была зменена назва партыі. Цяпер яна стала называцца **Камуністычная партыя Савецкага Саюза (КПСС),** ужо без спасылкі на бальшавізм. У краіне рэгулярна пачалі праводзіцца выбары ў Вярхоўныя Саветы СССР і саюзных рэспублік, якім па Канстытуцыі СССР 1936 г. належала ўся ўлада ў краіне. У сапраўднасці ўсё грамадска-палітычнае жыццё па-ранейшаму строга кантралявалася партыйнымі органамі.



*І. В. Сталін выступае на XIX з’ездзе ВКП(б). 1952 г.*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

У гэты ж час І. В. Сталін наблізіў да сябе прагматычна думаючых палітычных дзеячаў Л. П. Берыя і Г. М. Малянкова, якія не былі перакананымі марксістамі і бачылі неабходнасць эканамічнай мадэрнізацыі краіны. Савецкі лідар сур'ёзна разглядаў пытанне аб паступовым вызваленні партыі ад непасрэднага гаспадарчага кіравання. Пасада Генеральнага сакратара Цэнтральнага Камітэта КПСС была ліквідавана. Фактычна вышэйшай пасадай у Савецкім Саюзе стала пасада Старшыні Савета Міністраў СССР. Яе заняў сам І. В. Сталін.

**Палітычныя рэпрэсіі.** Пасля 1945 г. у краіне паступова аднавіліся палітычныя рэпрэсіі. У маладаступных рэгіёнах краіны (Пячора, Салехард, Экібастуз, Варкута, Нарыльск і інш.) былі створаны спецыяльныя лагеры для асуджаных за антысавецкую дзейнасць і «контррэвалюцыйныя акты». У другой палове 1940-х гг. рэпрэсіі не мелі такога масавага характару, як гэта было ў 1930-я гг., а тычыліся асобных груп насельніцтва, у першую чаргу, кіруючага апарату і часткі інтэлігенцыі. У 1948 г. пачалося ўзмацненне кантролю за дзейнасцю рэлігійных арганізацый. Прайшлі рэпрэсіі супраць асобных актыўных епіскапаў, узмацнілася ўмяшанне дзяржавы ў кадравую палітыку Рускай Праваслаўнай Царквы (РПЦ). З гэтага часу і да смерці І. В. Сталіна ў краіне не было адкрыта ніводнага храма.

Адным з буйнейшых палітычных працэсаў пасляваеннага часу стала *«Ленінградская справа»*, сфабрыкаваная ў *1949 — 1950 гг.* Асноўнай прычынай гэтай справы быў рост палітычнага ўплыву кіраўніцтва Ленінградскай партыйнай арганізацыі, а таксама далейшая барацьба ўнутры партыйнага апарату. Па «Ленінградскай справе» было арыштавана каля 2 тыс. чалавек. Амаль усе вышэйшыя партыйныя кіраўнікі Ленінграда былі абвінавачаны ў здрадзе Радзіме і намерах пераўтварыць Ленінградскую партыйную арганізацыю ў апору барацьбы супраць ЦК ВКП(б). У выніку былі пакараны смерцю Старшыня Савета Міністраў РСФСР М. І. Радыёнаў, член Палітбюро і Старшыня Дзяржплана СССР М. А. Вазнясенскі, сакратар ЦК ВКП(б) А. А. Кузняцоў і інш.

У канцы 1940-х гг. у краіне пачалася кампанія па барацьбе з «бязродным касмапалітызмам». **Касмапалітызм** з'яўляецца ідэалогіяй так званага сусветнага грамадзянства. Касмапаліты прапаведваюць адмаўленне ад нацыянальных традыцый і культуры, патрыятызму, адмаўляюць дзяржаўны і нацыянальны суверэнітэт.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Ярлык «касмапалітаў» у СССР навешвалі прадстаўнікам інтэлігенцыі, асабліва асобам яўрэйскай нацыянальнасці. Касмапалітам маглі аб'явіць любога чалавека, які цікавіўся заходняй культурай, мастацтвам, жывапісам. У гэты час рэпрэсіям падвергся Яўрэйскі антыфашысцкі камітэт, створаны яшчэ ў гады вайны. Яго лідары пасля заканчэння вайны прапаноўвалі стварыць яўрэйскую аўтаномію ў Крыму ці Паволжы. Абвінавачаныя ў касмапалітызме і нават у змове, яны былі прыгавораны на закрытым судовым пасяджэнні, якое адбылося ў 1952 г., да расстрэлу. І толькі смерць І. В. Сталіна **5 сакавіка 1953 г.** спыніла новыя палітычныя рэпрэсіі.

**Знешняя палітыка.** Перамога ў Другой сусветнай вайне змяніла міжнародны статус Савецкага Саюза. Ён стаў адным з лідараў міжнароднай супольнасці і важнейшым фактарам пасляваеннага сусветнага развіцця. Вырашальны ўклад СССР у Перамогу над нацысцкай Германіяй садзейнічаў росту сімпатый да савецкай краіны на Захадзе.

У адказ на рост уплыву і ўмацаванне пазіцый СССР у свеце ЗША і Вялікабрытанія ўзмацнілі палітыку стрымлівання «савецкай экспансіі». Карыстаючыся ядзернай манаполіяй, ваенна-палітычнае кіраўніцтва ЗША ўжо з 1945 г. распрацоўвала планы нанясення атамных удараў па СССР. Адзін з планаў прадугледжваў знішчэнне 20 буйнейшых савецкіх гарадоў з выкарыстаннем 196 атамных бомб.

Нядаўнія саюзнікі па антыгітлераўскай кааліцыі фактычна апынуліся ў стане неабвешчанай вайны. Таму невыпадкова намаганні савецкага кіраўніцтва былі накіраваны на ўмацаванне ваеннай магутнасці краіны і хуткую ліквідацыю ядзернай манаполіі ЗША. Першае выпрабаванне СССР ядзернай зброі ў **1949 г.** стала важным стрымліваючым фактарам у развіцці савецка-амерыканскіх адносін.


*Выпрабаванне першай савецкай атамнай бомбы. 1949 г.*

У ацэнцы міжнароднага становішча савецкае кіраўніцтва зыходзіла з ідэі непрымірымасці супярэчнасцей паміж сацыялізмам і капіталізмам. Але ўжо ў канцы жыцця І. В. Сталін крыху змяніў сваю пазіцыю ў гэтым пытанні і лічыў магчымым суіснаванне дзвюх сістэм. У перыяд Карэйскай вайны ён зразу-


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

меў неабходнасць спынення баявых дзеянняў, што садзейнічала пачатку мірных перагавораў у 1951 г. Кіраўнікі вялікіх дзяржаў разумелі, што ад жорсткай знешняй палітыкі не выйграе ніхто, бо «халодная вайна» можа перарасці ў «гарачую».

**Пытанні і заданні:**

1. Ахарактарызуйце сацыяльна-эканамічнае становішча СССР пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны. Якія праблемы ўзніклі перад Савецкім Саюзам пасля заканчэння вайны?
2. Колькі часу спатрэбілася СССР для таго, каб аднавіць разбураную вайной эканоміку? Якія фактары гэтаму спрыялі? Ахарактарызуйце вынікі аднаўленчага перыяду.
3. Якія змены адбыліся ва ўнутранай палітыцы савецкага кіраўніцтва?
4. Чым былі выкліканы рэпрэсіі пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны? Якія сацыяльныя групы насельніцтва галоўным чынам падвергліся рэпрэсіям?
5. Растлумачце значэнне паняцця «касмапалітызм». Чаму пасля вайны пачалася барацьба з касмапалітызмам?
6. Ахарактарызуйце міжнароднае становішча СССР пасля заканчэння Другой сусветнай вайны. Якія фактары аказвалі ўплыў на ажыццяўленне знешняй палітыкі СССР? Якія задачы ў галіне знешняй палітыкі савецкае кіраўніцтва лічыла прыярытэтнымі?

**Прапануем абмеркаваць.** Агульны стан савецкага грамадства ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе можна ахарактарызаваць словамі: надзея і расчараванне. Што выклікала ў савецкіх людзей надзею, а што расчараванне?

**Гістарычны дакумент**

**З пісьма членаў праўлення калгаса «Кызыл Маяк» Горна-Алтайскай аўтаномнай вобласці**

*13 верасня 1948 г.*

Мы звяртаемся да Вас з просьбай растлумачыць, у чым прычына, што тут у нас з году ў год увесь ураджай прыходзіцца здаваць... Мы разумеем, што ў перыяд вайны патрабавалася для забеспячэння арміі больш хлеба... 1945 — 1946 — 1947 гг. — неўраджай — таксама здалі ўсё, каб як мага



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

хутчэй аднавіць народную гаспадарку. 1948 г. — мы спадзяваліся, што ў бягучым годзе, выканаўшы дзяржаўны план хлебаздачы, зможам размеркаваць на працадні прыкладна па аднаму кілаграму. Цяпер мы дзяржаўны план выканалі датэрмінова на 200 %... Але, нягледзячы на гэта, абкам ВКП(б) і райкам давялі нам і ўсім калгасам цвёрдае заданне на звышпланавую здачу, якое перавышала ў некалькі разоў дзяржаўныя планы, такім чынам на працадні размяркоўваць няма чаго, і нават насення не хопіць засыпаць цалкам, каб пасеяць у 1949 г.

Калгаснікі… жывуць у надзвычай цяжкіх умовах… працуем суткамі круглы год, але на працадні абсалютна нічога не атрымліваем, хлеба не бачым, жывём на бульбе, а вясной заканчваецца і бульба — пераходзім на траву…

*Якія метады кіравання сельскай гаспадаркай выкарыстоўваліся ў СССР? Які быў узровень жыцця калгаснікаў? Якія наступствы для развіцця сельскай гаспадаркі мела такая палітыка?*

## § 14. СССР у 1953 — 1964 гг.

**Успомніце:** *Якія былі прыярытэты эканамічнага развіцця СССР у 1945 — 1953 гг.? У чым заключаліся асаблівасці палітычных рэпрэсій у краіне ў другой палове 1940-х — пачатку 1950-х гг.?*

**Барацьба за ўладу ў 1953 — 1957 гг.** Пасля смерці І. В. Сталіна ў 1953 г. паміж яго паплечнікамі разгарнулася жорсткая барацьба за ўладу. Партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва ўзначалілі *Г. М. Маленкоў* і *Л. П. Берыя*. Г. Маленкоў быў прызначаны афіцыйным пераемнікам І. В. Сталіна на пасадзе Старшыні Савета Міністраў СССР, а Л. П. Берыя — яго намеснікам і адначасова міністрам унутраных спраў і міністрам дзяржбяспекі.

Абодва лідары выступалі за перадачу ўладных паўнамоцтваў ад партыйных да дзяржаўных структур. Былі спынены ўсе палітычныя працэсы, праведзена ўсеагульная амністыя. Л. П. Берыя лічыў, што нельга ўжо па-ранейшаму эксплуатаваць сялянства, і выступаў за спыненне «халоднай вайны». Аднак у кіраўніцтве партыі пачала складвацца змова супраць Л. П. Берыя на чале з сакратаром ЦК КПСС **М. С. Хрушчовым**. У выніку ў чэрвені 1953 г. Л. П. Берыя быў арыштаваны і неўзабаве расстраляны як «вораг народа» і «замежны шпіён».


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Пасля ліквідацыі Л. П. Берыя на вяршыне ўлады апынуліся Г. М. Маленкоў і М. С. Хрушчоў. У краіне была адноўлена пасада адзінаасобнага кіраўніка партыі. Першым сакратаром Цэнтральнага камітэта КПСС стаў М. С. Хрушчоў, які імкнуўся пераўтварыць гэтую ў цэлым тэхнічную пасаду ў асноўны цэнтр улады. Пасада кіраўніка ўрада, якая з'яўлялася галоўнай пасадай у СССР у 1939—1953 гг., страчвала сваё значэнне. У краіне ўзрастала роля партыйнага апарату. У лютым 1955 г. М. С. Хрушчову ўдалося зняць Г. М. Маленкова з пасады кіраўніка ўрада і правесці на яго месца свайго прыхільніка *М. А. Булганіна*.

У далейшым М. С. Хрушчову давялося весці барацьбу за ўладу з «антыпартыйнай групай Молатава, Маленкова, Кагановіча». Летам 1957 г. Прэзідыум ЦК КПСС, які кантраляваўся гэтай групай, прыняў рашэнне аб скасаванні пасады Першага сакратара ЦК і прызначэння М. С. Хрушчова міністрам сельскай гаспадаркі. У адказ на гэта М. С. Хрушчоў патрабаваў разгледзіць гэтае пытанне на пленуме ЦК КПСС, дзе яго прыхільнікі складалі пераважную большасць. Пленум абвясціў Г. М. Маленкова, Л. М. Кагановіча, В. М. Молатава «антыпартыйнай групай» і адправіў іх у адстаўку.

## Гістарычны партрэт



**Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў** (1894—1971) — савецкі дзяржаўны і партыйны дзеяч. Член партыі бальшавікоў з 1918 г. Удзельнік Грамадзянскай вайны. У даваенны перыяд прайшоў шлях ад сакратара партыйнай ячэйкі рабфака да Першага сакратара ЦК КП(б) Украіны. У час Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся ў дзеючай арміі, удзельнічаў у абароне Сталінграда. У 1953 г. стаў Першым сакратаром ЦК КПСС, з 1958 г. адначасова ўзначаліў Савет Міністраў СССР. Адзін з ініцыятараў лібералізацыі ва ўнутранай і знешняй палітыцы, рэабілітацыі ахвяр рэпрэсій; зрабіў спробу мадэрнізаваць партыйна-дзяржаўную сістэму, палепшыць матэрыяльнае становішча і ўмовы жыцця насельніцтва. На XX (1956) і XXII (1961) з'ездах КПСС выступіў з рэзкай крытыкай культу асобы Сталіна. Аднак яго пераўтварэнні былі непаслядоўнымі і мелі суб'ектыўны характар. Незадаволенасць дзяржаўнага і партыйнага апарату прывяла да зняцця Хрушчова ў 1964 г. з усіх пасад, якія ён займаў.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Зыход унутрыпалітычнай барацьбы ў многім быў прадвызначаны арміяй, якая на чале з маршалам Г. К. Жукавым падтрымала М. С. Хрушчова. Але ўжо ў кастрычніку 1957 г. Жукаў быў пазбаўлены сваіх пасад — члена Прэзідыума ЦК і міністра абароны СССР. Партыйныя вярхі апасаліся ўзрослага ўплыву знакамітага палкаводца ў палітычным жыцці краіны.

У сакавіку 1958 г. М. С. Хрушчоў заняў пасаду Старшыні Савета Міністраў СССР замест М. А. Булганіна, які падтрымаў антыпартыйную групу летам 1957 г. Адначасова ён захаваў за сабой пасаду Першага сакратара ЦК КПСС. Гэтыя падзеі сведчылі пра канчатковае зацвярджэнне М. С. Хрушчова на чале партыі і дзяржавы. Амерыканскі часопіс «Тайм» назваў М. С. Хрушчова «чалавекам 1957 года».

**Рэформы М. С. Хрушчова.** У перыяд знаходжання ва ўладзе М. С. Хрушчова былі ажыццёўлены важныя палітычныя і эканамічныя рэформы.

На **XX з’ездзе КПСС,** які праходзіў у **лютым 1956 г.,** М. С. Хрушчоў зрабіў даклад, у якім выкрываўся культ асобы Сталіна. На І. В. Сталіна ўскладалася ўся адказнасць за рэпрэсіі 1930-х — пачатку 1950-х гг.

Пасля з’езда па ўсёй краіне пачаўся дэмантаж помнікаў І. В. Сталіну, перайменаванне вуліц і гарадоў, якія насілі яго імя. Без ранейшага размаху стаў адзначацца Дзень Перамогі. Савецкая прапаганда імкнулася наогул выкрасліць імя Сталіна з гісторыі.

У краіне спыніліся палітычныя рэпрэсіі, унутры партыі пачалі складвацца больш дэмакратычныя адносіны. Былі прыняты абноўленыя Асновы крымінальнага заканадаўства, якія адмянялі паняцце «вораг народа», павышалі ўзрост наступлення крымінальнай адказнасці з 14 да 16 гадоў, забаранялі атрыманне прызнання падчас следства шляхам пагроз і насілля. У 1956—1961 гг. было **рэабілітавана** каля 700 тыс. чалавек, у тым ліку шэраг вядомых ваенных і партыйных дзеячаў. Гэта азначала не толькі іх вызваленне, але і аднаўленне ў правах, вяртанне добрага імя.

**XXII з’езд КПСС,** які адбыўся ў **кастрычніку 1961 г.,** зноў асудзіў культ асобы Сталіна. На з’ездзе была прынята новая *Праграма партыі,* у якой абвяшчаўся курс на пабудову камунізму ў СССР. Стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму меркавалася завяршыць да 1980 г., што было нерэальным і ўтапічным рашэннем.


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



*Адна з першых «хрушчовак» у Маскве. 1950-я гг.*

**Эканоміка СССР у 1953—1964 гг.** Значныя змены адбываліся ў эканоміцы. Яшчэ ў жніўні 1953 г. Г. М. Малянкоў ставіў пытанне аб уздыме вытворчасці харчавання і тавараў народнага спажывання. Такая канцэпцыя эканамічнага развіцця СССР пачала рэалізоўвацца пасля прыходу да ўлады М. С. Хрушчова. У гады **сямігодкі (1959—1965)** ішло актыўнае будаўніцтва шматлікіх прадпрыемстваў лёгкай і харчовай прамысловасці, таннага і практычнага жылля. Станоўчыя вынікі гэтага курсу хутка праявіліся. Якасна змяніўся ўзровень жыцця савецкіх людзей. Яны пачалі набываць тэлевізары, халадзільнікі, радыёпрыёмнікі, больш якаснае адзенне. Многія працоўныя пераехалі з камунальных кватэр і баракаў у асобныя кватэры.

| Галіны вытворчасці | 1954 г. | 1965 г. |
|---|---|---|
| Вытворчасць электраэнергіі (млрд кВт/г) | 150,6 | 507,7 |
| Здабыча нафты (млн т) | 52,7 | 347,3 |
| Выплаўка сталі (млн т) | 41,4 | 91,0 |
| Здабыча вугля (млн т) | 347,1 | 577,7 |

Важныя змены адбыліся ў сельскай гаспадарцы. Значна ўзраслі дзяржаўныя закупачныя цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю. Так, у верасні 1953 г. на малако яны павысіліся ўдвая,



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"




*Плакат, прысвечаны асваенню цаліны. 1950-я гг.*

на жывёлу і птушку — у 5 разоў. Машынна-трактарныя станцыі былі рэарганізаваны ў рамонтна-тэхнічныя станцыі. Цяпер тэхніка непасрэдна перадавалася ў распараджэнне калектыўных гаспадарак, праўда, за выкуп па высокай цане. Уводзілася грашовая аплата працы калгаснікаў замест аплаты па працаднях, што існавала раней. Калгаснікі пачалі больш зарабляць. У гэты перыяд адмяняецца падатак на асабістую падсобную гаспадарку, з 1964 г. уводзяцца пенсіі для калгаснікаў, ім сталі выдаваць пашпарты. Прырост сельскагаспадарчай прадукцыі ў 1953 — 1958 гг. склаў 34 % у параўнанні з папярэдняй пяцігодкай.

У 1954 г. быў узяты курс на асваенне **цаліны** — урадлівых неапрацаваных зямель Казахстана і іншых рэгіёнаў краіны. У 1947 — 1955 гг. у СССР было вырашчана 727 млн т збожжавых. За такі ж дзевяцігадовы перыяд з 1956 г., калі быў зняты першы ўраджай на цалінных землях, па 1964 г. было вырашчана 1138 млн т. У краіне ў дастатку з'явіўся танны хлеб, і масавы голад назаўсёды адышоў у мінулае. Ударная праграма па асваенню цаліны многімі крытыкавалася, але на справе яна дазволіла хуткімі тэмпамі павялічыць вытворчасць збожжа і гарантаваць харчовую бяспеку краіны. Да канца 1950-х гг. на цалінных землях вырошчвалася амаль 40 % збожжавых у СССР.

З канца 1950-х гг. зноў узмацніліся метады адміністрацыйнага прымусу, пачалося наступленне на падсобную гаспадарку. Дзяржаўным органам было даручана на працягу 2 — 3 гадоў скупіць жывёлу ў працаўнікоў саўгасаў, а затым і членаў калгасаў. Гэта непрадуманая мера прывяла да абвастрэння харчовай праблемы. Надзеі вырашыць яе з дапамогай павелічэння пасеваў пад кукурузу не апраўдаліся, бо з-за скарачэння пасеваў пшаніцы і жыта адбылося агульнае зніжэнне збору збожжавых. Сітуацыю ўскладнілі таксама неўраджаі на цалінных землях у 1962 — 1963 гг. Аб крызісу сельскай гаспадаркі сведчылі і першыя за доўгія гады масавыя закупкі збожжа за мяжой. Рост цэн на харчовыя тавары выклікаў масавае незадавальненне людзей. Аўтарытэт улады ў насельніцтва краіны пачаў падаць.


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Важным вынікам развіцця савецкай дзяржавы быў магутны тэхналагічны прарыў. СССР першым у свеце пабудаваў атамную электрастанцыю, спусціў на ваду атамны ледакол «Ленін», запусціў у космас штучны спадарожнік Зямлі. **12 красавіка 1961 г.** адбыўся першы ў свеце палёт чалавека ў космас. Штурм космаса стаў своеасаблівым сімвалам савецкага навукова-тэхнічнага прагрэсу.



*Першы савецкі касманаўт Ю. А. Гагарын і вучоны-канструктар С. П. Каралёў. 1962 г.*

**Навукова-тэхнічная рэвалюцыя ў СССР**

| | |
|---|---|
| 1954 г. | Пачала працу першая ў свеце атамная электрастанцыя ў Обнінску. |
| 1955 г. | У паветра padняўся першы рэактыўны пасажырскі самалёт Ту-104. |
| 1956 г. | Адкрыты інстытут ядзерных даследаванняў у Дубне. |
| 4 кастрычніка 1957 г. | Запушчаны першы штучны спадарожнік Зямлі. |
| 1959 г. | Савецкая аўтаматычная станцыя дасягнула Месяца. |
| 1959 г. | Спушчаны на ваду першы ў свеце атамны ледакол «Ленін». |
| 12 красавіка 1961 г. | Ю. А. Гагарын стаў першым чалавекам, які здзейсніў касмічны палёт. |
| 6 — 7 жніўня 1961 г. | Савецкі касманаўт Г. С. Цітоў ажыццявіў другі арбітальны палёт на касмічным караблі «Усход-2». |
| 1962 г. | Праведзены першы групавы касмічны палёт А. Р. Ніканаева і П. Р. Паповіча. |
| 1963 г. | В. У. Церашкова — першая жанчына ў свеце, якая ажыццявіла палёт у космас. |



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ




*Першая ў свеце жанчына-касманаўт В. У. Церашкова.*

Разам з эканамічнымі пераўтварэннямі адбыліся змены ў духоўным жыцці краіны, якія атрымалі назву **«адліга»**. Знікла пачуццё страха, такое характэрнае для сталінскай эпохі, сталі выконвацца асноўныя правы і свабоды, у друку з'явіліся смелыя публікацыі аб надзённых праблемах жыцця краіны.

Нягледзячы на ўсе гэтыя дасягненні, М. С. Хрушчовым было дапушчана нямала сур'ёзных памылак. Для стылю яго кіраўніцтва былі характэрны валюнтарызм у прыняцці рашэнняў, непаслядоўнасць дзеянняў, пастаянныя перастаноўкі кадраў, якія выклікалі незадавальненне ў вярхоў партыйнага апарату. У выніку ўпершыню ў гісторыі СССР кіраўнік такога рангу, як М. С. Хрушчоў, быў зняты ў **кастрычніку 1964 г.** з усіх пасад, якія займаў.

**Антырэлігійная кампанія 1958—1964 гг.** У перыяд кіравання М. С. Хрушчова наступіла значнае ахаладжэнне адносін паміж дзяржавай і рэлігійнымі арганізацыямі. Актывізацыя барацьбы супраць рэлігіі, асабліва супраць РПЦ, пачалася пасля XX з'езда КПСС. Савецкае кіраўніцтва паставіла сваёй мэтай у кароткі тэрмін вырашыць рэлігійную праблему. Сакрэтная пастанова ЦК КПСС ад 4 кастрычніка 1958 г. абавязвала партыйныя, камсамольскія і грамадскія арганізацыі разгарнуць прапагандысцкае наступленне на «рэлігійныя перажыткі» ў свядомасці людзей. Дзяржаўным установам прадпісвалася ажыццявіць мерапрыемствы, накіраваныя на стварэнне больш жорсткіх умоў існавання рэлігійных абшчын.

З 1959 г. пачалося масавае адміністрацыйнае закрыццё прыходаў і манастыроў. Нягледзячы на супрацьдзеянне веруючых і Патрыярха, была зноў закрыта Кіева-Пячэрская лаўра. З усіх закрытых храмаў у 1958 — 1964 гг. больш за 60 % былі праваслаўныя. Адначасова з гэтым праходзілі арышты царкоўных актывістаў, якія імкнуліся супрацьдзейнічаць антырэлігійнай палітыцы дзяржавы. У 1961 г. М. С. Хрушчоў падчас выступлення па тэлебачанні



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

запэўніў: «Абяцаю, што хутка мы пакажам апошняга папа па тэлебачанні!». «Усесаюзная» кампанія супраць рэлігіі ў такіх маштабах была спынена толькі пасля адхілення М. С. Хрушчова ад улады.

**Знешняя палітыка.** Пасля смерці І. В. Сталіна ў СССР прасочваліся два розныя падыходы да знешняй палітыкі краіны. Міністр замежных спраў В. М. Молатаў выступаў за захаванне жорсткага супрацьстаяння дзвюх грамадска-палітычных сістэм. Г. М. Малянкоў, а затым і М. С. Хрушчоў лічылі, што ў атамнае стагоддзе адзіна магчымай асновай міждзяржаўных адносін можа быць толькі палітыка мірнага суіснавання.

СССР і ЗША пачалі рабіць першыя крокі ў пошуках кампрамісу. У 1958 г. паміж абедзвюма краінамі былі заключаны пагадненні аб супрацоўніцтве ў эканоміцы і культуры, а ў наступным годзе ўпершыню ў гісторыі адбыўся візіт лідара СССР у ЗША. Перагаворы на вышэйшым узроўні не паклалі канец «халоднай вайне». Абедзве краіны імкнуліся да адзінаасобнага дамінавання ў свеце. У пачатку 1960-х гг. адносіны паміж СССР і ЗША пагоршыліся і дасягнулі выбуханебяспечнага стану падчас Карыбскага крызісу 1962 г.

Ва ўмовах супрацьстаяння дзвюх сусветных сістэм СССР усімі спосабамі імкнуўся да ўмацавання сацыялістычнага лагера. Пры гэтым савецкае кіраўніцтва адкрыта ўмешвалася ва ўнутраныя справы ГДР (1953, 1961), Польшчы (1956), Венгрыі (1956).

Ва ўмовах «халоднай вайны» і крызісу каланіяльнай сістэмы савецкае кіраўніцтва стала надаваць асаблівую ўвагу краінам «трэцяга свету» з мэтай распаўсюдзіць на іх уплыў СССР. У 1957 — 1964 гг. былі падпісаны больш за 20 дагавораў аб супрацоўніцтве з краінамі Азіі і Афрыкі. Дынамічнае развіццё адносін СССР з Індыяй, Інданезіяй, Бірмай, Афганістанам, Егіптам выклікала неспакой заходніх краін, якія імкнуліся супрацьстаяць росту савецкага ўплыву ў краінах, якія развіваюцца.

Асаблівы характар мелі адносіны СССР з Кітайскай Народнай Рэспублікай (КНР). Кіраўніцтва КНР адмоўна паставілася да выкрыцця культу асобы Сталіна. Яно прэтэндавала на ролю другога лідара ў міжнародным камуністычным руху. Неўзабаве ідэалагічныя рознагалоссі паміж КПСС і Камуністычнай партыяй Кітая былі перанесены на міждзяржаўныя адносіны.


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Пытанні і заданні:**

1. Якія змены адбыліся ў кіраўніцтве краінай пасля смерці І. В. Сталіна? Якія змены назіраліся ва ўнутранай палітыцы? Чаму новае савецкае кіраўніцтва пачало правядзенне рэформ?
2. Калі адбыўся XX з'езд КПСС? Якое значэнне ў гісторыі Савецкага Саюза меў гэты з'езд?
3. Які перыяд у гісторыі СССР называюць «адлігай»? Чым ён характарызуецца?
4. Ахарактарызуйце эканамічнае развіццё СССР у 1953 — 1964 гг. Што было зроблена ў галіне сацыяльнай палітыкі?
5. Як змяніўся знешнепалітычны курс СССР? Ці азначаў новы курс адмаўленне ад «халоднай вайны»?
6. Дайце ацэнку дзейнасці М. С. Хрушчова. У чым заключалася яе супярэчлівасць?

**Прапануем абмеркаваць.** Калі гаварыць пра аб'ектыўныя вынікі палітыкі М. С. Хрушчова, то ён атрымаў масавую падтрымку насельніцтва. Чаму ж яго адстаўка не выклікала рэзанансу ў савецкім грамадстве?

**Гістарычны дакумент**

**З даклада Першага сакратара ЦК КПСС М. С. Хрушчова XX з'езду КПСС «Аб культе асобы і яго выніках»**

*1956 г.*

У гэтым дакладзе не ставіцца задача даць усебаковую ацэнку жыццю і дзейнасці Сталіна. Пра заслугі Сталіна яшчэ пры яго жыцці напісана дастатковая колькасць кніг, брашур, даследаванняў. Агульнавядома роля Сталіна ў падрыхтоўцы і правядзенні сацыялістычнай рэвалюцыі, у грамадзянскай вайне, у барацьбе за пабудову сацыялізму ў нашай краіне. Гэта ўсім добра вядома. Цяпер размова ідзе пра пытанне, якое мае велізарнае значэнне і для сучаснага і для будучага партыі, — размова ідзе пра тое, як паступова складваўся культ асобы Сталіна, які ператварыўся на пэўным этапе ў крыніцу цэлага шэрага буйнейшых і даволі цяжкіх скажэнняў партыйных прынцыпаў, партыйнай дэмакратыі, рэвалюцыйнай законнасці.

*Якую мэту праследаваў М. С. Хрушчоў, калі выступіў з дакладам на XX з'ездзе КПСС? Ці значыла гэтае выступленне змену курсу партыі і дзяржавы?*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

# § 15. СССР У СЯРЭДЗІНЕ 1960-х — ПАЧАТКУ 1980-х гг.

**Успомніце:** *Якія з'явы ў развіцці эканомікі СССР сведчылі пра неабходнасць правядзення рэформ? Якія прычыны прывялі да адхілення ад улады М. С. Хрушчова? Чым характарызавалася знешняя палітыка Савецкага Саюза ў 1953 — 1964 гг.?*

**Эпоха «развітога сацыялізму» (1964 — 1985).** Пасля адхілення М. С. Хрушчова лідарам СССР стаў **Л. І. Брэжнеў,** які знаходзіўся ва ўладзе да сваёй смерці ў 1982 г. Гэты перыяд характарызаваўся максімальнай палітычнай і эканамічнай стабільнасцю за гады савецкай улады. У гэтыя гады быў дасягнуты самы высокі ў гісторыі СССР узровень матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва. У той жа час, менавіта ў брэжнеўскі перыяд, былі закладзены непасрэдныя перадумовы, якія прывялі да распаду СССР.

Найбольш паспяховымі для СССР былі 1964 — 1977 гг. У **1965 г.** пачала праводзіцца эканамічная рэформа. Яе ініцыятарам стаў старшыня Савета Міністраў СССР **А. М. Касыгін.** Мэтай рэформы была замена адміністрацыйных метадаў кіравання новымі, эканамічнымі метадамі.

Асноўныя рэформы ў сельскай гаспадарцы былі накіраваны на павелічэнне фінансавых выдаткаў, развіццё матэрыяльнай і сацыяльнай базы вёскі, павышэнне закупачных цэн на сельскагаспадарчыя прадукты, увядзенне надбавак да цэн на звышпланавую прадукцыю, увядзенне гарантаванай аплаты працы калгаснікаў, адмену абмежаванняў на вядзенне асабістай падсобнай гаспадаркі.

Першыя вынікі рэфармавання сельскай гаспадаркі былі станоўчымі. Рэзка ажывілася сельскагаспадарчая вытворчасць і, адпаведна, павялічыліся пастаўкі сельгаспрадукцыі ў гарады. На вёсцы хуткімі тэмпамі пачалі будаваць жыллё і аб'екты сацыяльна-культурнага прызначэння. Аднак прыкладзеныя намаганні былі недастатковымі. Да пачатку 1980-х гг. сельская гаспадарка апынулася ў крызісным стане. У 1980 г. закупкі сельгаспрадукцыі, рыбы і рыбапрадуктаў за мяжой выраслі больш чым у 10 разоў у параўнанні з 1965 г.

У адпаведнасці з рэформай 1965 г. у прамысловасці меркавалася змяніць умовы планавання і ўзмацніць эканамічнае стымуляванне. Колькасць плануемых паказчыкаў скарачалася да мінімуму



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

(пры захаванні жорсткіх нарматываў па аб’ёму прадукцыі). Дзейнасць прадпрыемства павінна была ацэньвацца не па валавых паказчыках выпрацаванай прадукцыі, а па яе рэалізацыі. Прадпрыемствам дазвалялася пакідаць у сваім распараджэнні частку прыбыткаў для эканамічнага стымулявання вытворцаў. Гэтыя прыбыткі дзяліліся на фонд матэрыяльнага заахвочвання, фонд сацыяльна-культурнага і побытавага развіцця (будаўніцтва жылля, пансіянатаў, клубаў і г.д.) і фонд самафінансавання вытворчасці. Такім чынам, рэформа прадугледжвала ўмацаванне гаспадарчага разліку і павышэнне самастойнасці прадпрыемстваў, захаванне ў іх распараджэнні большай долі прыбытку.

У цэлым рэформа дала немалы эканамічны вынік. Аб’ём прамысловай вытворчасці за гады **восьмай пяцігодкі (1966 — 1970)** узрос у паўтары разы. У краіне было пабудавана каля 1900 буйных прадпрыемстваў. Але да канца 1960-х гг. рэформу давялося згарнуць, як толькі стала зразумела, што планавую эканоміку не ўдаецца спалучыць з асобнымі рысамі рыначных адносін.

**Сярэднегадавыя тэмпы росту асноўных паказчыкаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР у 1966—1985 гг. (у %)**

| Паказчыкі | 1966 — 1970 гг. | 1971 — 1975 гг. | 1976 — 1980 гг. | 1981 — 1985 гг. |
|---|---|---|---|---|
| Прырост нацыянальнага прадукту | 7,2 | 5,1 | 3,8 | 3,1 |
| Вытворчасць прамысловай прадукцыі | 8,5 | 7,4 | 4,4 | 3,4 |
| Вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі | 3,9 | 2,5 | 1,7 | 1,1 |
| Прадукцыйнасць грамадскай працы | 6,8 | 4,5 | 3,3 | 3,1 |
| Рэальныя даходы на душу насельніцтва | 5,9 | 4,4 | 3,4 | 2,1 |


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## Гістарычны партрэт



**Леанід Ільіч Брэжнеў** (1906 — 1982) — савецкі дзяржаўны і палітычны дзеяч. У гады Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся на палітрабоце ў дзеючай арміі. Пасля вайны — на партыйнай рабоце. Кіраваў асваеннем цалінных зямель. Адзін з асноўных арганізатараў адхілення М. С. Хрушчова ў 1964 г. У 1964 г. быў абраны на пасаду першага, з 1966 г. Генеральнага сакратара ЦК КПСС, старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР у 1960 — 1964 гг., 1977 — 1982 гг. У перыяд знаходжання на пасадзе Генеральнага сакратара ў краіне перамаглі кансерватыўныя тэндэнцыі, нарасталі негатыўныя працэсы ў эканоміцы, сацыяльнай і духоўнай сферах жыцця грамадства, была ажыццёўлена інтэрвенцыя ў Чэхаславакію (1968), уведзены савецкія войскі ў Афганістан (1979).

Дзяржава зноў перайшла да жорсткай адміністрацыйна-каманднай сістэмы і знайшла новы выхад са становішча. Сітуацыя была палепшана не з дапамогай рэформ, а шляхам выкарыстання прыродных рэсурсаў. У 1970-я гг. павялічыўся продаж нафты і газу за мяжу. Такая палітыка першапачаткова дапамагала актывізаваць эканоміку і паляпшаць жыццё людзей. Але пасля падзення сусветных цэн на нафту і газ у пачатку 1980-х гг. савецкая дзяржава не змагла падтрымліваць тэмпы эканамічнага развіцця, як у папярэдняе дзесяцігоддзе. Эканоміка, якая прывыкла да «нафтадолараў», уступіла ў паласу глыбокага крызісу. Пачаўся татальны дэфіцыт неабходных тавараў і недахоп харчавання. Сітуацыя пагаршалася гонкай узбраенняў, якая прадаўжалася і патрабавала велізарных фінансавых выдаткаў.




*Савецкі аўтамабіль «Жыгулі». 1970-я гг.*

Адміністрацыйна-камандная сістэма апынулася не ў стане задаволіць элементарныя эканамічныя патрэбы краіны. У гэты ж час намецілася адставанне СССР ад развітых краін Захаду, у якіх адбыліся тэхналагічная і інфармацыйная рэвалюцыі, пачалася камп'ютарызацыя



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"




*Савецкі Саюз у 1945 — 1985 гг.*

і ўсё сталі вырашаць высокія тэхналогіі ў адрозненне ад 1930-х гг., калі такая роля належала цяжкай прамысловасці.

**Грамадска-палітычнае жыццё.** Перыяд кіравання Л. І. Брэжнева характарызуецца паступовым адыходам ад канцэпцыі пабудовы камунізму як непасрэднай практычнай задачы. На змену гэтай утапічнай устаноўцы прыйшла ідэя аб пабудове ў СССР развітога сацыялістычнага грамадства, якая з часам афармілася ў *канцэпцыю «развітога сацыялізму»*. Канцэпцыя ўтрымлівала наступныя палажэнні: наяўнасць поўнай, хоць і адноснай, аднароднасці савецкага грамадства, узнікненне новай сацыяльнай супольнасці — савецкі народ, канчатковае вырашэнне нацыянальнага пытання, адсутнасць унутры савецкага грамадства рэальных супярэчнасцей, абвастрэнне



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



*Цырымонія закрыцця XXII Алімпійскіх гульняў. Масква, 1980 г.*

ідэалагічнай барацьбы паміж сацыялізмам і капіталізмам. Канцэпцыя прадугледжвала бесканфліктнае развіццё грамадства. Перспектыва пабудовы камунізму адсоўвалася ў нявызначаную будучыню.

Важнейшыя палажэнні канцэпцыі «развітога сацыялізму» былі адлюстраваны ў **Канстытуцыі 1977 г.**, якая стала чацвёртай за гады савецкай улады. У параўнанні з Канстытуцыяй 1936 г. да сацыяльна-эканамічных правоў савецкіх грамадзян дадаліся і новыя: на працу, бясплатную адукацыю, медыцынскую дапамогу, адпачынак, пенсійнае забеспячэнне, жыллё.

Аднак жыццё савецкіх людзей у многім было далёкім ад таго, якое прадугледжвалася ў адпаведнасці з канцэпцыяй «развітога сацыялізму». Асабліва негатыўнае ўражанне рабіла ўвядзенне ў рэгіёнах картачнага размеркавання прадуктаў. Невыпадкова новы лідар партыі і дзяржавы Ю. У. Андропаў выступіў у 1982 г. з ідэяй «удасканалення развітога сацыялізму» на працягу значнага гістарычнага перыяду.

У пачатку 1970-х гг. узмацніўся ідэалагічны кантроль за сродкамі масавай інфармацыі, установамі адукацыі і культуры. Стала больш заўважнай, у параўнанні з перыядам кіравання М. С. Хрушчова, непрымірымасць улады да іншадумства. У асяроддзі навуковай і творчай інтэлігенцыі ўзнікае **дысідэнцкі рух,** гэта значыць рух нязгодных з пануючай ідэалогіяй і ўладай. Гэты неафармальны грамадскі рух прайшоў шлях ад культурнай і духоўнай да палітычнай апазіцыі савецкай уладзе.


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

У дысідэнцкім руху можна выдзеліць некалькі напрамкаў. Прыхільнікі «сапраўднага марксізму-ленінізму» выступалі за вяртанне да сапраўдных каштоўнасцей гэтага вучэння ў мэтах аздараўлення грамадства. Прыхільнікі хрысціянскай ідэалогіі выступалі за распаўсюджванне хрысціянска-дэмакратычных прынцыпаў у грамадскім жыцці. Яскравым прадстаўніком гэтага напрамку быў пісьменнік *А. І. Салжаніцын*. Ідэолагі ліберальнага кшталту абаранялі ідэю пераходу да дэмакратычнага грамадства заходняга тыпу. На пазіцыях, блізкіх да заходняга лібералізму, стаяў акадэмік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру *А. Д. Сахараў*. У нацыянальных рэспубліках узнік рух абаронцаў нацыянальна-культурных правоў і народнасцей.

Для барацьбы супраць дысідэнтаў ў Камітэце дзяржаўнай бяспекі СССР было створана спецыяльнае, Пятае ўпраўленне. Многія дысідэнты прайшлі праз турмы і лагеры. Па палітычных матывах з СССР былі высланы ці былі вымушаны выехаць выдатныя прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі.

**Праблемы знешняй палітыкі СССР.** У гэты перыяд савецкае кіраўніцтва імкнулася да змякчэння адносін з краінамі Захаду. Пачатак 1970-х гг. быў адзначаны працэсам разрадкі міжнароднай напружанасці.

У *1970 г.* быў падпісаны дагавор паміж СССР і ФРГ, які абавязваў бакі ўтрымлівацца ад выкарыстання сілы і прызнаваў прынцып непарушнасці межаў усіх еўрапейскіх дзяржаў. У *1972 г.* адбыўся першы ў гісторыі савецка-амерыканскіх адносін візіт прэзідэнта ЗША Р. Ніксана ў СССР. Паміж СССР і ЗША былі падпісаны дагаворы аб асновах узаемаадносін дзвюх краін, аб абмежаванні сістэм *супрацьракетнай абароны (Дагавор ПРА)* і *стратэгічных наступальных узбраенняў (АСУ)*. Падчас візіту ў адказ Л. І. Брэжнева ў ЗША ў 1973 г. адбылося падпісанне савецка-амерыканскага пагаднення аб прадухіленні ядзернай вайны. Такім чынам, стваралася аснова для павароту ад канфрантацыі да разрадкі ў адносінах паміж Усходам і Захадам.

Перамогай усіх міралюбівых сіл стала Нарада па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, якая адбылася ў Хельсінкі **1 жніўня 1975 г.** Заключны акт Нарады прадугледжваў непарушнасць межаў, непрымяненне сілы ці пагрозы сілай, павага правоў і асноўных свабод чалавека.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Палітычная разрадка была нядоўгай. Яна завяршылася пасля таго, як на Захадзе пачалася кампанія ў падтрымку правоў чалавека ў СССР, а Савецкі Саюз у *снежні 1979 г.* увёў свае войскі ў Афганістан.

Па меры таго як краіны Азіі і Афрыкі вызваляліся ад каланіяльнай залежнасці, яны знаходзілі падтрымку ў СССР ці ў ЗША. Абедзве звышдзяржавы, якія сапернічалі адна з адной, шчодра забяспечвалі сваіх саюзнікаў ваеннай і эканамічнай дапамогай. Часам лакальныя канфлікты ў афра-азіяцкім рэгіёне перарасталі ў буйныя канфрантацыі і поўнамаштабныя ваенныя дзеянні.

Савецкі Саюз аказваў дапамогу Дэмакратычнай Рэспубліцы В'етнам у яе барацьбе супраць амерыканскай агрэсіі (1964—1975), заняў праарабскую пазіцыю ў перыяд араба-ізраільскай вайны на Блізкім Усходзе ў 1967 г. Пры падтрымцы СССР Ангола, Мазамбік, Гвінея (Бісау) у сярэдзіне 1970-х гг. дамагліся вызвалення ад партугальскіх каланізатараў. Ваенную дапамогу атрымлівалі Эфіопія, якая абвясціла пасля 1974 г. сацыялістычны шлях развіцця, і нікарагуанскія паўстанцы, якія ў 1979 г. скінулі рэакцыйны рэжым Анастасіо Самосы.

Логіка «халоднай вайны» падвяла савецкае кіраўніцтва да распрацоўкі знешнепалітычнай канцэпцыі, у адпаведнасці з якой СССР меў права на ваеннае ўмяшанне ва ўнутраныя справы любой дзяржавы Арганізацыі Варшаўскага Дагавора, калі гэтага патрабавала становішча. На Захадзе гэтая канцэпцыя атрымала назву *«дактрыны Брэжнева»*. Так вясной 1968 г. войскі СССР, Польшчы, Венгрыі, ГДР і Балгарыі былі ўведзены ў Чэхаславакію для таго, каб не дапусціць «перараджэння сацыялізму».

У гэты ж час узмацніўся раскол сярод краін сацыялістычнага лагера. Кітай, Румынія, Югаславія ўсё больш аддаляліся ад СССР, а Албанія заявіла аб выхадзе з АВД. Абвастрэнне савецка-кітайскіх адносін у канцы 1960-х гг. нават прывяло да ўзброеных сутыкненняў на савецка-кітайскай мяжы і кароткачасовай вайны паміж КНР і В'етнамам у 1979 г.

З усіх знешнепалітычных падзей найбольшыя наступствы для СССР мела ўмяшанне ва ўнутраныя справы Афганістана. *Афганская вайна (1979—1989)* знясільвала савецкую эканоміку і адмоўна адбівалася на маральна-палітычным стане савецкага грамадства.


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Важнай праблемай у СССР стаў востры палітычны і маральны крызіс. Практычна знікла вера ў камуністычныя ідэалы, адбылося духоўнае перараджэнне партыйнага апарату, разрасталася карупцыя, асабліва ў нацыянальных рэспубліках, адбывалася зрошчванне крымінальнага бізнесу і партыйнай эліты, у грамадстве нарасталі песімізм і двайная мараль. Спроба *Ю. У. Андропава*, які прыйшоў на змену Л. І. Брэжневу, пераламіць сітуацыю поспеху не мела. Ён, як і яго пераемнік *К. У. Чарненка*, знаходзіўся ва ўладзе даволі кароткі час.

### Пытанні і заданні:

1. Чым была выклікана неабходнасць правядзення эканамічных рэформ у сярэдзіне 1960-х гг.? Ахарактарызуйце сутнасць і вынікі гэтых рэформ. Чаму яны былі згорнуты?
2. Якія былі прычыны запаволенага эканамічнага развіцця СССР?
3. Чаму пры Л. І. Брэжневе КПСС паступова адмовілася ад канцэпцыі пабудовы камунізму як непасрэднай практычнай задачы?
4. Ахарактарызуйце палітычны рэжым у СССР, які склаўся ў брэжнеўскі перыяд. Якія фактары жыцця савецкага грамадства садзейнічалі фарміраванню ідэйнай апазіцыі? Якія метады барацьбы з іншадумствам выкарыстоўваліся ў сярэдзіне 1960-х—пачатку 1980-х гг.?
5. Вызначыце асноўныя напрамкі знешняй палітыкі СССР у сярэдзіне 1960-х—пачатку 1980-х гг. Запоўніце табліцу «СССР і лакальныя канфлікты ў сярэдзіне 1960-х—пачатку 1980-х гг.».

| Гады | Лакальны канфлікт | Дзеянні СССР |
|---|---|---|
| | | |

6. Як складваліся адносіны Савецкага Саюза з сацыялістычнымі краінамі? У чым сутнасць «дактрыны Брэжнева»?
7. Дайце ацэнку дзейнасці Л. І. Брэжнева. Вызначыце яе станоўчыя і адмоўныя бакі ва ўнутранай і знешняй палітыцы.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Прапануем абмеркаваць.** На XXIV з’ездзе КПСС (1971) было прапанавана тэарэтычнае палажэнне аб савецкім народзе як новай гістарычнай супольнасці, для якой былі характэрны адданасць справе камунізму, савецкі патрыятызм і сацыялістычны інтэрнацыяналізм, высокая працоўная і грамадска-палітычная актыўнасць, сацыялістычны калектывізм і таварыская ўзаемадапамога, непрымірымасць да эксплуатацыі і прыгнёту, да нацыянальнай і расавай непрыязнасці, да ворагаў міру, дружбы і свабоды народаў, класавая салідарнасць з працоўнымі ўсіх краін. Ці адпавядала рэальнасці гэтае палажэнне? Свой адказ аргументуйце.

# § 16. РАСПАД СССР І ЎТВАРЭННЕ СНД

**Успомніце:** *Якія крызісныя з’явы ў палітычным, эканамічным і грамадскім жыцці СССР назіраліся ў канцы 1970-х — першай палове 1980-х гг.? Чым яны былі абумоўлены?*

**Перабудова і крах палітыкі М. С. Гарбачова.** Лідары СССР верылі ў тое, што капіталістычны лад асуджаны на пагібель, і за камунізмам — будучае. Аднак іх надзеі не ажыццявіліся. Наадварот, у першай палове 1980-х гг. эканамічнае становішча СССР прыкметна пагоршылася.

Да сярэдзіны 1980-х гг. у краіне ўсё мацней сталі праяўляцца крызісныя з’явы: спад вытворчасці, цяжкасці з харчаваннем, дэфіцыт тавараў народнага спажывання. Дырэктыўнае планавае кіраванне не магло забяспечыць далейшага развіцця эканомікі ва ўмовах НТР. Разбуральнымі для СССР сталі падзенне цэн на нафту і гонка ўзбраенняў, канкурэнцыя з высокаразвітымі індустрыяльнымі дзяржавамі, якія згуртаваліся вакол ЗША. Адчужанасць чалавека ад уласнасці, «ураўнілаўка» ў заробках спараджалі ў грамадстве скрытае незадавальненне. Бюракратызм і карупцыя партыйнай наменклатуры выклікалі нявер’е большасці людзей у ідэалы сацыяльнай справядлівасці, якія абвяшчаліся.

Пачынаючы з канца 1970-х гг. урад шукаў выйсце з гэтага становішча. Перад ім стаяла альтэрнатыва: ці рэфарматарская палітыка накшталт нэпа (дзяржаўны кантроль і дапушчэнне вельмі абмежаванай прыватнай ініцыятывы), ці татальнае цэнтралізаванае каманднае кіраванне з апорай на дзяржаўную ўласнасць і падаўленне прыватнай ініцыятывы.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## Гістарычны партрэт



**Міхаіл Сяргеевіч Гарбачоў** (нар. у 1931 г.) — савецкі палітычны і дзяржаўны дзеяч, прэзідэнт СССР (1990 — 1991). Закончыў юрыдычны факультэт МДУ. Пасля яго заканчэння перайшоў на камсамольскую, а затым і на партыйную работу: спачатку першым сакратаром Стаўрапольскага крайкама УЛКСМ, а затым другім сакратаром крайкама КПСС. У 1970 г. стаў самым маладым першым сакратаром крайкама партыі і праз год быў абраны ў склад ЦК КПСС. Адрозніваўся мэтанакіраванасцю, напорыстасцю, высокай працаздольнасцю. У 1980 г. стаў самым маладым членам Палітбюро, а пасля смерці Л. І. Брэжнева, па даручэнню Ю. У. Андропава, пачаў займацца пытаннямі ўнутранай і знешняй палітыкі. Пасля смерці К. У. Чарненкі ў сакавіку 1985 г. адзінагалосна абраны Генеральным сакратаром ЦК КПСС і пачаў перабудову, якая скончылася распадам СССР. У 1990 г. быў удастоены Нобелеўскай прэміі міру «ў знак прызнання яго вядучай ролі ў мірным працэсе, які сёння характарызуе важную састаўную частку жыцця міжнароднай супольнасці».

У **сакавіку 1985 г.**, пасля смерці Генеральнага сакратара ЦК КПСС К. У. Чарненкі, Пленум ЦК КПСС выбраў Генеральным сакратаром КПСС **М. С. Гарбачова**, адносна маладога і энергічнага партыйнага функцыянера. З яго імем звязаны новы перыяд, які атрымаў назву **«перабудова»**.

Кіраўніцтва краіны разглядала перабудову як спробу абнаўлення сацыялізму. М. С. Гарбачоў не раз заяўляў, што імкнецца рэфармаваць неэфектыўную сістэму кіравання дзяржавай і эканоміку. Але перамены, якія ён пачаў, выйшлі з-пад кантролю партыйнага і дзяржаўнага апарату. Палітыка дэмакратызацыі, якую пачало новае кіраўніцтва, прывяла да адмовы ад сацыялістычнага шляху развіцця, разбурэнню савецкага ладу і распаду СССР.

Курс на перабудову быў афіцыйна абвешчаны **23 красавіка 1985 г.** на Пленуме ЦК КПСС. Першапачаткова новая палітыка называлася «паскарэнне і перабудова». Прычым тэрмін «паскарэнне» ўжываўся часцей, чым тэрмін «перабудова». Курс на «паскарэнне і перабудову» быў замацаваны на XXVII з’ездзе КПСС. Сэнс



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

паскарэння заключаўся ў тым, каб за кароткі час дасягнуць рэзкага павышэння эфектыўнасці вытворчасці, павелічэння валавага нацыянальнага прадукту. Гэта меркавалася ажыццявіць, у першую чаргу, за кошт пераходу да прынцыпова новых тэхналагічных сістэм, укараненне найноўшых распрацовак і тэхналогій.

Аднак стала зразумела, што СССР не зможа рэалізаваць курс на «паскарэнне». Да пачатку 1987 г. ад першапачатковага лозунга «паскарэнне і перабудова» застаўся ў выкарыстанні толькі другі тэрмін — «перабудова».

На пачатковым этапе перабудовы адбылося значнае абнаўленне і амалажэнне партыйных і дзяржаўных кадраў усіх узроўняў. Толькі першых сакратароў абкамаў было заменена больш за 60 %, а таксама значная частка кіраўнікоў саюзных рэспублік і членаў урада. Адыёзныя асобы брэжнеўскай эпохі былі зняты са сваіх пасад.

Ішлі пошукі шляхоў «паскарэння» эканамічнага развіцця. На прадпрыемствах уводзіўся гаспадарчы разлік, выбары дырэктараў, адраджалася кааперацыя. У адной з эканамічных праграм ставілася мэта даць кожнай савецкай сям'і асобную кватэру да 2000 г.

У краіне праводзілася **палітыка галоснасці**, якая першапачаткова азначала адкрытае асвятленне негатыўных бакоў жыцця савецкага грамадства. Пачалося пераасэнсаванне мінулага і сучаснага. Бязлітаснай крытыцы падвяргалася дзейнасць І. В. Сталіна і часткова Л. І. Брэжнева, якіх абвінавачвалі ў «дэфармацыі» сацыялізму. Вясной 1985 г. М. С. Гарбачоў сустрэўся ў Крамлі з іерархамі РПЦ, пасля чаго ў Царквы з'явілася рэальная магчымасць рыхтавацца да юбілейнай даты — 1000-годдзя Хрышчэння Русі. Праўда, згоду на абвяшчэнне юбілейных урачыстасцей і адкрыццё Памеснага Сабору ўлады далі толькі праз тры гады. З 1988 г. РПЦ атрымала магчымасць пашырыць сваю дзейнасць у асветніцкай, выдавецкай, місіянерскай, дабрачыннай і іншых сферах.

У знешняй палітыцы М. С. Гарбачоў імкнуўся закончыць «халодную вайну», якая дорага каштавала. СССР перастаў прасоўваць сваю мадэль развіцця ў іншыя краіны і ўзяў курс на паляпшэнне адносін з краінамі Захаду. У 1987 г. паміж СССР і ЗША быў падпісаны Дагавор аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай далёкасці. Знешняя палітыка СССР, які адмовіўся ад ідэі супрацьстаяння сацыялістычнай і капіталістычнай сістэм, атрымала назву **«новае мысленне»**.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



*Генеральны сакратар ЦК КПСС М. С. Гарбачоў і прэзідэнт ЗША Р. Рэйган падпісваюць Дагавор аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай далёкасці. 8 снежня 1987 г.*

На першым этапе пераўтварэнняў было дапушчана нямала сур'ёзных памылак, сярод якіх размытасць мэтаў і стыхійнасць перабудовы, пастаноўка задач, якія загадзя не маглі быць выкананы, празмернае ачарненне гістарычнага мінулага, пагарджанне нацыянальнымі інтарэсамі, каб дагадзіць заходнім краінам.

У 1988 г. пачаўся крызіс перабудовы, які завяршыўся распадам СССР у 1991 г. Паказчыкам крызісу перабудовы з'яўляліся наступныя падзеі. Перш за ўсё адсутнасць адзінства ў вышэйшым кіраўніцтве партыі і дзяржавы. Зняцце з пасады і цкаванне ў 1987 — 1988 гг. першага сакратара Маскоўскага гаркама партыі Б. М. Ельцына высунулі яго ў шэраг новых папулярных лідараў, якія заклікалі да большай рашучасці і паслядоўнасці дзеянняў.

За кароткі перыяд часу КПСС імкліва страчвала свой аўтарытэт. Прыкметным стала падзенне маралі сярод моладзі. Міжнацыянальныя канфлікты прывялі да беспарадкаў у 1986 г. у Казахстане, да хваляванняў у Прыбалтыцы ў 1987 г., узброеных сутыкненняў паміж армянамі і азербайджанцамі ў Сумгаіце ў 1988 г. Трагічным сімвалам крызісу стала аварыя **26 красавіка 1986 г.** на Чарнобыльскай АЭС. Асноўнымі прычынамі гэтай жудаснай аварыі сталі злачынная нядбайнасць кіраўніцтва і персаналу станцыі, а таксама праектныя і канструкцыйныя недахопы рэактара, якія не адпавядаў патрабаваннямі бяспекі.

**Рэформа палітычнай сістэмы і паглыбленне крызісу перабудовы.** Пераломнай падзеяй перабудовы стала **XIX Усесаюзная партыйная канферэнцыя,** якая адбылася **28 чэрвеня — 1 ліпеня**



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**1988 г.** і закліканая знайсці выйсце з крызісу, які пачынаўся. Партканферэнцыя прыняла рашэнне аб правядзенні палітычнай рэформы ў СССР. Асноўны змест гэтай рэформы заключаўся ў тым, каб пераўтварыць Саветы з намінальных у рэальныя органы ўлады, заснаваць новы палітычны орган — З'езд народных дэпутатаў СССР, правесці выбары З'езда народных дэпутатаў СССР, з'ездаў (вярхоўных саветаў) саюзных рэспублік і іншых саветаў усіх узроўняў на альтэрнатыўнай аснове.

XIX партканферэнцыя змяніла ход перабудовы. Да гэтага перабудова праходзіла больш на ўзроўні дыскусіі, не закранаючы асноў партыйна-дзяржаўнай улады. Пасля XIX партканферэнцыі пачаліся першыя крокі па дэмантажу сістэмы ўлады, якая склалася.

I З'езд народных дэпутатаў СССР адбыўся **25 мая — 9 чэрвеня 1989 г.** Са свайго складу З'езд сфарміраваў Вярхоўны Савет СССР, які працаваў пастаянна. Старшынёй Вярхоўнага Савета СССР быў абраны М. С. Гарбачоў. Упершыню ў гісторыі СССР была створана парламенцкая апазіцыя (кіраўнікі — Б. М. Ельцын, А. Д. Сахараў і інш.), якая выступіла з крытыкай КПСС і савецкага ладу. Пасля заснавання З'езда народных дэпутатаў, які пераўтварыўся ў новы цэнтр улады, значнасць вышэйшых партыйных органаў КПСС пачала зніжацца. У такія ж цэнтры ўлады пераўтвараліся зноў выбраныя Вярхоўныя Саветы — парламенты саюзных рэспублік.



*А. Д. Сахараў выступае на I З'ездзе народных дэпутатаў СССР. Масква, 1989 г.*

У гэты ж час СССР усё больш прыкметна рабіў аднабаковыя рэгулярныя саступкі Захаду. У **лютым 1989 г.** савецкія войскі былі цалкам выведзены з Афганістана. Са згоды СССР была б'яднана Германія. Затым савецкае кіраўніцтва згадзілася вывесці свае войскі з аб'яднанай Германіі. СССР заняў пазіцыю неўмяшання ва ўнутрыпалітычныя працэсы, у выніку чаго палі сацыялістычныя рэжымы краін сацлагера. У 1991 г. былі распушчаны СЭУ і АВД без усялякіх крокаў у адказ з боку Паўночнаатлантычнага блока.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



*Вывад савецкіх войскаў з Афганістана. 1989 г.*

Непаслядоўнасць М. С. Гарбачова, які лавіраваў паміж камуністамі-кансерватарамі і камуністамі-рэфарматарамі, прывяла да фарміравання новага радыкальнага палітычнага напрамку. Яго сімвалам стаў Б. М. Ельцын, які выступіў з крытыкай вышэйшага кіраўніцтва КПСС за павышэнне ролі Саветаў. Ён не абвяргаў сацыялістычнага выбару і ідэй сацыяльнай справядлівасці. Б. М. Ельцын пачаў «барацьбу з прывілеямі наменклатуры партыі» і дасягнуў папулярнасці. У хуткім часе ён стаў Старшынёй Вярхоўнага Савета РСФСР. У гэты ж час КПСС пачала распадацца на фракцыі, затым на новыя партыі, быў адменены 6-ы артыкул Канстытуцыі (аб кіруючай ролі КПСС). Пачалася барацьба за ўладу паміж М. С. Гарбачовым і Б. М. Ельцыным. М. С. Гарбачоў паспрабаваў умацаваць сваю ўладу і стаў у **1990 г. прэзідэнтам СССР.**

У той жа час у саюзных рэспубліках (Літве, Латвіі, Эстоніі, Арменіі, Грузіі, Азербайджане, Украіне і Беларусі) з экалагічных, культурных рухаў утварыліся *«Народныя франты»* ў падтрымку перабудовы. У палітычнае жыццё, разам з сумленнымі і прынцыповымі палітыкамі, якія хутка сталі нацыянальнымі героямі, кінуліся і экстрэмісцкія групы. Апошнія рваліся да ўлады і ўласнасці і тлумачылі ўсе беды сваіх народаў дзеяннямі саюзных органаў і эксплуатацыяй з боку цэнтральнай улады. Нацыяналістычныя настроі атрымалі масавую падтрымку. Многім людзям пачало здавацца, што іх беднае жыццё абумоўлена тым, што менавіта яны на шкоду сабе «кормяць» цэнтр і іншыя народы. Рэальная дапамога і выгады адзінага Саюза былі забытыя. На-



Адукацыя і выхаванне
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

цыянальныя эліты паставілі перад Масквой пытанне аб заключэнні дагавора аб размежаванні паўнамоцтваў паміж цэнтрам і саюзнымі рэспублікамі.

У гэты ж час абвастрыліся канфлікты на нацыянальнай глебе, асабліва моцныя ў Нагорным Карабаху, Малдове, Абхазіі, Фергане і інш. Імкнучыся выратаваць СССР, М. С. Гарбачоў адначасова ініцыяваў стварэнне новага Саюзнага дагавора («Нова-Агароўскі працэс» ці «9 + 1» — па колькасці рэспублік, якія ў ім удзельнічалі) і ў той жа час дэманстраваў сілавы падыход. У 1990 — 1991 гг. былі ўведзены войскі ў Ерэван (сталіцу Арменіі), Баку (сталіцу Азербайджана), Тбілісі (сталіцу Грузіі), Вільнюс (сталіцу Літвы).

У адказ пачаўся **«парад суверэнітэтаў»**, г. зн. прыняцце дэкларацый аб незалежнасці вярхоўнымі саветамі саюзных рэспублік. Цэнтр ініцыяваў эканамічную блакаду. Такім чынам, у СССР пачалася барацьба паміж цэнтрам і саюзнымі рэспублікамі. Апошнія патрабавалі самавызначэння і заканадаўчага афармлення права выхаду са складу СССР. Супрацьстаянне паміж цэнтрам і саюзнымі рэспублікамі крайне абвастрылася.

**Жнівеньскія падзеі 1991 г. і распад СССР.** Каб выратаваць сваю ўладу і захаваць СССР, па ініцыятыве М. С. Гарбачова **17 сакавіка 1991 г.** быў праведзены рэферэндум аб захаванні СССР. За існаванне абноўленага (федэратыўнага) СССР выказалася каля 80 % грамадзян, якія ўдзельнічалі ў галасаванні. Выконваючы гэтае рашэнне, быў падрыхтаваны новы Саюзны дагавор.

Аднак 19 жніўня ў Маскве кансерватыўна настроенае акружэнне М. С. Гарбачова заявіла ў яго адсутнасць (ён знаходзіўся ў Крыму) аб стварэнні *Дзяржаўнага камітэта па надзвычайнаму становішчу (ДКНС)* з мэтай аднаўлення старога парадку. У Маскву былі ўведзены войскі. Дзеянні ДКНС не атрымалі падтрымкі як сярод значнай часткі дзяржапарату, так і ў грамадстве. Апазіцыю ДКНС склала, перш за ўсё, кіраўніцтва РСФСР на чале з Б. М. Ельцыным. У выніку супрацьстаяння члены ДКНС былі адхілены ад сваіх пастоў і арыштаваны.

Пасля вяртання ў Маскву М. С. Гарбачоў, спрабуючы выратаваць свой аўтарытэт, адмовіўся ад пасады Генеральнага сакратара ЦК КПСС. Ініцыятыва перайшла да Б. М. Ельцына. У гэты час напалоханыя непрадказальнасцю цэнтра і спрыяльнай сітуацыяй, якая склалася, эліты саюзных рэспублік вырашылі замацаваць незалежнасць.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**8 снежня 1991 г.** лідары Расіі, Украіны і Беларусі Б. М. Ельцын, Л. М. Краўчук і С. С. Шушкевіч абвясцілі аб роспуску СССР і стварэнні **Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). 21 снежня** да іх далучыліся кіраўнікі яшчэ васьмі рэспублік (Азербайджан, Арменія, Казахстан, Кыргызстан, Малдавія, Таджыкістан, Туркменістан і Узбекістан). Пазней у СНД увайшла Грузія (выйшла ў 2008 г.). Выключэнне склалі дзяржавы Балтыі: Латвія, Літва, Эстонія. Садружнасць Незалежных Дзяржаў была створана на канфедэратыўных прынцыпах, але многія пункты дагавора аб саюзных адносінах ніхто выконваць не імкнуўся.

25 снежня 1991 г. М. С. Гарбачоў склаў паўнамоцтвы прэзідэнта СССР. Савецкая дзяржава, якая ўзнікла ў 1917 г., спыніла сваё існаванне.




*Распад СССР. Утварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў.*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## Пытанні і заданні:

1. Якія задачы ставіў М. С. Гарбачоў, пачынаючы перабудову ў СССР? Растлумачце, чаму рэфармаванне грамадства ў СССР пачалося «зверху»?
2. У чым праявілася супярэчлівасць правядзення эканамічных рэформ? Якім быў іх вынік?
3. Што прадугледжвала дэмакратызацыя палітычнай сістэмы ў СССР? Якія былі яе вынікі?
4. Якія змены адбыліся ў сістэме дзяржаўнага ўладкавання СССР у гады перабудовы?
5. Чаму перабудовачныя працэсы прывялі да абвастрэння нацыянальнага пытання? Якія спробы захаваць СССР былі зроблены? Сфармулюйце прычыны, якія прывялі да распаду СССР.
6. Якая новая палітычная канцэпцыя была прапанавана кіраўніком дзяржавы М. С. Гарбачовым у галіне знешняй палітыкі СССР? Прывядзіце прыклады яе рэалізацыі. Як змянілася пазіцыя СССР на міжнароднай арэне?
7. Параўнайце мэты, якія ставіў М. С. Гарбачоў, пачынаючы перабудову, і яе вынікі. Якія фактары садзейнічалі таму, што перабудовачныя працэсы набылі некіруемы, незваротны характар?

**Прапануем абмеркаваць.** У грамадстве «развітога сацыялізму» назіраўся шэраг негатыўных з'яў. Тым не менш значная частка насельніцтва былога Савецкага Саюза са шкадаваннем успамінае пра тыя часы. Правядзіце апытанне людзей старэйшага пакалення з чым гэта звязана. Якія іх адносіны да хрушчоўскай «адлігі», брэжнеўскага «застою», гарбачоўскай перабудовы?

## Гістарычны дакумент

### З кнігі М. С. Гарбачова «Перабудова і новае мысленне для нашай краіны і для ўсяго свету» (1988)

Калі мы прыйшлі на сваім XXVII з'ездзе да канцэпцыі супярэчлівага, але ўзаемазвязанага, узаемазалежнага, па сутнасці справы, цэласнага свету, то сталі на гэтай аснове выбудоўваць і сваю знешнюю палітыку…

Асноўны, зыходны прынцып новага палітычнага мыслення просты: ядзерная вайна не можа быць сродкам дасягнення палітычных, эканамічных,



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

ідэалагічных, якіх бы то ні было мэтаў... Адзіны шлях да бяспекі — гэта шлях палітычных рашэнняў, шлях раззбраення.

Прынцыповая аснова ўсеагульнай бяспекі ў наш час — гэта прызнанне за кожным народам права выбару ўласнага шляху сацыяльнага развіцця, гэта адмова ад умяшання ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў, гэта павага да іншых у спалучэнні з аб'ектыўным, самакрытычным поглядам на ўласнае грамадства...

Ядром новага мыслення з'яўляецца прызнанне прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей...

... сёння... дзяржавы, якія належаць да розных сацыяльных сістэм, могуць і павінны супрацоўнічаць паміж сабой у імя міру, у імя рашэння агульначалавечых, глабальных задач...

*Выдзеліце асноўныя палажэнні «новага палітычнага мыслення». Які ўплыў на міжнароднае становішча зрабіла «новае палітычнае мысленне»?*

## § 17—18. РАСІЙСКАЯ ФЕДЭРАЦЫЯ І СНД

**Успомніце:** *Які перыяд гісторыі СССР называюць «перабудовай»? Калі была ўтворана Садружнасць Незалежных Дзяржаў?*

**Расія на шляху да суверэнітэту.** Расія, буйнейшая па тэрыторыі і насельніцтву рэспубліка, адыгрывала дамінуючую ролю ў СССР. Аднак уласнай дзяржаўнасці ў савецкі перыяд яна фактычна не мела. Палітыка перабудовы прывяла да распаду СССР, стварэнню на яго тэрыторыі незалежных дзяржаў, у тым ліку Расійскай Федэрацыі. Працэс палітычнага рэфармавання і суверэнізацыі Расійскай Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікі (РСФСР) пачаўся пасля выбараў дэпутатаў З'езда народных дэпутатаў РСФСР у





*Дзяржаўныя герб і сцяг Расійскай Федэрацыі.*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



*Прэзідэнт РСФСР Б. М. Ельцын выступае на мітынгу падчас жнівеньскіх падзей 1991 г.*

сакавіку 1990 г. У выніку выбараў каля паловы дэпутацкіх месцаў атрымалі прадстаўнікі дэмакратычных сіл, лідарам якіх стаў былы апальны першы сакратар Маскоўскага гаркама КПСС Б. М. Ельцын. У маі 1990 г. ён быў абраны старшынёй Вярхоўнага Савета РСФСР.

Важнымі крокамі на шляху пабудовы новай дзяржаўнасці РСФСР сталі прыняцце **Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце РСФСР,** якое адбылося **12 чэрвеня 1990 г.,** і заснаванне інстытута прэзідэнта РСФСР, які павінен быў выбірацца ўсім народам. Уся паўната суверэнітэту на расійскай тэрыторыі цяпер належала вышэйшым дзяржаўным органам Расіі. Першым прэзідэнтам РСФСР у **1991 г.** быў абраны Б. М. Ельцын, які актывізаваў палітыку адасаблення Расіі ад саюзнага цэнтра. Расія аднавіла свае гістарычныя дзяржаўныя сімвалы і стала афіцыйна называцца **Расійскай Федэрацыяй (РФ)** і **Расіяй.** Расійскае грамадства ўступіла ў паласу складанай і супярэчлівай трансфармацыі.

**Радыкальная эканамічная рэформа.** У выніку жнівеньскіх падзей 1991 г. і распаду СССР да ўлады ў Расійскай Федэрацыі прыйшлі радыкальна настроеныя рэфарматары. Іх лідары былі перакананымі прыхільнікамі канцэпцыі ліберальных рыначных адносін, прапаведавалі адмаўленне ад дзяржаўнага кантролю над эканомікай. Паводле іх канцэпцыі, свабодны рынак павінен быў пераўтварыць эканоміку Расіі, сфарміраваць сярэдні клас і закласці ўстойлівыя асновы палітычнай дэмакратыі.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Стаўку зрабілі на *манетарызм*, у адпаведнасці з якім вызначальную ролю ў эканамічных працэсах адыгрывае колькасць грошай у абароце і сувязь паміж грашовай і таварнай масамі. Манетарысцкі метад пераходу да рынку характарызуецца жорсткімі сродкамі паскоранай лібералізацыі і так званай «шокавай тэрапіяй», апрабаванай у Польшчы і ў краінах Лацінскай Амерыкі. У 1992 — 1993 гг. важнейшымі мерамі для рэфармавання эканомікі сталі ўвядзенне свабодных цэн, лібералізацыя гандлю, прыватызацыя дзяржаўных прадпрыемстваў і жылля. Вялікае значэнне надавалася змяненню адносін да ўласнасці. Урад меркаваў, што прыватызацыя прывядзе да фарміравання шырокага слою ўласнікаў у якасці сацыяльнай базы рыначнай эканомікі і дэмакратычнага грамадства, а таксама павысіць эфектыўнасць вытворчасці.

Першыя вынікі рэформ мелі драматычныя наступствы. Цэны выраслі ў дзясяткі разоў, рост заробкаў і пенсій не паспяваў за ростам цэн. Працяг палітыкі «шокавай тэрапіі» прывёў да разарэння прадпрыемстваў лёгкай і абароннай прамысловасці, сельскагаспадарчага комплексу. Большасць насельніцтва апынулася за рысай беднасці, а надзеі на фінансавую дапамогу Захаду не апраўдаліся. У грамадстве фарміравалася масавае незадавальненне палітыкай выканаўчай улады. Урадавы курс на радыкальныя рэформы не быў падтрыманы Вярхоўным Саветам Расійскай Федэрацыі, а таксама віцэ-прэзідэнтам А. У. Руцкім.

**Кастрычніцкія падзеі 1993 г. і прыняцце Канстытуцыі Расійскай Федэрацыі.** *Восенню 1993 г.* паміж заканадаўчай і выканаўчай уладамі ўзнік востры палітычны канфлікт. У цэнтры канфлікту стаяла пытанне аб форме дзяржаўнага ўладкавання Расіі: быць краіне парламенцкай ці прэзідэнцкай рэспублікай. 21 верасня 1993 г. прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Б. М. Ельцын выдаў указ аб спыненні паўнамоцтваў вышэйшых органаў заканадаўчай улады — З’езда народных дэпутатаў і Вярхоўнага Савета. Замест іх прадугледжвалася стварэнне новага парламента — **Федэральнага сходу**, які складаўся з дзвюх палат — **Дзяржаўнай Думы** і **Савета Федэрацыі.** Аднак Вярхоўны Савет не падпарадкаваўся ўказу, палічыўшы дзеянні прэзідэнта антыканстытуцыйнымі. Спроба перагавораў бакоў пры пасрэдніцтве Патрыярха РПЦ Аляксія II поспеху не прынесла. У выніку сілавога супрацьстаяння 3 — 4 каст-



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

рычніка будынак Вярхоўнага Савета быў блакіраваны, абстраляны і ўзяты штурмам вернымі прэзідэнту Расійскай Федэрацыі войскамі, а кіраўнікі супраціўлення арыштаваны.

Вынікам трагічных падзей стала радыкальная змена палітычнай сістэмы расійскага грамадства. Новая **Канстытуцыя,** прынятая ў выніку рэферэндуму **12 снежня 1993 г.,** завяршыла працэс ліквідацыі сістэмы Саветаў народных дэпутатаў. Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі надзяляўся надзвычай шырокімі паўнамоцтвамі, атрымліваў права прызначаць кіраўніка ўрада, распускаць Дзяржаўную Думу і аб'яўляць новыя выбары. Расія станавілася, такім чынам, прэзідэнцка-парламенцкай рэспублікай.

Парламенцкія выбары, якія адбыліся 12 снежня 1993 г., прынеслі нечаканы поспех Ліберальна-дэмакратычнай партыі Расіі (ЛДПР) на чале з У. В. Жырыноўскім. Яна набрала амаль 23 % галасоў выбаршчыкаў па партыйных спісах. Прапрэзідэнцкая партыя «Выбар Расіі» набрала ўсяго 15,5 % галасоў, што сведчыла пра крызіс даверу насельніцтва да выканаўчай улады. На трэцяе месца ўпэўнена выйшла Камуністычная партыя Расійскай Федэрацыі (КПРФ) на чале з Г. А. Зюганавым (12,4 %).

**Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Расіі.** На хвалі сацыяльнага пратэсту ўрад на чале з Я. Ц. Гайдарам, які складаўся з радыкальна настроеных рэфарматараў, у снежні 1992 г. быў адпраўлены ў адстаўку. Новым старшынёй урада Расійскай Федэрацыі стаў *В. С. Чарнамырдзін,* былы міністр нафтагазавай прамысловасці СССР і старшыня праўлення канцэрна «Газпрам». Касцяк новага ўрада склалі былыя дырэктары заводаў і іншыя буйныя кіраўнікі, якія сфарміраваліся яшчэ ў савецкую эпоху. Урад В. Чарнамырдзіна прадоўжыў эканамічныя рэформы, але больш умерана, чым папярэднікі, спалучаючы манетарысцкія і традыцыйныя метады кіравання.

Радыкальная эканамічная рэформа ў цэлым завяршылася да сярэдзіны 1994 г. Яе вынікам стала разбурэнне камандна-адміністрацыйнай сістэмы кіравання эканомікай і стварэнне асноў рыначнай капіталістычнай эканомікі. Ураду В. С. Чарнамырдзіна ўдалося паступова знізіць тэмпы інфляцыі, забяспечыць рост заработнай платы, часова ўмацаваць рубель як плацежны сродак, папоўніць золатавалютныя рэзервы краіны.


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## Гістарычны партрэт



**Барыс Мікалаевіч Ельцын** (1931 — 2007) — расійскі палітычны і дзяржаўны дзеяч, першы прэзідэнт Расіі (1991 — 1999). Закончыў Уральскі політэхнічны інстытут. З 1976 г. кіраваў Свярдлоўскім абкамам КПСС. Менавіта тут у поўнай ступені праявіліся яго арганізатарскія і лідарскія якасці. У 1985 г. заняў пасаду першага сакратара Маскоўскага гарадскога камітэта КПСС. У 1990 г. быў абраны Старшынёй Вярхоўнага Савета РСФСР. 12 чэрвеня 1991 г. быў абраны прэзідэнтам РСФСР. У 1996 г. паўторна пераабраны на гэтую пасаду. Адзін з арганізатараў супраціўлення дзеянням ДКНС у жніўні 1991 г. У снежні 1991 г. падпісаў Белавежскае пагадненне аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД).

Аднак многія праблемы так і не былі вырашаны. Эканамічная палітыка ўрада прэзідэнта Б. М. Ельцына на працягу ўсіх 1990-х гг. была арыентавана на экспартныя галіны вытворчасці (нафта, газ і іншыя віды сыравіны). Рэгіёны Расійскай Федэрацыі, не звязаныя з вытворчасцю сыравіны, апынуліся ў крызісным стане. Узровень вытворчасці ў іх прадаўжаў імкліва падаць. Перыядычна не выплочваўся заробак работнікам галін народнай гаспадаркі, што прыводзіла да масавых антыўрадавых выступленняў. З’явілася вялікая колькасць махлярскіх «фінансавых пірамід», якія выманьвалі грошы ў насельніцтва. Расія трапляла ва ўсё большую залежнасць ад замежных крэдытораў.

Істотна паўплываў на ўнутрыпалітычную сітуацыю чачэнскі канфлікт, які меў шматгадовыя карані. Абвяшчэнне Чачнёй поўнай незалежнасці ад Расіі прывяло да ваенных дзеянняў у снежні 1994 г., якія прадаўжаліся да восені 1996 г. Але і пасля падпісання ўмовы аб міру з яе тэрыторыі не спынялася тэрарыстычная дзейнасць.

У сакавіку 1998 г. урад В. Чарнамырдзіна быў адпраўлены ў адстаўку. Пасля гэтага ў Расіі пачалася «ўрадавая чахарда», падчас якой за два гады змяніліся чатыры ўрады.

Аснову ўрада *С. У. Кірыенкі*, як і ў пачатку 1990-х гг. урада Я. Ц. Гайдара, склалі «маладыя рэфарматары», якія ў поўным аб’ёме аднавілі жорсткія манетарысцкія метады кіравання. У *жніў-*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

*ні 1998 г.* у Расіі выбухнуў глыбокі фінансава-эканамічны крызіс. Курс рубля ў адносінах да долара ўпаў амаль у 4 разы, што мела катастрафічныя наступствы. У выніку быў страчаны давер насельніцтва і замежных інвестараў да расійскіх банкаў і дзяржавы. Людзі пазбавіліся сваіх укладанняў, упаў узровень жыцця. Тым часам экспартаарыентаваныя прадпрыемствы атрымалі перавагу на знешніх рынках, расійскія тавары сталі танней і попыт на іх узрос.

Пасля працяглага ўрадавага крызісу на пасаду старшыні ўрада быў прызначаны *Я. М. Прымакоў,* былы кіраўнік Службы знешняй разведкі РФ і міністр замежных спраў у 1996—1998 гг. Ён выдаліў з урада каманду «маладых рэфарматараў» і супрацоўнічаў як з прэзідэнцкім лагерам, так і з камуністамі. Яму ўдалося стабілізаваць сітуацыю пасля фінансавага крызісу і спыніць далейшае падзенне курса рубля. Аднак 12 мая 1999 г. урад Я. М. Прымакова быў адпраўлены ў адстаўку па палітычных меркаваннях. Новы ўрад *С. В. Сцяпашына* працаваў усяго 3 месяцы. 16 жніўня 1999 г. Б. М. Ельцын вылучыў на пасаду старшыні ўрада кіраўніка Федэральнай службы бяспекі і сакратара Савета бяспекі *У. У. Пуціна.*

Пасля крызісу 1998 г. у Расіі адбылася стабілізацыя эканамічнага становішча, намеціўся эканамічны рост, якому садзейнічала трайное павелічэнне сусветных цэн на нафту. У 1997 г. Расійскай Федэрацыя была прынята ў лік самых уплывовых у эканамічных адносінах краін свету. Разам з ЗША, Вялікабрытаніяй, Францыяй, Германіяй, Італіяй, Японіяй і Канадай яна стала паўнапраўным членам «вялікай сямёркі», якая ператварылася ў *«вялікую васьмёрку»*.

**Расія ў пачатку XXI ст.** На зыходзе 1999 г. у палітычным жыцці Расіі адбылася важная падзея: 31 снежня дзеючы прэзідэнт Б. М. Ельцын добраахвотна пайшоў са свайго паста. У адпаведнасці з Канстытуцыяй выкананне прэзідэнцкіх абавязкаў было ўскладзена на старшыню ўрада У. У. Пуціна. На прэзідэнцкіх выбарах, якія адбыліся 26 сакавіка 2000 г., прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі быў абраны **У. У. Пуцін,** які атрымаў каля 52 % галасоў і апярэдзіў лідара камуністаў Г. А. Зюганава больш чым на 20 %. На прэзідэнцкіх выбарах 14 сакавіка 2004 г. за У. У. Пуціна аддалі свае галасы больш за 71 % расійскіх выбаршчыкаў.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Асноўнымі прыярытэтамі ўнутранай і знешняй палітыкі У. У. Пуціна сталі наступныя кірункі: узмацненне ролі дзяржавы, стабілізацыя сітуацыі ў эканоміцы і забеспячэнне эканамічнага росту, барацьба з тэрарызмам, інтэграцыя на постсавецкай прасторы, збліжэнне з вядучымі еўрапейскімі краінамі — Германіяй, Францыяй, Вялікабрытаніяй.

Новая адміністрацыя павяла рашучую барацьбу супраць разнастайных праяў сепаратызму як галоўнай пагрозы тэрытарыяльнай цэласнасці Расіі. У шэрагу суб'ектаў Расійскай Федэрацыі былі адменены заканадаўчыя акты, якія супярэчылі Канстытуцыі Расійскай Федэрацыі. У. У. Пуцін заняў прынцыповую пазіцыю ў адносінах да чачэнскіх тэрарыстаў. Яшчэ ў *кастрычніку 1999 г.* пачалася контртэрарыстычная аперацыя, якая праз тры гады прывяла да стабілізацыі жыцця ў Чачэнскай Рэспубліцы і замацаванню яе ў складзе Расійскай Федэрацыі. Вялікая ўвага стала ўдзяляцца ўмацаванню ваенна-прамысловага комплексу і сілавых структур.



*Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі У. У. Пуцін.*

Унутраная і знешняя палітыка Расійскай Федэрацыі кардынальна не змянілася і пасля абрання ў **2008 г.** прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі **Д. А. Мядзведзева,** а ў 2012 г. — **У. У. Пуціна.**

Адносна ўстойліваму эканамічнаму росту Расіі ў пачатку XXI ст. садзейнічала не толькі спрыяльная кан'юнктура для расійскіх тавараў і сыравіны, але і структурныя змены ў эканоміцы: рэфармаванне падатковай і бюджэтнай сферы, ажыццяўленне зямельнай рэформы, падтрымка малога прадпрымальніцтва. Замест прагрэсіўнай сістэмы падаткаабкладання для фізічных асоб была ўсталявана адзіная 13-працэнтная стаўка падаходнага падатку. У краіне ажыццяўляецца зямельная рэформа, уведзена прыватная ўласнасць на зямлю. Праводзіцца ў жыццё пакет законаў, накіраваных на падтрымку малога і сярэдняга бізнесу. У апошнія гады прыкметна ўзмацнілася сацыяльная складаючая палітыкі расійскага ўрада.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

У той жа час, нягледзячы на станоўчыя тэндэнцыі, эканамічнае развіццё Расіі па-ранейшаму ў многім мае экстэнсіўны характар, захоўваецца залежнасць краіны ад экспарту нафты, газу, іншых прыродных рэсурсаў. Сур'ёзнымі праблемамі з'яўляюцца манапалізацыя шэрага сыравінных галін і энергетычнай сістэмы, старэнне асноўных вытворчых фондаў, недастатковае ўкараненне новых тэхналогій, распаўсюджванне карупцыі ў дзяржаўным апараце, павольны рост жыццёвага ўзроўню насельніцтва.

У знешняй палітыцы Расія сутыкнулася з шэрагам выклікаў, звязаных у першую чаргу з забеспячэннем нацыянальнай бяспекі. У адрозненне ад СССР яна перастала адыгрываць вядучую ролю на міжнароднай арэне. Але Расія па-ранейшаму валодае велізарным ваенным і ядзерным арсеналам, што дазваляе ёй захоўваць статус і ўплыў сусветнай дзяржавы. У цяперашні час ЗША і іншыя краіны Захаду заклапочаны імкненнем расіян аднавіць былую магутнасць Расійскай дзяржавы. У сваю чаргу, Расія занепакоена разглядае прасоўванне НАТО на Усход і бачыць у гэтым не без падстаў пагрозу сваёй нацыянальнай бяспецы.

**Краіны СНД.** Пасля распаду СССР на месцы былых савецкіх рэспублік узніклі новыя незалежныя дзяржавы.

Вядучую ролю ў інтэграцыйных працэсах на постсавецкай прасторы адыгрывала Расійская Федэрацыя. Аднак адносіны Расіі і іншых краін у рамках СНД заставаліся даволі складанымі. Шматлікія дакументы, падпісаныя падчас сустрэч, дэкларавалі неабходнасць збліжэння і інтэграцыі дзяржаў — удзельніц Садружнасці. Прынятыя рашэнні, аднак, слаба падмацоўваліся практычнымі крокамі. Таму прыярытэтнымі заставаліся двухбаковыя адносіны паміж Расіяй і іншымі дзяржавамі.

Найбольшы рух наперад быў дасягнуты ў адносінах паміж Расіяй, Беларуссю і Казахстанам. Пачаткам беларуска-расійскіх адносін сталі Дагавор аб утварэнні Супольнасці Расіі і Беларусі (1996) і Дагавор аб саюзе Беларусі і Расіі (1997). Наступным важным крокам з'явіўся **Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі,** падпісаны **8 снежня 1999 г.** Працэс будаўніцтва Саюзнай дзяржавы аказаўся няпростым. У яго нямала праціўнікаў, але ён аб'ектыўна адпавядае інтарэсам двух брацкіх народаў. Выступаючы 21 студзеня 2011 г. з інаўгурацыйнай прамовай, Прэ-



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

зідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка заявіў аб неабходнасці далейшага ўмацавання Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.

Неабходнасць эканамічнай інтэграцыі прывяла ў *2010 г.* да стварэння Расіяй, Беларуссю і Казахстанам **Мытнага Саюза,** а *18 лістапада 2011 г.* Расія, Беларусь і Казахстан падпісалі Дэкларацыю аб Еўразійскай эканамічнай інтэграцыі, канчатковая мэта якой — стварэнне Еўразійскага эканамічнага саюза.

Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё новых незалежных дзяржаў, якія ўтварыліся пасля распаду СССР, характарызуецца супярэчлівымі тэндэнцыямі.

У краінах **Балтыі**, якія арыентаваліся на заходнія дзяржавы і з 2004 г. сталі паўнапраўнымі членамі Еўрапейскага Саюза, вострую форму набыла праблема «рускамоўнага насельніцтва». У Латвіі і Эстоніі ўдзельная вага рускамоўнага насельніцтва (пераважна рускіх) пасля дасягнення незалежнасці перавышала долю карэнных жыхароў. Занепакоеныя такімі абставінамі, урады гэтых дзяржаў сур'ёзна абмежавалі права «рускамоўных» на атрыманне грамадзянства цэлым шэрагам умоў. Такое парушэнне правоў чалавека выклікае справядлівае абурэнне прадстаўнікоў «рускамоўнага насельніцтва».

У **Малдове** эканамічныя цяжкасці ўзмацняюцца крызісам вакол Прыднястроўя, дзе была сканцэнтравана значная частка прамысловага патэнцыялу рэспублікі. Пасля распаду СССР пракамуністычныя сілы абвясцілі тут утварэнне Прыднястроўскай Малдаўскай Рэспублікі (ПМР), якая стала арыентавацца на Расію. Малдова ўзяла курс на збліжэнне з Румыніяй. Сутыкненні паміж узброенымі сіламі ПМР і Малдовы прывялі да шматлікіх ахвяр у 1992 г. Пры пасрэдніцтве Расіі і Украіны ў Маскве ў 1997 г. паміж Малдовай і ПМР было падпісана пагадненне аб наданні Прыднястроўю аўтаноміі і самакіравання. Аднак адносіны паміж імі застаюцца неўрэгуляванымі і перыядычна абвастраюцца. Малдова прытрымліваецца федэратыўнай канцэпцыі дзяржаўнага ўладкавання, а ПМР праводзіць самастойную палітыку з арыентацыяй на Расію.

Адносіны паміж **Арменіяй** і **Азербайджанам** у апошнія дзесяцігоддзі ўскладніла праблема *Нагорнага Карабаха.* Тэрытарыяльныя спрэчкі і рэлігійныя канфлікты паміж гэтымі дзвюма дзяржавамі сягаюць у глыбіню стагоддзяў (азербайджанцы — мусуль-



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

мане, армяне — хрысціяне). Нагорна-Карабахская аўтаномная вобласць (НКАВ), утвораная ў 1923 г., уваходзіла ў склад Азербайджана, хоць большасць яе насельніцтва складалі армяне. У 1988 г. надзвычайная сесія абласнога савета НКАВ звярнулася з просьбай да Вярхоўнага Савета Азербайджанскай ССР аб выхадзе вобласці са складу Азербайджана і ўключэння яе ў склад Арменіі. Пасля гэтага ў рэгіёне пачаліся масавыя сутыкненні на нацыянальнай глебе. У Азербайджанскім горадзе Сумгаіт адбыліся пагромы армян. З рэспублікі ў рэспубліку рушылі патокі бежанцаў. Армяне пакідалі Азербайджан, азербайджанцы — Арменію.

У лістападзе 1991 г. НКАВ была пазбаўлена статуса аўтаноміі, што прывяло да яшчэ большага абвастрэння канфлікту. У верасні гэтага ж года была абвешчана Нагорна-Карабахская рэспубліка, у снежні ў НКАВ быў праведзены рэферэндум, падчас якога абсалютная большасць яе жыхароў выказалася за незалежнасць Нагорнага Карабаха. Паміж Арменіяй і Азербайджанам пачаліся ваенныя дзеянні. У выніку армяна-карабахскага наступлення з 1993 г. Азербайджан страціў кантроль над значнай часткай сваёй тэрыторыі. Ваенныя дзеянні спыніліся ў 1994 г. Пры пасрэдніцтве ААН паміж варагуючымі бакамі было заключана перамір’е, аднак праблема Нагорнага Карабаха да гэтага часу застаецца нявырашанай. Азербайджан імкнецца да аднаўлення тэрытарыяльнай цэласнасці краіны, Арменія — да ўмацавання свайго ўплыву ў Нагорным Карабаху, нават да яго далучэння.

З праблемай захавання тэрытарыяльнай цэласнасці сутыкнулася **Грузія,** якая ў знешняй палітыцы пачала арыентавацца на Захад, і асабліва на ЗША. Яшчэ ў 1989 г. кіраўніцтва Абхазскай аўтаномнай рэспублікі заявіла пра намер выйсці са складу Грузінскай ССР. У 1992 г. мясцовы парламент абвясціў незалежнасць Абхазіі ад Грузіі. Пасля гэтага канфлікт уступіў у ваенную фазу, падчас якой узброеныя сілы Грузіі пацярпелі паражэнне і былі выведзены з тэрыторыі Абхазіі. Пагадненне аб перамір’і паміж варагуючымі бакамі было падпісана ў Маскве ў 1994 г. Аналагічныя працэсы адбываліся ў Паўднёвай Асеціі, якая з 1989 г. настойліва патрабавала аддзялення ад Грузіі. Спроба вырашэння праблемы ўзброенай сілай прывяла Грузію да вайны з Расіяй у жніўні 2008 г., у якой яна пацярпела сакрушальнае паражэнне. Паўднёвая Асеція абвясціла незалежнасць і была прызнана


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Расійскай Федэрацыяй. Адначасова Расія прызнала суверэнны статус Абхазіі.

Важнай складаючай знешняй палітыкі Грузіі з'яўляецца яе антырасійская накіраванасць, якая асабліва ўзмацнілася пасля так званай «каляровай рэвалюцыі» 2003 г. Грузінскае кіраўніцтва настойліва дабіваецца ўступлення ў НАТО і па сутнасці ператварыла краіну ў інструмент рэалізацыі геапалітычных мэт ЗША ў Закаўказзі, што стварае непасрэдную пагрозу нацыянальным інтарэсам Расіі.

Унутраныя ўзрушэнні і сацыяльныя катаклізмы адбыліся ў былых савецкіх рэспубліках Цэнтральнай Азіі, дзе дэстабілізуючую ролю ў палітычным жыцці адыгрываюць мусульманскія фундаменталісты. Іх мэта — пабудова ісламскіх дзяржаў, метадам арацьбы часта з'яўляецца тэрарызм. Гэта праявілася ў ходзе падзей ва **Узбекістане**, калі ўрадам быў жорстка падаўлены «Андыжанскі мяцеж» (2005), а таксама працяглай грамадзянскай вайны, якая выбухнула ў 1992 г. у **Таджыкістане**. Барацьбу за ўладу і ўплыў у гэтай краіне вялі два варагуючыя лагеры. З аднаго боку, партыйна-дзяржаўная бюракратыя і прадстаўнікі інтэлігенцыі, з другога боку, ісламская апазіцыя, якую падтрымліваюць афганскія маджахеды. Вайна мела жорсткі і непрымірымы характар: падчас ваенных дзеянняў загінулі дзясяткі тысяч чалавек. І толькі пад ціскам Расіі бакі згадзіліся на перамовы. У 1997 г. было заключана Маскоўскае пагадненне аб спыненні баявых дзеянняў. Аднак спыненне вайны не прывяло да вырашэння супярэчнасцей. Ісламскі рух паранейшаму застаецца вядучай палітычнай сілай апазіцыі.

У адрозненне ад кіраўніцтва Узбекістана і Таджыкістана, кіраўніцтва **Кыргызстана** заявіла аб сваім імкненні ажыццяўляць рыначныя рэформы і будаваць прававую дзяржаву. Але і Кыргызстану не ўдалося пазбегнуць сацыяльных узрушэнняў. У 2005 г. у выніку ўзброенага выступлення апазіцыйных сіл прэзідэнт краіны А. Акаеў, які займаў гэты пост з 1990 г., быў адхілены ад улады. Стабільнай засталася сітуацыя ў Беларусі, Казахстане і Туркменістане.

### Пытанні і заданні:

1. Складзіце храналагічную табліцу палітычнага развіцця Расіі ў постперабудовачны перыяд.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

2. Прасачыце эвалюцыю расійскай дзяржаўнасці ў постперабудовачны перыяд. Складзіце схему дзяржаўнага кіравання ў сучаснай Расіі.
3. Ахарактарызуйце эканамічнае развіццё Расіі пасля распаду СССР. Якія станоўчыя і адмоўныя наступствы меў пераход расійскай эканомікі да рынаучных адносін? Якія эканамічныя праблемы застаюцца нявырашанымі да цяперашняга часу?
4. Чаму ў перыяд перабудовы абвастрыліся міжнацыянальныя праблемы?
5. Якія асноўныя напрамкі знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі? Вызначыце дасягненні і праблемы Расійскай Федэрацыі на міжнароднай арэне.
6. Апішыце развіццё дзяржаў, якія былі рэспублікамі СССР. З якімі праблемамі яны сутыкнуліся? Якім шляхам яны іх вырашаюць?
7. Прасачыце працэс утварэння СНД. Чым выклікаўны цяжкасці інтэграцыйных працэсаў паміж краінамі СНД?

**Прапануем абмеркаваць.** Выкарыстоўваючы інфармацыю СМІ, ацаніце змены, якія адбываюцца ў Расійскай Федэрацыі ў сацыяльна-эканамічнай сферы і палітыцы Расійскай Федэрацыі на міжнароднай арэне.

## § 19. НАВУКА І КУЛЬТУРА Ў СССР І РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ

**Успомніце:** *Які мастацкі метад быў пакладзены ў аснову развіцця савецкай літаратуры і мастацтва? Якія найбольш значныя дасягненні савецкай навукі міжваеннага перыяду і ў гады Вялікай Айчыннай вайны?*

Духоўнае і культурнае жыццё ў 1945 — 1991 гг. характарызавалася супярэчлівымі тэндэнцыямі. Пасляваенныя гады (1945 — 1953) — гэта гады вяртання да рэпрэсіўнай практыкі 1930-х гг., палітыкі жорсткага ідэалагічнага кантролю. Час «адлігі» (1953 — 1964) быў часам адноснай дэмакратызацыі ў сферы адукацыі, навукі і культуры. У перыяд так званага «застою» (1964 — 1985) разам з яркімі дасягненнямі ў навуцы і культуры назіраліся негатыўныя з’явы, як і ў цэлым у жыцці савецкага грамадства.


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Адукацыя.** Паспяховае аднаўленне народнай гаспадаркі ў пасляваенны перыяд дазволіла значна павялічыць колькасць навучэнцаў. У канцы 1950-х гг. была праведзена перабудова народнай адукацыі. Адной з важнейшых мэт рэформы, якая праводзілася, было аб'яднанне навучання з вытворчай працай. З 1957 г. уводзіліся новыя правілы прыёму ў ВНУ, па якіх перавагі атрымлівалі дэмабілізаваныя з радоў Савецкай Арміі і асобы, якія мелі стаж працы больш чым два гады. Такім чынам, пашыраўся кантынгент навучэнцаў за кошт маладых рабочых і калгаснікаў.

У снежні 1958 г. быў прыняты закон, у адпаведнасці з якім замест сямігадовай адукацыі ўводзілася ўсеагульная абавязковая васьмігадовая адукацыя. Паступленне ў ВНУ было магчыма толькі пры наяўнасці вытворчага стажу.



*Будынак Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта.*

У 1970-я гг. у краіне разгарнулася падрыхтоўчая работа па ўвядзенню ўсеагульнай сярэдняй адукацыі. У гады дзясятай пяцігодкі пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі быў завершаны. У гэты ж час павялічылася колькасць навуковых устаноў і выпуск спецыялістаў з вышэйшых навучальных устаноў. Разам з тым якасць падрыхтоўкі ў школе і ў ВНУ пачала зніжацца. У 1960-я — 1980-я гг., нягледзячы на колькасны рост навучэнцаў з сярэдняй адукацыяй, агульны ўзровень падрыхтоўкі не адпавядаў сучасным патрабаванням. У школах навучэнцаў рыхтавалі да прадаўжэння адукацыі ў ВНУ, у той час як грамадству востра не хапала кваліфікаваных спецыялістаў сярэдняга звяна. Крызісны стан школьнай адукацыі выклікаў спробу ажыццявіць у 1983 — 1984 гг. рэформу школы, каб зарыентаваць яе на патрэбы эканомікі. Але крызісныя з'явы ў СССР не дазволілі ажыццявіць гэтыя планы.

**Навука.** Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны пачалася работа па аднаўленню і адкрыццю новых навуковых цэнтраў, навукова-даследчых інстытутаў. Кіраўніцтва СССР выдзяляла велізарныя фінансавыя сродкі для навукі. У сувязі з пачаткам «халоднай вайны» неабходна было пераадольваць тэхналагічнае і навуковае адставанне ад моцнага саперніка — ЗША. Рост патрэбнасцей у



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

спецыялістах стымуляваў павелічэнне колькасці інстытутаў, звязаных з перадавымі тэхналогіямі: рэактыўнай тэхнікай, радыёэлектронікай, ядзернай энергетыкай, аўматыкай і інш. У той жа час шэраг кірункаў, якія здаваліся кіраўніцтву краіны неперспектыўнымі, а часам і шкоднымі і нават абвяшчаліся лжэнавукамі (квантавая механіка, кібернетыка, генетыка), у пасляваенныя гады не фінансаваліся. Грамадскія навукі знаходзіліся пад пастаянным ідэалагічным кантролем.

Для забеспячэння ваенна-прамысловага комплексу СССР у кароткія тэрміны былі пабудаваны шматлікія заводы і цэлыя навуковыя гарады. Першым такім цэнтрам стаў Арзамас-16, размешчаны недалёка ад г. Горкі (цяпер Ніжні Ноўгарад). Усяго ў СССР да 1991 г. налічвалася 47 такіх «закрытых» цэнтраў з насельніцтвам каля 1,5 млн чалавек.

У пасляваенныя гады актыўна развіваліся навуковыя школы, якія стваралі абарончую магутнасць краіны. Працавалі закрытыя канструктарскія бюро пад кіраўніцтвам А. М. Тупалева, С. У. Ільюшына, П. В. Сухога, С. П. Каралёва, М. Ц. Калашнікава. У 1949 г. быў паспяхова ажыццёўлены атамны праект (І. Я. Там, Ю. Б. Харытон, І. В. Курчатаў, А. Д. Сахараў).

## Гістарычны партрэт



**Андрэй Дзмітрыевіч Сахараў** (1921 — 1989) — савецкі вучоны, грамадскі дзеяч. У 1947 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю. На працягу 20 гадоў працаваў у спецыяльнай групе па распрацоўцы тэрмаядзернай зброі. У 1953 г. стаў доктарам фізіка-матэматычных навук, у тым жа годзе быў абраны акадэмікам, тройчы атрымаў званне Героя Сацыялістычнай Працы, удастоены Сталінскай (Дзяржаўнай) прэміі. З канца 1950-х гг. актыўна выступаў за спыненне выпрабаванняў ядзернай зброі, стаў адным з лідараў праваабарончага руху, за што быў адхілены ад работы. Рэзка асудзіў савецкае ўварванне ў Афганістан у 1979 г. За гэта ён быў пазбаўлены ўсіх урадавых узнагарод, уключаючы званне Героя Сацыялістычнай Працы, высланы ў г. Горкі (цяпер Ніжні Ноўгарад) і змешчаны пад хатні арышт. Быў вызвалены з горкаўскай ссылкі ў 1986 г. У 1989 г. выбраны народным дэпутатам СССР. Лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру (1975).



АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

У гады рэформ М. С. Хрушчова адбылася рэарганізацыя Акадэміі навук СССР. У маі 1957 г. быў створаны буйны навуковы цэнтр — Сібірскае аддзяленне Акадэміі навук СССР. Пачалося будаўніцтва ў раёне Новасібірска навуковага гарадка, які ў хуткім часе стаў буйнейшым у СССР даследчыцкім цэнтрам. У 1957 г. у СССР быў запушчаны самы магутны ў свеце паскаральнік элементарных часціц — сінхрафазатрон. У 1956 г. у Дубне (пад Масквой) быў створаны буйнейшы міжнародны даследчыцкі цэнтр — Аб'яднаны інстытут ядзерных даследаванняў. Сусветную вядомасць атрымалі работы савецкіх фізікаў — акадэмікаў Л. Д. Ландау, М. А. Леантовіча, І. Я. Тама, М. М. Багалюбава і інш. Пачалася вытворчасць айчыннай вылічальнай тэхнікі. Важнае тэарэтычнае і прыкладное значэнне мелі працы акадэмікаў Л. А. Арцымовіча, М. У. Келдыша, М. А. Лаўрэнцьева, якія знайшлі прымяненне ў галіне тэорыі ядзернага сінтэзу, тэорыі поля, у гідрадынаміцы, аэрадынаміцы і іншых галінах навук.

У цэлым савецкая навука ў фундаментальных галінах не адставала ад навукі заходніх краін, а вось у прыкладной галіне, і асабліва ў камп'ютарызацыі, яна адставала. Найбольшыя поспехі былі дасягнуты савецкай навукай у галіне фізікі, хіміі, у асваенні космасу. Пастаянны навуковы прагрэс назіраўся толькі ў ваенных галінах.

Перабудовачныя працэсы абярнуліся для навукі істотнымі стратамі. Многія вучоныя змянілі характар сваёй дзейнасці ці пакінулі краіну.

**Мастацкая культура і літаратура.** Асноўнай тэндэнцыяй развіцця літаратурнага мастацкага працэсу ў СССР стаў паступовы пераход творчай інтэлігенцыі ад прынцыпаў «партыйнага мастацтва» і пераарыентацыя іх на гуманістычныя ідэалы і агульначалавечыя каштоўнасці.

У пасляваенныя гады асабліва ўзмацніўся націск партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва на літаратуру. Пачынаючы з 1946 г. партыйны ідэолаг А. А. Жданаў правёў шэраг ідэалагічных кампаній, у ходзе якіх асноўны ўдар наносіўся па творчай інтэлігенцыі пад сцягам чысціні сацыялістычнага рэалізму. У 1946 — 1947 гг. жорстка крытыкавалася творчасць М. Зошчанкі, Г. Ахматавай, У. Пудоўкіна, С. Эйзенштэйна, А. Аляксандрава, С. Пракоф'ева, В. Мурадэлі, А. Хачатурана, Д. Шастаковіча.


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



*М. С. Хрушчоў з мастакамі на выстаўцы ў Манежы. Масква, 1962 г.*

У перыяд «адлігі» адзначаўся прыкметны пад'ём у літаратуры і мастацтве, чаму нямала садзейнічала рэабілітацыя часткі дзеячаў культуры. У 1958 г. былі прыняты пастановы ЦК КПСС «Аб выпраўленні памылак...», дзе асуджаліся жданаўскія кампаніі. Разам з тым партыйныя кіраўнікі па-ранейшаму кантралявалі літаратуру, жывапіс, навуку, спрабуючы падпарадкаваць ідэалагічным штампам творчы працэс. Пад кантролем дзяржавы створаны новыя творчыя саюзы: Саюз работнікаў кінематаграфіі СССР, Саюз пісьменнікаў РСФСР, Саюз мастакоў РСФСР і г.д. У 1957—1962 гг. праводзіліся сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з дзеячамі культуры і мастацтва, прадстаўнікамі інтэлігенцыі, на якіх гучалі надзвычай рэзкія ацэнкі такіх твораў, як раманы «Не хлебам адзіным» У. Дудзінцава, «Рычагі» А. Яшына, «Асабістая думка» Д. Граніна, «Сем дзён тыдня» С. Кірсанава, фільма «Застава Ільіча» М. Хуцыева. У 1961 г. Б. Пастарнак за раман «Доктар Жывага» быў выключаны з Саюза пісьменнікаў СССР. У снежні 1962 г. М. С. Хрушчоў наведаў выстаўку маскоўскіх мастакоў у Манежы, якая скончылася разгромным выступленнем у адрас мастакоў. У 1964 г. было пачата судовае праследаванне пісьменнікаў Ю. Даніэля і А. Сіняўскага за публікацыю літаратурных «антысавецкіх» твораў.

Развіццё літаратуры ў 1960-я — 1980-я гг. мела супярэчлівы характар. Пастаянная апека дзеячаў культуры з боку дзяржаўнага



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

апарату, і перш за ўсё Міністэрства культуры, часта прыводзіла да зніжэння мастацкага ўзроўню твораў. Літаратурныя творы, якія не супадалі з усталяванымі ідэалагічнымі канонамі, не публікаваліся. Кінафільмы заставаліся ў сховішчах і не даходзілі да шырокага гледача. Дзеячы культуры, якія не прымалі «правіл гульні» і выступалі з уласнымі ацэнкамі, меркаваннямі, сумненнямі, часцей за ўсё высылаліся за межы СССР ці пазбаўляліся магчымасці працаваць. У 1970-я — пачатку 1980-х гг. за мяжой апынуліся пісьменнікі В. Аксёнаў, А. Салжаніцын, У. Максімаў, В. Някрасаў, У. Вайновіч, паэт І. Бродскі, кінарэжысёр А. Таркоўскі, тэатральны рэжысёр Ю. Любімаў, віяланчэліст М. Растраповіч, оперная спявачка Г. Вішнеўская, паэт і выканаўца А. Галіч і інш. Жорстка кантралявалася з боку Міністэрства культуры дзейнасць асобных прадстаўнікоў мастацкай інтэлігенцыі — А. Германа, Т. Абуладзе, С. Параджанава, братоў Міхалковых, Э. Неізвеснага, М. Шэмякіна.

## Гістарычны партрэт



**Аляксандр Трыфанавіч Твардоўскі** (1910 — 1971) — савецкі рускі паэт і грамадскі дзеяч. Творчы шлях пачаў у 1924 г. Падчас вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г., савецка-фінляндскай 1939 — 1940 гг. і Вялікай Айчыннай войн працаваў ваенным карэспандэнтам. У паэме «Васіль Цёркін: Кніга пра байца» (1942 — 1945) стварыў вобраз бывалага салдата, у якім прадстаўлены лепшыя духоўныя і маральныя рысы народа. У лірыка-публіцыстычнай паэме «За даллю — даль» (1953 — 1960) адлюстраваны найбольш істотныя з'явы ў жыцці краіны, настроі грамадства ў 1950-я гг. З'яўляецца аўтарам сатырычнай паэмы «Цёркін на тым свеце» (1963), лірыка-эпічнага цыкла вершаў «Па праву памяці» (1968 — 1969), нарысаў, апавяданняў і аповесцей. Амаль 20 гадоў узначальваў літаратурны часопіс «Новый мир», які стаў сімвалам «адлігі». На старонках часопіса друкаваліся новыя творы айчынных аўтараў і замежных пісьменнікаў. Высока ацэньваў творчасць беларускіх літаратараў. Перакладаў на рускую мову беларускія народныя песні, творы Янкі Купалы, Якуба Коласа, А. Куляшова.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

У той жа час у гэты перыяд з'явіўся цэлы шэраг яркіх, высокамастацкіх літаратурных твораў, створаных знакамітымі савецкімі пісьменнікамі, як М. Шолахаў, В. Распуцін, Л. Лявонаў, В. Астаф'еў, А. Твардоўскі, І. Драч, В. Быкаў, І. Шамякін, Ч. Айтматаў, Д. Гранін, Ю. Бондараў, Ф. Іскандэр і многімі іншымі. У 1960-я — 1970-я гг. узышла літаратурная зорка паэтаў Я. Еўтушэнкі, А. Вазнясенскага, Б. Ахмадулінай, Р. Раждзественскага, М. Рубцова. Здабыткам савецкага мастацтва стала творчасць выдатных артыстаў і акцёраў А. Баталава, Я. Еўсцігнеева, Я. Лявонава, І. Смактуноўскага.



*Кадр з фільма М. К. Калатозава «Ляцяць жураўлі». 1957 г.*

Яркімі музычнымі творамі была адзначана творчая дзейнасць кампазітараў Д. Шастаковіча, Г. Свірыдава, А. Хачатурана, А. Шнітке, А. Пятрова, Я. Цікоцкага. Уся краіна спявала песні А. Пахмутавай, М. Фрадкіна, Я. Фрэнкеля. Атрымалі шырокае распаўсюджванне запісы бардаўскіх песень і сатырычных выступленняў. Лідарамі тут сталі У. Высоцкі, А. Галіч, Ю. Кім, Б. Акуджава, А. Райкін, М. Жванецкі.

З пачаткам перабудовы паступова знік партыйна-дзяржаўны кантроль у сферы культуры. Выйшлі ў свет новыя ці раней забароненыя цэнзурай творы, кнігі і фільмы. Аднак адмаўленне ад дзяржаўнай падтрымкі культуры, стомленасць грамадства ад палітыкі і засілля не лепшых узораў магутнай амерыканскай масавай культуры прывялі да таго, што за наступныя гады з'явілася мала яркіх імён і па-сапраўднаму моцных твораў.

**Духоўнае жыццё Расіі ў канцы XX — пачатку XXI ст.** Ужо ў канцы 1980-х гг. рэзка крытыкаваўся адзіны афіцыйна прызнаны мастацкі метад у СССР — метад сацыялістычнага рэалізму. Многія дзеячы культуры звярнуліся да авангарднага мастацтва — *канцэптуалізму, постмадэрнізму*. Аднак мастацтва авангарда звернута, як вядома, да эліты, даволі вузкага кола людзей — знатакоў. У 1990-я гг. Расію запаланілі нізкапробныя падробкі з заходніх краін, што адыграла пэўную ролю ў падзенні нораваў, асабліва сярод моладзі.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Характэрнай асаблівасцю літаратуры 1990-х гг. стала захапленне публіцыстыкай. Многія пісьменнікі, у тым ліку А. Салжаніцын, В. Бялоў і інш., спрабавалі з крытычных пазіцый асэнсаваць пераўтварэнні, якія пачаліся. Расійская літаратура гэтага часу ў значнай ступені адлюстроўвае разгубленасць, неразуменне і настальгію людзей па зыходзячай эпосе, якія былі выкліканы распадам адзінай дзяржавы. Асаблівае месца ў гэтым шэрагу занялі творы пісьменнікаў старэйшага пакалення — В. Аксёнава, Ф. Іскандэра, Л. Лявонава, В. Распуціна.

Пісьменнікі малодшага пакалення трымаюцца іншых уяўленняў, жанраў і мастацкіх прыёмаў. Для іх твораў часта характэрныя фантастычнасць сюжэтаў, іранічна-гратэскныя адносіны да ўсяго савецкага, элементы і прыёмы постмадэрнізму.

У галіне кінематаграфіі назіралася творчае зацішша, абумоўленае фінансавым крызісам. Масава выпускаліся серыялы і нізкаякасная мастацкая кінапрадукцыя. Толькі некалькі кінастужак выклікалі прыкметны грамадскі інтарэс: «Стомленыя сонцам» і «Сібірскі цырульнік» М. Міхалкова, «Брат» А. Балабанава, «Каўказскі палонны» С. Бадрова-старэйшага, «Молах» А. Сакурава, «Востраў» П. Лунгіна, «Брэсцкая крэпасць» А. Котта і некаторыя іншыя. Героямі цэлага шэрага кінафільмаў сталі прадстаўнікі крымінальнага свету, нярэдка надзеленыя станоўчымі рысамі («Брыгада», «Бумер» і інш.).



*Э. Неізвесны. Помнік М. С. Хрушчову на Навадзявочых могілках у Маскве.*

У пачатку 1990-х гг. дзеячы расійскага музычнага мастацтва выехалі за мяжу. Многія з іх, не парываючы творчых сувязей з замежнымі тэатрамі і аркестрамі, узначалілі творчыя калектывы ў Расіі (У. Федасееў, Ю. Цемірканаў, У. Співакоў і інш.).

У жывапісе развіваліся розныя напрамкі. Карціны сацыяльнай праблематыкі савецкага перыяду саступілі месца як абстракцыянісцкім, так і рэалістычным жывапісным палотнам, пейзажам і нацюрмортам. Вырасла цікавасць да гісторыі. Героямі



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

многіх твораў мастацтва сталі гістарычныя асобы, якія неадназначна, а часам і адмоўна ацэньваліся ў савецкі перыяд.

Пасля распаду СССР духоўнае і культурнае жыццё Расіі праходзіла ў новых гістарычных умовах. Важнейшым фактарам культурнага працэсу стала набыццё творчай свабоды, зняцце цэнзурных абмежаванняў, рэзкае скарачэнне дзяржаўных выдаткаў на развіццё ўстаноў культуры і матэрыяльная залежнасць ад спонсараў і мецэнатаў. Нягледзячы на шматлікасць мастацкіх стыляў і кірункаў, масавае прызнанне атрымалі творы мастацтва, створаныя ў традыцыях рэалізму.

## Пытанні і заданні:

1. Выдзеліце асноўныя этапы ў развіцці духоўнага жыцця савецкага і расійскага грамадства пасляваеннага перыяду.
2. Чым тлумачыцца неабходнасць правядзення рэформ у адукацыі? Якія змены ў сістэме адукацыі адбываліся ў пасляваенны перыяд?
3. Вызначыце асноўныя напрамкі развіцця навукі на розных этапах развіцця савецкага і расійскага грамадства. Назавіце імёны вучоных, якія зрабілі значны ўклад у развіццё навукі.
4. Ахарактарызуйце развіццё мастацкай культуры і літаратуры ў савецкі перыяд. Якія змены ў развіцці культуры адбыліся ў перыяд перабудовы? Якія новыя праблемы ўзніклі ў развіцці расійскай культуры?
5. Якія з’явы характарызуюць сучасную расійскую культуру?
6. З творчасцю якіх дзеячаў савецкай і расійскай культуры вы знаёмы? Выкажыце сваё меркаванне аб іх творчасці.

**Прапануем абмеркаваць.** Як вы думаеце, чаму, нягледзячы на цэнзуру і ідэалагічны ціск, у савецкі перыяд была створана вялікая колькасць высокадухоўных твораў культуры?

## Гістарычны дакумент

### З запіскі КДБ пры Савеце Міністраў СССР у Сакратарыят ЦК КПСС

*21 снежня 1970 г.*

Аналіз так званай «самвыдавецкай» літаратуры, якая распаўсюджваецца ў колах інтэлігенцыі і навучэнскай моладзі, паказвае, што «самвыд» зведаў



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

за апошнія гады якасныя змены. Калі пяць гадоў таму адзначалася хаджэнне па руках аднолькавым чынам ідэйна разбэшчаных мастацкіх твораў, у цяперашні час усё большыя распаўсюджванні атрымліваюць дакументы праграмна-палітычнага характару. За перыяд з 1965 г. з'явілася больш за 400 розных даследаванняў і артыкулаў па эканамічных, палітычных і філасофскіх пытаннях, у якіх з розных бакоў крытыкуецца гістарычны вопыт сацыялістычнага будаўніцтва ў Савецкім Саюзе, рэвізуецца знешняя і ўнутраная палітыка КПСС, прапануюцца рознага кшталту праграмы апазіцыйнай дзейнасці…

Цэнтрамі распаўсюджвання пазацэнзурных матэрыялаў па-ранейшаму застаюцца Масква, Ленінград, Кіеў, Горкі, Новасібірск, Харкаў.

*Што такое «самвыд»? Чым выклікана яго з'яўленне? Якога кшталту літаратура з'яўлялася ў «самвыдаце»? Сярод якіх слаёў насельніцтва яна ў асноўным распаўсюджвалася?*

## Гістарычная даведка

**Лаўрэаты Нобелеўскай прэміі СССР і Расійскай Федэрацыі**

| **Літаратура** | **Фізіка** |
|---|---|
| Б. Пастарнак (1958) | П. Чаранкоў, І. Франк, І. Там (1958) |
| М. Шолахаў (1965) | Л. Ландау (1962) |
| А. Салжаніцын (1970) | М. Басаў, А. Прохараў (1964) |
| І. Бродскі (1987) | П. Капіца (1978) |
| **Хімія** | Ж. Алфёраў (2000) |
| М. Сямёнаў (1956) | А. Абрыкосаў, В. Гінзбург (2003) |
| **Прэмія міру** | К. Навасёлаў, А. Гейм (2010) |
| А. Сахараў (1975) | **Эканоміка** |
| М. Гарбачоў (1990) | Л. Кантаровіч (1975) |



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

# УРОК АБАГУЛЬНЕННЯ

**1.** Дайце кароткую характарыстыку эканамічнага развіцця СССР у пазначаныя перыяды.

| | |
|---|---|
| 1945 — 1953 гг. | |
| 1954 — 1965 гг. | |
| Другая палова 1960-х гг. | |
| 1970-я — першая палова 1980-х гг. | |

**2.** Прааналізуйце даныя табліцы і зрабіце вывад аб характары развіцця савецкай эканомікі.

**Развіццё сродкаў вытворчасці і прадметаў спажывання ў агульным аб'ёме прамысловай вытворчасці СССР (1940 — 1986 гг.) (%)**

| Паказчык | Гады | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1940 | 1960 | 1970 | 1980 | 1985 | 1986 |
| Уся прадукцыя прамысловасці (%) | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 |
| У тым ліку:<br>Група «А»<br>Група «Б» | 61,0<br>39,0 | 72,5<br>27,5 | 73,4<br>16,6 | 73,8<br>26,2 | 74,8<br>25,2 | 75,3<br>24,7 |

**3.** Які перыяд гісторыі савецкага грамадства называюць «перабудовай»? Якія прычыны прывялі да неабходнасці перабудовы савецкага грамадства? Якія асноўныя вынікі перабудовы?

**4.** Перабудова, якую пачаў М. С. Гарбачоў, да цяперашняга часу выклікае супярэчлівыя ацэнкі сучаснікаў. Якое, на ваш погляд, гістарычнае значэнне гэтых падзей? Свой адказ аргументуйце.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**5.** Сярод вучоных няма адзінага пункту гледжання на тое, якія прычыны прывялі да распаду СССР. Якія б вы выдзелілі аб'ектыўныя і суб'ектыўныя прычыны распаду СССР?

**6.** Параўнайце працэс стварэння і функцыянавання СНД з СССР і ЕС. У чым вы бачыце падабенства? Чым яны прынцыпова адрозніваюцца? На аснове інфармацыі СМІ падрыхтуйце паведамленне аб дзейнасці СНД на сучасным этапе.

**7.** Ахарактарызуйце палітычную, сацыяльна-эканамічную сістэмы Расійскай Федэрацыі. Як вы лічыце, ці створаны ў Расійскай Федэрацыі ўмовы для развіцця эканомікі, сацыяльнай сферы грамадства? Свой пункт гледжання аргументуйце.

**8.** З якімі праблемамі ў галіне нацыянальных адносін сутыкнулася Расійская Федэрацыя? Як яны вырашаюцца ў цяперашні час?

**9.** Параўнайце асноўныя напрамкі знешняй палітыкі СССР і Расійскай Федэрацыі. Як змянілася роля новай Расіі ў сістэме міжнародных адносін?

**10.** У якіх галінах навукі і тэхнікі былі дасягнуты найбольш значныя поспехі СССР? Якімі новымі з'явамі характарызуецца развіццё навукі, адукацыі і мастацтва ў Расійскай Федэрацыі? Якія праблемы развіцця навукі і мастацтва існавалі ў СССР, якія існуюць у цяперашні час у Расійскай Федэрацыі, іншых краінах СНД?

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

# Раздзел III

# КРАІНЫ АЗІІ, АФРЫКІ І ЛАЦІНСКАЙ АМЕРЫКІ

## § 20. РАСПАД КАЛАНІЯЛЬНАЙ СІСТЭМЫ

**Успомніце:** *Які ўплыў на палітычнае развіццё каланіяльных і залежных краін зрабіла Другая сусветная вайна?*

Пасля Другой сусветнай вайны рэзка змяніліся суадносіны сіл на міжнароднай арэне. Уплыў еўрапейскіх краін зменшыўся, у той час як ЗША і СССР сталі звышдзяржавамі, паміж якімі пачалася «халодная вайна». Але самымі істотнымі зменамі былі крах каланіяльнай сістэмы і з'яўленне вялікай колькасці новых незалежных дзяржаў. Працэс вызвалення краін і народаў Азіі і Афрыкі ад каланіяльнага панавання пасля Другой сусветнай вайны ўвайшоў у гісторыю пад назвай **дэкаланізацыя.** Працэс дэкаланізацыі можна падзяліць на тры ўмоўныя этапы.

*Першы этап (1945 — сярэдзіна 1950-х гг.)* характарызуецца тым, што ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе незалежнымі сталі Індыя, Інданезія, Бірма. Усяго за гэты перыяд незалежнасць атрымалі 11 дзяржаў у Азіі і адна ў Афрыцы — Лівія.

*Другі этап (сярэдзіна 1950-х — сярэдзіна 1970-х гг.)* стаў перыядам вызвалення ад каланіяльнай залежнасці значнай часткі Афрыканскага кантынента. У 1960 г. Генеральная Асамблея ААН прыняла Дэкларацыю «Аб прадастаўленні незалежнасці каланіяльным краінам і народам». З гэтага часу дэкаланізацыя была пастаўлена пад міжнародны кантроль.

*Трэці этап (1975 — 1990-я гг.)* азнаменаваны крушэннем партугальскай каланіяльнай імперыі, у выніку чаго ўся тэрыторыя Афрыкі стала свабоднай ад каланіялізму.

**Набыццё незалежнасці.** Да 1930-х гг. у краінах Азіі і Афрыкі склаліся нацыянальныя рухі. Пасля Другой сусветнай вайны,



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



*Л. І. Брэжнеў падчас візіту ў Афрыку з прэзідэнтам Гвінеі Секу Турэ. 1961 г.*

у **1947 г.,** незалежнасці ад Вялікабрытаніі дабілася Індыя. На месцы былой брытанскай калоніі ўзніклі дзве незалежныя дзяржавы — Індыя і Пакістан.

Спачатку Вялікабрытанія, Францыя і іншыя еўрапейскія дзяржавы імкнуліся захаваць свае каланіяльныя імперыі, але працяглая і цяжкая вайна вычарпала іх ваенныя і фінансавыя рэсурсы. Многія еўрапейцы, якія перажылі вайну, не жадалі далейшых канфліктаў з народамі, гатовымі ваяваць за сваю свабоду і незалежнасць.

«Халодная вайна» таксама падрывала сілы імперыялізму. ЗША, хоць часта і дэкларатыўна, падтрымлівалі права прыгнечаных народаў на нацыянальнае самавызначэнне. Сапернік ЗША Савецкі Саюз рэзка выступаў супраць каланіялізму і капіталістычнай мадэлі развіцця. Працэс дэкаланізацыі пасля вайны набыў незваротны характар. Каланіяльныя і залежныя краіны адна за адной дабіваліся сваёй незалежнасці. Хутка абедзве звышдзяржавы пачалі шукаць саюзнікаў сярод новых дзяржаў.

Міжнародным **Годам Афрыкі** быў абвешчаны **1960 г.,** калі 17 афрыканскіх каланіяльных тэрыторый набылі незалежнасць. **У 1963 г.** гэтыя дзяржавы заснавалі **Арганізацыю Афрыканскага Адзінства (ААА).** У выніку «вялікага вызвалення» ў свеце з'явілася каля 100 новых незалежных дзяржаў.

**Краіны «трэцяга свету».** Новыя дзяржавы Азіі і Афрыкі, а таксама краіны Лацінскай Амерыкі сталі вядомы пад назвай **краін на стадыі развіцця,** або **краін «трэцяга свету».** Тэрмін «трэці свет» выкарыстоўваўся для абазначэння дзяржаў, менш развітых, чым «першы свет» (заходнія індустрыяльныя дзяржавы і Японія) ці «другі свет» (краіны сацыялістычнага лагера).

Нягледзячы на тое, што дзяржавы «трэцяга свету» мелі істотныя адрозненні, у іх былі агульныя мэты. Усім неабходна было правесці мадэрнізацыю, што прадугледжвала пабудову стабільнай



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"




*Дэкаланізацыя Афрыкі.*

і сучаснай сістэмы кіравання і вырашэння найбольш актуальных сацыяльна-эканамічных праблем з мэтай ліквідацыі каланіяльнай спадчыны і шматвяковай адсталасці. Да мадэрнізацыі яны ішлі рознымі шляхамі, але многія сутыкнуліся з падобнымі цяжкасцямі: эканамічная адсталасць, жабрацтва, перанаселенасць, непісьменнасць і г.д. Большасць з краін «трэцяга свету» ўступілі



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

ў ААН, дзе сталі адыгрываць прыкметную ролю, аб'яднаўшы свае інтарэсы і часта выступаючы адзіным блокам. Многія з гэтых краін маюць вялікае значэнне ў глабальных палітычных і эканамічных працэсах.

**«Халодная вайна» і «трэці свет».** Новыя дзяржавы ўзніклі ў перыяд «халоднай вайны». ЗША і СССР змагаліся за ўплыў у свеце, прапаноўваючы эканамічную і ваенную дапамогу краінам «трэцяга свету». Кожная звышдзяржава імкнулася да таго, каб новыя краіны ўспрынялі яе ідэалогію і мадэль развіцця: капіталізм ці сацыялізм. Многія новыя дзяржавы аддалі перавагу сацыялізму галоўным чынам з-за таго, што іх старыя каланіяльныя ўладары былі капіталістамі. Іншыя дзяржавы прываблівалі эканамічная магутнасць і матэрыяльны дабрабыт Захаду.

Імкнучыся пазбегнуць удзелу ў палітыцы звышдзяржаў, многія новыя дзяржавы вырашылі не далучацца ні да аднаго з бакоў, што сапернічалі ў «халоднай вайне». Яны стараліся захаваць нейтралітэт і пры гэтым надаць сваёй палітыцы пэўныя арганізацыйныя формы (рэгулярныя сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў ці міністраў замежных спраў, узгодненыя дзеянні ў ААН і іншых міжнародных арганізацыях). Так у другой палове 1950-х гг. узнік **Рух недалучэння.** Асноўнай яго мэтай было аслабленне міжнароднай напружанасці і правядзенне эканамічнай палітыкі, выгаднай менавіта краінам «трэцяга свету». Лідарам гэтага руху стала Індыя, якая ў перыяд кіравання Дж. Нэру ўзяла курс на стварэнне грамадства сацыялістычнага ўзору.

У краінах Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі даволі часта выбухалі лакальныя канфлікты. ЗША і СССР, як правіла, падтрымлівалі процілеглыя бакі. Выкарыстоўваючы такія канфлікты, звышдзяржавы ваявалі адна з адной ускосна, а не напрамую.

Часам «халодная вайна» ператваралася ў сапраўдныя войны, асабліва ў Азіі. Яркім прыкладам гэтага служыць вайна ЗША супраць в'етнамскага народа **(1964 — 1973)**, развязаная з мэтай перашкодзіць распаўсюджванню ўплыву СССР у Паўднёва-Усходняй Азіі. Адным з самых працяглых і вострых канфліктаў стала араба-ізраільскае супрацьстаянне на Блізкім Усходзе ў другой палове XX — пачатку XXI ст. Важную ролю ва ўрэгуляванні канфліктаў у краінах «трэцяга свету» адыгрывала Арганізацыя



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Аб'яднаных Нацый (ААН). Заканчэнне «халоднай вайны» не прывяло да ліквідацыі лакальных канфліктаў.

**Новыя дзяржавы ў пошуках стабільнасці.** Многія краіны «трэцяга свету» сутыкнуліся з сур'ёзнымі праблемамі, асабліва ў Афрыцы. Тут маладыя дзяржавы атрымалі ў спадчыну неўпарадкаваныя тэрыторыі, на якіх жылі людзі з рознай моўнай, рэлігійнай і этнічнай ідэнтычнасцю. Каланіяльныя правіцелі, якія актыўна прымянялі палітыку «падзяляй і ўладай», часта выкарыстоўвалі этнічнае саперніцтва. Пасля атрымання незалежнасці насельніцтва Афрыканскага кантынента заставалася разнастайным у эканамічных і культурных адносінах.

Новыя дзяржавы прымалі канстытуцыі па ўзору заходніх дэмакратычных краін. Але толькі нямногія з іх змаглі падтрымліваць дэмакратычнае кіраванне. Народы, якія вызваліліся ад каланіяльнай залежнасці, былі слаба падрыхтаваны да самакіравання. Часта багатая еўрапеізаваная эліта кантралявала ўрад і эканоміку краін «трэцяга свету». Пераважная большасць насельніцтва заставалася бедным.

У 1948 г. у **Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы (ПАР)** на ўсеагульных выбарах перамагла Нацыянальная партыя. Яна правяла некалькі вельмі строгіх законаў, што абмяжоўвалі правы чарнаскурага насельніцтва. Канчатковай мэтай палітыкі **апартэіду,** гэта значыць раздзельнага пражывання, падзелу і абасаблення па расавай прыкмеце, было стварэнне «Паўднёвай Афрыкі для белых». Толькі ў 1994 г. у ПАР адбыліся свабодныя і сумленныя ўсеагульныя выбары, прызнаныя міжнароднай супольнасцю. Перамогу атрымаў Афрыканскі нацыянальны кангрэс, які знаходзіцца ва ўладзе да гэтага часу.

Па меры нарастання праблем да ўлады прыходзілі ваенныя ці аўтарытарныя лідары. Часта гэта былі тыя ж людзі, якія актыўна змагаліся за нацыянальнае вызваленне. Яны ўсталёўвалі аднапартыйную дыктатуру, забаранялі іншыя палітычныя партыі, заяўляючы, што шматпартыйная сістэма пагражае стабільнасці ў дзяржаве.

У выніку перамогі ў грамадзянскай вайне 1975 г. да ўлады ў **Камбоджы** прыйшлі «чырвоныя кхмеры» на чале з Пол Потам. У краіне быў развязаны генацыд супраць уласнага народа. У 1978 г. Пол Пот пачаў вайну з В'етнамам. У 1979 г. в'етнамскія войскі скінулі рэжым «чырвоных кхмераў». У выніку, па розных ацэнках, было знішчана ад 1 млн да 3 млн чалавек.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Пэўныя дэмакратычныя пераўтварэнні адбыліся ў краінах «трэцяга свету» ў канцы 1980-х — пачатку 1990-х гг. У шэрагу афрыканскіх, азіяцкіх і лацінаамерыканскіх дзяржаў адбыліся шматпартыйныя выбары. Аднак эканамічная сітуацыя ў многіх краінах «трэцяга свету», асабліва ў Афрыцы, застаецца складанай, захоўваецца высокі ўзровень беднасці.

**Перашкоды на шляху развіцця новых дзяржаў.** Некаторыя краіны «трэцяга свету», напрыклад Паўднёвая Карэя, Малайзія, Інданезія, Сінгапур, Тайланд, Філіпіны, дасягнулі пэўнага прагрэсу на шляху мадэрнізацыі, а такія, як Эфіопія, Самалі, Марока і іншыя, не дасягнулі прыкметных вынікаў. Чаму ж яны не змаглі дасягнуць пастаўленых мэт? Прычыны разнастайныя, але галоўным з'яўляецца тое, што многія дзяржавы сутыкнуліся з праблемамі, якія былі выкліканы ў большай ступені асаблівасцямі геаграфічнага становішча, ростам насельніцтва, карупцыяй, неэфектыўнай эканамічнай палітыкай, нестабільнасцю ў грамадстве.

У некаторых рэгіёнах Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі геаграфічныя ўмовы сталі сур'ёзнай перашкодай на шляху прагрэсу. Асобныя дзяржавы маюць невялікую тэрыторыю і таму адчуваюць недахоп прыродных рэсурсаў, неабходных для самастойнага развіцця. Складаныя кліматычныя ўмовы, залежнасць ад ападкаў, недахоп прыдатнай для сельскай гаспадаркі зямлі і розныя захворванні ствараюць дадатковыя праблемы.

Рост насельніцтва, які пачаўся ў XVIII ст., прадоўжыўся паўсюдна і ў наступныя стагоддзі. Паляпшэнне медыцынскага абслугоўвання і якасці харчавання прывяло да зніжэння смяротнасці і дэмаграфічнага выбуху. Аднак хуткі прырост насельніцтва ў «трэцім свеце» стаў адной з прычын росту беднасці і галечы. У такіх краінах, як, напрыклад, Нігерыя, Пакістан ці Індыя, насельніцтва штогод павялічваецца на некалькі мільёнаў чалавек. Рост колькасці насельніцтва ў краінах «трэцяга свету» прывёў да таго, што ў цяперашні час каля паловы людзей, якія жывуць на планеце, маладзей за 25 гадоў.

Многія краіны «трэцяга свету» спрабуюць зменшыць рост насельніцтва, але толькі некаторым з іх удаецца прымусіць людзей абмежаваць памер сям'і. У традыцыйных культурах краін Азіі і Афрыкі наяўнасць дзяцей з'яўляецца паказчыкам сацыяльнага статусу. У аграрных грамадствах дзеці выкарыстоўваюцца як рабочая сіла, яны ўспрымаюцца бацькамі як гарантыя свайго



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

ўтрымання і падтрымкі ў старасці. Нярэдка вялікай колькасці сям'і садзейнічаюць рэлігійныя традыцыі.

У краінах «трэцяга свету» сотні мільёнаў людзей жывуць у беднасці. Больш за ўсё пакутуюць дзеці. Паводле даных ААН, штодзённа дзясяткі тысяч дзяцей паміраюць ад недаядання, хвароб і іншых наступстваў галечы.

Эканамічныя адносіны, якія ўсталяваліся ў эпоху імперыялізму, не змяніліся па-сутнасці і пасля 1945 г. Большасць новых краін захавалі залежнасць ад сваіх былых метраполій. Яны па-ранейшаму пастаўляюць сельскагаспадарчую прадукцыю і сыравіну індустрыяльнаму свету і маюць патрэбу ў заходніх прамысловых таварах, тэхналогіях і інвестыцыях. Акрамя таго, у многіх новых краінах наладжана вытворчасць аднаго віду прадукцыі, напрыклад, цукру, какавы ці медзі. Таму іх эканомікі знаходзяцца ў поўнай залежнасці ад сусветнай патрэбы ў тым ці іншым прадукце. Часта большая частка даходаў ад экспарту прыродных рэсурсаў краін «трэцяга свету» ідзе на выплату працэнтаў па даўгах.

Такім чынам, краіны «трэцяга свету» апынуліся ў залежнасці ад розных відаў дапамогі з боку былых метраполій. Вялікабрытанія, Францыя і іншыя дзяржавы Захаду праводзілі палітыку, накіраваную на захаванне свайго ўплыву ў былых калоніях новымі, больш гнуткімі метадамі. Гэта палітыка атрымала назву палітыкі неакаланіялізму. **Неакаланіялізм** прадстаўляе сабой сістэму нераўнапраўных эканамічных і палітычных адносін, навязаную прамыслова развітымі краінамі Захаду краінам «трэцяга свету» — Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі.

Пасля набыцця незалежнасці многія краіны абвясцілі аб арыентацыі на сацыялістычны шлях развіцця, разлічваючы на падтрымку краін сацыялістычнага лагера. У 1950-я — 1960-я гг. гэтым дзяржавам удалося ажыццявіць пэўны прарыў. Аднак затым па розных прычынах, асабліва пасля распаду СССР, краіны сацыялістычнай арыентацыі зведалі эканамічныя і палітычныя цяжкасці.

Вырашэнню сацыяльных праблем і эканамічнаму развіццю перашкаджаюць грамадзянскія войны і іншыя канфлікты. Сальвадор у Цэнтральнай Амерыцы, Ліван на Блізкім Усходзе, Камбоджа ў Паўднёва-Усходняй Азіі і Мазамбік у Афрыцы знаходзяцца сярод краін, эканоміка якіх моцна пацярпела ад грамадзянскіх войнаў. Ваенныя дыктатары і аўтарытарныя правіцелі трацілі велізарныя сумы на зброю, а не на адукацыю, жыллё ці ахову здароўя.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## Пытанні і заданні:

1. Растлумачце значэнне паняцця «дэкаланізацыя». Якія асноўныя этапы працэсу дэкаланізацыі? Вызначыце значэнне ліквідацыі каланіяльнай сістэмы.
2. Чаму краіны, якія вызваліліся ад каланіяльнай залежнасці, пачалі называцца краінамі «трэцяга свету»? З якімі праблемамі сутыкнуліся гэтыя краіны?
3. Які ўплыў на развіццё краін «трэцяга свету» зрабіла «халодная вайна»? Назавіце асноўныя шляхі, па якіх пайшло развіццё краін, што вызваліліся?
4. Чаму краіны Захаду імкнуліся захаваць свой уплыў у былых калоніях? Якую назву атрымала гэтая палітыка? У чым яна заключаецца?
5. Чаму ў краінах, якія вызваліліся, актыўную ролю ў палітыцы адыгрываюць ваенныя і часта ўсталёўваюцца аўтарытарныя рэжымы? Прывядзіце прыклады.
6. Чаму краіны, якія вызваліліся, імкнуцца да стварэння міждзяржаўных арганізацый? Прывядзіце прыклады.

**Прапануем абмеркаваць.** Чаму ў краінах Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі з цяжкасцю прыжываюцца прынцыпы дэмакратычнага кіравання?

## Гістарычны дакумент

### З заключнага камюніке Канферэнцыі краін Азіі і Афрыкі

*Бандунг, 24 красавіка 1955 г.*

Удзельнікі Канферэнцыі выразілі агульнае імкненне да эканамічнага супрацоўніцтва на аснове ўзаемнага інтарэсу і павагі нацыянальнага суверэнітэту...

Канферэнцыя згадзілася: заявіць, што каланіялізм ва ўсіх яго праявах з'яўляецца злом, якое належыць хутка спыніць...

Свабодныя ад недаверу і страху і прасякнутыя даверам і добрай воляй у адносінах адзін да аднаго, краіны павінны праяўляць цярпенне і жыць у міры адна з адной, як добрыя суседзі, і развіваць сяброўскае супрацоўніцтва на аснове наступных прынцыпаў:

1. Павага асноўных правоў чалавека, а таксама мэт і прынцыпаў Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

2. Павага суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці ўсіх краін.

3. Прызнанне роўнасці ўсіх рас і роўнасці ўсіх нацый, вялікіх і малых.

4. Устрыманне ад інтэрвенцыі і ўмяшання ва ўнутраныя справы іншай краіны.

5. Павага права кожнай краіны на індывідуальную ці калектыўную абарону…

6. Устрыманне ад выкарыстання пагадненняў аб калектыўнай абароне ў прыватных інтарэсах якой-небудзь з вялікіх дзяржаў…

7. Устрыманне ад актаў ці пагроз агрэсіі ці прымянення сілы…

8. Урэгуляванне ўсіх міжнародных спрэчак мірнымі сродкамі…

9. Садзейнічанне ўзаемным інтарэсам і супрацоўніцтву…

*Якія краіны прынялі ўдзел у канферэнцыі? Што выклікала занепакоенасць гэтых краін? Да чаго заклікалі ўдзельнікі канферэнцыі?*

## § 21. КІТАЙ У 1945 — 1978 гг.

**Успомніце:** *Калі была абвешчана Кітайская Рэспубліка? Якія палітычныя партыі вялі барацьбу за ўладу ў Кітаі ў міжваенны перыяд? Якім было становішча Кітая ў гады Другой сусветнай вайны?*

**Утварэнне КНР.** У гісторыі Кітая другой паловы XX — пачатку XXI ст. можна выдзеліць два асноўныя перыяды. *Першы перыяд (1949 — 1978 гг.)* ахоплівае сацыялістычныя эксперыменты на мааісцкай аснове. *Другі перыяд (з 1979 г.)* — адзначаны пераходам КНР да рыначнай эканомікі — своеасаблівага варыянта перабудовы кітайскага грамадства.

У жніўні 1945 г. завяршылася вызваленне Кітая ад японскай акупацыі. Актыўны ўдзел у вызваленчай барацьбе прынялі дзве буйнейшыя палітычныя сілы краіны — Гаміньдан (Нацыянальная партыя) і Камуністычная партыя Кітая (КПК). Лідар Гаміньдана Чан Кайшы ўзначаліў урад Кітайскай Рэспублікі. Гаміньдан выступаў за развіццё эканомікі на аснове рыначных адносін і ўмацаванне сувязей з заходнімі краінамі.

Камуністы на чале з Мао Цзэдунам першапачаткова кантралявалі невялікую тэрыторыю — так званы *Асобы раён* на поўначы краіны. Да канца вайны Народна-вызваленчая армія Кітая (НВАК) кантралявала 19 «свабодных раёнаў» з плошчай каля 1 млн км$^2$ і



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

насельніцтвам каля 100 млн чалавек. Больш чым мільённая КПК пераўтварылася ў сілу, з якой даводзілася лічыцца гаміньданаўскаму ўраду. Камуністы атрымлівалі дапамогу ад Савецкага Саюза зброяй і грашыма. Яны падтрымлівалі курс на сацыялістычную рэвалюцыю і пабудову грамадства па савецкай мадэлі.

Велізарны ўклад у разгром японскіх мілітарыстаў на Далёкім Усходзе зрабіў СССР. Яго войскі, якія разграмілі Квантунскую армію ў жніўні 1945 г., часова акупіравалі тэрыторыю Маньчжурыі (Паўночна-Усходні Кітай) з насельніцтвам у 40 млн чалавек. У жніўні 1945 г. паміж Савецкім Саюзам і гаміньданаўскім Кітаем быў заключаны Дагавор аб дружбе і саюзе. Гаміньдан і КПК пачалі перагаворы аб стварэнні кааліцыйнага ўрада. Аднак супярэчнасці паміж бакамі былі настолькі вострымі, што перагаворы не мелі поспеху.




*Грамадзянская вайна ў Кітаі.*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

У гэты час савецкі ўрад прыняў канчатковае рашэнне арыентавацца ў сваёй палітыцы ў адносінах да Кітая толькі на КПК і яе ўзброеныя сілы. Армія КПК атрымлівала на ўзбраенне савецкія самалёты, танкі, артылерыю, а таксама трафейную японскую зброю. У шэрагах НВАК, якая дасягнула больш за 2 млн байцоў, знаходзіліся шматлікія савецкія ваенныя спецыялісты.

У красавіку **1946 г.** Савецкі Саюз вывеў свае войскі з Маньчжурыі. Гаміньданаўскі ўрад у той жа час аддаў загад аб наступленні на паўночным напрамку. У Кітаі зноў пачалася грамадзянская вайна.

Першапачаткова перавага была на баку гаміньданаўскіх войскаў. Але ўжо вясной 1947 г. НВАК перайшла ў наступленне і паспяхова фарсіравала раку Хуанхэ. Восенню 1948 г. яна разграміла асноўныя сілы Гаміньдана. У студзені 1949 г. войскі пад камандаваннем Лінь Бяо занялі Пекін. Пазней НВАК захапіла Нанкін (сталіцу гаміньданаўцаў) і Шанхай, фарсіравала раку Янцзы і завяршыла разгром Гаміньдана. Чан Кайшы з рэшткамі сваёй арміі перабраўся на в. Тайвань, дзе замацаваўся пад прыкрыццём ваенна-марскога флоту ЗША. Тут была абвешчана Кітайская Рэспубліка, якая абрала капіталістычны шлях развіцця і прэтэндавала на месца адзінага прадстаўніка кітайскага народа на міжнароднай арэне. Такім чынам, з разгромам Гаміньдана ў Кітаі скончылася грамадзянская вайна.

У канцы верасня 1949 г. у Пекіне адбылося пасяджэнне Народнага палітычнага кансультацыйнага савета, які ўключаў прадстаўнікоў КПК і іншых антыгаміньданаўскіх палітычных сіл. На пасяджэнні было прынята рашэнне аб стварэнні *Цэнтральнага народнага ўрадавага савета (ЦНУС)* на чале са старшынёй ЦК КПК Мао Цзэдунам. Выканаўчая ўлада перадавалася новаму кітайскаму ўраду. Галоўнай мэтай камуністаў стала пераўтварэнне Кітая ў «моцную прамыслова развітую дзяржаву з кіруючай роляй рабочага класа і будаўніцтва ў перспектыве сацыялістычнага грамадства».

**1 кастрычніка 1949 г.** на шматтысячным мітынгу ў Пекіне новы кіраўнік Кітая абвясціў утварэнне **Кітайскай Народнай Рэспублікі (КНР).** На наступны дзень яна была прызнана СССР. Кіраўніцтва КНР на чале з Мао Цзэдунам з самага пачатку выбрала савецкую мадэль пабудовы грамадства.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Аднаўленчы перыяд.** Пасля трыццацігадовага перыяду войнаў і рэвалюцыі эканоміка КНР знаходзілася ў разбураным стане. Адсталай была і сацыяльная структура грамадства. Каля 90 % насельніцтва краіны складалі сяляне і толькі 2 % — рабочыя. Таму на ліквідацыю адсталасці ў КНР патрабавалася шмат часу.

У *1950 г.* паміж КНР і СССР быў падпісаны Дагавор аб дружбе, саюзе і ўзаемнай дапамозе. Савецкая падтрымка стала важным фактарам сацыяльна-эканамічнага развіцця КНР. У краіне пачала праводзіцца аграрная рэформа. Значная частка памешчыцкіх зямель нацыяналізавалася, а астатнія перадаваліся ва ўладанне сялянам. Адначасова ствараўся дзяржаўны сектар эканомікі за кошт канфіскацыі ўласнасці буйной нацыянальнай буржуазіі і замежнага капіталу. У 1952 г. быў адноўлены даваенны ўзровень вытворчасці ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы.

**Пачатак радыкальных пераўтварэнняў.** У 1953 г. у КНР пачаліся «сацыялістычныя пераўтварэнні», хоць раней прадугледжвалася пабудова сацыялістычнага грамадства толькі «ў перспектыве». Сацыялістычныя пераўтварэнні супалі з рэалізацыяй *першага пяцігадовага плана (1953 — 1957).* Прымусовымі метадамі ў краіне ствараўся дзяржаўны сектар эканомікі. Пры дапамозе СССР было пабудавана больш за 500 буйных прамысловых

---

## Гістарычны партрэт



**Мао Цзэдун** (1893 — 1976) — дзяржаўны і палітычны дзеяч Кітая. Адзін з заснавальнікаў КПК, старшыня ЦК КПК з 1943 г. Закончыў педагагічнае вучылішча, працаваў у бібліятэцы Пекінскага ўніверсітэта. Адыграў рашаючую ролю ў барацьбе супраць Гаміньдана і ў працэсе ўтварэння КНР. Пасля ўтварэння КНР узначальваў урад краіны, у 1954 — 1959 гг. — старшыня КНР. Мао лічыў, што ўзброеная барацьба, тэрор і насілле адыгрываюць рашаючую ролю ў гісторыі. Такімі метадамі ён імкнуўся хуткімі тэмпамі пабудаваць сацыялізм і камунізм у Кітаі. Мао лічыў, што класавыя супярэчнасці пастаянна абвастраюцца падчас будаўніцтва сацыялізму, таму вёў пастаянную ідэалагічную барацьбу супраць сваіх апанентаў. Ён быў таксама прыхільнікам кітайскага нацыяналізму, пастаянна падкрэсліваў вядучую ролю кітайскай нацыі ў ходзе рэвалюцыйнага пераўтварэння свету.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

аб’ектаў. У 1956 г. прамысловасць і гандаль былі практычна цалкам нацыяналізаваны. Па савецкаму ўзору было праведзена суцэльнае каапераванне сельскай гаспадаркі. 96 % сялян аб’ядналіся ў кааператывы з абмежаванымі правамі.

У 1954 г. адбыліся выбары ў новы парламент — *Усекітайскі сход народных прадстаўнікоў (УСНП)*. На першай сесіі УСНП старшынёй КНР быў абраны **Мао Цзэдун,** а прэм’ерам *Дзяржаўнага савета* (урада) — **Чжоу Эньлай.**

**Палітыка «трох чырвоных сцягоў».** Пасля ХХ з’езда КПСС, у 1956 г., адносіны КНР з СССР рэзка пагоршыліся. Спачатку, праўда, Мао Цзэдун таксама схіляўся да пэўнай лібералізацыі, абвясціўшы лозунг «Няхай квітнеюць сто кветак, няхай спаборнічаюць сто школ», што прадугледжвала магчымасць дыскусіі і крытыкі ва ўнутрыпартыйным жыцці. Аднак у хуткім часе крытыка дзейнасці кіраўніцтва партыі стала ім успрымацца надзвычай негатыўна, таксама як і крытыка культу асобы Сталіна ў СССР. Мао Цзэдун вырашыў будаваць сацыялізм «больш, хутчэй, лепш і эканомней», чым у СССР. У **маі 1958 г.** КПК прыняла план эканамічнага развіцця краіны, які атрымаў назву **«трох чырвоных сцягоў».** Пад імі разумеліся «генеральная лінія», «вялікі скачок» і «народныя камуны».

*«Генеральная лінія»* азначала фарсіраванае будаўніцтва камунізму праз *«вялікі скачок»* у прамысловасці і сельскай гаспадарцы. За пяцігоддзе — 1958 — 1962 гг. — меркавалася павялічыць вытворчасць сталі ў 20 разоў (да 100 млн т) замест раней прадугледжанага павелічэння з 5 да 10 млн т. У дварах прадпрыемстваў, устаноў, камун пачалі будавацца маленькія прымітыўныя домны для выплаўкі чугуна і сталі. Амаль усё насельніцтва краіны вырабляла метал у падобных саматужных умовах. Адначасова мільёны людзей працавалі на будаўніцтве каналаў і іншых гіганцкіх збудаванняў. Масавая кампанія па рэалізацыі палітыкі «вялікага скачка» праходзіла пад лозунгам: «Тры гады ўпартай працы — 10 тысяч гадоў шчасця!».

У той жа час на вёсцы сотні тысяч кааператываў былі пераўтвораны ў 26 тыс. *народных камун,* якія ўяўлялі сабой вялікія калектывы (у сярэднім 20 — 30 тыс. чалавек), у якіх уся маёмасць з’яўлялася агульнай. Жыццё камуны было ваенізавана, уводзіўся камуністычны прынцып размеркавання даброт. Мэтай камун было


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

павелічэнне сельскагаспадарчай вытворчасці і «выхаванне новага чалавека».

Аднак курс на «вялікі скачок» праваліўся. Прамысловая і сельскагаспадарчая вытворчасці скараціліся. Мільёны тон выплаўленай сталі былі нізкай якасці, ды і новых заводаў не пабудавалі ў дастатковай колькасці. У гэты ж час СССР скараціў дапамогу Кітаю, а ў 1960 г. і ўвогуле спыніў яе. Савецкія спецыялісты былі адкліканы. У асобных раёнах Кітая пачаўся голад.

**«Курс на рэгуляванне эканомікі».** Пасля правалу «вялікага скачка» неабходна было зноў аднаўляць краіну і наладжваць нармальнае жыццё. У **студзені 1961 г.** пленум ЦК КПК прыняў рашэнне аб выпраўленні памылак і абвясціў «курс на рэгуляванне эканомікі». За гэтым рашэннем стаялі так званыя прагматыкі з кіраўніцтва КПК і дзяржавы, якія выступалі ў адрозненне ад радыкалаў за адмаўленне ад неапраўданых забяганняў наперад, да камунізму. Гэта — Лю Шаацы — старшыня КНР, Дэн Сяапін — генеральны сакратар ЦК КПК, Чжоу Эньлай — прэм'ер Дзяржсавета КНР.

У выніку новага курсу сялянам былі вернуты прысядзібныя ўчасткі. Ім дазвалялі трымаць дробную жывёлу і птушку, займацца рамёствамі і гандляваць на рынку. Галоўнай вытворчай адзінкай унутры камуны станавілася брыгада (10 — 30 двароў). Паўсюль уводзіўся прынцып матэрыяльнай зацікаўленасці ў выніках працы.

Дзякуючы прынятым мерам да 1965 г. у краіне ў цэлым была адноўлена вытворчасць і пакончана з голадам. Тым не менш унутрыпалітычная сітуацыя заставалася складанай. Усё часцей у адрас Мао Цзэдуна гучалі крытычныя галасы з асяроддзя інтэлігенцыі і партыйнага апарату. У краіне і партыі фарміравалася апазіцыя Мао Цзэдуну. Сваіх праціўнікаў радыкальная групоўка на чале з Мао Цзэдунам кляйміла як бюракратаў, якія перашкаджаюць ініцыятыве мас знізу.

**«Культурная рэвалюцыя» (1966 — 1976).** У гэтых умовах Мао Цзэдун і яго прыхільнікі вырашылі правесці чарговую масавую кампанію. У Кітаі была абвешчана **«Вялікая пралетарская культурная рэвалюцыя»**. Яна павінна была падавіць крытыкаў і апазіцыянераў, знішчыць «здраднікаў», якія перашкаджалі будаваць «узорнае камуністычнае грамадства» ў адпаведнасці з вучэннем Мао. Галоўнай рухаючай сілай культурнай рэвалюцыі была кітайская моладзь.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



Група хунвэйбінаў, якая здзяйсняе самасуд над двума выкладчыкамі Індустрыяльнага ўніверсітэта. Харбін, 1967 г.

*Першы этап «культурнай рэвалюцыі» (1966 — 1969)* характарызаваўся разгулам масавага насілля. Пад кіраўніцтвам спецыяльнай «групы па справах культурнай рэвалюцыі» ў Кітаі пачалі стварацца атрады **хунвэйбінаў** — «чырвоных ахоўнікаў» са школьнай і студэнцкай моладзі і атрады **цзаафаней** — «бунтароў» з маладых рабочых і служачых.

Карныя органы «культурнай рэвалюцыі» наводзілі страх і жах на ўсіх кітаўцаў незалежна ад іх становішча ў грамадстве. Хунвэйбіны і цзаафані грамілі партыйныя камітэты і міністэрствы, захоплівалі прадпрыемствы і навучальныя ўстановы, наладжвалі паказальныя «судовыя працэсы» над усімі, хто падазраваўся ў нелаяльнасці да камуністычнай улады. Больш за ўсё пакутавалі прадстаўнікі інтэлігенцыі і ўсе тыя, хто насіў замежнае адзенне і модныя прычоскі. Іх збівалі, зрывалі адзенне, галілі. На вуліцах гарэлі вогнішчы з «буржуазных» кніг і пласцінак. Бібліятэкі і музеі былі разрабаваны. Гарады Кітая паглыбляліся ў хаос і насілле.

У ходзе «культурнай рэвалюцыі» многія прадстаўнікі кіруючай эліты былі адхілены ад улады ці рэпрэсіраваны (Пэн Дэхуай, Лю Шаацы, Дэн Сяапін і інш.). Замест ранейшых органаў улады ствараліся рэвалюцыйныя камітэты з прадстаўнікоў арміі, хунвэйбінаў, цзаафаней і часткі адміністрацыйных і партыйных кадраў. Толькі пасля гэтага Мао Цзэдун перастаў падтрымліваць «культурную рэвалюцыю». У канцы 1967 г. міністр абароны Лінь Бяо атрымаў загад узяць пад кантроль арміі сітуацыю ў краіне.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

У выніку мільёны маладых людзей былі накіраваны на перавыхаванне ў вёску. На IX з'ездзе КПК, які адбыўся ў красавіку 1969 г., Мао дабіўся поўнага панавання ў партыі. Яго ідэі былі прызнаны «вышэйшым этапам у развіцці марксізму-ленінізму», «пуцяводнай зоркай для ўсяго чалавецтва». Пасля гэтага «культурная рэвалюцыя» перайшла ў новую стадыю свайго развіцця.

*Другі этап «культурнай рэвалюцыі» (1969 — 1976)* характарызаваўся ўмацаваннем рэжыму асабістай улады і культу асобы Мао Цзэдуна, працягам вострай унутрыпалітычнай барацьбы ў кіраўніцтве партыі і дзяржавы. Кітайскага лідара пачалі называць не інакш як «Чырвонае сонца» і «Вялікі рулявы». У той жа час кіруючыя вярхі вымушаны былі вярнуць частку рэпрэсіраваных чыноўнікаў з ліку прагматыкаў на даволі высокія дзяржаўныя пасады. Сярод іх быў будучы рэфарматар Дэн Сяапін.

9 верасня 1976 г. 82-гадовы Мао Цзэдун памёр, пакінуўшы пасля сябе велізарную краіну, ізаляваную ад усяго свету, з неэфектыўнай эканомікай.

## Пытанні і заданні:

1. Чаму пасля заканчэння Другой сусветнай вайны ў Кітаі прадаўжалася грамадзянская вайна? Якія асноўныя сілы супрацьстаялі адна адной падчас грамадзянскай вайны? Чым скончылася грамадзянская вайна ў Кітаі?
2. Дайце кароткую характарыстыку асноўным перыядам гісторыі Кітая. Даныя аформіце ў табліцу.

| Перыяд | Кароткая характарыстыка |
|---|---|
| 1949 — 1952 гг. | |
| 1953 — 1957 гг. | |
| 1958 — 1960 гг. | |
| 1961 — 1965 гг. | |
| 1966 — 1976 гг. | |



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"
АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

3. Ахарактарызуйце палітыку «трох чырвоных сцягоў» паводле плана:
   а) перыяд правядзення;
   б) асноўныя мэты;
   в) метады правядзення;
   г) вынікі.
4. Чаму Мао Цзэдун і яго прыхільнікі рашыліся на правядзенне «культурнай рэвалюцыі»? Якія былі яе асноўныя мэты? Хто былі найбольш актыўнымі ўдзельнікамі «культурнай рэвалюцыі»? Якія вынікі і наступствы мела «культурная рэвалюцыя»?
5. Дайце ацэнку дзейнасці Мао Цзэдуна і яго метадам пабудовы камунізму.
6. Якія праблемы неабходна было вырашыць у Кітаі пасля «культурнай рэвалюцыі»?

## Гістарычны дакумент

### З пастановы ЦК КПК аб вялікай пралетарскай культурнай рэвалюцыі

*8 жніўня 1966 г.*

Хоць буржуазія ўжо звергнута, яна, тым не менш, спрабуе з дапамогай эксплуататарскай старой ідэалогіі, старой культуры, старых нораваў і старых звычаяў разлажыць масы, заваяваць сэрцы людзей, узмоцнена імкнецца да сваёй мэты — ажыццяўлення рэстаўрацыі. У процівагу буржуазіі пралетарыят на любы яе выклік у галіне ідэалогіі павінен адказваць сакрушальным ударам і з дапамогай пралетарскай новай ідэалогіі, новай культуры, новых нораваў і новых звычаяў змяняць духоўнае аблічча ўсяго грамадства. Цяпер мы ставім перад сабой мэту разграміць тых надзеленых уладай, якія ідуць па капіталістычнаму шляху, раскрытыкаваць рэакцыйныя буржуазныя «аўтарытэты» ў навуцы, раскрытыкаваць ідэалогію буржуазіі і ўсе іншыя эксплуататарскія класы, рэфармаваць асвету, літаратуру і мастацтва, рэфармаваць усе галіны надбудовы, якія не адпавядаюць эканамічнаму базісу сацыялізму, з тым, каб садзейнічаць умацаванню і развіццю сацыялістычнага ладу…

*Супраць каго была накіравана «культурная рэвалюцыя»? Якія мэты ставіліся ў ходзе ажыццяўлення «культурнай рэвалюцыі»? Якімі метадамі планавалася ажыццявіць «культурную рэвалюцыю»?*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

# § 22. КІТАЙСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА (1979 — 2012)

**Успомніце:** *Калі была абвешчана Кітайская Народная Рэспубліка? Чым характарызавалася эканамічная палітыка ў КНР пры Мао Цзэдуне?*

**Кітай пасля праўлення Мао Цзэдуна.** Пасля смерці Мао Цзэдуна ў 1976 г. наступіла новая эпоха ў найноўшай гісторыі Кітая. Адны палітычныя дзеячы імкнуліся «прадаўжаць» справу Мао Цзэдуна, другія шукалі іншы шлях развіцця. Пачаўся працэс рэфармавання кітайскага грамадства, у аснову якога быў пакладзены пераход да рыначнай эканомікі.

Мао Цзэдун пакінуў пасля сябе краіну ў стане вострага крызісу. Аб гэтым сведчаць афіцыйныя даныя. У КНР налічвалася 20 млн беспрацоўных і 8 млн асоб, якія «шукалі» работу, 100 млн чалавек галадалі. Гадавы даход на душу насельніцтва быў адным з самых нізкіх у свеце — каля 220 долараў, у сельскай гаспадарцы яшчэ менш — каля 80 долараў. Многія прадукты харчавання і невытворчыя тавары размяркоўваліся па картках.

Унутры партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва Кітая разгарнулася бязлітасная барацьба за ўладу. У ходзе гэтай барацьбы на першыя ролі выйшаў *Хуа Гафэн,* былы начальнік аховы Мао Цзэдуна, а пасля смерці Чжоу Эньлая прэм'ер Дзяржсавета. У кастрычніку 1976 г. ён быў абраны старшынёй ЦК КПК. Яму ўдалося адхіліць ад улады радыкальную мааісцкую групу — так званую «банду чатырох» на чале з удавой памерлага правадыра Цзян Цын. Многія партыйныя дзяржаўныя дзеячы былі рэабілітаваны, сярод іх Дэн Сяапін, які ўзначаліў групу рэфарматараў-прагматыкаў.

XI з'езд КПК, які адбыўся ў жніўні 1977 г., афіцыйна абвясціў аб завяршэнні «культурнай рэвалюцыі». **Дэн Сяапін** быў абраны на пасады намесніка прэм'ера Дзяржсавета і намесніка Старшыні ЦК КПК. З гэтага часу ён і яго акружэнне пачалі адыгрываць усё больш прыкметную ролю ў жыцці дзяржавы, паступова выцясняючы Хуа Гафэна, у якога не было неабходнага аўтарытэту, каб стаць «новым Мао». Такі аўтарытэт меў толькі Дэн Сяапін, які настойліва прасоўваў на ключавыя пасады сваіх прыхільнікаў — Ху Яабана, Чжао Цзыяна, Цзян Цзэміня і інш.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

### Гістарычны партрэт



**Дэн Сяапін** (1904 — 1997) — кітайскі дзяржаўны дзеяч. Вучыўся ў Францыі і Савецкім Саюзе. Удзельнічаў у Вялікім паходзе Кітайскай Чырвонай арміі на паўночны захад краіны (1934 — 1935), камандаваў камуністычнымі атрадамі, якія змагаліся супраць японцаў (1937 — 1945) і Гаміньдана (1945 — 1949). У 1952 г. прызначаны віцэ-прэм'ерам Дзяржаўнага савета КНР, а ў 1954 г. Генеральным сакратаром КПК. З пачаткам «культурнай рэвалюцыі» ў 1966 г. быў зняты з усіх пасад і накіраваны на «перавыхаванне» на трактарны завод у правінцыі Цзянсі. У 1973 г. рэабілітаваны. У 1976 г. зноў адхілены ад улады. У 1977 г. вярнуў сабе ўсе пасады ў кіраўніцтве КНР. Па яго ініцыятыве ў 1978 г. пачалося правядзенне эканамічных рэформ. У апошнія гады жыцця, не займаючы афіцыйных пасад, з'яўляўся палітычным сімвалам кітайскай «перабудовы». Быў прыхільнікам «сацыялістычнай мадэрнізацыі Кітая», падкрэсліваў, што «калі б Кітай зышоў са шляху сацыялізму, то ён непазбежна апынуўся бы зноў сярод паўфеадальных, каланіяльных краін».

Дэн Сяапін стаў самым уплывовым палітычным дзеячам Кітая, не займаючы першых пасад у партыі і дзяржаве. Ён быў ініцыятарам і галоўным ідэолагам рэформ, што змянілі аблічча Кітая ў канцы XX — пачатку XXI ст. У 1981 г. старшынёй ЦК КПК быў абраны *Ху Яабан*. Але яму заўсёды даводзілася ўлічваць меркаванне Дэн Сяапіна, які ўзначаліў Ваенны савет ЦК КПК і такім чынам забяспечыў кантроль над узброенымі сіламі.

**Праграма рэформ Дэн Сяапіна.** Асноўныя элементы рэфарматарскай праграмы Дэн Сяапіна склаліся яшчэ ў перыяд «культурнай рэвалюцыі». У сярэдзіне 1960-х гг. ён прапанаваў ідэю *«чатырох мадэрнізацый»*, гэта значыць вываду на сучасны ўзровень прамысловасці, сельскай гаспадаркі, навукі і ваенна-прамысловага комплексу.

Дэн Сяапін крытычна ставіўся да тых палітыкаў, якія дагматычна змагаліся за «чысціню ідэй сацыялізму». Вядомы яго крылаты выраз: «Не мае значэння, якога колеру кошка — чорнага ці белага. Толькі б яна лавіла мышэй». У сапраўднасці рэфарматар не адмаўляўся ад прынцыпаў сацыялізму і камуністычнай



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

ідэалогіі. У снежні 1979 г. на пленуме ЦК КПК па яго ініцыятыве было прынята рашэнне аб правядзенні ў КНР буйнамаштабнай эканамічнай рэформы з мэтай пабудовы ў краіне «сацыялізму з кітайскай спецыфікай».

У наступным годзе Дэн Сяапін сфармуляваў «чатыры прынцыпы» рэформ, якія ўвайшлі ў абноўленую Канстытуцыю КНР: прытрымліванца сацыялістычнага шляху, дыктатуры пралетарыяту, кіруючай ролі Кампартыі, марксізму-ленінізму і ідэй Мао Цзэдуна.

**Эканамічныя рэформы.** Асаблівасць эканамічных рэформ заключалася ў тым, што спачатку яны былі праведзены ў сельскай гаспадарцы, і толькі затым ахапілі прамысловую сферу.

Рэформы ў сельскай гаспадарцы пачаліся ў *канцы 1970-х гг.* Іх адметная рыса — паступовае адмаўленне дзяржавы ад умяшання ў працэс вытворчасці і збыту прадукцыі. Істотна пераглядаліся, а то і наогул здымаліся планавыя заданні. Шырокае распаўсюджванне атрымаў сямейны падрад. Зямля перадавалася на дагаварных пачатках сялянам, якія свабодна распараджаліся вынікамі сваёй працы пасля выплаты падатку дзяржаве. Павышаліся закупачныя цэны і ўводзіліся свабодныя цэны на сельгаспрадукцыю. У асабістую ўласнасць сялян пераходзіла сельскагаспадарчая тэхніка.

Рэзкае стымуляванне сялянскай працы прывяло да хуткага росту прадукцыі сельскай гаспадаркі. У 1984 г. ураджай збожжавых склаў 400 млн т — у два разы больш, чым у 1958 г. У сярэдзіне 1990-х гг. ужо вырошчвалася 450 млн т збожжа ў год. Гэтага было дастаткова, каб задаволіць гіганцкія патрэбы ўзрастаючай колькасці насельніцтва ў прадуктах харчавання. Маючы толькі 7 % сусветнай пашы, Кітай павінен быў пракарміць 21 % насельніцтва свету. Больш за тое, КНР ператваралася з імпарцёра збожжа ў яго экспарцёра. Поспех быў настолькі значны і відавочны, што здзівіў увесь свет.

З *1980-х гг.* пачалі праводзіцца рэформы ў прамысловасці. Спынілася практыка ўмяшання адміністрацыйных і партыйных органаў у дзейнасць прадпрыемстваў, адмянялася абавязковае ранейдырэктыўнае планаванне. Прадпрыемствы пераводзіліся на гаспадарчы разлік, ім перадаваліся шырокія правы. У краіне дазвалялася прыватнапрадпрымальніцкая дзейнасць, дзяржава ўсяляк заахвочвала развіццё малога і сярэдняга бізнесу. Дазвалялася стварэнне сумесных прадпрыемстваў і свабодных эканамічных зон з удзелам замежнага капіталу.


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

У свабодныя эканамічныя зоны і раёны пайшоў паток замежных інвестыцый. У 1979 — 1995 гг. аб’ём інвестыцый, у тым ліку ад кітайскай дыяспары за мяжой, перавысіў 1 трлн долараў ЗША. Сярэднегадавы прырост ВУП склаў у 1991 — 1995 гг. 12 %. Да 2000 г. планавалася павелічэнне ВУП у 4 разы, але гэты вынік быў дасягнуты ўжо ў 1995 г. У цяперашні час па аб’ёму ВУП Кітай займае 2-е месца ў свеце пасля ЗША. Сутнасць падыходу да рэфармавання эканомікі КНР была ў тым, што краіна прыняла правілы глабальнай рыначнай эканомікі і ў рамках гэтых правіл дасягнула выдатных поспехаў у сваім развіцці. Яшчэ адным важнейшым фактарам стала тое, што глыбокія рыначныя пераўтварэнні ў эканамічнай сферы праводзіліся ва ўмовах жорсткага палітычнага кантролю, што дазволіла захаваць краіну, пазбегнуць дапушчаных у СССР памылак, якія прывялі яго да распаду.

**Палітычнае развіццё КНР у гады рэформ.** Эканамічныя рэформы ў Кітаі ажыццяўляліся ў цеснай сувязі з рэфармаваннем палітычнай сістэмы. Пры гэтым кіруючую ролю прадаўжала адыгрываць Камуністычная партыя. У 1981 г. на пленуме ЦК КПК былі асуджаны культ асобы Мао Цзэдуна, палітыка «вялікага скачка», «культурная рэвалюцыя». У той жа час падкрэслівалася, што заслугі памерлага правадыра перад партыяй і дзяржавай «займаюць галоўнае, а памылкі — другараднае месца».

З сярэдзіны 1980-х гг., ва ўмовах укаранення элементаў рыначнай эканомікі, у кітайскім грамадстве пачалі нарастаць дэмакратычныя тэндэнцыі. Студэнцтва, інтэлігенцыя, частка рабочых патрабавалі лібералізацыі палітычнай сістэмы, сапраўднай шматпартыйнасці, захаванне асноўных правоў чалавека. У шэрагу гарадоў Кітая адбыліся выступленні студэнцтва і нават сутыкненні з уладамі.

У 1987 г. Ху Яабан быў зняты з пасады генеральнага сакратара ЦК КПК па абвінавачванню ў заступніцтве «буржуазнай лібералізацыі». Замест яго на гэту пасаду быў абраны *Чжао Цзыян.* У новым кіраўніцтве краіны пачалі пераважаць прыхільнікі «жорсткай палітычнай лініі» на чале з новым прэм’ерам Дзяржсавета *Лі Пэнам.*

Вясной **1989 г.** незадавальненне адсутнасцю палітычных свабод вылілася ў мільённыя мітынгі ў Шанхаі, Нанкіне і іншых гарадах. На цэнтральнай плошчы Пекіна *Цяньаньмэнь* бесперапынна адбываліся мітынгі студэнтаў. У сталіцы было ўведзена ваеннае становішча, а ў чэрвені супраць дэманстрантаў была накіравана


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



*Дэманстрацыя на плошчы Цяньаньмэнь. Пекін, 1989 г.*

бронетэхніка. У выніку з вялікімі чалавечымі ахвярамі выступленні былі падаўлены. Кіраўніцтва КПК расцаніла выступленні студэнтаў як «контррэвалюцыйны бунт» і адхіліла Чжао Цзыяна ад улады, абвінаваціўшы яго ў нерашучасці і правядзенні буржуазнай антысацыялістычнай палітыкі. Новым лідарам КПК стаў *Цзян Цзэмінь,* які паступова заняў тры вышэйшыя пасады — дзяржаўную, партыйную і ваенную. У 1992 г. на XIV з’ездзе КПК была канчаткова вызначана афіцыйная сацыяльна-эканамічная мэта рэформ — будаўніцтва «сацыялістычнай рыначнай эканомікі».

Пасля смерці Дэн Сяапіна ў 1997 г. курс рэформ не змяніўся. Кіраўніцтва КНР атрымала ўрокі з падзей 1989 г., распаду СССР і змен, якія адбыліся ў краінах Усходняй Еўропы. Цзян Цзэмінь праводзіў палітыку кампрамісу і імкнуўся арыентавацца на ўсе слаі кітайскага грамадства. Ён больш рашуча вызваляў эканоміку ад кантролю з боку дзяржавы. Разам з тым на XV з’ездзе КПК (1997 г.) Цзян Цзэмінь заклікаў прытрымлівацца ідэй марксізму-ленінізму, Мао Цзэдуна і тэарэтычнай спадчыны Дэн Сяапіна, пацвердзіў арыентацыю на будаўніцтва «сацыялістычнай рыначнай эканомікі».

Аднак новае пакаленне лідараў КНР было менш за ўсё схільна да крытыкі былых кіраўнікоў. Яно клапацілася ў першую чаргу пра рух краіны наперад. У 1998 г. кансерватар Лі Пэн быў заменены на пасадзе прэм’ера Дзяржсавета рэфарматарам *Чжу Жунцзы.* Рэфарматарам з’яўляецца і цяперашні лідар КНР **Ху Цзіньтао.**

**Знешняя палітыка КНР.** Знешняя палітыка Кітая ў другой палове XX — пачатку XXI ст. зведала значныя змены. У 1950-я гг.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

яна вызначалася ў цэлым сяброўскімі адносінамі з СССР. Пераломным стаў 1956 г., калі ў СССР быў асуджаны культ асобы Сталіна. Савецкае кіраўніцтва прапанавала на міжнароднай арэне ідэю «мірнага суіснавання» з Захадам, і перш за ўсё з ЗША, якія ўпарта не прызнавалі КНР і падтрымлівалі Тайвань. Гэтая ідэя не адпавядала палітычнай лініі Мао Цзэдуна, які баяўся «змовы» двух звышдзяржаў за кошт Кітая. «Мы не павінны баяцца вайны», — заявіў Мао Цзэдун.

У 1960-я гг. савецка-кітайскія адносіны былі цалкам згорнуты, і справа дайшла да памежных канфліктаў і ўзброеных сутыкненняў паміж дзвюма краінамі. КНР пад сваёй эгідай спрабавала сфарміраваць на міжнароднай арэне з краін «трэцяга свету» групіроўку дзяржаў. Але гэтая спроба не была паспяховай, бо СССР і ЗША як два цэнтры біпалярнага свету валодалі большай прыцягальнай сілай, чым КНР. Недавер да кітайскага кіраўніцтва спараджалі ўзброеныя канфлікты Кітая са сваімі суседзямі — Індыяй у 1962 г., В'етнамам у 1979 г.

КНР не ўдалося таксама стаць лідарам сусветнага рэвалюцыйнага працэсу. Пекін актыўна падтрымліваў паўстанцкія рухі ў розных краінах Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі ў 1960-я — 1970-я гг. Але ні адзін з іх не дабіўся перамогі.

Пэўную выгаду КНР змагла атрымаць з савецка-амерыканскага супрацьстаяння. У 1970 г. пачалося збліжэнне паміж Кітаем і ЗША, якія, у сваю чаргу, хацелі атрымаць выгаду з існуючых рознагалоссяў паміж КНР і СССР. ЗША далі згоду на аднаўленне кантынентальнага Кітая ў ААН замест Тайваня. КНР стала пастаянным членам Савета Бяспекі ААН. У 1972 г. прэзідэнт ЗША Р. Ніксан наведаў КНР. У 1978 г. адбылося ўзаемнае прызнанне і абмен пасольствамі паміж КНР і ЗША. ЗША пачалі ажыццяўляць буйныя інвестыцыі ў эканоміку Кітая. У той жа час на міжнароднай арэне КНР актыўна прадаўжала выступаць супраць гегеманісцкіх памкненняў ЗША.

Пасля 1985 г. пачалася нармалізацыя савецка-кітайскіх адносін. У 1989 г. адбыўся візіт у Пекін савецкага лідара М. С. Гарбачова. Да сярэдзіны 1990-х гг. склаліся партнёрскія адносіны паміж КНР і пераемніцай СССР Расіяй. Старшыня КНР тройчы прыязджаў у Расію ў 1990-я гг. Столькі ж разоў наведаў Кітай прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Б. М. Ельцын. Высокі ўзровень адносін паміж



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

дзвюма дзяржавамі падтрымліваўся пры пераемніках Ельцына — У. У. Пуціне і Д. А. Мядзведзеве. Былі ўрэгуляваны памежныя праблемы. Намаганнямі КНР і Расійскай Федэрацыі была створана **Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва (ШАС),** у якую ўвайшлі таксама Казахстан, Кыргызстан, Таджыкістан, Узбекістан. У год 60-годдзя КНР Расійская Федэрацыя і Кітай заключылі пагадненні аб супрацоўніцтве да 2018 г.

Характар стратэгічнага партнёрства набылі адносіны паміж КНР і Рэспублікай Беларусь. Рэгулярнымі сталі сустрэчы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі з вышэйшымі кіраўнікамі КНР. Хуткімі тэмпамі развіваецца эканамічнае супрацоўніцтва. Тавараабарот паміж дзвюма краінамі за 2006 — 2011 гг. павялічыўся амаль да 3 млрд долараў ЗША ў год. Рэалізуецца шэраг буйных інвестыцыйных беларуска-кітайскіх праектаў. Адначасова Пекін умацоўвае адносіны з ЗША і іншымі краінамі Захаду.

У *1997 г.* у склад КНР быў вернуты Сянган (Ганконг), а ў *1999 г.* Аамынь (Макао). Аднак да гэтага часу не ўрэгуляваны адносіны з Тайванем. Кіраўніцтва Кітая прытрымліваецца формулы «адна дзяржава — дзве сістэмы», лічачы востраў неад’емнай часткай КНР. Большасць краін свету падтрымлівае гэтую пазіцыю: існуе адзін Кітай і ўрад КНР з’яўляецца адзіным яго законным прадстаўніком.

Такім чынам, кітайская «перабудова», якая пачалася на шэсць гадоў раней савецкай, не прывяла краіну да негатыўных наступстваў.

### Пытанні і заданні:

1. Ахарактарызуйце эканамічнае становішча Кітая пасля правядзення эканамічных эксперыментаў у ходзе «вялікага скачка» і «культурнай рэвалюцыі».
2. Якая праграма рэформ была прапанавана Дэн Сяапінам? Растлумачце, у чым сутнасць «сацыялізму з кітайскай спецыфікай». Якія вынікі гэтых рэформ?
3. Чаму ў другой палове 1980-х гг. насельніцтва Кітая стала патрабаваць дэмакратызацыі палітычнай сістэмы? Калі адбыліся студэнцкія хваляванні на плошчы Цяньаньмэнь? Які іх вынік?
4. Выдзеліце асноўныя этапы знешняй палітыкі Кітая. Дайце ім кароткую характарыстыку. Вызначыце асноўныя напрамкі



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

знешняй палітыкі Кітая ў цяперашні час. Растлумачце сэнс палітыкі «адна дзяржава — дзве сістэмы».

5. Якое значэнне для Кітая мелі яго адносіны з СССР? Якія падзеі аказалі ўплыў на стан адносін паміж імі?
6. Якія дасягненні сучаснага Кітая? Што, на вашу думку, дало магчымасць дасягнуць такіх вынікаў? Якія праблемы яму належыць вырашыць?

**Прапануем абмеркаваць.** *Якая роля Кітая ў сучасным свеце?*

**Гістарычны дакумент**

**З даклада Цзян Цзэміна на XVI Усекітайскім з'ездзе КПК**

*8 лістапада 2002 г.*

На аснове структурнай аптымізацыі і павышэння эфектыўнасці пастарацца павялічыць да 2020 года валавы ўнутраны прадукт у чатыры разы ў параўнанні з 2000-м годам, значна ўзмацніць сукупную магутнасць краіны і нашу міжнародную канкурэнтаздольнасць. Ажыццявіць у асноўным індустрыялізацыю, стварыць дасканалую сістэму сацыялістычнай рыначнай эканомікі і больш жыццядзейную і адкрытую эканамічную сістэму. Значна падняць удзельную вагу гарадскога насельніцтва і паступова ліквідаваць тэндэнцыю да павелічэння адрозненняў паміж прамысловасцю і сельскай гаспадаркай, горадам і вёскай, асобнымі рэгіёнамі. Зрабіць больш дасканалай сістэму сацзабеспячэння і больш поўнай грамадскую занятасць, паўсюдна памножыць сямейную маёмасць і забяспечыць народу больш заможнае жыццё.

*Якія задачы пастаўлены перад партыяй і краінай на бліжэйшае дваццацігоддзе?*

## § 23. ЯПОНІЯ

**Успомніце:** *Як скончылася Другая сусветная вайна для Японіі? Калі быў падпісаны Акт аб безагаворачнай капітуляцыі Японіі?*

**Пасляваенная Японія.** Пасля капітуляцыі Японіі ў 1945 г. краіна была акупіравана амерыканскімі войскамі, якія дзейнічалі ад імя саюзных дзяржаў. З гэтага часу і да ўступлення ў сілу ў



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

1952 г. Сан-Францыскага мірнага дагавора вярхоўная ўлада ў краіне знаходзілася ў руках ЗША. Палітыка саюзных дзяржаў у адносінах да пераможанай Японіі прадугледжвала выкараненне ў гэтай краіне мілітарызму і станаўленне дэмакратычнай формы дзяржаўнага ўладкавання.

Пад кіраўніцтвам амерыканскага генерала *Дугласа Макартура,* вярхоўнага камандуючага саюзнымі войскамі, Японія падверглася самай радыкальнай праграме рэформ з часоў рэвалюцыі Мэйдзі. У краіне былі ліквідаваны палітычная паліцыя і жандармерыя, міністэрствы ўнутраных спраў, ваеннае і марское, пачалося вызваленне з турмаў палітычных зняволеных. Вызваленыя камеры ў турмах запоўнілі японскія ваенныя злачынцы, спіс якіх быў апублікаваны штабам Макартура. Адначасова пачалася чыстка дзяржаўнага апарату, сродкаў масавай інфармацыі і сферы адукацыі ад асоб, якія супрацоўнічалі з мілітарыстамі (пад гэтыя рэпрэсіі трапіла да 200 тыс. чалавек). Суду Міжнароднага трыбунала былі перададзены 28 прадстаўнікоў правячых вярхоў Японіі, 7 з іх былі пакараны смерцю. Ваенныя трыбуналы адбыліся ў Токіа, Іакагаме, Сінгапуры, Ганконгу, Маніле, Хабараўску. Дзайбацу (буйныя манапалістычныя аб'яднанні) былі распушчаны, раздроблены на дзясяткі меншых кампаній, іх аперацыі былі пастаўлены пад кантроль амерыканцаў. Такім чынам ЗША вырашалі задачу па аслабленню свайго асноўнага гандлёва-прамысловага канкурэнта на Далёкім Усходзе.

У акупіраванай Японіі аднавілі дзейнасць палітычныя партыі, прафсаюзы. Быў падтрыманы таксама левы рух, уключаючы легальную Камуністычную партыю Японіі. 10 красавіка 1946 г. прайшлі ўсеагульныя выбары ў парламент. Затым быў апублікаваны тэкст новай Канстытуцыі (прынята 3 лістапада 1946 г.), распрацаваны ў штабе акупацыйных войск. Гэты дакумент прапаноўваў прынцыпова новую трактоўку статуса імператара Японіі. Абсалютная манархія скасоўвалася, а імператар быў пераўтвораны ў «сімвал адзінства нацыі» і фактычна пазбаўлены палітычнай улады, якая перайшла да парламента. Носьбітам суверэннай улады ў Японіі быў абвешчаны народ. Паводле новай Канстытуцыі, грамадзянамі пачалі лічыцца як мужчыны, так і жанчыны, якія атрымалі роўныя з мужчынамі выбарчыя правы. Уводзілася ўсеагульнае выбарчае права, дэкларавалiся грамадзянскія правы.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

У адпаведнасці з Канстытуцыяй парламент станавіўся цэнтрам палітычнага працэсу. Асноўным законам прадугледжвалася парламенцкая сістэма брытанскага ўзору з кабінетам міністраў, які выбіраўся і нёс адказнасць перад палатай прадстаўнікоў.

Але самым знамянальным новаўвядзеннем стаў 9-ы артыкул Канстытуцыі, якім абвяшчалася аб адмаўленні японскага народа ад вайны як суверэннага права нацыі. Існаванне ў краіне арміі, ваенна-марскога флоту і ваеннай авіяцыі не дапускаліся. Радыкальныя змены адбыліся ў аграрнай сферы. Зямельная рэформа прывяла да адчужэння зямлі ў памешчыкаў і продажу яе па льготных цэнах сялянам-арандатарам. У выніку ў японскай вёсцы ўтварыўся шматлікі слой сялян-уласнікаў. У лістападзе 1948 г. штаб Макартура прапанаваў японскаму ўраду свой план эканамічнай праграмы — курс «шокавай тэрапіі». Але гэта праграма не прынесла чакаемага выніку. Краіна ўцягвалася ў доўгую інфляцыю.

Выратаваў японскую эканоміку пачатак вайны ў Карэі (чэрвень 1950 г.). Японія ператварылася ў тылавую базу амерыканскіх войскаў, што спарадзіла ў краіне своеасаблівы эканамічны бум. За гады Карэйскай вайны (1950 — 1953) ВНП Японіі павялічыўся ў два разы. Падчас вайны былі зняты практычна ўсе абмежаванні ў галіне прамысловасці і гандлі, навязаныя амерыканскай адміністрацыяй у першыя гады акупацыі. Японія ператваралася ў стратэгічнага саюзніка ЗША.

**Сан-Францыскі дагавор.** У **верасні 1951 г.** у *Сан-Францыска* прайшла мірная канферэнцыя, якая падвяла вынікі вайны на Ціхім акіяне. Акупацыя Японіі завяршылася. Адначасова паміж Японіяй і ЗША быў заключаны Дагавор аб узаемным супрацоўніцтве і гарантыях бяспекі, які прадугледжваў захаванне амерыканскіх ваенных баз на японскай тэрыторыі. Японскі ўрад, выкарыстаўшы спрыяльную сітуацыю, да мінімуму скараціў ваенныя расходы і зрабіў асноўны ўпор на вельмі хуткае вырашэнне эканамічных задач. Ужо да 1957 г. было завершана пасляваеннае аднаўленне эканомікі.

У 1956 г. былі нармалізаваны савецка-японскія адносіны, якія доўгі час заставаліся нявызначанымі з-за таго, што СССР адмовіўся ўдзельнічаць у падпісанні Сан-Францыскага мірнага дагавора 1951 г. У Сумесную дэкларацыю аб нармалізацыі адносін было ўключана абавязацельства Савецкага Саюза перадаць Японіі, пасля заключэння мірнага дагавора паміж дзвюма краінамі, паўднёва-курыльскія


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

астравы Хабамаі і Шыкатан. Аднachасова СССР абяцаў падтрымаць просьбу Японіі аб уступленні ў ААН. У студзені 1960 г. у разгар «халоднай вайны» Вашынгтон і Токіо заключылі новы Дагавор аб бяспецы. Правы амерыканскіх ваеннаслужачых у Японіі абмежаваліся, але самі ваенныя базы заставаліся недатыкальнымі. У адказ на гэта Савецкі Саюз перагледзеў умовы Сумеснай дэкларацыі і адмовіўся абмяркоўваць тэрытарыяльныя прэтэнзіі Японіі. Гэта прыкметна ўскладніла савецка-японскія, а затым і расійска-японскія адносіны.

**Эканамічнае развіццё.** Развіццё японскай эканомікі ў пасляваенны перыяд было выключна паспяховым. За 15 гадоў (1958 — 1973) ВНП Японіі павялічыўся ў 6,5 раза, а аб'ём прамысловай вытворчасці — у 10 разоў. У свеце загаварылі пра «японскі эканамічны цуд». Да канца 1960-х гг. краіна заняла другое месца ў капіталістычным свеце па аб'ёму прамысловай вытворчасці, а ў пачатку 1970-х гг. — і па аб'ёму ВНП.

У літаратуры ўказваюцца дзясяткі прычын эканамічнага цуду Японіі. Аднак важнейшай, безумоўна, з'яўляецца рэгулюючая роля дзяржавы ў сацыяльна-эканамічнай сферы. Гэта перш за ўсё дзяржкантроль над экспартам — імпартам капіталу; пратэкцыянізм у гандлёвай сферы, усялякае заахвочванне імпарту сучасных заходніх тэхналогій для развіцця нацыянальнай прамысловасці на сучаснай тэхналагічнай аснове; прыярытэтная падтрымка вытворцы, у тым ліку дробнага, у параўнанні з гандляром-перакупшчыкам; спыненне фінансавых спекуляцый; прымяненне строгіх санкцый да японскіх фірм, якія канкурыравалі паміж сабой на сусветным рынку.



*Будынак такійскай біржы.*

Да самага канца 1960-х гг. тэмпы росту эканомікі забяспечваліся высокай ступенню эксплуатацыі рабочай сілы. Праца японскага рабочага аплачвалася ў 3 — 5 разоў менш, чым праца амерыканскага рабочага. Як і пасля рэвалюцыі Мэйдзі, Японія шырока выкарыстоўвала навукова-



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

тэхнічныя дасягненні краін Захаду. Ёю былі закуплены дзясяткі тысяч ліцэнзій і патэнтаў. Японцы творча дапрацавалі іх і хутка ўкаранілі ў вытворчасць. У выніку Японія ліквідавала сваё навукова-тэхнічнае адставанне ад больш развітых краін свету. Неабходна ўлічваць і тое, што Японія ўпершыню ў сваёй гісторыі будавала эканоміку ва ўмовах адсутнасці ўзброеных сіл і ваенных расходаў, што давала краіне магчымасць дадатковага прамысловага росту.

Немалаважную ролю адыгралі сінтаісцкія і канфуцыянскія працоўныя і сацыяльныя традыцыі японцаў, наяўнасць адной з лепшых у свеце сістэм адукацыі і прафарыентацыі. Дзякуючы гэтаму японцам удалося ажыццявіць «рэвалюцыю якасці» — адну з галоўных умоў канкурэнтаздольнасці японскіх тавараў на сусветным рынку.

Аднак сучасная японская эканоміка надзвычай уразлівая. Яна ў многім залежыць ад краін, якія маюць сыравінныя рэсурсы ці кантралююць іх здабычу і транспарціроўку. Толькі 17 % тэрыторыі краіны прыдатна для сельскагаспадарчай вытворчасці, таму існуе харчовая залежнасць ад знешняга свету.



*Імператар Японіі Акіхіта з жонкай.*

**Палітычнае развіццё.** Палітычная сістэма Японіі пасля Другой сусветнай вайны заснавана на шматпартыйнай парламенцкай дэмакратыі з захаваннем імператара ў якасці кіраўніка дзяржавы. У студзені 1989 г. 125-м імператарам Японіі стаў 55-гадовы Акіхіта, старэйшы сын памерлага імператара Сёва. Па традыцыйнаму японскаму летазлічэнню пачалася новая эра, якая атрымала афіцыйную назву Хэйсэй («Усталяванне міру»).

Умацаванне і згуртаванне левых партый, актыўнасць рабочага руху, нарастанне барацьбы супраць амерыканскіх ваенных баз на тэрыторыі Японіі падштурхнулі буржуазныя партыі да аб’яд-



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

нання. У *1955 г.* была створана *Ліберальна-дэмакратычная партыя (ЛДП).* Яна прадстаўляла інтарэсы манапалістычнага капіталу, але выкарыстоўвала лозунг стварэння «дзяржавы ўсеагульнага дабрабыту». Кансерватыўны лагер і прамыслова-фінансавыя колы аб'ядналіся і тым самым адмовіліся ад заходняй мадэлі канкурэнцыі некалькіх буржуазных партый. У 1964 г. вылучалася *правацэнтрысцкая партыя Камэйта* з палітыкай, разлічанай на дробнабуржуазныя слаі горада. Яе стварэнне завяршыла фарміраванне шматпартыйнай сістэмы. Так у японскім грамадстве адбылося дакладнае палітычнае размежаванне. Суадносіны сіл, якія склаліся, вызначалі ўсё ўнутрыпалітычнае жыццё да пачатку 1990-х гг. Яго асаблівасці — ЛДП мела пастаянную большасць, апазіцыйным партыям належала больш за $^1/_3$ дэпутацкіх месцаў у парламенце. Гэта перашкаджала ЛДП перагледзець Канстытуцыю і змяніць палітычны лад.

У палітычным жыцці з пачатку 1970-х гг. правячая ЛДП заахвочвала мілітарысцкія тэндэнцыі, раслі ваенныя расходы, прэстыж урада падрываўся фактамі прамога ўмяшання буйнога капіталу ў выбарчую кампанію. У 1975—1976 гг. разгарэўся палітычны скандал вакол прэм'ер-міністра К. Танакі, якога арыштавалі за хабар, атрыманы ад амерыканскай авіякампаніі Локхід. Ажыятаж вакол «справы Локхід» доўжыўся прыкладна 10 гадоў. ЛДП стала губляць свае пануючыя пазіцыі ў дзяржаўным апараце Японіі. Тым не менш ЛДП перамагла на парламенцкіх выбарах у 1986 г.

У 1980-я — 1990-я гг. шматпартыйная сістэма пашыралася, абвастралася барацьба за выбаршчыкаў. ЛДП прапанавала канцэпцыю «частковай кааліцыі» з мэтай прыцягнення на свой бок больш дробных партый. У 1993 г. ЛДП прайграла парламенцкія выбары і саступіла ўладу кааліцыйнаму ўраду. Праз тры гады яна аднавіла свае пазіцыі. Аднак выбары 2009 г. прынеслі перамогу Дэмакратычнай партыі, і ЛДП перайшла ў апазіцыю.

**Сучасная Японія.** З канца 1980-х гг. пачалі праяўляцца першыя прыкметы крызісу ў эканоміцы. У 1991 г. пачынаецца дэпрэсія. Ужо ў 1992 г. рост ВНП Японіі прыпыніўся, у 1993 г. тэмп росту складаў усяго 0,1 % да ўзроўню 1992 г. З 1994 г. эканамічная дэпрэсія перарасла ў крызіс. Вясной 1995 г. беспрацоўе скла-



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

ла 3,2 % (самы высокі паказчык з 1953 г.). Структурны крызіс у Японіі выявіў сур'ёзныя праблемы ў грамадстве: адставанне ў сацыяльнай інфраструктуры, зніжэнне канкурэнтаздольнасці японскіх тавараў на сусветным рынку, рост удзельнай вагі пенсіянераў у агульнай колькасці насельніцтва, рэзкае павышэнне цэн на нерухомасць, залежнасць ад амерыканскіх тэхналогій, адсутнасць прарываў у вядучых галінах (авіябудаванне, засваенне космасу і інш.). Яшчэ адной важнай прычынай эканамічных цяжкасцей з'яўляецца праблема банкаўскай сістэмы, якая адчувальна рэагуе на любыя змены ў сусветнай фінансавай сістэме. З 1998 г. рэалізуецца комплексны план развіцця краіны да 2010 — 2015 гг.



*Пяцідзесяціпавярховы небаскроб у Токіа. 2008 г.*

У знешняй палітыцы Японія накіравала ўсе свае намаганні на наладжванне дыпламатычных адносін са сваімі суседзямі. У 1965 — 1970-я гг. японскі ўрад усталяваў цесныя кантакты з краінамі Азіі. У 1972 г. японскі прэм'ер-міністр наведаў Кітай, пасля чаго Японія спыніла дыпламатычныя адносіны з Тайванем.

З лістапада 1975 г. Японія стала пастаянным удзельнікам усіх штогадовых сустрэч кіраўнікоў найбольш развітых капіталістычных краін (краін «вялікай сямёркі»). Асноўнай дактрынай сучаснай знешняй палітыкі застаецца канцэпцыя саюза з ЗША, якія захоўваюць ваенныя базы ў Японіі. У 1987 г. было заключана пагадненне аб удзеле Японіі ў праграме «зорных войнаў». Восенню 1997 г. ваенныя міністры і міністры замежных спраў ЗША і Японіі падпісалі ў Вашынгтоне новае пагадненне аб асноўных напрамках ваеннага супрацоўніцтва дзвюх краін на аснове японa-амерыканскага дагавора аб бяспецы.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Сярод знешнепалітычных партнёраў Японіі вядучыя месцы займаюць Кітай, ЗША, Паўднёвая Карэя, Аўстралія. У канцы XX — пачатку XXI ст. дзякуючы прынятым на ўзроўні ўрадаў мерам удалося рэзка павялічыць вываз капіталу і інвестыцый за мяжу. Вельмі буйныя ўкладанні зроблены ў эканоміκі ЗША, краін Азіі, Заходняй Еўропы і Лацінскай Амерыкі.

## Пытанні і заданні:

1. Якія асноўныя праблемы неабходна было вырашыць у Японіі пасля заканчэння Другой сусветнай вайны? Што было зроблена для таго, каб вырашыць гэтыя праблемы? У чым заключалася дваістасць палітыкі ЗША ў Японіі?
2. Якія змены адбыліся ў дзяржаўным уладкаванні Японіі пасля заканчэння Другой сусветнай вайны? Пабудуйце схему дзяржаўнага ўладкавання Японіі ў адпаведнасці з Канстытуцыяй 1946 г.
3. Якія прычыны садзейнічалі «японскаму эканамічнаму цуду»? Параўнайце «эканамічны цуд» у Германіі і Японіі.
4. Складзіце табліцу «Асноўныя палітычныя партыі Японіі».

| Дата стварэння | Назва палітычнай партыі | Чые інтарэсы прадстаўляе |
|---|---|---|
| | | |

5. Ахарактарызуйце сацыяльна-эканамічнае становішча Японіі ў канцы XX — пачатку XXI ст.
6. Якія асноўныя напрамкі знешняй палітыкі Японіі ў пасляваенныя гады? Што прадстаўляе сабой асноўная дактрына сучаснай знешняй палітыкі Японіі?
7. Як складваліся адносіны паміж Японіяй і СССР, а цяпер Расійскай Федэрацыяй?

## Гістарычная даведка

**Гурткі якасці.** У пачатку 1960-х гг. у Японіі арганізуюцца першыя гурткі якасці, у якіх рабочыя па ўласнай ініцыятыве збіраліся пасля работы на 1 — 2 гадзіны для абмеркавання шляхоў павышэння якасці прадукцыі, скарачэння выдаткаў вытворчасці, эканоміі электраэнергіі, павышэння



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

ступені тэхнічнай бяспекі. У 1965 г. дзейнічала каля 5 тыс. такіх гурткоў, якія аб'ядноўвалі 70 тыс. работнікаў. Да пачатку 1980-х гг. гурткоў налічвалася ўжо больш за 100 тыс. і аб'ядноўвалі яны больш за 1 млн работнікаў, а ў канцы 1980-х гг. дзейнічала амаль 300 тыс. гурткоў, у якіх удзельнічала каля 2,25 млн чалавек.

## § 24. ІНДЫЯ

**Успомніце:** *Якая партыя ўзначаліла нацыянальна-вызваленчы рух у Індыі ў міжваенны перыяд? Які ўплыў на нацыянальна-вызваленчы рух у Індыі аказала Другая сусветная вайна?*

**Дасягненне незалежнасці.** З пачаткам Другой сусветнай вайны нацыянальна-вызваленчы рух у Індыі не спыніўся. У адказ на кампанію масавага непадпарадкавання, што разгарнулася ў 1942 г., англічане адказалі рэпрэсіямі і арыштамі кіраўнікоў Індыйскага нацыянальнага кангрэса (ІНК) — М. Гандзі і Дж. Нэру. Непапулярнасць англійскай адміністрацыі ўзмацніў голад 1943 — 1944 гг., падчас якога памерла каля 3 млн чалавек на паўночным усходзе і поўдні краіны. Пасля вайны кіраўнікі ІНК былі выпушчаны на свабоду. Яны патрабавалі ад Вялікабрытаніі надання Індыі поўнай незалежнасці.

Разумеючы пагрозу існуючай у Індыі палітычнай сістэме, правячыя колы Вялікабрытаніі падтрымалі ідэю дэкаланізацыі. Англічане вырашылі мірным шляхам перадаць уладу ўмераным індыйскім нацыяналістам, баючыся захопу ўлады радыкаламі.

Перагаворы праходзілі ў напружанай атмасферы: ва ўмовах росту інфляцыі і народных хваляванняў. Росту незадавальнення садзейнічаў разгорнуты ў Індыі судовы працэс па справе салдат Індыйскай нацыянальнай арміі, якая ў перыяд вайны падтрымала Японію з надзеяй рэалізаваць ідэі індыйскай незалежнасці. Сацыяльная напружанасць узмацнілася міжканфесійнымі і этнічнымі канфліктамі, якія актыўна выкарыстоўвалі англічане.

У **1947 г.** апошні віцэ-кароль Індыі *лорд Маўнтбетэн*, абапіраючыся на пажаданні ўрада лейбарыстаў, падрыхтаваў план, у адпаведнасці з якім на тэрыторыі Індыі прадугледжвалася стварэнне дзвюх дзяржаў — індускай і мусульманскай.


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"
АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

**14 жніўня 1947 г.** уступіў у сілу *Закон аб незалежнасці Індыі,* які замацоўваў за ёй статус **дамініёна**. Яе тэрыторыя была падзелена на два дамініёны — *Індыйскі саюз* і *Пакістан* («краіна чыстых»). Лідар Мусульманскай лігі М. А. Джына стаў на чале Пакістана, Індыя ж часова засталася пад кіраўніцтвам лорда Маўнтбетэна да ўсталявання рэспубліканскай Канстытуцыі. У *1949 г.* Індыя і Пакістан увайшлі ў Брытанскую Садружнасць, якая аб'яднала Вялікабрытанію і яе былыя дамініёны і калоніі, што сталі незалежнымі дзяржавамі.

Паколькі межы паміж дзвюма новымі дзяржавамі былі праведзены без уліку нацыянальных і рэлігійных асаблівасцей, зыход англічан прывёў да абвастрэння адносін паміж індусамі і мусульманамі. Супрацьстаянне дзвюх рэлігійных абшчын суправаджалася маштабнымі перасяленнямі і велізарнымі ахвярамі. Ужо з *кастрычніка 1947 г.* Індыя і Пакістан пачалі вайну за кантроль над штатам Кашмір, і, нягледзячы на рашэнне ААН на карысць Індыі, кашмірскае пытанне да гэтага часу застаецца нявырашаным.

Сікхскае насельніцтва штата Пенджаб у сувязі з новым тэрытарыяльным падзелам таксама апынулася падзеленым і стала з 1947 г. патрабаваць ад дзвюх новаўтвораных дзяржаў прызнання сваёй аўтаноміі. Канфлікты, што пачаліся паміж мусульманамі і сікхамі, прывялі да масавага выгнання сікхаў з Заходняга і мусульман з Усходняга Пенджаба. Пазней, з 1970-х гг., абвастрыліся супярэчнасці паміж сікхамі і індусамі.



*Джавахарлал Нэру і Махатма Гандзі.*

Народныя хваляванні канца 1940-х гг. прывялі да наплыву ў Дэлі бежанцаў, што магло прывесці да новых міжнацыянальных канфліктаў. Адзін з лідараў індыйскага нацыянальна-вызваленчага руху М. Гандзі паспрабаваў знізіць напружанне і дамагчыся заключэння міру з Пакістанам. Аднак 30 студзеня 1948 г. М. Гандзі быў забіты індусам-фанатыкам.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"




*Індыя і суседнія дзяржавы ў 1945 — 2012 гг.*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Утварэнне рэспублікі. «Курс Нэру».** У **1950 г.** уступіла ў сілу Канстытуцыя Індыі, паводле якой краіна станавілася суверэннай парламенцкай рэспублікай і захоўвала сваё членства ў Садружнасці нацый.

Дзяржаўным будаўніцтвам незалежнай Індыі заняўся прэм'ер-міністр **Джавахарлал Нэру.** Перад ім стаяла цяжкая задача: пераадолець каланіяльнае мінулае і зрабіць Індыю сапраўды незалежнай дзяржавай. Яго праграма атрымала назву **«курс Нэру».** У яе аснову была пакладзена канцэпцыя «індыйскага сацыялізму» («кангрэсісцкага сацыялізму»), якая прадугледжвала абмежаванне прыватнай уласнасці на карысць грамадства. Прадухіленне нацыянальна-рэлігійнага разладу і сацыяльны кампраміс з'яўляліся састаўной часткай «курсу Нэру».

Урад Дж. Нэру правёў шэраг рэформ у эканоміцы і дзяржаўнай дзейнасці, накіраваных на пераадоленне адсталасці і мадэрнізацыю краіны. Улады імкнуліся развіваць прыватны і дзяржаўны сектары эканомікі. Развіццё цяжкай прамысловасці стварала эканамічную аснову незалежнасці. З 1953 г. у краіне разгарнулася адміністрацыйная рэформа, паводле якой прадугледжвалася рэарганізацыя тэрыторый штатаў па нацыянальна-моўнаму прынцыпу.

### Гістарычны партрэт



**Джавахарлал Нэру** (1889 — 1964) — палітычны і дзяржаўны дзеяч Індыі. Закончыў Кембрыджскі ўніверсітэт. У 1912 г. уступіў у ІНК і хутка стаў яго лідарам. У 1929 г. прапанаваў лозунг поўнай незалежнасці Індыі, узначаліў распрацоўку першай сацыяльна-эканамічнай праграмы развіцця краіны. З моманту стварэння незалежнай Індыі (1947) да сваёй смерці бязменна займаў пасаду прэм'ер-міністра і міністра замежных спраў. З яго імем звязаны распрацоўка і ажыццяўленне асноўных прынцыпаў унутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Індыя, якія атрымалі назву «курсу Нэру». Выступаў супраць рэлігійнага фанатызму. Праводзіў палітыку, накіраваную на барацьбу за мір, міжнароднае супрацоўніцтва, супраць неакаланіялізму і расізму. Лічыў важным развіццё сяброўскіх адносін з СССР. Адыгрываў вядучую ролю ў рухах салідарнасці народаў Азіі і Афрыкі і краін, што не далучыліся.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

У знешняй палітыцы Дж. Нэру прытрымліваўся прынцыпаў мірнага суіснавання і недалучэння да ваенных блокаў. Менавіта Індыя стаяла ля вытокаў **Руху недалучэння.** Былі ўсталяваны таксама сяброўскія адносіны з СССР, з дапамогай якога ажыццяўлялася індустрыялізацыя краіны. Узаемаадносіны з паўночна-ўсходнім суседам — КНР — былі нацягнутымі: у тыбецкім рэгіёне паміж дзвюма дзяржавамі адбываліся ваенныя сутыкненні.

Смерць Дж. Нэру ў 1964 г. прывяла да актывізацыі ў ІНК правых сіл, таму нядзіўна, што на выбарах 1967 г. Кангрэс страціў частку месцаў. Імкнучыся аднавіць папулярнасць ІНК, прэм'ер-міністр **Індзіра Гандзі** (дачка Дж. Нэру), якая ўзначаліла з 1966 г. урад, аб'явіла аб правядзенні ў краіне новых рэформ. Яны ўключалі пашырэнне сферы дзяржсектара, абмежаванні дзейнасці манаполій, падтрымку дробнага бізнесу. Правыя кангрэсісты, якія настойвалі на абмежаванні ролі дзяржавы ў эканоміцы, пайшлі на арганізаванае супраціўленне.

У 1969 г. у ІНК адбыўся раскол. Правыя выйшлі са складу ІНК і ўтварылі сваю партыю «Арганізацыя Кангрэс» — ІНК (А). Прыхільнікі І. Гандзі вымушаны былі змяніць назву партыі, і яна стала называцца ІНК (І). У 1971 г. блок І. Гандзі атрымаў унушальную перамогу на выбарах у многім дзякуючы паспяховай вайне Індыі з Пакістанам. Аднак ва ўмовах дэмаграфічнага выбуху і засухі 1972—1975 гг. у краіне пагоршылася эканамічная сітуацыя. Пачаліся забастовачны рух і студэнцкія хваляванні.

Апазіцыйныя палітычныя партыі патрабавалі адстаўкі ўрада. Індзіра Гандзі адказала працягам нацыяналізацыі (дзяржсектар склаў 43 %) і сацыялістычнага курсу, а затым і ўвядзеннем надзвычайнага становішча ў 1975 г. Аднак сітуацыя была настолькі сур'ёзнай, што яна прызнала сваё паражэнне і нечакана абвясціла аб правядзенні ўсеагульных выбараў у парламент. Апазіцыйныя партыі сфарміравалі ў 1977 г. адзіную партыю *Народная партыя («Джаната парці»)*, якая адразу ж атрымала перамогу на парламенцкіх выбарах. Новы ўрад узначаліў 80-гадовы *Мараржы Дэсаі.*

**Урад Індзіры Гандзі.** Апазіцыйныя ІНК сілы змаглі пратрымацца ва ўладзе толькі да 1980 г. Іх раз'яднанасць, невыкананне перадвыбарных абяцанняў, рост цэн і падаткаў прывялі да таго, што ІНК на чале з І. Гандзі атрымаў перамогу на выбарах. І. Гандзі пасля заручэння фінансавай падтрымкай МВФ пайшла на скара-



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

чэнне дзяржсектара і лібералізацыю эканомікі, аднак распачатыя меры прывялі толькі да павелічэння знешняга доўгу. У гэты перыяд у палітычным жыцці краіны абвастрылася праблема сепаратызму. На поўдні Індыі пачалі дзейнічаць тамільскія сепаратысты. Актывізаваліся сутыкненні паміж мусульманамі і індусамі ў штатах Джаму і Кашмір. У штаце Пенджаб з патрабаваннямі аддзялення ад Індыі выступілі сікхі, што прывяло да ўзброенага сутыкнення з урадавымі войскамі. 31 кастрычніка 1984 г. была забіта Індзіра Гандзі двума сікхамі-тэрарыстамі. Пасаду прэм'ер-міністра заняў яе сын — *Раджыў Гандзі*.

**Курс на лібералізацыю.** На парламенцкіх выбарах у студзені 1985 г. упэўненую перамогу атрымаў ІНК на чале з Р. Гандзі. У якасці першачарговай задачы гэты ўрад абвясціў захаванне адзінства краіны. У 1986 г. была абвешчана таксама новая праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця, накіраваная на лібералізацыю эканомікі. Улады аслабілі дзяржаўны кантроль над эканомікай, былі скарочаны падаткі, спрошчаны імпартна-экспартныя працэдуры. Індыйскія фірмы пачалі супрацоўнічаць з замежнымі прадпрыемствамі, дазвалялася стварэнне сумесных прадпрыемстваў. Малаэфектыўныя дзяржаўныя прадпрыемствы закрываліся. Адначасова па ініцыятыве Р. Гандзі пры падтрымцы СССР у Індыі ўкараняліся высокія тэхналогіі.

Аднак з-за імклівага росту насельніцтва жыццёвы ўзровень індыйцаў пагаршаўся. На парламенцкіх выбарах 1989 г. перамогу атрымаў блок палітычных партый, вядучую ролю ў якім займала Індыйская народная партыя («Бхарація джаната парці»). Яна была створана ў 1980 г. у выніку расколу Народнай партыі і прытрымлівалася кансерватыўных і рэлігійных (індуісцкіх) ідэй. Новы ўрад аказаўся недзеяздольным і не змог стабілізаваць сітуацыю ў краіне. У маі 1991 г. былі прызначаны датэрміновыя выбары ў парламент. Падчас выбарчай кампаніі Р. Гандзі быў забіты тамільскімі сепаратыстамі, што не перашкодзіла ІНК (І) атрымаць перамогу.

Урад *Нарасімха Раа* (1991—1996), а таксама правыя кааліцыйныя ўрады, якія прыходзілі яму на змену, праводзілі лібералізацыю эканомікі. Рэформы прыкметна палепшылі становішча краіны. Эканоміка павольна пайшла на ўздым: спачатку з тэмпамі росту 3,9 %, потым яны выраслі да 9 % у 2000 г. Да цяперашняга часу Індыя дасягнула значных поспехаў. Дзяржава ўмацоўвае



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

ўласныя золатавалютныя рэзервы, пашырае здабычу нафты. З 1992 г. Індыя экспартуе збожжа. З кожным годам расце экспарт тавараў высокіх тэхналогій. Па колькасці высокакласных кадраў у галіне камп'ютарнага праграміравання Індыя займае другое месца ў свеце пасля ЗША.

Аднак перад Індыяй па-ранейшаму стаяць цяжкавырашальныя сацыяльна-эканамічныя праблемы. Адна з іх — аграрнае перанасяленне краіны. У Індыі ўжо асвоена пад пашу больш за палову тэрыторыі, што значна больш, чым дзе-небудзь у свеце (напрыклад, у ЗША — 16 %, у Японіі — 15 %, у КНР — 11 %). Далейшае павелічэнне плошчы ворнай зямлі практычна вычарпана. Вострай сацыяльнай праблемай з'яўляецца няроўнасць у даходах: 20 % насельніцтва спажывае больш за палову нацыянальнага даходу. Далёкае ад вырашэння і праблема беднасці. Індыя ўсё яшчэ застаецца краінай масавай галечы, хоць узровень яе прыкметна знізіўся: з 51 % у 1980 г. да 23 % у 1990 г. Каля 300 млн індыйцаў жывуць за рысай беднасці. Прырост насельніцтва, якое ўжо пераваліла за мільярд чалавек, апераджае рост эканомікі.

У маі 2004 г. на выбарах Індыйская народная партыя пацярпела паражэнне. Новы ўрад, які ўзначаліў адзін з лідараў ІНК М. Сінгх, імкнецца праводзіць палітыку «эканамічнага росту і сацыяльнай гармоніі».

**Праблемы знешняй палітыкі.** Асноўнымі задачамі знешняй палітыкі сучаснай Індыі з'яўляюцца забеспячэнне міру, нацыянальнай бяспекі, абарона суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці. Першачарговае значэнне для іх вырашэння маюць адносіны з Кітаем, Пакістанам, ЗША і Расіяй.

Праблема ўзаемаадносін паміж Індыяй і Кітаем узнікла пасля акупацыі КНР Тыбета ў 1954 г. Тысячы тыбетцаў збеглі праз горныя перавалы ў Індыю. Тут знайшоў свой прытулак духоўны і свецкі лідар Тыбета Далай-Лама. Кітайскае кіраўніцтва палічыла такое рашэнне Індыі несяброўскім. Індыйскі бок, у сваю чаргу, расцаніў далучэнне Тыбета і размяшчэнне там кітайскіх узброеных сіл як варожыя дзеянні. Адбыліся памежныя ўзброеныя сутыкненні. У 1962 г. кітайскія войскі нечакана пачалі масіраванае наступленне на індыйска-кітайскай мяжы. Індыйскія войскі, якія не рыхтаваліся да ваенных падзей, пацярпелі поўнае паражэнне. Паваротнай падзеяй у складаных узаемаадносінах дзвюх краін стала заява новага кітайскага лідара Дэн Сяапіна (пасля смерці Мао


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"
АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

Цзэдуна) аб тым, што праблема межаў з Індыяй можа і павінна быць вырашана толькі мірнымі сродкамі.

Асаблівае месца ў знешняй палітыцы Індыі займаюць адносіны з Пакістанам. Прычынай абвастрэння інда-пакістанскіх адносін і ваенных канфліктаў (1947, 1965, 1971, 1999) стала несумяшчальнасць падыходаў абодвух бакоў да вырашэння пытання аб прыналежнасці штатаў Джаму і Кашмір. Лінія спынення агню, усталяваная пад эгідай ААН у 1949 г., фактычна падзяліла Кашмір на дзве часткі — індыйскую і пакістанскую. У 1971 г. Пакістан пацярпеў паражэнне ў вайне з Індыяй. З яго складу выйшла незалежная рэспубліка Бангладэш, створаная пры падтрымцы Індыі. Суадносіны сіл змяніліся не на карысць Пакістана. У выніку падпісанага ў 1972 г. інда-пакістанскага пагаднення бакі дамовіліся вырашаць усе спрэчныя пытанні шляхам перагавораў і афіцыйна прызнавалі лінію падзелу Кашміра на індыйскую і пакістанскую часткі. Аднак Пакістан, у канчатковым выніку, не задавальняла такая сітуацыя. Яго прэтэнзіі на мусульманскую частку індыйскага Кашміра захоўваюцца, што можа выклікаць новыя ваенныя сутыкненні. Інда-пакістанскія супярэчнасці на сучасным этапе ўскладняюцца наяўнасцю ў абодвух бакоў ядзернай зброі.

Яшчэ адзін важны напрамак знешняй палітыкі Індыі — амерыканскі. У гады «халоднай вайны» Індыя з'яўлялася лідарам Руху недалучэння і арыентавалася ў асноўным на Савецкі Саюз. Злучаныя Штаты займалі прапакістанскую пазіцыю. Пасля распаду СССР Індыя, Кітай і Расія абвясцілі стратэгію шматпалярнага свету, якая па сутнасці была накіравана на абмежаванне сусветнага лідарства Злучаных Штатаў. Палітычнае збліжэнне паміж Індыяй і ЗША пачалося пасля візіту прэзідэнта Б. Клінтана ў Індыю ў 2000 г. ЗША прызналі Індыю ў якасці ядзернай дзяржавы і знялі ўсе санкцыі, уведзеныя супраць яе раней. У 2008 г. паміж Індыяй і ЗША быў заключаны дагавор аб ядзерным супрацоўніцтве, які канчаткова паклаў канец ізаляцыі краіны ў галіне атамнай энергетыкі. Цяпер ЗША сталі асноўным эканамічным партнёрам Індыі.

Пасля дасягнення палітычнай незалежнасці Індыя ўсталявала сяброўскія адносіны з СССР. Савецкі Саюз аказаў дапамогу ў стварэнні прадпрыемстваў у энергетыцы, нафтахімічнай, суднабудаўнічай і іншых галінах прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Сімвалам савецка-індыйскага сяброўства стаў Бхілайскі металургічны завод. Першы індыйскі спадарожнік быў запушчаны ў космас



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

з дапамогай савецкай ракеты-носьбіта. Індыйская армія на 80 % была ўкамплектавана савецкай зброяй. Пасля распаду СССР Расійскай Федэрацыі давялося наладжваць новыя адносіны з Індыяй, якія традыцыйна маюць сяброўскі характар.

## Пытанні і заданні:

1. Выдзеліце асноўныя этапы набыцця Індыяй незалежнасці. Складзіце храналагічную табліцу.
2. Якія праблемы неабходна было вырашыць Індыі пасля набыцця незалежнасці?
3. У чым былі асаблівасці эканамічнага развіцця Індыі ў пасляваенны перыяд? Ахарактарызуйце «курс Нэру» і эканамічную палітыку Індзіры і Раджыва Гандзі. Што характарызуе эканамічнае развіццё Індыі ў сучасны перыяд?
4. Ахарактарызуйце палітычную сістэму Індыі. Якія партыі адыгрываюць вядучую ролю ў палітыцы? Назавіце найбольш значных, на ваш погляд, палітычных дзеячаў Індыі. Дайце ацэнку іх дзейнасці.
5. Якія сацыяльныя і нацыянальныя праблемы існуюць у Індыі? Ахарактарызуйце палітычную карту Індастана.
6. Якія асноўныя мэты і напрамкі знешняй палітыкі Індыі? Якія нявырашаныя знешнепалітычныя праблемы стаяць перад Індыяй?

**Прапануем абмеркаваць.** Індыя належыць да ліку самых шматпартыйных краін свету, а яе партыйная сістэма па сваёй структуры і функцыях найбольш развітая і дыферэнцыраваная ў параўнанні з іншымі краінамі «трэцяга свету» Азіі і Афрыкі. Так, ва ўсеагульных выбарах удзельнічаюць каля 300 палітычных партый, сярод якіх да 10 — усеіндыйскіх. Чым вы можаце растлумачыць такі шырокі спектр палітычных плыней?




## Гістарычная даведка

**Балівуд** — гэта сінонім кінаіндустрыі індыйскага горада Мумбай (былы Бамбей), названы так па аналогіі з Галівудам у Каліфорніі, ЗША. Часта гэтым тэрмінам



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

называюць увесь кінематограф Індыі, але Балівуд — гэта толькі частка ўсяго індыйскага кінематографа. Штогод на кінастудыях Балівуда выпускаецца каля 800 фільмаў, у асноўным на мове хіндзі. Індыйскі кінематограф — з'ява ўнікальная, па сваіх маштабах ён дастаткова можа сапернічаць з амерыканскім кіно і ўжо працяглы час займае першае месца ў свеце па вытворчасці мастацкіх фільмаў, большасць якіх не выходзіць за межы сваёй радзімы. Кінематограф Індыі дзеліцца на дзве часткі, якія існуюць незалежна адна ад адной. Ёсць мастацтва «масавае», а ёсць — элітарнае. У апошні час балівудскія фільмы пачалі набываць папулярнасць у заходніх краінах.

## § 25. КРАІНЫ МУСУЛЬМАНСКАГА СВЕТУ

**Успомніце:** *Якія краіны называюць краінамі «трэцяга свету»? Растлумачце значэнне паняццяў «дэкаланізацыя», «неакаланіялізм».*

**Агульная характарыстыка краін мусульманскага свету.** Паняцце «ісламскі свет», ці «ісламская цывілізацыя», у многім умоўная. Яно азначае сукупнасць дзяржаў, насельніцтва якіх у сваёй большасці вызнае мусульманскую рэлігію. У сучасным свеце налічваецца больш за 1 млрд мусульман. Іх на планеце менш, чым хрысціян, але розніца няўмольна скарачаецца. Іслам з'яўляецца рэлігіяй, якая распаўсюджваецца хутчэй за іншыя на планеце. У Заходняй Еўропе жыве каля 20 млн мусульман, у Паўночнай Амерыцы



*Паломнікі каля свяшчэннага камня мусульман Кааба ў горадзе Мекка.*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

— больш за 5 млн чалавек. Вучоныя прадказваюць, што ў XXI ст. іслам стане самай распаўсюджанай рэлігіяй на Зямлі.

Амаль у 50 краінах свету большасць насельніцтва адносіцца да традыцыйна мусульманскіх народаў. У больш чым 20 афра-азіяцкіх дзяржавах іслам абвешчаны дзяржаўнай (ці афіцыйнай) рэлігіяй. Аднак у сучасным свеце найбольшая канцэнтрацыя мусульманскага насельніцтва назіраецца не ў тых краінах, якія здаўна лічыліся сусветнымі цэнтрамі ісламу, а на ўскраінах мусульманскай умы (абшчыны).

Самая шматнаселеная мусульманская дзяржава — Інданезія — размешчана на перыферыі мусульманскага свету, у Паўднёва-Усходняй Азіі. У гэтай краіне пражывае 235 млн чалавек, з іх мусульман — не менш 200 млн чалавек. Яшчэ адной ісламскай ускраінай, якая хутка расце, стала афрыканская краіна — Нігерыя. Тут мусульманская большасць складае каля 70 млн чалавек. Сярод «старых» ісламскіх краін выдзяляюцца сваёй колькасцю Пакістан — каля 160 млн мусульман (96 % насельніцтва) і Бангладэш — 135 млн




*Ісламскі свет у 1945 — 2012 гг.*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

чалавек (больш за 85 %). У арабскіх жа краінах пражываюць толькі 18 % усіх мусульман.

Характэрнай рысай мусульманскага свету з'яўляецца яго этнічная неаднастайнасць. У ім выдзяляюцца цюркамоўны, персідскі і арабскі рэгіёны. Цэнтр ісламскага свету складаюць краіны арабскага Усходу.

**Ісламскі фундаменталізм.** У другой палове XX ст., асабліва ў апошняе дзесяцігоддзе, у мусульманскім свеце ўзмацніўся ўплыў ісламу на ўсе сферы жыццядзейнасці чалавека — эканоміку, палітыку, культуру, духоўнае жыццё. Адной з прычын гэтага з'яўляецца спецыфіка дадзенай рэлігійнай сістэмы: іслам — не толькі рэлігія, але і лад жыцця.

Пад ісламскімі лозунгамі актывізаваўся нацыянальна-вызваленчы рух, узніклі ісламскія палітычныя таварыствы і партыі, міжнародныя арганізацыі. Такая актывізацыя ісламу атрымала назву *«ісламскае адраджэнне»*. У 1970-я гг., асабліва пасля «ісламскай» рэвалюцыі ў Іране, шырока заявіў пра сябе ў мусульманскім свеце рух, вядомы як **ісламскі фундаменталізм.** Яго галоўная мэта — вяртанне да фундаменту, г. зн. да «чыстага» першапачатковага ісламу, стварэнне грамадства і дзяржавы на аснове і прынцыпах Карана і законаў шарыяту.

Фундаменталізм — з'ява не новая. Пачынаючы з VIII ст. у мусульманскім свеце рэгулярна рабіліся спробы вярнуцца да першапачатковага ісламу. У XX ст. фундаменталізм стаў рэакцыяй мусульманскага свету на каланіяльную палітыку заходніх дзяржаў, на занадта хуткую і гвалтоўную ломку традыцыйных каштоўнасцей усходняга грамадства. Сацыяльную базу руху склалі сотні тысяч людзей, якія аднолькава расчараваліся як у палітыцы бязбожнай заходняй цывілізацыі, так і ў палітыцы ўласнай правячай эліты. У пошуках сацыяльнай справядлівасці яны звярнуліся да ісламскай сістэмы каштоўнасцей. Рух ахапіў практычна ўсе ісламскія краіны. У мусульманскім свеце ўзніклі і дзейнічаюць сотні няўрадавых рэлігійна-палітычных арганізацый, якія называюць *ісламісцкімі.* Буйнейшая з іх — *арганізацыя «Браты-мусульмане»* ўзнікла ў 1928 г. у Егіпце. Некаторыя ісламісцкія арганізацыі прытрымліваюцца тактыкі гвалтоўных дзеянняў. Тэорыя і практыка ісламскага фундаменталізму выклікаюць трывогу і заклапочанасць у многіх краінах мусульманскага свету і за яго межамі.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Нацыянальна-вызваленчыя рэвалюцыі ў арабскім рэгіёне.** Арабскія народы, якія пражываюць у Паўднёва-Заходняй Азіі (Блізкі Усход) і Паўночнай Афрыцы, з'яўляюцца прамымі нашчадкамі культуры Арабскага халіфата. З XVI ст. яны ўваходзілі ў склад Асманскай Імперыі, затым трапілі ў каланіяльную залежнасць ад еўрапейскіх дзяржаў. У міжваенны перыяд намінальнай незалежнасці дабіліся Егіпет і Ірак.

Новы ўздым нацыянальна-вызваленчай барацьбы пачаўся пасля Другой сусветнай вайны. Былі ліквідаваны падмандатныя рэжымы ў Ліване, Сірыі, Палесціне, Іарданіі.

*1950 — 1960-я гг.* азнаменаваліся ўзброенай барацьбой егіпецкага народа супраць англійскіх акупантаў і перамогай антыімперыялістычнай антыманархічнай рэвалюцыі ў Егіпце (1952). У 1954 г. у Алжыры выбухнула васьмігадовая антыкаланіяльная рэвалюцыйная вайна супраць Францыі. Дамагліся незалежнасці Лівія (1951), Марока, Туніс, Судан (1956). У выніку намаганняў арміі і народа быў знішчаны манархічны рэжым і абвешчана рэспубліка ў Іраку (1958), што нанесла моцны ўдар па пазіцыях Захаду на Блізкім Усходзе.

*1961 — 1969-я гг.* характарызаваліся палявеннем многіх арабскіх рэжымаў і працягам працэсу дэкаланізацыі. У 1961 г. прэзідэнт Егіпта Г. А. Насер пачаў «некапіталістычныя» рэформы. У ходзе вызваленчай вайны дамагліся незалежнасці алжырцы (1962). Адбылася антыманархічная рэвалюцыя ў Емене (1962). У лютым 1963 г. Партыя арабскага сацыялістычнага адраджэння, ці Баас, прыйшла да ўлады ў Іраку. У 1969 г. быў звергнуты каралеўскі рэжым у Лівіі.

**Арабская Рэспубліка Егіпет** уяўляе асаблівы варыянт мадэрнізацыі. Егіпет прайшоў шлях ад антыманархічнай рэвалюцыі і сацыялістычнай арыентацыі да ўмацавання і развіцця рыначных адносін і саюза з Захадам. Егіпет атрымаў намінальную незалежнасць ад Вялікабрытаніі яшчэ ў 1922 г. Аднак Егіпецкае каралеўства знаходзілася пад ваенным і палітычным кантролем англічан. Новую старонку ў гісторыі гэтай краіны адкрыла звяржэнне манархіі ў 1952 г. арганізацыяй «Свабодныя афіцэры» на чале з **Гамалем Абдэль Насерам.**

У перыяд кіравання прэзідэнта Г. А. Насера краіна дамаглася вялікіх поспехаў у эканоміцы. У *1956 г.* быў нацыяналізаваны Суэцкі канал. У некалькі этапаў праводзілася прагрэсіўная аграрная рэформа, у выніку якой фелахі (сяляне) атрымалі зямлю,



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## Гістарычны партрэт



**Гамаль Абдэль Насер** (1918 — 1970) — дзяржаўны, палітычны і ваенны дзеяч Егіпта. Закончыў ваеннае вучылішча ў Каіры. Заснаваў і ўзначаліў тайную палітычную арганізацыю «Свабодныя афіцэры», якая падрыхтавала і ўзначаліла 23 ліпеня 1952 г. антыімперыялістычную і антыфеадальную рэвалюцыю. У 1954 г. стаў старшынёй Рэвалюцыйнага савета і прэм'ер-міністрам, а ў 1956 г. абраны прэзідэнтам рэспублікі. Пры яго праўленні быў нацыяналізаваны Суэцкі канал, падпісаны шэраг законаў аб поўнай ці частковай нацыяналізацыі больш за 300 прамысловых і камерцыйных прадпрыемстваў, усіх банкаў і страхавых кампаній, што належалі буйной буржуазіі, а таксама аб абмежаванні памешчыцкага землеўладання. Па яго ініцыятыве быў распрацаваны план пабудовы ў Егіпце «арабскага сацыялізму», праведзены дэмакратычныя пераўтварэнні. Быў паслядоўным прыхільнікам умацавання сяброўскіх адносін і пашырэння ўсебаковага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з СССР і іншымі сацыялістычнымі краінамі.

выкупленую дзяржавай у памешчыкаў. Былі пабудаваны Асуанская высотная плаціна, якая дазволіла арашаць велізарныя плошчы ў даліне Ніла, і шэраг буйных прамысловых прадпрыемстваў (Хелуанскі металургічны камбінат, алюмініевы камбінат у Наг-Хамадзі, суднабудаўнічы завод у Александрыі). Да нашага часу гэтыя прадпрыемствы застаюцца асновай сучаснай індустрыі Егіпта. Велізарную ваенную і эканамічную дапамогу Егіпет атрымаў ад Савецкага Саюза. У пачатку 1960-х гг. егіпецкае кіраўніцтва абвясціла курс на пабудову сацыялізму.

Пасля паражэння Егіпта ў вайне 1967 г. з Ізраілем і смерці Г. Насера ў 1970 г. у егіпецкім грамадстве ўзмацніліся праамерыканскія сімпатыі. Прэзідэнт *Анвар Садат* узяў курс на саюз з ЗША і рыначныя рэформы. У 1979 г. ён падпісаў дагавор аб міры з Ізраілем. Гэты крок прывёў да эканамічнага і палітычнага байкоту Егіпта з боку арабскіх дзяржаў. Аднак буйная амерыканская дапамога (да 2 млрд долараў у год) дазволіла краіне павялічыць тэмпы эканамічнага развіцця і вырашаць сацыяльныя праблемы. У кастрычніку 1981 г. А. Садат быў забіты членамі тайнай ісламісцкай арганізацыі.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Новы прэзідэнт Егіпта *Хосні Мубарак* у цэлым прадоўжыў курс свайго папярэдніка. Яму ўдалося аднавіць пазіцыі Егіпта ў рэгіёне і адносіны з арабскімі краінамі. Мубарак прыняў рашучыя меры па ўсталяванню кантролю над ісламскімі фундаменталісцкімі арганізацыямі. У адносінах да ваяўнічых ісламістаў падтрымліваўся жорсткі курс, а ў адносінах да ўмераных фундаменталістаў праводзілася палітыка супрацоўніцтва. Тым не менш галоўнай пагрозай рэжыму Х. Мубарака заставаліся ваяўнічыя ісламісцкія арганізацыі, якія прадаўжалі сваю тэрарыстычную дзейнасць. Сур'ёзнай палітычнай сілай стала арганізацыя «Браты-мусульмане», якая адмовілася ад экстрэмізму і ступіла на шлях «мірнага наступлення» на ўрад.

У сацыяльна-эканамічнай сферы перад краінай стаяла цяжкавырашальная задача. З аднаго боку, неабходна было паскараць эканамічныя рэформы, з другога — падтрымліваць беднату, каб не дапусціць сацыяльнага выбуху. У Егіпце захоўваецца вялікая армія беспрацоўных і паўбеспрацоўных (15 — 25 %). Сітуацыя ўскладняецца прыростам насельніцтва (1 — 1,3 млн чалавек штогод на працягу апошніх чатырох дзесяцігоддзяў). Пагражаючы рост насельніцтва адымае значную частку сродкаў, прызначаных для развіцця. Менавіта ў гэтым адна з прычын абвастрэння сацыяльных праблем у Егіпце. Апынуўшыся не ў стане вырашыць гэтую праблему пад ціскам народных выступленняў канца 2010 — пачатку 2011 г., прэзідэнт Х. Мубарак быў вымушаны пайсці ў адстаўку. На прэзідэнцкіх выбарах у 2012 г. атрымаў перамогу адзіны кандыдат ад ісламісцкай арганізацыі «Браты-мусульмане» *Мухамед Мурсі*.

**Мадэрнізацыя Ірана.** Пасля Другой сусветнай вайны Іран знаходзіўся пад уплывам Вялікабрытаніі і ЗША, якія разглядалі гэтую краіну як зону сваіх геапалітычных інтарэсаў. Тут іх прываблівалі вялікія запасы нафты і магчымасці выгадна ўкладваць капіталы. Празаходняя палітыка Ірана праявілася ва ўступленні яго ў сістэму Багдадскага пакта (1955) і падпісанне ваеннага пагаднення з ЗША (1959).

У сярэдзіне 1950-х гг. у Іране значна вырасла асабістая ўлада шаха *Мухамеда Рэза Пехлеві*. У краіне была забаронена дзейнасць палітычных партый. У пачатку 1960-х гг. пад кіраўніцтвам шаха ў Іране пачаліся рэформы, якія атрымалі назву *«белай рэвалюцыі»* (белы колер — сімвал манархіі). Важнейшай састаўной часткай гэтай «рэвалюцыі» стала аграрная рэформа, якая падрывала



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

пазіцыі памешчыцкага землеўладання і ператварала большасць сялян ва ўласнікаў.

У гады «белай рэвалюцыі» былі праведзены прыватызацыя дзяржаўных прадпрыемстваў і нацыяналізацыя лясоў і пашаў, а таксама водных рэсурсаў. На землі мячэцей уводзіліся падаткі, што пазбаўляла духавенства даходаў. Прадпрымаліся меры па барацьбе з непісьменнасцю, паляпшалася медыцынскае абслугоўванне сельскага насельніцтва. У Іране з'явіліся новыя галіны прамысловасці: машынабудаванне — аўтамабільная, алюмініевая, нафтахімічная. Гарады набывалі больш сучаснае аблічча. У Іран пранікла заходняя культура. Іранскім жанчынам былі прадстаўлены выбарчыя правы. У краіне ўводзілася свецкае судаводства, бясплатная васьмігадовая адукацыя. Важнейшай крыніцай мадэрнізацыі краіны сталі паступленні ад нафты ў дзяржаўную казну.

Аднак рэзкі курс шаха на паскоранае развіццё Ірана па заходняму ўзору быў варожа сустрэты значнай часткай іранскага грамадства. Мусульманскае духавенства бачыла ў «белай рэвалюцыі» адступленне ад ісламу і яго традыцый, пагрозу традыцыйнаму ладу жыцця. Былі незадаволены рэформамі гандлёвапрамысловыя колы, закранутыя шахскай палітыкай індустрыялізацыі. У сувязі з хуткімі тэмпамі індустрыялізацыі рэзка павялічылася армія абяздоленага насельніцтва. За захаванне імамскіх традыцый у краіне выступала і інтэлігенцыя, за якой ішлі студэнты. Стаўка на сілу і зняважлівыя адносіны да духавенства былі сур'ёзнай памылкай шаха, якая прывяла да антыманархічнай рэвалюцыі ў Іране, вядомай таксама як **«ісламская рэвалюцыя»**.


*Аятала Рухала Хамейні.*

У **1978 г.** у Іране пачаўся магутны антышахскі рух, які ўзначаліў духоўны ісламскі лідар *аятала Рухала Хамейні*. У студзені 1979 г. шах Мухамед Рэза Пехлеві вымушаны быў пакінуць Іран. Прыхільнікі Хамейні авалодалі Тэгеранам. У краіне быў праведзены рэферэндум, у выніку якога **1 красавіка 1979 г.** была абвешчана **Ісламская Рэспубліка Іран.** Паводле


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

новай Канстытуцыі, вышэйшая ўлада ў краіне належыць духавенству. Вярхоўным органам гэтай улады стаў *Савет абаронцаў ісламскай рэвалюцыі.* Выканаўчую ўладу ажыццяўляе *прэзідэнт,* заканадаўчую — *меджліс* (парламент). Заходнія краіны цалкам пазбавіліся свайго ўплыву ў краіне. Новае іранскае кіраўніцтва адвергла капіталізм і камунізм. Яно выбрала ўласны ісламскі шлях развіцця. Эканоміку новай рэспублікі склалі дзяржаўны, кааператыўны і прыватны сектары.

**Турцыя.** У адрозненне ад Егіпта ці Ірана **Турэцкая Рэспубліка** прадстаўляла іншы варыянт мадэрнізацыі ў пасляваенны перыяд.

*Першы этап (1945—1960).* Першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ў Турцыі адзначана змякчэннем аўтарытарнасці рэжыму і пашырэннем дэмакратычных асноў улады. Былі прыняты законапраекты аб пераходзе ад аднапартыйнай сістэмы да шматпартыйнай. Найбольш уплывовай з новаўтвораных партый стала буржуазна-памешчыцкая *Дэмакратычная партыя (ДП),* створаная ў 1946 г. У той жа час абазначылася збліжэнне Турцыі з ЗША і іншымі заходнімі краінамі. Турцыя была ўключана ў сферу дзеяння палітыкі «дактрыны Трумэна» і «плана Маршала». Значная доля амерыканскай дапамогі пайшла на ваеннае будаўніцтва. На парламенцкіх выбарах у 1950 г. перамогу атрымала ДП. У перыяд кіравання ДП (1950—1960) унутрыпалітычнае становішча ў краіне абвастрылася. У канцы 1950-х гг. краіну ахапілі хваляванні, урад прыняў шэраг мер па падаўленню апазіцыі. У гэтых умовах у *маі 1960 г.* адбыўся ваенны пераварот. Была адменена Канстытуцыя 1924 г., распушчаны парламент, забаронена дзейнасць палітычных партый.

*Другі этап (1960—1980)* характарызаваўся палітычнай лібералізацыяй. У адпаведнасці з новай Канстытуцыяй (1961) Турцыя вызначалася як «сацыяльна-прававая дзяржава». Важнай асаблівасцю Другой Рэспублікі з'яўляецца зацвярджэнне шматпартыйнай сістэмы. У 1960-я — 1970-я гг. Турцыя ператварылася ў аграрна-індустрыяльную краіну. Аднак у эканоміцы не атрымлівалася забяспечыць устойлівыя тэмпы росту, а ў палітыцы — ліквідаваць вострае саперніцтва паміж прыхільнікамі этатызму і прыхільнікамі лібералізацыі і пашырэння прыватнай ініцыятывы. Складванню крызіснай сітуацыі ў краіне садзейнічала актывізацыя арганізацый левага і правага экстрэмізму.


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Ваеннае кіраўніцтва зноў вырашыла ўзяць ініцыятыву ў свае рукі і ажыццявіла ў *верасні 1980 г.* дзяржаўны пераварот. Урад быў звергнуты, парламент распушчаны, дзейнасць партый і прафсаюзаў прыпынена. Армія заставалася ва ўладзе больш за тры гады.

У *1982 г.* была ўведзена ў дзеянне новая Канстытуцыя Турцыі, ад якой пачала свой адлік Трэцяя Рэспубліка. Фактычна быў абвешчаны курс на «накіроўваемую дэмакратыю». Узмацнілася роля выканаўчай улады, абмяжоўвалася дзейнасць прафсаюзаў і іншых грамадскіх арганізацый. На выбарах 1983 г. перамагла *Партыя Айчыны (ПА)*. Яе кіраўнік *Тургут Азал* стаў прэм'ер-міністрам і «бацькам турэцкіх рэформ». Т. Азал ажыццяўляў палітыку лібералізацыі эканомікі і ўмацавання рыначных адносін за кошт адмовы ад строгага дзяржаўнага рэгулявання і абмежавання росту рэальных даходаў турэцкіх працоўных. Эканоміка адкрылася для замежных тавараў і капіталаў. Прыярытэтным стала развіццё сярэдняга і дробнага бізнесу. Тэмпы эканамічнага росту ў 1980—1990 гг. склалі каля 8 % у год.

У снежні 1995 г. на датэрміновых парламенцкіх выбарах перамогу атрымала *Партыя дабрабыту (ПД)*, якая стаяла на пазіцыях ісламізму. Поспех ісламістаў сведчыў, што значная частка насельніцтва Турцыі, выпрабаваўшы на сябе цяжкасці курсу эканамічнай лібералізацыі, выступіла супраць умацавання сувязі краіны з Захадам. З гэтага часу ў грамадска-палітычным жыцці Турцыі ўзмацняецца ўплыў ісламскіх арганізацый. На парламенцкіх выбарах 2002 і 2007 гг. пераканаўчую перамогу атрымала ўмераная ісламісцкая *Партыя справядлівасці і развіцця (ПСР)*. Прэм'ерам стаў адзін з лідараў ПСР *Рэджэп Тайіп Эрдаган*. І хоць партыю абвінавачваюць у ісламізме, яна арыентуецца на заходнія каштоўнасці, такія як рыначная эканоміка і ўступленне ў Еўрапейскі Саюз. За часы праўлення ПСР Турцыя перажыла перыяд эканамічнага росту і перамагла шматгадовую гіперінфляцыю. На Захадзе многія называюць праўленне ПСР самым паспяховым за апошнія пяцьдзесят гадоў.

**Пытанні і заданні:**

1. Ахарактарызуйце сучасную мусульманскую (ісламскую) цывілізацыю. Выкарыстайце карту. Якую ролю адыгрывае іслам у жыцці веруючых?



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

2. Чаму пасля Другой сусветнай вайны ўзмацніўся ўплыў ісламу ў свеце? Якія ідэі ляжаць у аснове фундаменталісцкіх плыней ісламу?
3. Апішыце працэс дэкаланізацыі краін арабскага рэгіёна пасля Другой сусветнай вайны.
4. Ахарактарызуйце егіпецкі варыянт мадэрнізацыі. Якія этапы ў ім можна выдзеліць? Складзіце гістарычны партрэт Х. Мубарака. Чаму хваляванні, якія адбыліся ў Егіпце ў пачатку 2011 г., прывялі ў рух увесь мусульманскі свет?
5. Якія асаблівасці працэсу мадэрнізацыі ў Іране? Чаму іранскае грамадства не прыняло «белай рэвалюцыі»? Ахарактарызуйце дзяржаўны лад Ісламскай Рэспублікі Іран. Выкарыстайце дакумент.
6. Ахарактарызуйце турэцкі варыянт мадэрнізацыі. Вызначыце супярэчлівасць правядзення мадэрнізацыі ў Турцыі.

**Прапануем абмеркаваць.** Турцыя на працягу доўгага часу робіць спробы ўступіць у Еўрапейскі Саюз. Аднак згодна апошнім апытанням грамадскай думкі, ад 70 да 90 % еўрапейцаў не жадаюць бачыць Турцыю ў еўрапейскай сям'і. Абмяркуйце магчымыя наступствы: а) уваходжанне Турцыі ў ЕС; б) непрыняцце Турцыі ў ЕС.

## Гістарычны дакумент

### З Канстытуцыі Ісламскай Рэспублікі Іран

*1979 г.*

Адметная асаблівасць нашай рэвалюцыі ў параўнанні з іншымі рэвалюцыйнымі рухамі ў Іране за апошняе стагоддзе заключаецца ў яе рэлігійным, ісламскім характары. Прайшоўшы шлях ад антыдэспатычнага руху за канстытуцыйную манархію да руху за нацыяналізацыю нафты, іранскі народ набыў каштоўны вопыт, які сведчыў, што пералічаныя вышэй рухі не мелі поспеху з-за свайго нерэлігійнага характару…

…Ісламская Рэспубліка — гэта сістэма кіравання, заснаваная на веры ў Адзінага Бога, у тое, што Ён устанаўлівае законы шарыяту і што чалавек павінен падпарадкоўвацца Яго волі; боскія адкрыцці і іх асноватворную ролю ў тлумачэнні законаў; страшны суд і яго канструктыўную ролю ў чалавечым удасканаленні на шляху да Бога; боскую справядлівасць у стварэнні і ўсталяванні законаў шарыяту; пераемнасць імамаў (імамат) і іх апеку



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

над грамадствам і асноватворную ролю гэтага прынцыпу ў прадаўжэнні ісламскай рэвалюцыі; высакароднасць і вышэйшую каштоўнасць чалавека і свабоды і яго адказнасці перад Богам, што забяспечвае роўнасць, справядлівасць і палітычную, эканамічную, сацыяльную і культурную незалежнасць, а таксама нацыянальнае адзінства і салідарнасць…

*У чым асаблівасць рэвалюцыйнага руху ў Іране? Як у Канстытуцыі тлумачыцца значэнне паняцця «ісламская рэвалюцыя»?*

## § 26. КРАІНЫ ЛАЦІНСКАЙ АМЕРЫКІ

**Успомніце:** *Якую палітыку ў адносінах да краін Лацінскай Амерыкі праводзілі ЗША ў міжваенны перыяд? Чаму ў палітычным жыцці краін Лацінскай Амерыкі вялікую ролю адыгрываюць ваенныя?*

**Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця.** Лацінская Амерыка з'яўляецца агульнай назвай рэгіёна, які ўключае ў сябе тэрыторыі, размешчаныя ў паўднёвай частцы Паўночнай Амерыкі, Цэнтральнай Амерыкі, Вест-Індыі і Паўднёвай Амерыкі. У другой палове XX ст. у лацінаамерыканскіх дзяржавах захоўвалася традыцыйная арыентацыя эканомікі на экспарт харчавання і сыравіны. Тым не менш сусветныя эканамічныя крызісы вымусілі краіны Лацінскай Амерыкі развіваць імпартазамяшчальную прамысловасць. У выніку эканамічнага пад'ёму 1960-х гг. буйная прамысловасць была створана ў Мексіцы, Бразіліі, Аргенціне і Чылі. Аднак арыентацыя Лацінскай Амерыкі на паўночна-амерыканскі рынак і залежнасць ад капіталу ЗША па-ранейшаму рабілі лацінаамерыканскія краіны ў другой палове XX ст. адчувальнай да ваганняў цэн на нафту і крызісаў сусветнай эканомікі. Паскораныя тэмпы прамысловага развіцця прывялі да рэзкага росту знешняга доўгу краінам Захаду.

У Лацінскай Амерыцы на працягу ўсяго XX ст. быў самы высокі прырост насельніцтва ў свеце. Да 2000 г. яго колькасць павялічылася да 500 млн чалавек. Дэмаграфічная сітуацыя, адсталасць сельскай гаспадаркі і аграрнае перанасяленне выклікалі ўцёкі вясковых жыхароў у гарады, што стала адной з вострых праблем Лацінскай Амерыкі. Нават у багатай землямі Бразіліі больш за тры чвэрці ўсяго насельніцтва жыве ў гарадах. Колькасць


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"




*Лацінская Амерыка ў канцы XX — пачатку XXI ст.*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

мігрантаў значна перавышае колькасць створаных у гарадах працоўных месцаў. Наступствам гэтага працэсу стала разрастанне жабрацкіх антысанітарных трушчоб на ўскраінах гарадоў, рост беспрацоўя, дзіцячай беспрытульнасці і злачыннасці.

Надзвычай вострай праблемай для Лацінскай Амерыкі сталі наркабізнес і дзейнасць наркамафіі. Нелегальная вытворчасць наркотыкаў шырока наладжана ў Калумбіі, Мексіцы, Перу і Балівіі. Сотні тысяч сялян жывуць на даходы ад продажу лістоў кокі, з якіх у тайных лабараторыях робяць наркотык какаін. У Перу — гэта 7 % насельніцтва. Ад вырашэння гэтай праблемы сусветнай супольнасцю залежаць лёсы мільёнаў людзей.

У краінах Лацінскай Амерыкі захоўваецца і такая актуальная праблема, як тэрарызм. Яго распаўсюджванне звязана з наяўнасцю вялікай колькасці беднага насельніцтва. У Лацінскай Амерыцы тэрору надаецца высакароднасць тэрмінам «герылья» («партызанская вайна») і рамантычнай устаноўкай на «народную вайну» супраць «прадажных улад». Напрыклад, вядомая перуанская арганізацыя «Сендэра луміноса» («Светлы шлях») ставіць сваёй мэтай з дапамогай узброенай тэрарыстычнай барацьбы пабудаваць камунізм ва ўсім свеце. Апрача ўльтралевых ствараюцца і ўльтраправыя рухі і арганізацыі.

**Палітычнае жыццё.** У другой палове XX ст. у палітычным жыцці Лацінскай Амерыкі панавалі традыцыйныя партыі буйных землеўласнікаў-кансерватараў і ліберальна настроенай гарадской буржуазіі. Вельмі вялікую ролю адыгрывала асоба лідара (каўдыльё, правадыра), які вядзе за сабой народ. У якасці такога лідара часта выступалі прадстаўнікі ваенных колаў, якія, як правіла, выказвалі інтарэсы буйных зямельных уласнікаў — латыфундыстаў. Роля ваенных захавалася і ў пасляваенны перыяд, але абапіраліся яны ў цэлым ужо на большасць насельніцтва, ды і самі былі часцей за ўсё выхадцамі з сярэдніх слаёў грамадства.

У XX ст. у Лацінскай Амерыцы суіснавалі, змагаліся і змянялі адзін аднаго кансерватыўная, рэфармісцкая і рэвалюцыйная мадэлі развіцця. Нярэдка яны чаргаваліся ў адной і той жа краіне пры самым актыўным удзеле ваенных. *Кансерватыўныя рэжымы* імкнуліся захаваць ва ўладзе традыцыйную буржуазна-памешчыцкую алігархію. Масавыя *рэфармісцкія партыі і рухі* выступалі ў пасляваенны перыяд за сацыяльны і эканамічны прагрэс, за па-



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

будову справядлівага квітнеючага грамадства на аснове класавага супрацоўніцтва і адзінства нацыі.

Найбольш масавым і ўплывовым рэфармісцкім рухам стаў **перанізм** у **Аргенціне** ў другой палове 1940-х гг. Прапанаваная прэзідэнтам *Хуанам Дамінга Перонам* канцэпцыя «хусцісіялізму» (справядлівасці) была своеасаблівым варыянтам «трэцяга шляху» развіцця паміж сацыялізмам і капіталізмам.

Яркім прыкладам *рэвалюцыйнай мадэлі* развіцця і курсу на паскоранае «будаўніцтва камунізму» з'яўляецца Куба. Радыкальна вырашыць наспелыя праблемы ў пасляваенныя дзесяцігоддзі рабіліся ў Гватэмале, Балівіі, Нікарагуа, Сальвадоры. Яны суправаджаліся вострай палітычнай барацьбой і кровапралітнымі грамадзянскімі войнамі. Іншы варыянт рэвалюцыйнага развіцця прадстаўляе «чылійскі эксперымент» 1970 — 1973 гг., здзейснены сацыялістамі, камуністамі, радыкаламі і іх саюзнікамі.

У 1960-я — 1980-я гг. правячыя колы большасці лацінаамерыканскіх краін актыўна ажыццяўлялі палітыку мадэрнізацыі, узяўшы на ўзбраенне канцэпцыю «свабоднай рыначнай эканомікі». Гэта канцэпцыя прадугледжвала вядучую ролю прыватнага прадпрымальніцтва, скарачэнне дзяржаўнага сектара і эканамічных функцый дзяржавы, адмову ад пратэкцыянізму, цеснае супрацоўніцтва з замежным капіталам. У гэтых умовах выразна праявіўся цікавы феномен: ваенна-дыктатарскія рэжымы значна больш паспяхова спраўляліся з задачамі мадэрнізацыі, чым ліберальна-дэмакратычныя ўрады. Поспех забяспечваўся за кошт жорсткай улады і гвалтоўнага падаўлення апазіцыі. У краінах з канстытуцыйна-дэмакратычнымі ўладамі такую палітыку праводзіць было нашмат цяжэй.

Выканаўшы сваю задачу, дыктатарскія рэжымы зышлі з палітычнай арэны. Упершыню ў гісторыі кантынента амаль паўсюдна (за выключэннем Гаіці і Кубы) да пачатку 1990-х гг. зацвердзілася прадстаўнічая дэмакратыя. Многія ўрады ў пошуках выхаду з крызісу звярнуліся да яшчэ больш рашучай «лібералізацыі» эканомікі і знешняга гандлю. Пры гэтым назіралася зніжэнне ўзроўню жыцця значнай часткі насельніцтва. Па ацэнках ААН, за рысай беднасці апынулася амаль палова лацінаамерыканцаў. У канцы 1990-х гг. сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча ў краінах Лацінскай Амерыкі пагоршылася. Спачатку ў


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Мексіцы, затым у Бразіліі пачаўся цяжкі фінансавы крызіс. Масавыя выступленні працоўных і беспарадкі адбыліся ў Аргенціне. У Лацінскай Амерыцы да гэтага часу захоўваецца глыбокая палітычная і сацыяльная палярызацыя.

**Рэформы, ваенныя дыктатуры і рэвалюцыі.** На прыкладзе асобных дзяржаў рэгіёна прасочым рэалізацыю кансерватыўнай, рэфармісцкай і рэвалюцыйнай мадэлей развіцця.

**Мексіка.** У гісторыі Лацінскай Амерыкі XX ст. Мексіка займае асаблівае месца. У пачатку стагоддзя яна перажыла прагрэсіўную буржуазна-дэмакратычную рэвалюцыю. У 1930-я гг. тут была праведзена першая ў Лацінскай Амерыцы глыбокая аграрная рэформа. Пасля Другой сусветнай вайны пачалося стварэнне разгалінавай прамысловай інфраструктуры. Эканамічны ўздым, які Мексіка перажыла ў 1970-я гг. як нафтаздабываючая краіна, падштурхнуў урад да затратных інвестыцый і павелічэння імпарту. Гэта прывяло ў пачатку 1980-х гг. да надзвычай высокай знешняй запазычанасці дзяржавы.

У 1994 г. у Мексіцы пачаўся фінансава-эканамічны крызіс, абясцэнілася нацыянальная валюта. Перашкодай у развіцці Мексікі з'яўляецца арганізаваная злачыннасць, перш за ўсё наркамафія. Для пераадолення крызісу ў Мексіцы сусветнай супольнасцю было выдзелена фінансавай дапамогі на агульную суму 50 млрд долараў ЗША. У цяперашні час эканамічная сітуацыя ў краіне дастаткова стабільная. Ажыццяўляецца экспарт нафты, іншых карысных выкапняў, прадуктаў сельскай гаспадаркі, развіваецца металургічная, хімічная прамысловасць, машынабудаванне.



*Фідэль Кастра з М. С. Хрушчовым падчас візіту кубінскага лідара ў Маскву. 1963 г.*

**Куба.** З 1898 г. Куба практычна з'яўлялася пратэктаратам ЗША, хоць фармальна была незалежнай. ЗША не раз умешваліся ва ўнутраныя справы краіны, амерыканскі капітал кантраляваў кубінскую эканоміку. Яе аснову складала монакультура цукро-



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## Гістарычны партрэт



**Эрнеста «Чэ» Рафаэль Гевара Лінч дэ ла Серна** (1928 — 1967) — лацінаамерыканскі рэвалюцыянер, адзін з кіраўнікоў Кубінскай рэвалюцыі (1959). Па прафесіі ўрач. У 1955 г. у Мексіцы сустрэўся з Ф. Кастра і з гэтага часу звязаў свой лёс з барацьбой кубінскага народа. Пасля перамогі Кубінскай рэвалюцыі актыўна ўдзельнічаў у пабудове сацыялізму на Кубе. Быў начальнікам гарнізона крэпасці Ла-Кабанья (Гавана), дырэктарам Упраўлення прамысловага развіцця краіны, прэзідэнтам Нацыянальнага банка Кубы, міністрам прамысловасці. У 1965 — 1967 гг. удзельнічаў у арганізацыі партызанскага руху ў Конга і Балівіі. У адным з баёў у Балівіі створаны ім партызанскі атрад быў акружаны і разбіты. Гевара быў паранены, захоплены ў палон і забіты.

вага трыснягу, які рабіўся выключна на амерыканскі рынак. Фактычная ўлада ў краіне належала сямейным кланам ці генералам тыпу Батысты (1934 — 1944; 1952 — 1958), якія стаялі на варце амерыканскіх інтарэсаў. Узброеныя выступленні патрыётаў супраць дыктатарскага рэжыму заканчваліся правалам. І толькі паўстанне пад кіраўніцтвам **Фідэля Кастра** звергла рэжым Батысты і адкрыла новую старонку ў гісторыі кубінскага народа.

Кубінская рэвалюцыя змяніла палітычную сітуацыю на кантыненце. Асабліва непрыемным сюрпрызам яна была для ЗША. Куба далучылася да блока сацыялістычных краін і ўзяла курс на пабудову сацыялізму. Фідэль Кастра і яго паплечнік **Эрнеста Чэ Гевара** спрабавалі экспартаваць рэвалюцыю ў іншыя дзяржавы Лацінскай Амерыкі. У некаторых краінах разгарнуўся партызанскі рух, аднак жадаемых вынікаў ён не прынёс. Улады імкнуліся любым спосабам не дапусціць «другой Кубы».

На Кубе ж, наадварот, рэвалюцыйная мадэль дэманстравала прыкметныя поспехі. Аграрная рэформа паклала канец латыфундызму, землі размяркоўваліся сярод беззямельных і малазямельных сялян. Усе ўладанні замежных кампаній былі канфіскаваны. Дзякуючы размеркавальна-ўраўняльнай палітыцы ўрада і эканамічнай дапамозе СССР павысіўся жыццёвы ўзровень большасці кубінцаў. Асабліва ўражваючымі былі дасягненні ў сацыяльнай сферы:



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

ліквідацыя беспрацоўя, усеагульная пісьменнасць, бясплатная ахова здароўя высокага ўзроўню, павелічэнне сярэдняй працягласці жыцця да 75 гадоў. Тым не менш кубінскаму кіраўніцтву так і не ўдалося ліквідаваць залежнасць краіны ад цэн на цукар на сусветным рынку і картачную сістэму на спажывецкія тавары і прадукты харчавання.

Пасля распаду СССР камуністычны рэжым Кубы апынуўся ў вельмі цяжкім становішчы. У сярэдзіне 1990-х гг. у краіне пачалі ажыццяўляцца некаторыя рыначныя рэформы — створаны свабодныя эканамічныя зоны, пастулова развіваецца малы бізнес. Цяпер кіраўніцтва Кубы вядзе краіну па шляху частковай мадэрнізацыі, захоўваючы пры гэтым асноўныя прынцыпы развіцця па сацыялістычным шляху. Куба да гэтага часу мае сур'ёзныя эканамічныя цяжкасці, прадаўжае адстойваць уласны варыянт пачатай мадэрнізацыі і грамадскага прагрэсу.

**Чылі** адносіцца да шэрага адносна развітых краін Лацінскай Амерыкі. Важнейшая традыцыя чылійскай дзяржаўнасці — яе арыентацыя на Канстытуцыю і парламенцкую сістэму. Пасля кровапралітнай грамадзянскай вайны, якая скончылася ў 1891 г., і ажно да 1973 г. (за выключэннем ваеннага праўлення 1927—1931 гг.) у краіне праводзіліся рэгулярныя парламенцкія выбары і забяспечваўся мірны пераход улады ад адной палітычнай кааліцыі да другой. Армія прызнавала сваю падначаленую ролю, затое карысталася высокім сацыяльным статусам.


*Сальвадор Альендэ.*

Аднак палітычна прагрэсіўная сістэма знаходзілася ў супярэчнасці з адсталай эканамічнай і сацыяльнай структурай. У сельскай гаспадарцы ўсё яшчэ дамінавала буйное землеробства з экстэнсіўным спосабам вытворчасці. У той час як на іншым полюсе былі невытворчыя дробныя гаспадаркі, маса сельскагаспадарчых рабочых і высокае беспрацоўе. Эканоміка пасля Першай сусветнай вайны залежала ад здабычы медзі і замежнага капіталу.

У 1970 г. у выніку дэмакратычных выбараў прэзідэнтам краіны стаў лідар блока некалькіх левых партый і арганіза-



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

цый (Народнае адзінства) сацыяліст **Сальвадор Альендэ.** Яго ўрад нацыяналізаваў здабываючую прамысловасць, якая належала замежным кампаніям, і банкаўскую сістэму. Пад кантроль дзяржавы перайшоў знешні гандаль. Паскоранымі тэмпамі была праведзена аграрная рэформа, якая пакончыла з панаваннем латыфундызму. У знешняй палітыцы стала развівацца супрацоўніцтва з сацыялістычнымі краінамі. Рэформы левага ўрада набывалі рэвалюцыйныя рысы. Перамога Народнага адзінства на парламенцкіх выбарах паскорыла выступленне правай апазіцыі, якая ўключала буйную і сярэднюю буржуазію, латыфундыстаў, частку сярэдняга слоя насельніцтва. Правыя схілілі на свой бок армію, і **11 верасня 1973 г.** пры падтрымцы ЗША ўзнялі ўзброены мяцеж. Прэзідэнт С. Альендэ загінуў на сваім пасту са зброяй у руках. Да ўлады прыйшла ваенная хунта на чале з генералам **Аўгуста Піначэтам.**

Ваенная дыктатура змагла палепшыць эканамічнае становішча ў краіне, скараціць беспрацоўе, рэальна павысіць жыццёвы ўзровень насельніцтва. Чылі стала адным з лідараў Лацінскай Амерыкі па тэмпах росту валавага ўнутранага прадукту. Гэтыя станоўчыя вынікі былі дасягнуты пры дапамозе палітыкі «моцнай рукі», абмежавання асноўных дэмакратычных прынцыпаў і свабод. У 1981 г. Піначэт без выбараў быў абвешчаны «канстытуцыйным прэзідэнтам» на 8 гадоў з правам перавыбрання. Аднак на прэзідэнцкіх выбарах 1989 г. перамогу атрымала Хрысціянска-дэмакратычная партыя. Прэзідэнцкія выбары 2000 г. прынеслі перамогу левацэнтрысцкай кааліцыі «Згода», якая паклала ў аснову свайго палітычнага курсу правядзенне сацыяльна-арыентаваных рэформ і ўмацаванне дэмакратычных інстытутаў.

**Бразілія.** У 1985 г. у Бразіліі скончыўся перыяд ваеннай дыктатуры, які доўжыўся 20 гадоў. Асабліва шмат для ліквідацыі наступстваў дыктатарскіх рэжымаў зрабіў прэзідэнт *Фернанду Энрыке Кардозу.* У гады яго кіравання (1994 — 2002) была стабілізавана эканоміка і прыпынена інфляцыя. Маштабныя сацыяльныя рэформы былі праведзены прэзідэнтам краіны Луісам да Сілва ў 2003 — 2011 гг. Дзякуючы сацыяльным праграмам узровень беднасці знізіўся на 50 %, а ВУП на душу насельніцтва дасягнуў 11,5 тыс. долараў ЗША. Штогадовае перавышэнне экспарту над імпартам складае больш за 10 млрд долараў. У свеце загаварылі пра «бразільскі эканамічны цуд».


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Бразілія актывізавала свае намаганні па асваенню космасу, актыўна вядзе работу па асваенню ядзернага патэнцыялу. Яна адыгрывае вядучую ролю ў інтэграцыйных працэсах у Лацінскай Амерыцы, не без падстаў імкнецца стаць пастаянным прадстаўніком у Савеце Бяспекі ў ААН.

У 1980-я гг. акрамя Чылі і Бразіліі ваенныя дыктатуры спынілі сваё існаванне ў Аргенціне, Перу, Балівіі, Уругваі, Гватэмале, Сурынаме, Парагваі і шэрагу іншых лацінаамерыканскіх краін. Пераход да грамадзянскага кіравання ў большасці выпадкаў адбываўся мірным шляхам.

**Венесуэла.** Асаблівае месца ў сучаснай гісторыі Лацінскай Амерыкі займае Венесуэла. У 1998 г. на прэзідэнцкіх выбарах з вялікай перавагай перамогу атрымаў падпалкоўнік **Уга Рафаэль Чавес Фрыас.** 7 кастрычніка 2012 г. ён у чацвёрты раз быў абраны на пасаду прэзідэнта Венесуэлы. Унутраная і знешняя палітыка Уга Чавеса заключаецца ў барацьбе супраць глабальнага панавання ЗША і амерыканскіх карпарацый у Лацінскай Амерыцы, за ўсталяванне эканамічнага суверэнітэту і прамой дэмакратыі (усе рашэнні ў краіне павінны прымацца пры ўдзеле народа). Эканоміка Венесуэлы заснавана на здабычы нафты, якая дае 80 % экспартных даходаў і каля 30 % ВУП. У рамках плана «сацыялізм XXI стагоддзя» прэзідэнт У. Чавес узмацняе дзяржаўны кантроль над эканомікай. У гэтай краіне праведзены маштабныя сацыяльныя рэформы. З дапамогай спецыялістаў з Кітая, Беларусі, Расіі рэалізуюцца праграмы жыллёвага будаўніцтва, ствараюцца новыя прадпрыемствы.

Да пачатку XXI ст. шэраг лацінаамерыканскіх дзяржаў дасягнуў прыкметных поспехаў у сваім эканамічным развіцці. Аргенціна, Бразілія, Мексіка, Чылі сталі індустрыяльнымі краінамі, іншыя, як напрыклад, Венесуэла — аграрна-індустрыяльнымі.

### Пытанні і заданні:

1. Вызначыце асноўныя праблемы развіцця краін Лацінскай Амерыкі ў пасляваенны час.
2. Назавіце асноўныя шляхі мадэрнізацыі ў краінах Лацінскай Амерыкі. Прывядзіце прыклады. На прыкладзе палітыкі «перанізму» растлумачце, што значыць «трэці шлях» развіцця.


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

3. Якую ролю ў гісторыі краін Лацінскай Амерыкі адыгрываюць ЗША? Як змяняліся адносіны ЗША да дзяржаў Лацінскай Амерыкі?
4. Што характарызуе сучаснае жыццё краін Лацінскай Амерыкі? Для адказу выкарыстайце інфармацыю са сродкаў масавай інфармацыі і Інтэрнэту.
5. Падрыхтуйце паведамленне: «Кубінская рэвалюцыя: учора і сёння», «Чылійскі эксперымент: «страчанае дзесяцігоддзе» ці «эканамічны цуд», «Інтэграцыя краін Лацінскай Амерыкі».
6. Назавіце імёны палітычных дзеячаў краін Лацінскай Амерыкі, якія адыгралі вызначальную ролю ў яе гісторыі пасляваеннага перыяду.

**Прапануем абмеркаваць.** Чаму ў краінах Лацінскай Амерыкі слаба выкарыстоўваецца вопыт мадэрнізацыі грамадства, які ёсць у ЗША і заходнееўрапейскіх краінах?

## Гістарычная даведка

**Кубінская рэвалюцыя.** У выніку дзяржаўнага перавароту ў сакавіку 1952 г. да ўлады на Кубе прыйшоў Фульхенсіа Батыста, які ўсталяваў у краіне ваенна-паліцэйскую дыктатуру. Пераварот выклікаў незадавальненне ў асяроддзі прагрэсіўна настроенай моладзі, найбольш радыкальную групу якой узначаліў малады адвакат і пачынаючы палітычны дзеяч Фідэль Кастра.

26 ліпеня 1953 г. група паўстанцаў на чале з Ф. Кастра выступіла на штурм умацаванай казармы Монкада ў Сант'яга-дэ-Куба, але пацярпела паражэнне. Кастра быў прыгавораны да 15 гадоў пазбаўлення свабоды, хутка амнісціраваны і эмігрыраваў у Мексіку. 2 снежня 1956 г. з яхты «Гранма» высадзіўся атрад паўстанцаў з 82 чалавек. Некаторы час становішча рэвалюцыянераў заставалася крытычным, аднак з лета 1958 г. стратэгічная ініцыятыва перайшла на іх бок. 1 студзеня 1959 г. паўстанцкія войскі ўвайшлі ў Сант'яга. Дыктатура Батысты пала. З 1959 па 2008 г. Ф. Кастра ўзначальваў урад Кубы.

Адукацыя і выхаванне



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

# УРОК АБАГУЛЬНЕННЯ

**1.** Якія фактары садзейнічалі актывізацыі нацыянальна-вызваленчага руху ў краінах Азіі і Афрыкі ў другой палове XX ст.? Ахарактарызуйце працэс дэкаланізацыі, выдзеліўшы ў ім асноўныя працэсы. Вызначыце значэнне працэсу дэкаланізацыі.

**2.** Растлумачце значэнне паняцця «неакаланіялізм». У якіх формах ён праяўляецца? Чаму стаў магчымым?

**3.** Растлумачце, чаму ў некаторых краінах, якія вызваліліся ад каланіяльнай залежнасці, узніклі канфлікты як унутраныя, так і міжнародныя. Прывядзіце прыклады.

**4.** З якімі праблемамі мадэрнізацыі сутыкнуліся краіны «трэцяга свету»? Якія асаблівасці мадэрнізацыі ў ісламскіх краінах Блізкага Усходу, Паўночнай Афрыкі? Чым тлумачыцца ўздым ісламскага фундаменталізму ў гэтых краінах?

**5.** Прааналізуйце наступныя даныя і зрабіце вывады: у Бразіліі з 1960 па 1990 г. удзельная вага рабочай сілы, занятай у сельскай гаспадарцы, скарацілася з 52 да 23 %, у прамысловасці вырасла з 18 да 23 %, у сферы паслуг — з 30 да 54 %. У 1980-я гг. сярэднегадавыя тэмпы прыросту ВНП у Лацінскай Амерыцы складалі 1,7 %, у 1990-х гг. яны выраслі да 3,2 %. З 1980 па 1995 гг. аб'ём знешняй запазычанасці ў Бразіліі скараціўся з 31,2 % ад кошту ВНП да 24 %. Рэзкі рост даўгоў назіраўся толькі ў Мексіцы (з 30,5 да 69,9 % ВНП).

**6.** Якія прычыны асаблівай палітычнай нестабільнасці ў краінах Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі? Чым растлумачыць слабасць дэмакратычных рэжымаў у гэтых дзяржавах? Ці можна лічыць, што перыяд ваенных дыктатур для іх пройдзены?

**7.** У 2010—2011 гг. у Егіпце, Лівіі, Емене адбыліся выступленні народных мас супраць правячых рэжымаў. Высвятліце прычыны гэтых выступленняў. Які іх вынік? Якая рэакцыя сусветнай супольнасці на гэтыя падзеі?

**8.** Групу краін «трэцяга свету» Паўднёва-Усходняй Азіі і Лацінскай Амерыкі, у якіх у канцы XX ст. адбыўся якасны скачок сацыяльна-эканамічных паказчыкаў, сталі называць новымі індустрыяльнымі краінамі. Якія краіны да іх адносяцца? Якія ўрокі можна атрымаць з вопыту іх мадэрнізацыі?



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

# Раздзел IV

# МІЖНАРОДНЫЯ АДНОСІНЫ І ГЛАБАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ СВЕТУ

## § 27. ФАРМІРАВАННЕ БІПАЛЯРНАГА СВЕТУ (1945 — 1950-я гг.)

**Успомніце:** *Як складваліся адносіны паміж СССР, ЗША, Вялікабрытаніяй і Францыяй у гады Другой сусветнай вайны? Якую ролю ў аднаўленні краін Заходняй Еўропы адыгралі ЗША?*

**Ваенна-палітычныя вынікі Другой сусветнай вайны. Парыжская мірная канферэнцыя.** Перамога над германскім нацызмам і японскім мілітарызмам стварыла спрыяльныя ўмовы для развіцця дэмакратычнага і рэвалюцыйнага ўздыму ў краінах Еўропы, Азіі і Афрыкі. Значна вырасла роля камуністычных і сацыял-дэмакратычных партый, якія ўвайшлі ў склад урадаў шэрага еўрапейскіх дзяржаў. Важным вынікам вайны стаў пачатак распаду каланіяльнай сістэмы і магутны ўздым нацыянальна-вызваленчага руху. Вядучыя пазіцыі ў свеце занялі СССР і ЗША, вакол якіх фарміраваліся саюзныя блокі палітычных сіл. У свеце стала складвацца *двухполюсная (біпалярная)* сістэма міжнародных адносін.

Ваенна-палітычныя вынікі вайны праявіліся і ў заключэнні мірных дагавораў дзяржаў-членаў антыгітлераўскай кааліцыі з дзяржавамі-саюзніцамі нацысцкай Германіі — Італіяй, Фінляндыяй, Балгарыяй, Венгрыяй і Румыніяй. Распрацоўка гэтых дагавораў адбылася на *Парыжскай мірнай канферэнцыі* **29 ліпеня — 15 кастрычніка 1946 г.**, у якой удзельнічала 21 дзяржава. Падпісанне мірных дагавораў адбылося **10 лютага 1947 г.** У іх канстатавалася, што з краінамі, якія падпісалі мір, спыняецца стан вайны. Гэтыя дзяржавы былі абавязаны забяспечыць дэмакратычныя правы і свабоды грамадзян і выдаць ваенных злачынцаў. Мірныя дагаворы зафіксавалі і некаторыя тэрытарыяльныя змены.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"
АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

**Перадумовы і пачатак «халоднай вайны».** У гады Другой сусветнай вайны ў працэсе фарміравання антыгітлераўскай кааліцыі не раз узнікалі вострыя супярэчнасці паміж СССР, з аднаго боку, і ЗША з Вялікабрытаніяй — з другога. Гэта тычылася перш за ўсё праблемы адкрыцця другога фронту і шляхоў вырашэння германскага пытання. У 1945 г. абазначылася сутыкненне геапалітычных інтарэсаў ЗША і СССР у Еўропе, Турцыі, Іране і на Далёкім Усходзе. Пасля смерці ў красавіку 1945 г. прэзідэнта ЗША Ф. Рузвельта, які выступаў за супрацоўніцтва з СССР, ЗША па сутнасці пайшлі на абвастрэнне савецка-амерыканскіх адносін. Адміністрацыя новага прэзідэнта Г. Трумэна ў маі 1945 г. спыніла дапамогу СССР па ленд-лізу. Месца падпісання акта аб безагаворачнай капітуляцыі Германіі таксама стала прадметам спрэчак паміж саюзнікамі. 7 мая 1945 г. у Рэймсе ў штаб-кватэры галоўнакамандуючага саюзных войскаў Д. Эйзенхаўэра была падпісана першая безагаворачная капітуляцыя Германіі. Па патрабаванню савецкага кіраўніцтва позна вечарам **8 мая** (па маскоўскім часе — **9 мая**) у Берліне прайшла цырымонія падпісання *Акта аб безагаворачнай капітуляцыі Германіі* на больш высокім узроўні. На Патсдамскай канферэнцыі ў **ліпені — жніўні 1945 г.** ЗША выступілі супраць СССР па шэрагу пытанняў пасляваеннага ўрэгулявання ў Германіі і Усходняй Еўропе. Г. Трумэн і У. Чэрчыль дабіваліся рэвізіі рашэнняў Ялцінскай (Крымскай) канферэнцыі, імкнучыся заняць пануючае становішча ў Германіі і Усходняй Еўропе. ЗША звярнуліся ў



*Падпісанне Акта аб безагаворачнай капітуляцыі Германіі. 9 мая 1945 г.*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

адносінах СССР да шантажу ядзернай зброяй ужо ў Патсдаме. Пагаршэнню адносін паміж Усходам і Захадам садзейнічала асабістая непрыязнасць паміж І. В. Сталіным і Г. Трумэнам. Як стала вядома гісторыкам адносна нядаўна, Вялікабрытанія нават рыхтавала ў маі 1945 г. план ваенных дзеянняў супраць савецкіх войск у Еўропе.

Умоўна пачаткам «халоднай вайны» лічыцца выступленне У. Чэрчыля ў прысутнасці Г. Трумэна ў амерыканскім горадзе Фултан у **сакавіку 1946 г.** У сваёй прамове У. Чэрчыль назваў СССР галоўнай пагрозай заходняй цывілізацыі і прапанаваў краінам Захаду, асабліва ЗША і Вялікабрытаніі, аб’яднацца ў барацьбе з распаўсюджваннем камунізму. Ён абвінаваціў СССР у стварэнні «жалезнай заслоны» ва Усходняй Еўропе паміж Захадам і Усходам і падаўленні дэмакратычных сіл у занятых Чырвонай Арміяй краінах Еўропы. У пачатку 1947 г. кіраўніцтва ЗША прыняло рашэнне пайсці на канфрантацыю з СССР, у сакавіку 1947 г. прэзідэнт ЗША Г. Трумэн выклаў дактрыну аказання ваеннай дапамогі Грэцыі і Турцыі. Мэтай яго дактрыны было недапушчэнне ўключэння гэтых краін у сферу ўплыву СССР. На тэрыторыі Турцыі былі размешчаны амерыканскія ракетныя ўстаноўкі.

**Раскол Германіі. Фарміраванне біпалярнага свету.** Германскае пытанне з’яўлялася цэнтральнай праблемай пасляваеннага ўрэгулявання ў Еўропе. Яго вырашэнне прадугледжвала стварэнне адзінай Германіі і вызначэнне яе статусу на міжнароднай арэне. Германскае пытанне стала каталізатарам «халоднай вайны» і прывяло да ўзнікнення на нямецкай зямлі дзвюх дзяржаў. З-за ідэалагічных і палітычных супярэчнасцей СССР не змог дамагчыся адзінай пазіцыі з ЗША і Вялікабрытаніяй па гэтаму пытанню. Вялікабрытанія і ЗША пайшлі на аб’яднанне сваіх зон акупацыі ў Германіі ў снежні 1946 г. у выглядзе Бізоніі (у красавіку 1949 г. у выніку далучэння французскай зоны ўзнікла Трызонія). У ёй праводзілася сепаратная эканамічная і сацыяльная палітыка, накіраваная супраць СССР. У чэрвені 1947 г. у адпаведнасці з «планам Маршала» кіраўніцтва ЗША абвясціла аб шырокай эканамічнай дапамозе еўрапейскім краінам, у тым ліку і Заходняй Германіі. Дапамога давалася з умовай прытрымлівання прынцыпаў дэмакратыі і фактычнага выдалення камуністаў з урадаў шэрага краін Еўропы. СССР і яго саюзнікі не маглі прыняць «план Маршала» на такіх умовах. У чэрвені 1948 г. заходнія краіны правялі



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

ў сваіх зонах акупацыі грашовую форму, распаўсюдзіўшы яе і на Берлін. У адказ на гэта СССР перакрыў транспартныя шляхі, што звязвалі Заходнюю Германію з Берлінам. Блакада Заходняга Берліна працягвалася 324 дні і ўвайшла ў гісторыю пад назвай **першы Берлінскі крызіс.** Гэты крызіс стаў першай адкрытай канфрантацыяй СССР з былымі саюзнікамі. Ён паскорыў раскол Германіі і ўтварэнне двух ваенна-палітычных блокаў на чале з СССР і ЗША, якія супрацьстаялі адзін аднаму. **4 красавіка 1949 г.** 10 еўрапейскіх дзяржаў, а таксама ЗША і Канада заснавалі **Арганізацыю Паўночнаатлантычнага Дагавора (НАТО).** Фармальна НАТО з'яўлялася абарончым саюзам, аднак пазней не раз праяўляла сваю агрэсіўную сутнасць. У хуткім часе пасля ўтварэння НАТО ў маі 1949 г. была створана ФРГ. Раскол Германіі стаў здзейсненым фактам. У кастрычніку 1954 г. дзевяць заходнееўрапейскіх дзяржаў падпісалі Парыжскія пагадненні, у адпаведнасці з якімі Германія і Італія ўвайшлі ў склад ваенна-палітычнага блока Заходнееўрапейскі саюз (ЗЕС). ФРГ атрымала права на стварэнне сваіх узброеных сіл — бундэсвера, колькасцю 500 тыс. чалавек. У маі 1955 г. ФРГ увайшла ў склад НАТО. У 1957 г. яна стала членам Еўрапейскай эканамічнай супольнасці і адыграла важную ролю ў працэсе заходнееўрапейскай інтэграцыі.

У адказ на такую палітыку Захаду СССР і сацыялістычныя краіны ў **студзені 1949 г.** заснавалі **Савет эканамічнай узаемадапамогі (СЭУ).** У кастрычніку 1949 г. на тэрыторыі Усходняй Германіі ўзнікла ГДР, якая стала саюзніцай СССР. У **маі 1955 г.** сацыялістычныя дзяржавы на чале з Савецкім Саюзам стварылі **Арганізацыю Варшаўскага Дагавора (АВД).** У сярэдзіне 1950-х гг. фарміраванне двухполюснага свету на чале з СССР і ЗША ў асноўным скончылася. Паміж Усходам і Захадам узмацнілася гонка ўзбраенняў і барацьба за сферу ўплыву ў розных рэгіёнах планеты.

Спробы прымірэння паміж Усходам і Захадам у 1955—1959 гг., нягледзячы на дасягнутыя пэўныя станоўчыя вынікі, былі беспаспяховымі. У 1955 г. быў падпісаны Дзяржаўны дагавор паміж краінамі антыгітлераўскай кааліцыі і Аўстрыяй. У адпаведнасці з ім ЗША, СССР, Вялікабрытанія і Францыя гарантавалі нейтралітэт незалежнай і дэмакратычнай Аўстрыі. У ліпені 1955 г. у Жэневе адбылася канферэнцыя кіраўнікоў СССР, ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі. Жэнеўская нарада абазначыла магчымыя шляхі вырашэння германскага пытання і актывізацыі адносін паміж Усходам


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

і Захадам. Лідары СССР былі запрошаны наведаць з афіцыйным візітам Вялікабрытанію вясной 1956 г. Аднак восенню 1956 г. з-за Суэцкага крызісу адносіны паміж СССР, Вялікабрытаніяй і Францыяй рэзка пагоршыліся. У лістападзе 1958 г. адбыўся **другі Берлінскі крызіс,** які пачаўся ў сувязі з прапановай М. С. Хрушчоваператварыць Заходні Берлін у самастойную палітычную адзінку і вывесці адтуль войскі замежных дзяржаў. Новая спроба вырашыць германскае пытанне была зроблена ў маі—жніўні 1959 г. у Жэневе на нарадзе міністраў замежных спраў СССР, ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі, а таксама падчас візіту М. С. Хрушчова ў ЗША. Аднак дасягнуць якіх-небудзь буйных поспехаў у адносінах паміж Усходам і Захадам не ўдалося.

**«Халодная вайна» ў Азіі.** СССР актыўна падтрымліваў нацыянальна-вызваленчы рух у краінах Азіі і Афрыкі, у прыватнасці, у В'етнаме, на Блізкім і Сярэднім Усходзе. *2 верасня 1945 г.* была абвешчана Дэмакратычная Рэспубліка В'етнам (ДРВ). Прэм'ер-міністрам дзяржавы быў абраны Хо Шы Мін. У сакавіку 1946 г. урады ДРВ і Францыі падпісалі канвенцыю, у адпаведнасці з якой Францыя прызнавала ДРВ «свабоднай дзяржавай», што ўваходзіць у склад Французскага Саюза. Французскія войскі па дамоўленасці заставаліся на в'етнамскай тэрыторыі на пяць гадоў. Лёс Паўднёвага В'етнама павінен быў вырашыць рэферэндум. Аднак супярэчнасці паміж ДРВ і Францыяй абвастрыліся. У гэтых умовах у снежні **1946 г.** *Хо Шы Мін* заклікаў да ўсенароднай вайны супраць французскіх каланізатараў, якая скончылася разгромам французскіх войскаў. У ходзе мірных перагавораў у **1954 г.** былі падпісаны *Жэнеўскія пагадненні,* паводле якіх прызнавалася незалежнасць В'етнама. Яго тэрыторыя была часова падзелена па 17-й паралелі. Аднак аб'яднаць поўнач і поўдзень краіны не ўдалося. У Паўднёвым В'етнаме зацвердзіўся праамерыканскі палітычны рэжым.

У 1954 г. Партыя працоўных В'етнама (*ППВ,* былая кампартыя) узяла курс на правядзенне сацыялістычнай рэвалюцыі на поўначы і народна-дэмакратычнай рэвалюцыі на поўдні краіны. У 1959 г. ППВ перайшла да ўзброеных формаў барацьбы ў Паўднёвым В'етнаме. У 1960 г. там быў створаны Нацыянальны фронт вызвалення Паўднёвага В'етнама, які сфарміраваў Народныя ўзброеныя сілы вызвалення. Гэта вымусіла ЗША ў 1961 г. пачаць «асобую вайну» ў Паўднёвым В'етнаме.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"




*Карэйская вайна.*

У 1947 г. абвастрыўся і блізкаўсходні канфлікт, звязаны з праблемай утварэння яўрэйскай дзяржавы ў Палесціне. У 1947 г. палесцінскую праблему разгледзела Арганізацыя Аб'яднаных Нацый (ААН). СССР падтрымаў план стварэння двух самастойных дзяржаў — арабскай і яўрэйскай. 29 лістапада 1947 г. на Генеральнай Асамблеі ААН было прынята рашэнне аб утварэнні на тэрыторыі Палесціны дзвюх дзяржаў. Аднак арабскія краіны не адобрылі гэты план. **14 мая 1948 г.** у Тэль-Авіве была абвешчана *Дзяржава Ізраіль,* якую прызналі ЗША і СССР.

15 мая 1948 г. Егіпет, Ірак, Сірыя, Ліван і Трансіарданія, якія не прызналі за Ізраілем права на існаванне, пачалі вайну з ім. У выніку блізкаўсходняя праблема ператварылася ў востры міжнародны канфлікт, які не вырашаны да гэтага часу. У першай араба-ізраільскай вайне **1948 — 1949 гг.** Англія падтрымала арабскія краіны, а СССР і ЗША — Ізраіль. Слабыя арміі арабскіх дзяржаў былі разбіты. Вайна скончылася перамір'ем. У ходзе вайны Ізраіль захапіў большую частку тэрыторыі Палесціны, адведзенай ААН для Палесцінскай арабскай дзяржавы, і заходнюю частку Іерусаліма.

Пасля нацыяналізацыі Егіптам Суэцкага канала ў 1956 г. пачалася другая араба-ізраільская вайна, у ходзе якой супраць Егіпта вялі баявыя дзеянні Вялікабрытанія і Фран-

Адукацыя і выхаванне



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

цыя. Рашучая пазіцыя Савецкага Саюза падчас гэтай вайны дапамагла Егіпту адстаяць сваю незалежнасць.

Буйны ўзброены канфлікт у рэчышчы «халоднай вайны» адбыўся і ў Карэі. Стварэнне *9 верасня 1948 г.* на поўначы Карэі *Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі (КНДР)* замацавала факт расколу Карэі па 38-й паралелі. Паўночная Карэя атрымала ўсебаковую дапамогу ад СССР. Вясной 1950 г. І. В. Сталін згадзіўся з планам кіраўніка КНДР *Кім Ір Сена* — ваенным шляхам аб'яднаць Карэю. Паўднёвая Карэя, якую падтрымлівалі ЗША, не паспела падрыхтавацца да вайны. **25 чэрвеня 1950 г.** войскі КНДР пачалі наступленне ў глыб Паўднёвай Карэі і ў хуткім часе захапілі амаль усю яе тэрыторыю. ААН асудзіла агрэсію КНДР і накіравала на поўдзень Карэі войскі 16 дзяржаў-членаў ААН. Іх асноўную частку складала армія ЗША. У канцы 1950 г. амерыканцы занялі сталіцу КНДР г. Пхеньян і выйшлі да мяжы з Кітаем. Савецкія ваенныя спецыялісты, у прыватнасці лётчыкі, аказалі КНДР дапамогу ў вядзенні паветранай вайны супраць сіл ААН. На дапамогу КНДР рушылі і «кітайскія добраахвотнікі» — больш за 4 млн чалавек. У ходзе бязлітасных баёў фронт стабілізаваўся прыкладна па 38-й паралелі. У 1951 г. паміж варагуючымі бакамі пачаліся перагаворы аб перамір'і. Але ваенныя дзеянні спыніліся толькі ў **1953 г.**

### Пытанні і заданні:

1. Дзе і калі праходзіла канферэнцыя, якая падвяла вынікі Другой сусветнай вайны? Якія асноўныя рашэнні былі на ёй прыняты?
2. Чым можна растлумачыць раскол свету пасля Другой сусветнай вайны? Чаму міжнародныя адносіны пасляваеннага перыяду называюць «халоднай вайной»?
3. Якія ваенна-палітычныя блокі склаліся ў канцы 1940-х — першай палове 1950-х гг.? Ахарактарызуйце працэс іх стварэння па плану: а) дата стварэння; б) краіны-ўдзельніцы; в) мэты.
4. Назавіце падзеі, якія прывялі да пагаршэння адносін паміж СССР і яго былымі саюзнікамі па антыгітлераўскай кааліцыі. Чаму СССР і іншыя сацыялістычныя краіны не прынялі дапамогі паводле «плана Маршала»?



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

5. Якія найбольш вострыя палітычныя і ваенныя канфлікты адбыліся ў другой палове 1940-х — 1950-я гг.? Пачніце складаць табліцу «Лакальныя войны і канфлікты». Як яны былі вырашаны?

**Прапануем абмеркаваць.** Які фактар з'яўляўся рашаючым ва ўзаемаадносінах паміж СССР і ЗША ў гады «халоднай вайны»?

## Гістарычны дакумент

### З дагавора аб стварэнні НАТО

*Брусель, 4 красавіка 1949 г.*

...**Артыкул 2.** Дагаворныя Бакі будуць садзейнічаць далейшаму развіццю мірных і сяброўскіх міжнародных адносін... Яны будуць імкнуцца ліквідаваць канфлікты і супярэчнасці ў сваёй міжнароднай эканамічнай палітыцы і будуць заахвочваць эканамічнае супрацоўніцтва паміж усімі імі ці любымі з іх.

**Артыкул 3.** Каб больш эфектыўна ажыццявіць мэты сапраўднага дагавора, Дагаворныя Бакі... будуць падтрымліваць і развіваць свой індывідуальны і калектыўны патэнцыял і супраціўляцца ўзброенаму нападзенню.

### З дагавора аб стварэнні АВД

*Варшава, 14 мая 1955 г.*

Дагаворныя бакі, зноў пацвярджаючы сваё імкненне да стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе, заснаванай на ўдзеле ў ёй усіх еўрапейскіх дзяржаў, незалежна ад іх грамадскага і дзяржаўнага ладу... у інтарэсах далейшага ўмацавання і развіцця сяброўства, супрацоўніцтва і ўзаемнай дапамогі ў адпаведнасці з прынцыпамі павагі незалежнасці і суверэнітэту дзяржаў, а таксама неўмяшання ў іх унутраныя справы, вырашылі заключыць сапраўдны Дагавор аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе...

**Артыкул 1.** Дагаворныя бакі абяцаюць у адпаведнасці са Статутам ААН устрымлівацца ў сваіх міжнародных адносінах ад пагрозы сілай ці яе прымянення і вырашаць свае міжнародныя спрэчкі мірнымі сродкамі такім чынам, каб не ставіць пад пагрозу міжнародны мір і бяспеку...

*Параўнайце мэты стварэння НАТО і АВД. У чым былі асноўныя рознагалоссі паміж краінамі, якія ўваходзілі ў гэтыя блокі?*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

# § 28. СУПРАЦЬСТАЯННЕ ПАМІЖ УСХОДАМ І ЗАХАДАМ (1960 — 1970-я гг.)

**Успомніце:** *Якія лакальныя ваенныя канфлікты адбыліся ў другой палове 1940-х — 1950-я гг.? Якую ролю ў іх адыгрывалі ЗША і СССР?*

**Другі Берлінскі крызіс.** Міжнародная сітуацыя вакол Заходняга Берліна працягвала абвастрацца з лістапада 1958 г. Паколькі Жэнеўская нарада міністраў замежных спраў у 1959 г. не вырашыла праблему статуса Берліна, на май 1960 г. было прызначана скліканне канферэнцыі кіраўнікоў ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі і СССР. Аднак, напярэдадні канферэнцыі 1 мая 1960 г. пад Свярдлоўскам быў збіты амерыканскі разведвальны самалёт У-2. Улады ЗША лічылі, што пілот загінуў, і адмаўлялі шпіёнскі характар палёту. Аднак лётчык застаўся жывы і даў паказанні, якія сведчылі аб наўмысным парушэнні ім паветранай прасторы над СССР. На нарадзе, якая адкрылася 16 мая 1960 г. у Парыжы, М. С. Хрушчоў запатрабаваў ад прэзідэнта ЗША Д. Эйзенхаўэра прынесці прабачэнні за гэты інцыдэнт і забараніць далейшыя палёты амерыканскіх самалётаў над савецкай тэрыторыяй, а таксама пакараць вінаватых. Аднак той адмовіўся выканаць гэтыя ўмовы. Савецкая дэлегацыя пакінула Парыж, канферэнцыя была сарвана. СССР адмяніў афіцыйны візіт прэзідэнта ЗША, які быў прызначаны на восень 1960 г.

У чэрвені 1961 г. адбылася сустрэча ў Вене М. С. Хрушчова з новым амерыканскім прэзідэнтам Дж. Кенэдзі. Савецкі кіраўнік патрабаваў падпісаць мірны дагавор з Германіяй, а таксама заявіў, што ўвесь Берлін з'яўляецца тэрыторыяй ГДР, якую павінны пакінуць войскі іншых дзяржаў. Дж. Кенэдзі праявіў цвёрдасць і заявіў, што ЗША будуць ваяваць за Заходні Берлін. У ліпені 1961 г. ЗША ўзмацнілі ваенныя прыгатаванні і дэманстравалі сваю рашучасць абараняць ФРГ і Заходні Берлін. У гэты час у Берліне ўзмацнілася ідэалагічнае і ваенна-палітычнае супрацьстаянне паміж Усходам і Захадам. Многія жыхары ГДР, асабліва Усходняга Берліна, тысячамі з'язджалі ў ФРГ.

У гэтых умовах кіраўніцтва Арганізацыі Варшаўскага Дагавора адобрыла ініцыятыву Масквы і ГДР аб закрыцці свабодна-



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

га доступу з Усходняга Берліна ў Заходні. У глыбокай тайне ноччу 13 жніўня была праведзена аперацыя «Ружа». Армія, паліцыя і рабочыя дружыны ГДР узвялі на мяжы з Заходнім Берлінам драцяныя загароды і на асобных кірунках сцяну з цэглы і бетону. Пазней была ўзведзена **Берлінская сцяна,** якая падзяліла горад на дзве часткі і стала сімвалам канфрантацыі паміж Усходам і Захадам. Асабліва напружаная сітуацыя, якая пагражала пачаткам вайны, склалася ў **кастрычніку 1961 г.** На мяжы паміж Усходнім і Заходнім Берлінам адбылося «танкавае супрацьстаянне» войск СССР і ГДР, з аднаго боку, і заходніх дзяржаў (ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі) — з другога. Толькі ў 1963 г. сітуацыю ў Берліне ўдалося змякчыць. Другі Берлінскі крызіс запаволіў вырашэнне германскага пытання і абвастрыў праблему статуса Заходняга Берліна.

**Карыбскі крызіс.** Пасля прыходу да ўлады на Кубе рэвалюцыянераў на чале з Ф. Кастра паміж СССР і новым кубінскім рэжымам пачалося актыўнае супрацоўніцтва. Кубінскія контррэвалюцыянеры, абапіраючыся на дапамогу ЗША, рабілі спробы звергнуць рэвалюцыйны ўрад Ф. Кастра. У красавіку 1961 г. пры падтрымцы ЗША кубінскія эмігранты высадзіліся на востраве, аднак былі хутка разгромлены. У гэты час савецкае кіраўніцтва абмяркоўвала розныя планы дапамогі рэвалюцыйнай Кубе. Паколькі амерыканскія ракеты, размешчаныя ў Турцыі, маглі паразіць значную частку тэрыторыі СССР, савецкае кіраўніцтва па дамоўленасці з кубінскім прыняло рашэнне накіраваць на Кубу свой воінскі кантынгент і размясціць там ракеты з ядзернымі боегалоўкамі, якія маглі паставіць пад пагрозу ракетнага ўдару шэраг буйных гарадоў ЗША.

У ліпені—верасні 1962 г. у глыбокай тайне кіраўніцтва СССР правяло спецыяльную аперацыю, размясціўшы на Кубе 42 ракеты з ядзернымі боегалоўкамі і 40-тысячны кантынгент савецкіх войскаў. 14 кастрычніка амерыканская разведка выявіла савецкія ракетныя ўстаноўкі на Кубе. ЗША пачалі рашучыя дзеянні супраць Кубы і СССР і запатрабавалі вывесці з вострава савецкія ракеты і войскі. У хуткім часе яны ўстанавілі ў адносінах да Кубы «каранцін», г. зн. фактычна марскую блакаду вострава. Узброеныя сілы ЗША і СССР былі прыведзены ў поўную баявую гатоўнасць. Узнікла рэальная пагроза трэцяй сусветнай вайны. У ходзе абмену


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



*Зачахлёнае ракетнае абсталяванне, якое вывозіцца з Кубы на савецкім сухагрузе. Лістапад 1962 г.*

пасланнямі паміж Дж. Кенэдзі і М. С. Хрушчовым было дасягнута кампрамісгнае пагадненне. Савецкі ўрад абавязваўся вывесці ракеты з Кубы. ЗША далі абавязацельства не ўрывацца на Кубу і праз некалькі месяцаў вывелі свае ракеты з Турцыі.

Карыбскі крызіс паказаў надзвычайную небяспеку савецка-амерыканскага супрацьстаяння для ўсяго свету. Ён садзейнічаў абмежаванню гонкі ў галіне ядзерных узбраенняў. У жніўні *1963 г.* паміж СССР, ЗША і Вялікабрытаніяй быў падпісаны *Дагавор аб забароне выпрабаванняў ядзернай зброі ў атмасферы, касмічнай прасторы і пад вадой*, у *1968 г.* — *Дагавор аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі*. Падпісанне гэтых дагавораў адбылося пад ціскам шырокага народнага руху за мір і раззбраенне.

**Вайна ў В'етнаме.** У жніўні **1964 г.** адбыўся так званы *«танкінскі інцыдэнт»* — сутыкненне двух амерыканскіх эсмінцаў з паўночнав'етнамскімі тарпеднымі кацерамі. Ён стаў падставай для вынясення кангрэсам ЗША рашэння аб пачатку вайны супраць ДРВ. 3 лютага 1965 г. амерыканскія ВПС ажыццяўлялі бамбардзіроўкі в'етнамскай тэрыторыі. ДРВ падтрымлівалі СССР і яго саюзнікі. Савецкія ваенныя спецыялісты аказвалі дапамогу в'етнамскаму народу.

У 1968 г. у Парыжы пачаліся перагаворы паміж ДРВ і ЗША. Летам 1969 г. на востраве Гуам прэзідэнт ЗША Р. Ніксан прапанаваў гуамскую дактрыну — план *«в'етнамізацыі»* вайны. Гэты



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"
АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ




*Вайна ЗША ў Індакітаі.*

план прадугледжваў працяг ваенных дзеянняў сіламі паўднёвав'етнамскага рэжыму пры амерыканскай падтрымцы. ЗША прынялі рашэнне вывесці свае войскі з Паўднёвага В'етнама. У 1969 г. патрыятычныя сілы на поўдні краіны абвясцілі Рэспубліку Паўднёвы В'етнам.

27 студзеня **1973 г.** у Парыжы былі падпісаны пагадненні аб спыненні вайны ў В'етнаме. На працягу 60 дзён амерыканскія войскі пакінулі краіну. У сакавіку 1975 г. войскі камуністаў і сілы, якія іх падтрымлівалі, пачалі наступленне і ў хуткім часе занялі Паўднёвы В'етнам. **2 ліпеня 1976 г.** была абвешчана Сацыялістычная Рэспубліка В'етнам (СРВ).

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Разрадка міжнароднай напружанасці.** У канцы 1960-х — пачатку 1970-х гг. у міжнародных адносінах пачаўся пераход ад канфрантацыі да разрадкі і наладжвання супрацоўніцтва паміж СССР і вядучымі краінамі Захаду. Гэтаму садзейнічала дасягненне Савецкім Саюзам ваеннага парытэту з ЗША. Працэс разрадкі адносін паміж Усходам і Захадам пачаўся з сярэдзіны 1960-х гг. з паглыблення і развіцця савецка-французскага супрацоўніцтва. У 1966 г. Францыя выйшла з ваеннай арганізацыі НАТО, а французскі прэзідэнт Ш. дэ Голь наведаў з афіцыйным візітам Маскву. Было падпісана некалькі пагадненняў па развіццю эканамічных, навукова-тэхнічных, культурных сувязей паміж СССР і Францыяй.

Увод войскаў шэрага краін-удзельніц АВД у Чэхаславакію ў жніўні 1968 г. прывёў да часовага абвастрэння адносін паміж Усходам і Захадам. СССР адстаяў свае геапалітычныя пазіцыі ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе ў рамках дактрыны «сацыялістычнага інтэрнацыяналізму», якую на Захадзе пачалі называць *«дактрынай Брэжнева»*.

У 1969 г. з'явіліся перадумовы для паляпшэння адносін паміж СССР і ФРГ. Новая ўсходняя палітыка ФРГ і асабіста канцлера В. Бранта садзейнічала наладжванню савецка-заходнегерманскага дыялогу. У жніўні 1970 г. паміж СССР і ФРГ быў падпісаны Маскоўскі дагавор. У ім была зафіксавана непарушнасць пасляваенных межаў у Еўропе, у тым ліку і мяжы паміж ФРГ і ГДР. У дагаворы адзначалася, што бакі не будуць прад'яўляць тэрытарыяльных прэтэнзій да іншых дзяржаў. Пасля гэтага былі нармалізаваны адносіны паміж ФРГ і Польшчай, ФРГ і Чэхаславакіяй. Заходняя Германія прызнала несапраўдным Мюнхенскае пагадненне 1938 г. і законнасць мяжы паміж ФРГ і ЧССР. У снежні 1972 г. быў заключаны дагавор аб асновах адносін паміж ФРГ і ГДР. ФРГ прызнавала суверэнітэт ГДР. У наступным годзе абедзве германскія дзяржавы былі прыняты ў ААН.

Поспеху працэсу разрадкі міжнародных адносін ў значнай ступені садзейнічала савецка-амерыканскае збліжэнне. У пачатку 1971 г. прэзідэнт ЗША Р. Ніксан заявіў пра тое, што ні адна з дзвюх звышдзяржаў не мае яўнай перавагі ў ядзернай галіне, і нават пасля нанясення першага ядзернага ўдара другі бок здольны ў адказ нанесці праціўніку «непрымальныя страты». Такім чынам


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

стваралася сітуацыя «ўзаемнага гарантаванага знішчэння» ў выпадку пачатку ядзернай вайны. Савецка-амерыканскаму дыялогу садзейнічала і Праграма міру, прынятая на XXIV з'ездзе КПСС у сакавіку 1971 г. У верасні таго ж года у Вашынгтоне было заключана бестэрміновае савецка-амерыканскае пагадненне аб мерах па змяншэнню небяспекі ўзнікнення ядзернай вайны. У выніку візіта Р. Ніксана ў *1972 г.* у Маскву былі падпісаны *Дагавор аб абмежаванні сістэм супрацьракетнай абароны (ПРА), Пагадненне аб некаторых мерах у галіне абмежавання стратэгічных наступальных узбраенняў (АСУ-1)* і *Асновы ўзаемаадносін паміж СССР і ЗША.* Кіраўніцтва ЗША ўпершыню афіцыйна пагаджалася з савецкай ідэяй мірнага суіснавання. У чэрвені 1973 г. падчас візіту Л. І. Брэжнева ў ЗША былі ўзгоднены далейшыя меры па абмежаванню стратэгічных наступальных узбраенняў і падпісана бестэрміновае пагадненне аб недапушчэнні ядзернай вайны. У чэрвені *1979 г.* у Вене падчас перагавораў паміж Л. І. Брэжневым і Дж. Картэрам быў падпісаны *Дагавор аб абмежаванні стратэгічных узбраенняў (АСУ-2).*

Важным элементам працэсу разрадкі стала работа ў 1973—1975 гг. Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (НБСЕ) у Хельсінкі, у якой прынялі ўдзел 33 еўрапейскія дзяржавы, а таксама ЗША і Канада. **1 жніўня 1975 г.** быў падпісаны *Заключны акт Нарады.* У ім зафіксаваны прынцыпы мірнага суіснавання і супрацоўніцтва паміж краінамі, замацавана непарушнасць пасляваенных межаў у Еўропе, вызначаны напрамкі і меры па ўмацаванню бяспекі і раззбраення. У гэтым дакуменце значная ўвага надаецца праблемам забеспячэння правоў і свабод грамадзян і гуманітарнаму супрацоўніцтву дзяржаў.

Працэс разрадкі ў Еўропе, а таксама паміж СССР і ЗША добра паўплываў на развіццё міжнародных адносін у Азіі і Афрыцы. Пасля спынення вайны ў В'етнаме палепшылася сітуацыя ў Індакітаі і на Далёкім Усходзе. Былі ўрэгуляваны адносіны паміж ЗША і КНР, паміж Японіяй і Кітаем.

На Блізкім Усходзе пасля «шасцідзённай вайны» 1967 г. паміж Ізраілем і арабскімі краінамі стварылася напружаная сітуацыя, звязаная з захопам Ізраілем Сінайскага паўвострава, заходняга берага ракі Іардан, Галанскіх высот (Сірыя) і некаторых іншых арабскіх тэрыторый. У кастрычніку 1973 г. Егіпет зрабіў спробу


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

адваяваць Сінайскі паўвостраў, аднак яна была няўдалай. Новае кіраўніцтва Егіпта на чале з А. Садатам пайшло на прымірэнне з Ізраілем. У 1978 г. адбылося падпісанне пагадненняў у Кэмп-Дэвідзе па ўрэгуляванню блізкаўсходняга канфлікту. У 1979 г. быў заключаны мірны дагавор паміж Егіптам і Ізраілем. Ізраільскія войскі пакінулі Сінайскі паўвостраў.

У 1977 г. Савецкі Саюз размясціў у заходніх раёнах краіны новыя ракеты сярэдняга радыуса дзеяння (СС-20). Гэта стала прычынай для прыняцця ў снежні 1979 г. кіраўніцтвам НАТО «двайнога рашэння» — з 1983 г. пачаць размяшчэнне ў Еўропе амерыканскіх ракет «Першынг-2» і крылатых ракет, а таксама пачаць перагаворы з СССР па праблемах еўрапейскай бяспекі. У хуткім часе адбыўся ўвод савецкіх войск у Афганістан (канец снежня 1979 г.). Гэта падзея паслужыла для Захаду зачэпкай для канчатковага зрыву працэсу разрадкі. Кіраўніцтва ЗША адмовілася ратыфікаваць дагавор па АСУ-2. Вядучыя краіны Захаду заявілі пра байкот Алімпійскіх гульняў 1980 г. у Маскве. Разрадка саступіла месца канфрантацыі паміж Усходам і Захадам.

### Пытанні і заданні:

1. Вызначыце агульныя прычыны лакальных войнаў і канфліктаў, якія адбыліся ў 1960 — 1970-я гг. Прадоўжыце складанне табліцы «Лакальныя войны і канфлікты».
2. Які з канфліктаў, на вашу думку, быў найбольш небяспечным для чалавецтва? Як ён быў вырашаны? Што садзейнічала яго вырашэнню?
3. Растлумачце, у чым сутнасць берлінскага пытання. Як яно вырашалася ў 1960 — 1970-я гг.?
4. Чаму ў гады «халоднай вайны» разгарнулася гонка ўзбраенняў? Якую небяспеку яна несла?
5. Растлумачце значэнне паняцця «разрадка міжнароднай напружанасці». Якія падзеі садзейнічалі пераходу да палітыкі разрадкі? Якія крокі былі зроблены СССР і ЗША для ўмацавання міжнароднай бяспекі? Чаму ў канцы 1970-х гг. разрадка змянілася канфрантацыяй паміж заходнімі краінамі і СССР?



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Прапануем абмеркаваць.** У 1961 г. быў створаны Рух недалучэння. У 1970-я гг. недалучанымі лічылі сябе ўжо больш за 50 краін. Ці можна ўзнікненне Руху недалучэння разглядаць як адзін з сімптомаў крызісу двухполюснай мадэлі свету?

## Гістарычны дакумент

### З Заключнага акта Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе

*Хельсінкі (Фінляндыя), 1 жніўня 1975 г.*

Дзяржавы — удзельніцы Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе … прынялі наступнае.

Дзяржавы-ўдзельніцы будуць паважаць суверэнную роўнасць і своеасаблівасць адна адной, а таксама ўсе правы, якія мае іх суверэнітэт…

Дзяржавы-ўдзельніцы будуць устрымлівацца… ад прымянення сілы ці пагрозы сілай як супраць тэрытарыяльнай цэласнасці ці палітычнай незалежнасці любой дзяржавы…

Дзяржавы-ўдзельніцы разглядаюць як непарушныя ўсе межы адна адной, як і межы ўсіх дзяржаў у Еўропе…

Дзяржавы-ўдзельніцы будуць вырашаць спрэчкі паміж імі мірнымі сродкамі…

Дзяржавы-ўдзельніцы будуць устрымлівацца ад любога ўмяшання… ва ўнутраныя ці знешнія справы, якія ўваходзяць ва ўнутраную кампетэнцыю іншай дзяржавы-ўдзельніцы…

Дзяржавы-ўдзельніцы будуць паважаць правы чалавека і асноўныя свабоды, уключаючы свабоду думкі, сумлення, рэлігіі і перакананняў, для ўсіх, без адрознення расы, полу, мовы і рэлігіі…

Дзяржавы-ўдзельніцы будуць развіваць сваё супрацоўніцтва адна з адной, як і з усімі дзяржавамі…

*Якія асноўныя прынцыпы ўзаемаадносін дзяржаў-удзельніц нарады зафіксаваны ў Заключным акце? Да дасягнення якіх мэтаў імкнуліся дзяржавы-ўдзельніцы? Якую ролю ў развіцці міжнародных адносін адыграла падпісанне Заключнага акта? Ці захоўваюць актуальнасць гэтыя прынцыпы ў цяперашні час?*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

# § 29. МІЖНАРОДНЫЯ АДНОСІНЫ Ў 1980-я гг. — ПАЧАТКУ XXI ст.

**Успомніце:** *Што такое «разрадка міжнароднай напружанасці»? Якія краіны прынялі ўдзел у Нарадзе па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе? Які перыяд гісторыі СССР называюць «перабудовай»?*

**Абвастрэнне міжнародных адносін у 1980-я гг.** Увод савецкіх войскаў у Афганістан у канцы 1979 г. паглыбіў супярэчнасці паміж звышдзяржавамі і выклікаў крызіс у адносінах паміж Усходам і Захадам. У пачатку 1980 г. амерыканскі прэзідэнт Дж. Картэр абвясціў рэгіён Персідскага заліва зонай жыццёва важных інтарэсаў ЗША. Злучаныя Штаты прысвойвалі сабе права сілай зброі абараняць гэтую зону. Пасля «дактрыны Картэра» кіраўніцтва ЗША прыняло «новую ядзерную стратэгію», якая прадугледжвала магчымасць дасягнення перамогі ў ядзернай вайне з СССР. Дж. Картэр па сутнасці заклікаў еўрапейскія дзяржавы адмовіцца ад палітыкі разрадкі і байкатаваць Алімпійскія гульні 1980 г. у Маскве. Аднак з еўрапейскіх краін гэты заклік выканалі толькі ФРГ і Нарвегія.

Новаму вітку напружанасці садзейнічалі падзеі ў Польшчы ў 1980 — 1981 гг. У 1980 г. там прайшлі масавыя забастоўкі рабочых, у ходзе якіх узнікла незалежнае аб'яднанне прафсаюзаў «Салідарнасць» на чале з кіраўніком гданьскага стачачнага камітэта Л. Валенсай. Польскі касцёл і «Салідарнасць» сталі цэнтрамі апазіцыі правячаму рэжыму. У 1981 г. на чале ўрада Польшчы стаў генерал В. Ярузельскі, які зрабіў спробу наладзіць дыялог з апазіцыяй. Пасля зрыву перагавораў з лідарамі «Салідарнасці» і нарастання палітычнай нестабільнасці ў снежні 1981 г. В. Ярузельскі ўвёў у краіне ваеннае становішча. Улічваючы складаную міжнародную сітуацыю і сілу апазіцыі ў Польшчы, СССР устрымаўся ад прымянення ваеннай сілы для падтрымкі правячага рэжыму.

Новая адміністрацыя ЗША на чале з Р. Рэйганам зрабіла яшчэ больш жорсткай палітыку ў адносінах да СССР, абвясціўшы яго «імперыяй зла». У чэрвені 1982 г. Р. Рэйган у брытанскім парламенце заклікаў Захад да «крыжовага паходу» супраць СССР. У *1983 г.* ЗША, імкнучыся навязаць гонку ўзбраенняў і эканамічна



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

знясіліць СССР, абвясцілі *праграму «стратэгічнай абароннай ініцыятывы» (САІ ).* Яна прадугледжвала размяшчэнне ў космасе спецыяльных платформ з лазернымі ўстаноўкамі, якія маглі знішчаць ракеты праціўніка. У тым жа годзе ЗША размясцілі ракеты сярэдняй далёкасці і крылатыя ракеты ў Вялікабрытаніі, ФРГ і Італіі. Гэта пагоршыла ваенна-палітычнае становішча СССР і яго саюзнікаў у Еўропе. У адказ Савецкі Саюз размясціў у ГДР і Чэхаславакіі новыя ракетныя комплексы і пасунуў свае падводныя лодкі бліжэй да ўзбярэжжа ЗША. У пачатку 1985 г. Р. Рэйган абвясціў «дактрыну неаглабалізму», якая прадугледжвала супрацьстаянне «сусветнаму камунізму» ў любой кропцы планеты. У Еўропе і ў цэлым у свеце абвастрылася барацьба дзвюх звышдзяржаў за свае геапалітычныя інтарэсы.

**Савецка-амерыканскі дыялог у 1985 — 1989 гг. і яго вынікі.** Прыход да ўлады ў СССР М. С. Гарбачова і пачатак перабудовы стварылі перадумовы для аслаблення міжнароднай напружанасці. З лідараў Захаду першай М. С. Гарбачова падтрымала М. Тэтчэр, якая заклікала наладзіць дыялог з СССР. За гэта выступаў і прэзідэнт Францыі Ф. Мітэран. У кастрычніку 1985 г. у Парыжы М. С. Гарбачоў прапанаваў ідэю пабудовы «агульнага еўрапейскага дома» і заявіў аб неабходнасці скарачэння ядзерных і звычайных узбраенняў. У лістападзе 1985 г. у Жэневе адбылася першая сустрэча паміж М. С. Гарбачовым і Р. Рэйганам. У наступным годзе ў Рэйк'явіку яны ўжо абмяркоўвалі праблему абмежавання ракетных патэнцыялаў дзвюх звышдзяржаў. У снежні 1987 г. у Вашынгтоне М. С. Гарбачоў і Р. Рэйган падпісалі дагавор аб ліквідацыі ракет сярэдняй і малой далёкасці.

У 1987 — 1988 гг. кіраўніцтва СССР абгрунтавала неабходнасць *новага палітычнага мыслення* на міжнароднай арэне. У адпаведнасці з новым палітычным мысленнем СССР скараціў свае ўзброеныя сілы і ў **1990 г.** падпісаў *Пагадненне аб скарачэнні звычайных узбраенняў у Еўропе.* У тым жа годзе адбылося падпісанне *Парыжскай хартыі для новай Еўропы,* у якой было заяўлена аб заканчэнні «халоднай вайны» і канфрантацыі паміж Усходам і Захадам. У 1991 г. быў заключаны дагавор паміж СССР і ЗША аб скарачэнні стратэгічных наступальных узбраенняў (СНУ-1). У **1989 г.** СССР вывеў свае войскі з Афганістана і заявіў аб неабходнасці нармалізацыі савецка-кітайскіх адносін. У 1990 г. СССР падтрымаў



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

прымяненне санкцый супраць Ірака, які захапіў Кувейт. Гэта дало магчымасць ЗША і іх саюзнікам правесці ў 1991 г. аперацыю «Бура ў пустыні», якая прывяла да вызвалення Кувейта і паражэння Ірака.

**Геапалітычныя наступствы краху сацыялістычнага лагера і распаду СССР.** Перабудова ў СССР, у ходзе якой кіраўніцтва КПСС аказалася няздольным рэфармаваць эканамічнае і грамадска-палітычнае жыццё краіны, не прывяла да абнаўлення і мадэрнізацыі савецкай мадэлі сацыялізму. Сацыяльна-эканамічны крызіс і палітычная нестабільнасць у СССР у канцы 1980-х гг. аслабілі пазіцыі цэнтральнай улады і прывялі да цэнтрабежных тэндэнцый унутры савецкай дзяржавы. Гэта адбілася і на міжнародным становішчы Савецкага Саюза, які пачаў губляць геапалітычны кантроль над сваімі саюзнікамі. Перабудова ў СССР садзейнічала нарастанню рэвалюцыйнай сітуацыі ў некаторых сацыялістычных дзяржавах. Там прайшлі дэмакратычныя рэвалюцыі, у ходзе якіх рухнулі сацыялістычныя рэжымы і пачалася глыбокая грамадска-палітычная трансфармацыя.

Важнейшым геапалітычным наступствам распаду сацыялістычнай сістэмы ў Еўропе стаў пераход былых сацыялістычных краін у геапалітычную сферу ўплыву заходняй цывілізацыі. «Аксамітныя рэвалюцыі» садзейнічалі аслабленню і краху Савецкага Саюза, аб'яднанню Германіі, дэзінтэграцыі Югаславіі і распаду Чэхаславакіі.

Найбольш важнай геапалітычнай падзеяй 1989 — 1990 гг. у Еўропе стала аб'яднанне Германіі. Аб'яднаная Германія па сваёму эканамічнаму і дэмаграфічнаму патэнцыялу стала дамінуючай дзяржавай у Заходняй і Цэнтральнай Еўропе.

Распад Савецкага Саюза ў снежні 1991 г. прывёў да канчатковага краху біпалярнай геапалітычнай структуры міжнародных адносін, якую называлі *Ялцінска-Патсдамскай сістэмай сусветнага парадку*. Гэта пацягнула за сабой узмацненне працэсу еўрапейскай інтэграцыі і пашырэнне Еўрапейскага Саюза і НАТО на Усход.

**Лакальныя канфлікты і войны. Праблема стварэння новай сістэмы еўрапейскай і сусветнай бяспекі.** Найбольш складаным і супярэчлівым вузлом міжнародных адносін працягваў заставацца блізкаўсходні канфлікт. У другой палове 1980-х гг. адбыліся



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

істотныя зрухі на шляху яго вырашэння. У 1988 г. *Арганізацыя вызвалення Палесціны (АВП)* прызнала існаванне дзяржавы Ізраіль і ўступіла ў перагаворы з яе кіраўніцтвам. У 1993 — 1998 гг. Ізраіль і АВП заключылі пагадненне аб узаемным прызнанні і аб стварэнні часовай Палесцінскай аўтаноміі на заходнім беразе р. Іардан, у сектары Газа і ў зоне г. Іерыхон; былі ўрэгуляваны адносіны паміж Ізраілем і Іарданіяй. Аднак ізраільскія войскі застаюцца на Галанскіх высотах, што перашкаджае заключэнне міру з Сірыяй.

У апошнія гады АВП узмацніла барацьбу за стварэнне палесцінскай дзяржавы. Радыкальныя ісламскія арганізацыі (ХАМАС, «Браты-мусульмане», партыя Алаха, Ісламскі Джыхад і інш.) праводзяць тактыку бесперапыннага тэрору ў Ізраілі. Гэта ўзмацніла ўплыў правых партый у Ізраілі. Лідар блоку Лікуд (блока правых партый), прэм’ер-міністр Ізраіля А. Шарон выступаў за актыўнае супрацьдзеянне АВП і ісламскім тэрарыстам. Хвароба Шарона і перамога ХАМАС на выбарах у Палесцінскай аўтаноміі ў пачатку 2006 г. зноў абвастрылі сітуацыю. Летам 2006 г. Ізраіль пачаў ваенныя дзеянні ў Ліване, спасылаючыся на неабходнасць разгрому сіл тэрарыстаў на поўдні гэтай краіны. Пазней Ізраіль таксама блакіраваў сектар Газа, бамбардзіраваў і абстрэльваў яго. Сучаснае кіраўніцтва Ізраіля праводзіць жорсткі курс у адносінах да Палесцінскай нацыянальнай адміністрацыі, перашкаджаючы стварэнню арабскай палесцінскай дзяржавы.

Пасля перамогі ісламскай рэвалюцыі ў Іране (1979) абвастрыліся адносіны паміж Іракам і Іранам. Паміж гэтымі дзяржавамі пачаліся памежныя сутыкненні. Іракскі ўрад патрабаваў вярнуць занятыя Іранам астравы. У 1980 г. Ірак разарваў дасягнутыя дамоўленасці, яго войскі перайшлі мяжу і прасунуліся ўглыб Ірана. Кіраўнік Ірана аятала Хамейні абвясціў свяшчэнную вайну супраць Ірака. Хамейні хацеў разграміць Ірак і стварыць там ісламскую дзяржаву. Аднак галоўная прычына ірана-іракскай вайны заключалася ў імкненні абедзвюх краін кантраляваць важны нафтаносны і стратэгічны раён у Персідскім заліве. Ваенныя дзеянні праходзілі з пераменным поспехам і адрозніваліся надзвычайнай жорсткасцю. Іран страціў у вайне прыкладна 600 тыс. чалавек, Ірак — больш за 800 тыс. У 1988 г. краіны заключылі перамір’е.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



*Самалёты ЗША, якія атакуюць іракскія пазіцыі падчас аперацыі «Бура ў пустыні». 1991 г.*

У 1990 г. Ірак абвінавацiў Кувейт, на долю якога прыпадае 13 % сусветных запасаў нафты і газа, у тым, што ён прысвойвае іракскую нафту. Пасля зрыву перагавораў з Кувейтам 2 жніўня 1990 г. Ірак акупіраваў гэтую краіну. Кіраўнік Ірака С. Хусейн заявiў аб далучэнні Кувейта да Ірака, а таксама пачаў пагражаць вайной Ізраілю. Савет бяспекі ААН запатрабаваў ад Ірака вывесці войскі з Кувейта. Аднак С. Хусейн не выканаў гэтае патрабаванне. Тады ў студзені 1991 г. была пачата ваенная аперацыя «Бура ў пустыні» супраць Ірака, у якой прымалі ўдзел войскі ЗША, Турцыі, Саудаўскай Аравіі, Вялікабрытаніі, Францыі і іншых краін. СССР падтрымаў дзеянні саюзнікаў у Іраку. 28 лютага 1991 г. Ірак быў вымушаны прызнаць сваё паражэнне і пайсці з Кувейта.

Аднак супрацьстаянне паміж ЗША і Іракам працягвалася. Кіраўніцтва ЗША лічыла, што Ірак скрывае зброю масавага знішчэння і дапамагае міжнародным тэрарыстам. Была пастаўлена задача звергнуць рэжым С. Хусейна. У сакавіку 2003 г. ЗША і іх саюзнікі пачалі вайну супраць Ірака без санкцыі Савета Бяспекі ААН. Амерыканскія войскі занялі Ірак. С. Хусейн быў арыштаваны і пакараны смерцю. У краіне ўсталявана новая палітычная сістэма. Аднак сітуацыя ў Іраку застаецца нестабільнай. Супраць войскаў ЗША і іх саюзнікаў часта праводзяцца тэрарыстычныя акцыі.

У сувязі з перабудовай у СССР змянілася і сітуацыя ў Афганістане. Новае кіраўніцтва дзяржавы на чале з М. Наджыбулой з 1986 г. стала праводзіць курс на нацыянальнае прымірэнне. СССР у 1988 г. падпісаў Жэнеўскія пагадненні па Афганістану, а 15 лютага



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

1989 г. савецкія войскі пакінулі Афганістан. Афганскія маджахеды, базы якіх знаходзіліся ў Пакістане і Іране, прадоўжылі барацьбу супраць афганскага рэжыму. Перайменаванне Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан у Рэспубліку Афганістан (1987 г.), а таксама згода М. Наджыбулы стварыць кааліцыйны ўрад не задаволілі маджахедаў. Пасля шэрага сутыкненняў з урадавымі войскамі яны занялі Кабул — сталіцу Афганістана. 15 красавіка 1992 г. рэжым Наджыбулы рухнуў. Пасля гэтага ў краіне пачалася ўнутраная барацьба за ўладу.

У 1996 — 1997 гг. значную частку Афганістана занялі войскі талібаў — афганскіх ісламістаў, якіх падтрымліваў Пакістан. У 1997 г. талібы абвясцілі Афганістан эміратам — тэакратычнай ісламскай дзяржавай на чале з эмірам М. Амарам. Талібы скрывалі кіраўнікоў ісламскіх тэрарыстаў, у тым ліку лідара міжнароднай арганізацыі ісламскіх тэрарыстаў «Аль Каіда» («Аснова») Усаму бен-Ладэна. У выніку антытэрарыстычнай аперацыі войск заходніх дзяржаў на чале з ЗША (2001 — 2002) рэжым талібаў быў звергнуты. У Афганістане быў сфарміраваны залежны ад Захаду ўрад, які імкнецца стабілізаваць становішча ў краіне. У чэрвені 2011 г. прэзідэнт ЗША Б. Абама заявіў аб пачатку вываду амерыканскіх войскаў з Афганістана.

Міжнародныя канфлікты і лакальныя войны абвастралі адносіны паміж Расіяй і Захадам. Асабліва негатыўную рэакцыю Расіі выклікалі агрэсія ЗША супраць Сербіі ў 1999 г., стварэнне краінамі НАТО мусульманскай дзяржавы ў Косава, падтрымка Захадам Грузіі падчас ваеннага канфлікту з Абхазіяй і Паўднёвай Асеціяй у 2008 г. Расія ўмяшалася ў гэты канфлікт, яе войскі дапамаглі адбіць наступленне грузінскіх войскаў, следам за гэтым Расія прызнала незалежнасць Абхазіі і Паўднёвай Асеціі.

Расійскае кіраўніцтва выказвае таксама непакой па прычыне магчымага размяшчэння элементаў ПРА ЗША на тэрыторыі Польшчы і Чэхіі. Не адобрыла яно і пашырэнне ваенных дзеянняў краін НАТО ў Лівіі вясной — летам 2011 г. Імкнучыся абараніць свае геапалітычныя інтарэсы, Расія стварае сістэму геапалітычнага партнёрства з Кітаем, Індыяй, Іранам, Венесуэлай і іншымі дзяржавамі, каб супрацьстаяць спробам ЗША зацвердзіць сваю гегемонію ў свеце. ЗША і іх саюзнікам удалося дамагчыся змены рэжымаў у Тунісе, Егіпце, Лівіі. У апошні час яны актыўна падтрымліваюць апазіцыю ў Сірыі.


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## Пытанні і заданні:

1. Якія падзеі прывялі да зрыву разрадкі і абвастрэнню супрацьборства паміж СССР і ЗША? Якія наступствы гэта мела?
2. Хто прапанаваў канцэпцыю новага палітычнага мыслення? Якія ідэі ляжалі ў яе аснове? Якую ролю яна адыграла ў змене міжнародных палітычных адносін?
3. З якой мэтай ствараюцца міжнародныя арганізацыі? Што вы ведаеце аб іх дзейнасці? Які іх уплыў на жыццё ў сучасным свеце? Выкарыстайце матэрыялы СМІ, рэсурсы Інтэрнэта.
4. Ахарактарызуйце міжнародную сітуацыю ў канцы XX — пачатку XXI ст. Чаму яе характарызуюць як сітуацыю «новага міжнароднага беспарадку»?
5. Як змяніліся спосабы вырашэння ўнутраных канфліктаў у асобных краінах? Якую небяспеку ўяўляе тэрарызм у сучасным свеце? Як вы лічыце, ці можна вырашыць праблемы тэрарыстычнымі метадамі?
6. Якія метады выбралі ЗША для абароны нацыянальных інтарэсаў і барацьбы з міжнародным тэрарызмам? Выкажыце сваё меркаванне аб дзеяннях ЗША.

**Прапануем абмеркаваць.** Заканчэнне «халоднай вайны» прывяло да разбурэння двухполюснай структуры свету. Многія пры гэтым канстатавалі, што ў свеце захавалася адна звышдзяржава — Злучаныя Штаты Амерыкі. Аднак шэраг тэндэнцый сведчыць аб руху не да аднапалярнага, а да шматпалярнага свету. Як вы лічыце, якая структура свету склалася да цяперашняга часу.

## Гістарычны дакумент

### З Парыжскай хартыі для новай Еўропы

Нарада кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў дзяржаў — удзельніц Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (НБСЕ)

*Парыж, 21 лістапада 1990 г.*

...Наш час — гэта час ажыццяўлення тых надзей і чаканняў, якія жылі ў сэрцах нашых народаў на працягу дзесяцігоддзяў: цвёрдая адданасць дэмакратыі, заснаванай на правах чалавека і асноўных свабодах; росквіт праз эканамічную свабоду і сацыяльную справядлівасць і роўная бяспека для ўсіх нашых краін...



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Мы абяцаем будаваць, кансалідаваць і ўмацоўваць дэмакратыю як адзіную сістэму кіравання ў нашых краінах…

Дэмакратычнае кіраванне засноўваецца на волі народа, якая выказваецца рэгулярна ў ходзе свабодных і справядлівых выбараў. У аснове дэмакратыі знаходзіцца павага да чалавечай асобы і вяршэнства закона…

Мы пацвярджаем, што без якой-небудзь дыскрымінацыі кожны чалавек мае права на:

свабоду думкі, сумлення, рэлігіі і перакананняў, свабоду выказвання сваёй думкі, … свабоду перамяшчэння;

ніхто не будзе:

падвяргацца адвольнаму арышту ці ўтрыманню пад вартай, падвяргацца катаванням або іншым відам жорсткага, бесчалавечнага ці прыніжаючага чалавечую годнасць абыходжання і пакарання;

кожны мае таксама права:

… удзельнічаць у свабодных і справядлівых выбарах, на справядлівае і адкрытае судовае разбіральніцтва ў выпадку прад'яўлення яму абвінавачвання ў здзяйсненні злачынства, валодаць уласнасцю… і займацца індывідуальным прадпрымальніцтвам, карыстацца сваімі эканамічнымі, сацыяльнымі і культурнымі правамі.

Мы пацвярджаем, што этнічная, культурная, моўная і рэлігійная самабытнасць нацыянальных меншасцяў будзе абаронена…

*Якія краіны падпісалі Парыжскую хартыю? Якія асноўныя прынцыпы ўзаемаадносін дзяржаў закладзены ў прынятым дакуменце? Чаму стала магчымым прыняцце гэтага дакумента?*

## § 30. ГЛАБАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ЧАЛАВЕЦТВА

**Успомніце:** *Што такое «гонка ўзбраенняў»? Назавіце найбольш буйныя лакальныя войны і канфлікты, якія адбыліся ў свеце ў другой палове 1940-х гг. — пачатку XXI ст.*

**Ваенная і тэрарыстычная пагрозы.** Да канца XX ст. стала відавочна, што перад чалавецтвам паўсталі праблемы, ад вырашэння якіх залежыць само існаванне зямной цывілізацыі. Таму іх часта называюць **глабальнымі.** Яны цесна ўзаемазвязаны адна з адной. Іх вырашэнне можа быць знойдзена толькі сумеснымі намаганнямі ўсёй сусветнай супольнасці. У пачатку XXI ст. ваенную пагрозу чалавецтву нельга лічыць цалкам знятай. Пасту-



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

пова павялічваецца колькасць краін, якія маюць ядзерную зброю. Афіцыйна прызнанымі ядзернымі дзяржавамі з'яўляюцца ЗША, Расія, Вялікабрытанія, Францыя, Кітай. Большасць дзяржаў свету далучылася да падпісанага ў 1968 г. Дагавора аб нераспаўсюджанні ядзернай зброі. Ён забараняе перадачу ядзерных боепрыпасаў, тэхналогій і сыравіны для іх вытворчасці краінам, якія іх не маюць. Тыя, у сваю чаргу, абавязваюцца ўстрымлівацца ад стварэння ядзернай зброі.

Тым не менш яшчэ ў 1970-я гг. Ізраіль афіцыйна не дэклараваў, але і не адмаўляў факт валодання ядзернай бомбай. У 1980-я гг. ядзерныя выпрабаванні рыхтавалі ПАР і Бразілія, у 1990-я гг. — Лівія. У 1998 г. выпрабаванні ядзернай зброі правялі Індыя і Пакістан. Не выключана, што сакрэтныя ядзерныя распрацоўкі праводзяцца таксама ў Паўночнай Карэі і Іране.

Распаўзанне ядзернай зброі па планеце павышае рызыку яе выкарыстання ў шматлікіх лакальных канфліктах, а таксама таго, што яна трапіць у рукі міжнародных тэрарыстаў. Вялікую небяспеку ўяўляе хімічная і бактэрыялагічная зброя, забароненая сусветнай супольнасцю.

Колькасць *лакальных канфліктаў*, асабліва ўнутрыдзяржаўных, нягледзячы на завяршэнне «халоднай вайны», застаецца значнай. За перыяд 1990—2012 гг. свет перажыў больш за 50 буйных войнаў (буйнымі прынята лічыць тыя войны, дзе колькасць ахвяр за год перавышае 1 тыс. чалавек). З іх толькі тры адбыліся паміж дзяржавамі, астатнія пачыналіся як грамадзянскія. У 15 выпадках ва ўнутраныя канфлікты ўмешваліся замежныя дзяржавы. Большая частка гэтых войнаў прыходзілася на краіны Афрыкі і Азіі. Напружаная сітуацыя ў многіх рэгіёнах свету падштурхоўвае лідараў краін «трэцяга свету» выдаткоўваць усё больш сродкаў на ваенныя мэты.

Сур'ёзнай глабальнай праблемай сучаснасці з'яўляецца *міжнародны тэрарызм*. Да метадаў тэрору адносяцца выкраданні і забойствы палітычных дзеячаў, захоп заложнікаў і прад'яўленне патрабаванняў у абмен на іх вызваленне, спробы запужаць улады і насельніцтва той ці іншай краіны знішчэннем грамадзянскіх і ваенных аб'ектаў. У век інфармацыйных тэхналогій і *зброі масавага знішчэння (ЗМЗ)* тэрарызм стаў яшчэ больш небяспечны. Тэрарыстычныя і крымінальныя групіроўкі набылі магчымасць узгадняць свае дзеянні, падтрымліваць адна адну, тайна атрымліваць



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

фінансавую дапамогу ад урадаў і прыватных асоб, якія ім спачуваюць. Яны ствараюць базы падрыхтоўкі баевікоў на тэрыторыі краін, ахопленых унутранымі канфліктамі.

Мэты розных тэрарыстычных арганізацый не супадаюць. Але большасць з іх варожа ставяцца да краін Захаду, асабліва да ЗША. Найбольшую нецярпімасць праяўляюць ісламскія фундаменталісты.

Выканаўцамі тэрактаў нярэдка з'яўляюцца тэрарысты-смяротнікі — *шахіды*, выхаваныя ў рэчышчы ісламскага фундаменталізму. Кіраўнікі, якія іх пасылаюць на верную смерць, улічваюць слабасць сучаснай тэхнічнай цывілізацыі. Асноўныя яе цэнтры — гэта гіганцкія гарады — мегаполісы. У іх пражывае больш за 70 % насельніцтва развітых краін. Пашкоджанне тэрарыстамі метрапалітэну, прамысловых аб'ектаў, хімічных заводаў і атамных электрастанцый (АЭС) можа мець самыя катастрафічныя наступствы.

**Экалагічныя праблемы.** На працягу многіх стагоддзяў людзі практычна не адчувалі наступстваў сваёй дзейнасці па пераўтварэнню і змяненню навакольнага свету. І толькі ў XIX — XX стст. маштаб чалавечага ўздзеяння на прыроду павялічыўся настолькі, што ўзнікла пагроза ўсёй біясферы Зямлі. Дзякуючы развіццю навукі і тэхнікі, індустрыялізацыі толькі за перыяд 1850 — 1960-х гг. аб'ём вытворчасці тавараў і паслуг у прамыслова развітых краінах Еўропы і Паўночнай Амерыкі павялічыўся ў 30 разоў. Адпаведна вырасла спажыванне энергарэсурсаў, сыравіны, вады, павялічыліся адходы вытворчай дзейнасці. У 1970-я гг. гэтыя праблемы даследавала група вядучых вучоных свету, якія аб'ядналіся ў так званы **Рымскі клуб.**

Спецыялісты ўздымаюць трывогу наконт разбурэння азонавага слою, які абараняе паверхню планеты ад сонечнай радыяцыі. Гэта стварае пагрозу жыцця жывых істот, садзейнічае росту колькасці ракавых захворванняў сярод людзей. Значнае павелічэнне выкідаў у атмасферу вуглякіслага газу, які ўтвараецца ў выніку згарання розных відаў паліва, з'яўляецца адной з прычын глабальнага пацяплення клімату і яго нестабільнага характару.

З-за змяненняў клімату, спусташэння ўрадлівасці глебы і яе ветравой эрозіі ў многіх раёнах свету ідзе наступленне пустынь. Толькі ў Афрыцы за апошнія 50 гадоў штогод пустыні паглыналі 1,3 млн гектараў прадукцыйных зямель.


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

Працягваецца забруджванне паветра, вады, глебы таксічнымі, у тым ліку радыеактыўнымі, адходамі вытворчасці, хімічнымі рэчывамі і ядахімікатамі, якія выкарыстоўваюцца ў сельскай гаспадарцы.

Вучоныя лічаць, што калі разбурэнне асяроддзя пражывання чалавека будзе прадаўжацца цяперашнімі тэмпамі, то да сярэдзіны XXI ст. кампенсаваць нанесеную прыродзе шкоду будзе надзвычай цяжка. З улікам гэтага, большасць дзяржаў свету надае ўсё большую ўвагу прыродаахоўным мерам.

Павялічваюцца дзяржаўныя расходы на ахову навакольнага асяроддзя. У многіх развітых краінах яны перавысілі 5 — 7 % бюджэту дзяржавы, што дазваляе палепшыць экалагічную сітуацыю. Так, у Германіі ўдалося аднавіць чысціню вады ў рацэ Рэйн. У ЗША былі ачышчаны ад забруджвання Вялікія азёры. Паўсюль у свеце ствараюцца нацыянальныя паркі і запаведнікі, дзе забаронены прамысловая дзейнасць і паляванне.

У **1992 г.** у Рыа-дэ-Жанэйра (Бразілія) адбылася *канферэнцыя па навакольнаму асяроддзю і развіцці*. На ёй была прынята праграма дзеянняў на XXI ст. — **канцэпцыя ўстойліва-бяспечнага развіцця чалавецтва.** Вядучыя краіны свету прынялі на сябе абавязацельства скараціць, а ў далейшым і спыніць вытворчасць фрэонаўтрымліваючых рэчываў, якія, трапляючы ў атмасферу, наносяць шкоду азонаваму слою. Дзяржавы, якія выкарыстоўваюць ядзерныя тэхналогіі, прытрымліваюцца адзіных міжнародных стандартаў бяспекі функцыянавання АЭС. Прыняты прынцып міжнароднай адказнасці за захаванне асяроддзя пражывання чалавека і зацверджаны санкцыі за яго парушэнне. Прадугледжваецца выплата кампенсацый за нанясенне экалагічнай шкоды іншым краінам, калі гэта з'явілася наступствам парушэнняў стандартаў бяспекі.

У **2005 г.** уступіў у сілу дагавор, падпісаны ў горадзе Кіёта (Японія), так званы **Кіёцкі пратакол.** Згодна яму для кожнай дзяржавы вызначаюцца гранічна дапушчальныя нормы выкіду вуглякіслага газу ў атмасферу. Краіны, якія іх перавышаюць, абавязаны выплочваць кампенсацыі іншым удзельнікам дагавора. Гэта павінна стварыць дадатковы стымул для ўкаранення экалагічна бяспечных тэхналогій. Аднак да пратакола пакуль што не далучыліся такія буйныя дзяржавы, як ЗША, Кітай, Індыя, Аўстралія.


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

У цяперашні час пагрозу жыццю людзей нясе асяроддзе пражывання, створанае самім чалавекам. Пастаянна расце агульны фон электрамагнітнага выпраменьвання ад тысяч радыё- і тэлевяшчальных станцый, прамысловых і абарончых аб'ектаў. У гарадах, дзе сканцэнтравана большасць насельніцтва свету, чалавек пастаянна падвяргаецца нашмат большаму інфармацыйнаму ўздзеянню, чым калі-небудзь у мінулым. Пра неспрыяльныя наступствы змянення існуючых стагоддзямі ўмоў жыцця сведчыць рост нервова-псіхічных, ракавых і сардэчна-сасудзістых захворванняў, з'яўленне новых хвароб.



*Чацвёрты рэактар Чарнобыльскай АЭС, на якім 26 красавіка 1986 г. адбылася аварыя. 2000-я гг.*

Пакуль што не знойдзена эфектыўнага сродку лячэння такога небяспечнага захворвання як СНІД. У будучым не выключана мутацыя ўзбуджальнікаў небяспечных інфекцыйных хвароб, якія пры вялікай канцэнтрацыі насельніцтва і высокай



*Аварыя на АЭС у Фукусіме. 2011 г.*



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

інтэнсіўнасці міжнароднай камунікацыі могуць выклікаць пандэміі (глабальныя эпідэміі), небяспечныя для жыцця чалавецтва.

Вялікую шкоду асяроддзю пражывання людзей наносяць прыродныя і тэхнагенныя катастрофы. Найбольш вядомыя з іх — выбух хімічнага камбіната ў Бхапале (Індыя), катастрофы на АЭС: у ЗША на Трымайл-Айленд (1979), у СССР у Чарнобылі (1986), у Японіі (2011).

Пачасціліся прыродныя катастрофы і анамаліі ў розных рэгіёнах свету. Тэхнагеннае стагоддзе паставіла пад пагрозу само існаванне чалавецтва. Неадназначную ацэнку выклікаюць новыя біятэхналогіі, генная інжынерыя, праблема кланіравання жывёл і людзей.

**Праблемы нераўнамернасці развіцця.** Вырашэнне многіх экалагічных праблем, поспех барацьбы з тэрарызмам і распаўсюджваннем ЗМЗ залежаць ад пераадолення нераўнамернасці ў развіцці розных рэгіёнаў свету.

Менавіта краіны «трэцяга свету» сталі крыніцай дэмаграфічных праблем, выкліканых імклівым павелічэннем колькасці насельніцтва Зямлі. Голад, галеча, хваробы сталі нязменнымі спадарожнікамі бяднейшых дзяржаў Афрыкі і Азіі. Колькасць іх насельніцтва — каля 2 млрд чалавек, а сярэдні даход на аднаго чалавека складае менш за 1 долар у дзень. У гэтых дзяржавах не вырашана праблема забеспячэння насельніцтва харчаваннем, вадой, медыкаментамі, палыхаюць унутраныя канфлікты. Частка насельніцтва Азіі і Афрыкі актыўна мігрыруе ў Еўропу, што нараджае многія сацыяльна-эканамічныя і палітычныя праблемы ў краінах Захаду. У першую чаргу праблему адаптацыі імігрантаў у новым соцыуме.

Эксперты ААН ацэньваюць дынаміку змен у розных краінах на аснове комплекснага паказчыка — *індэкса развіцця чалавечага патэнцыялу (ІРЧП)*. Пры вызначэнні ІРЧП улічваюцца: памер ВУП на душу насельніцтва, сярэдняя працягласць жыцця чалавека, доступ да адукацыі, медыцынскай дапамогі і г. д. Максімальна высокі паказчык ІРЧП мае Канада, мінімальны — Нігер.

Многія заходнія палітыкі лічаць, што пераадолець беднасць і галечу ў краінах «трэцяга свету» можна, калі забяспечыць ім шырокі доступ да перадавых інфармацыйных тэхналогій.

З улікам набытага вопыту ў 2001 г. у ААН была створана Мэтавая група па інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогіях


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"



*Аварыя танкера, якi перавозiў нафту, у Мексiканскiм залiве. 2010 г.*

(IКТ). Яе задача — дапамагчы краiнам «трэцяга свету» пераадолець адставанне ў гэтай сферы, зрабiць IКТ даступнымi для ўсiх дзяржаў. З гэтай жа мэтай пад эгiдай ЮНЕСКА ў *2003* i *2005 гг.* у Жэневе i Тунiсе прайшоў *Сусветны самiт па iнфармацыйнаму грамадству*. Яго ўдзельнiкi прызналi, што асноўнай умовай пабудовы iнфармацыйнага грамадства з'яўляецца прадастаўленне ўсiм жадаючым свабоднага i бясплатнага доступу да iнфармацыi i ведаў ва ўсiх iх формах i на любых носьбiтах. Аднак на гэтым шляху ёсць нямала праблем. Адна з iх — моўны бар'ер, звязаны з пераважаннем у Iнтэрнэце матэрыялаў на англiйскай мове. ЮНЕСКА рэалiзуе каля 280 праграм дапамогi ў стварэннi глабальнага «грамадства ведаў». Праграма дзейнасцi ў гэтым напрамку была распрацавана вядучымi краiнамi свету, уключаючы Расiю, на сустрэчы iх лiдараў у **лiпенi 2000 г.** у Японii. Адразу пасля самiта на востраве Акiнава была арганiзавана *Мiжнародная рабочая група па лiчбавых магчымасцях*. Яна рэкамендавала выконваць рашэннi **Акiнаўскай хартыi** на аснове ўзаемадзеяння прадстаўнiкоў дзяржавы, бiзнесу i грамадскiх арганiзацый.

Глабальныя праблемы, з якiмi сутыкнулася чалавечая цывiлiзацыя, могуць быць вырашаны толькi пры ўмове цеснага i плённага супрацоўнiцтва ўсiх дзяржаў свету. Яно ажыццяўляецца ў рамках розных мiжнародных арганiзацый, роля i значэнне якiх пастаянна расце.


Правообладатель "Адукацыя i выхаванне"

## Пытанні і заданні:

1. Дайце вызначэнне паняцця «глабальныя праблемы сучаснасці». Якія глабальныя праблемы неабходна будзе вырашыць чалавецтву ў XXI стагоддзі?
2. Правядзіце класіфікацыю глабальных праблем чалавецтва. Даныя аформіце ў табліцу «Глабальныя праблемы чалавецтва»:

| Палітычныя праблемы | Сацыяльныя праблемы | Экалагічныя праблемы |
|---|---|---|
| | | |

3. Як звязаны паміж сабой праблемы навукова-тэхнічнага прагрэсу і глабальныя праблемы? Якія меры прымаюцца чалавецтвам для вырашэння глабальных праблем?
4. Чаму, нягледзячы на дасягненні ў галіне навукі і тэхнікі, вучоныя гавораць пра крызіс цывілізацыі? Як можа быць перадолены крызіс цывілізацыі?
5. Высветліце, якія праблемы характэрны для вашага рэгіёна. Абмяркуйце шляхі іх вырашэння.

**Прапануем абмеркаваць.** Уваходзячы ў новае тысячагоддзе, чалавецтву неабходна падвесці некаторыя вынікі. Якія ўрокі павінна вынесці чалавецтва з XX стагоддзя? Якую ролю ў развіцці сучаснага свету адыгрывае гістарычнае пазнанне?

## Гістарычны дакумент

### З Павесткі дня на XXI стагоддзе

*Рыа-дэ-Жанэйра, 3 — 14 чэрвеня 1992 г.*

Чалавецтва перажывае рашаючы момант сваёй гісторыі. Мы сутыкаемся з праблемай увекавечвання дыспрапорцый як паміж краінамі, так і ў межах асобных краін, праблемамі галечы, голаду, пагаршэння здароўя насельніцтва і непісьменнасці, якія абвастраюцца, з пагаршэннем стану экасістэм, ад якіх залежыць наш дабрабыт. Аднак комплексны падыход да праблем навакольнага асяроддзя і развіцця і наданне ім большай увагі будуць садзейнічаць задавальненню асноўных патрэб, павышэнню ўзроўню жыцця ўсяго насельніцтва, садзейнічаць больш эфектыўнай ахове і рацы-



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

янальнаму выкарыстанню экасістэм і забеспячэнню больш бяспечнай і паспяховай будучыні. Ні адна краіна не ў стане дамагчыся гэтага самастойна; аднак мы можам дасягнуць гэтага сумеснымі намаганнямі — на аснове глабальнага партнёрства ў інтарэсах забеспячэння ўстойлівага развіцця.

*Якія праблемы выклікаюць непакой? Якім шляхам магчыма вырашэнне гэтых праблем? Да дасягнення якой мэты імкнецца чалавецтва?*

### Гістарычная даведка

**Рымскі клуб** — міжнародная неўрадавая арганізацыя, дзейнасць якой накіравана на стымуляванне вывучэння глабальных праблем. Заснавана ў 1968 г. італьянскім менеджэрам і грамадскім дзеячам Аўрэліа Печэі. Сваю работу Рымскі клуб будуе ў форме правядзення сходаў, сімпозіумаў, семінараў, сустрэч з вядомымі вучонымі, палітычнымі лідарамі, уплывовымі бізнесменамі. Асноўным вынікам дзейнасці Клуба з'яўляюцца даклады, прысвечаныя прыярытэтным глабальным праблемам і шляхам іх вырашэння. Па заказу Рымскага клуба падрыхтавана больш за 30 дакладаў, сярод якіх можна адзначыць «Энергія: зваротны рахунак» (1978), «Няма межаў навучання» (1979), «Трэці свет: тры чвэрці свету» (1980), «Будучыня акіянаў» (1986), «Межы сацыяльнага адзінства: канфлікты і разуменне ў плюралістычным грамадстве» (1997), «Інфармацыйнае грамадства і дэмаграфічная рэвалюцыя» (2001), «Мастацтва прымушае думаць» (2002). Акрамя таго, у 1991 г. кіраўнікамі Клуба быў падрыхтаваны першы даклад ад імя самога Рымскага клуба — «Першая глабальная рэвалюцыя».

## УРОК АБАГУЛЬНЕННЯ

**1.** Дайце кароткую характарыстыку асноўным перыядам ў развіцці міжнародных адносін пасля Другой сусветнай вайны.

| | |
|---|---|
| Канец 1940-х — канец 1970-х гг. | |
| Канец 1970-х — сярэдзіна 1980-х гг. | |
| З сярэдзіны 1980-х гг. да цяперашняга часу | |



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**2.** Растлумачце значэнне паняцця «халодная вайна». Якімі прычынамі яна была выклікана? Назавіце міжнародныя крызісы ў перыяд «халоднай вайны». Якія з іх былі найбольш небяспечныя?

**3.** У чым праявілася біпалярнасць свету ў гады «халоднай вайны»? Якія ваенна-палітычныя блокі ўзніклі ў гэты час? Складзіце табліцу «Біпалярны свет».

**4.** Калі і якім чынам завяршылася «халодная вайна»? Якія фактары міжнароднага характару паўплывалі на яе завяршэнне? Як вы лічыце, ці можна вызначыць пераможцу ў «халоднай вайне»?

**5.** Раскрыйце сэнс паняцця «глабальныя праблемы чалавецтва». Якія глабальныя праблемы стаяць перад чалавецтвам у цяперашні час? Якія меры прымаюцца для іх вырашэння?

**6.** Якая з глабальных праблем, на ваш погляд, з'яўляецца найбольш небяспечнай для чалавецтва? Аргументуйце свой адказ. Якія шляхі яе вырашэння вы прапанавалі б?

**7.** Раскрыйце значэнне дзейнасці міжнародных арганізацый у вырашэнні глабальных праблем сучаснасці. Якія з іх адыгрываюць найбольшую ролю?

**8.** Калі і чаму была прынята канцэпцыя ўстойліва-бяспечнага развіцця? Што яна прадугледжвае? Якія праблемы перашкаджаюць пераходу да ўстойліва-бяспечнага развіцця ў глабальным маштабе?

**9.** Ці згодны вы з ацэнкай сучаснага стану развіцця чалавечага грамадства як крызісу цывілізацыі? Свой адказ аргументуйце.

**10.** Як бы вы ахарактарызавалі сучасны сусветны парадак? Якая роля ЗША, Расіі, ЕС, іншых дзяржаў і рэгіёнаў свету ў станаўленні сістэмы новага сусветнага парадку?

Адукацыя і выхаванне



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

## ХРАНАЛАГІЧНАЯ ТАБЛІЦА

| | |
|---|---|
| **29 ліпеня — 15 кастрычніка 1946 г.** | Парыжская мірная канферэнцыя |
| **1946 — 1958 гг.** | Чацвёртая рэспубліка ў Францыі |
| **1947 г.** | Прадастаўленне незалежнасці Брытанскай Індыі, яе падзел на Індыю і Пакістан |
| **1947 г.** | Абвяшчэнне «дактрыны Трумэна» і прыняцце ЗША «плана Маршала» |
| **14 мая 1948 г.** | Абвяшчэнне Дзяржавы Ізраіль |
| **1948 — 1949 гг.** | Першая араба-ізраільская вайна |
| **1948 — 1949 гг.** | Першы Берлінскі крызіс |
| **1949 г.** | Стварэнне Савета эканамічнай узаемадапамогі (СЭУ) |
| **1949 г.** | Стварэнне Арганізацыі Паўночнаатлантычнага Дагавора (НАТО) |
| **23 мая 1949 г.** | Стварэнне Федэратыўнай Рэспублікі Германія (ФРГ) |
| **1 кастрычніка 1949 г.** | Абвяшчэнне Кітайскай Народнай Рэспублікі (КНР) |
| **7 кастрычніка 1949 г.** | Стварэнне Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі (ГДР) |



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

| | |
|---|---|
| **1950—1953 гг.** | Карэйская вайна |
| **1951 г.** | Стварэнне Еўрапейскага аб’яднання вугля і сталі (ЕАВС) |
| **1951 г.** | Падпісанне ЗША, Вялікабрытаніяй і шэрагам іншых дзяржаў мірнага дагавора з Японіяй у Сан-Францыска (ЗША) |
| **1954—1962 гг.** | Вайна за незалежнасць Алжыра |
| **1955 г.** | Стварэнне Арганізацыі Варшаўскага Дагавора (АВД) |
| **14—25 лютага 1956 г.** | XX з’езд КПСС |
| **Кастрычнік 1956 — сакавік 1957 г.** | Другая араба-ізраільская вайна |
| **1956 г.** | Палітычнае супрацьстаянне ў Венгрыі («Будапешцкая восень») |
| **1957 г.** | Падпісанне дагавора аб заснаванні Еўрапейскай эканамічнай супольнасці (ЕЭС) («Агульны рынак») у Рыме |
| **4 кастрычніка 1957 г.** | Запуск першага штучнага спадарожніка Зямлі (СССР) |
| **1958 г. — да цяперашняга часу** | Пятая рэспубліка ў Францыі |
| **Лістапад 1958 — пачатак 1963 г.** | Другі Берлінскі крызіс |
| **1959 г.** | Кубінская рэвалюцыя |



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

| | |
|---|---|
| **1960 г.** | Прадастаўленне незалежнасці 17 афрыканскім дзяржавам («Год Афрыкі») |
| **12 красавіка 1961 г.** | Палёт першага чалавека ў космас (Ю. А. Гагарын, СССР) |
| **Жнівень 1961 г.** | Узвядзенне Берлінскай сцяны |
| **1961 г.** | Стварэнне Руху недалучэння на канферэнцыі ў Бялградзе |
| **1962 г.** | Карыбскі крызіс |
| **1963 г.** | Падпісанне Дагавора аб забароне выпрабаванняў ядзернай зброі ў атмасферы, у касмічнай прасторы і пад вадой |
| **1965 — 1973 гг.** | Барацьба в'етнамскага народа супраць агрэсіі ЗША |
| **1966 — 1976 гг.** | «Культурная рэвалюцыя» ў Кітаі |
| **1966 г.** | Выхад Францыі з ваенных структур НАТО |
| **1967 г.** | Трэцяя араба-ізраільская вайна |
| **1968 г.** | Палітычнае супрацьстаянне ў Чэхаславакіі («Пражская вясна») |
| **1968 г.** | Масавыя хваляванні студэнтаў і служачых у Францыі («чырвоны май») |
| **1968 г.** | Падпісанне Дагавора аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі |
| **21 ліпеня 1969 г.** | Высадка амерыканскіх астранаўтаў на паверхню Месяца |
| **1972, 1979 гг.** | Падпісанне савецка-амерыканскіх дагавораў па абмежаванні стратэгічных узбраенняў (АСУ-І, АСУ-ІІ) |



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"
АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

| | |
|---|---|
| **1973 г.** | Чацвёртая араба-ізраільская вайна |
| **1973 г.** | Ваенны пераварот у Чылі, падчас якога ваенная хунта на чале з генералам А. Пінachэтам звергла законнага прэзідэнта С. Альендэ |
| **1974 — 1975 гг.** | Сусветны эканамічны крызіс |
| **1975 г.** | Падпісанне Заключнага акта Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (НБСЕ) |
| **1976 г.** | Абвяшчэнне Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам (СРВ) |
| **1978 — 1979 гг.** | Ісламская рэвалюцыя ў Іране |
| **1980 — 1988 гг.** | Ірана-іракская вайна |
| **1982 г.** | Ваенны канфлікт паміж Вялікабрытаніяй і Аргенцінай з-за Фалклендскіх (Мальвінскіх) астравоў |
| **1985 г.** | Абранне М. С. Гарбачова Генеральным сакратаром ЦК КПСС |
| **26 красавіка 1986 г.** | Аварыя на Чарнобыльскай АЭС |
| **9 лістапада 1989 г.** | Падзенне Берлінскай сцяны |
| **12 чэрвеня 1990 г.** | Абвяшчэнне суверэнітэту РСФСР |
| **1990 — 1991 г.** | Вайна Ірака з Кувейтам |
| **3 кастрычніка 1990 г.** | Аб'яднанне Германіі |

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

| | |
|---|---|
| **1991, 1993 гг.** | Падпісанне дагавораў аб скарачэнні наступальных узбраенняў (СНУ-I, СНУ-II) |
| **1991 г.** | Распад СССР і ўтварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД) |
| **1992 г.** | Падпісанне Маастрыхцкага дагавора і стварэнне Еўрапейскага Саюза (ЕС) |
| **1992 г.** | Падзел Чэхаславакіі на Чэхію і Славакію |
| **1992 г.** | Канферэнцыя ААН па навакольным асяроддзі і развіццю (Рыа-дэ-Жанэйра, Бразілія) |
| **1994 г.** | Прыняцце НАТО праграмы «Партнёрства ў імя міру» |
| **1999 г.** | Ваенная аперацыя НАТО супраць Югаславіі |
| **1999 г.** | Увядзенне адзінай еўрапейскай валюты — еўра (у наяўным абарачэнні з 2002 г.) |
| **11 верасня 2001 г.** | Напад тэрарыстаў на будынкі Сусветнага гандлёвага цэнтра ў Нью-Ёрку |
| **2001—2002 гг.** | Ваенная аперацыя ЗША супраць Афганістана, звяржэнне рэжыму талібаў |
| **2003 г.** | Ваенная аперацыя войск ЗША і іх саюзнікаў у Іраку. Звяржэнне рэжыму С. Хусейна |
| **2005 г.** | Падпісанне Кіёцкага пратакола |
| **2008 г.** | Пачатак сусветнага эканамічнага крызісу |



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

## ГІСТАРЫЧНЫ СЛОЎНІК

**«Аксамітныя рэвалюцыі»** — працэс бяскроўнага дэмантажу сацыялістычных рэжымаў ва ўсходнееўрапейскіх краінах у канцы 1980-х — пачатку 1990-х гг.

**Апазіцыя** (ад лац. oppositio — супрацьпастаўленне) — супрацьдзеянне, супраціўленне; палітычная група, якая выступае супраць меркавання большасці і прапануе іншы спосаб вырашэння праблемы, іншую палітыку.

**Апартэід** — афіцыйная палітыка расавай сегрэгацыі і дыскрымінацыі, якая праводзілася правячай у ПАР з 1948 па 1994 г. Нацыянальнай партыяй.

**Арганізацыя Аб'яднаных Нацый (ААН)** — міжнародная арганізацыя, заснаваная ў 1945 г. саюзнымі дзяржавамі-пераможцамі з мэтай падтрымання міжнароднага міру і бяспекі; развіцця сяброўскіх адносін паміж нацыямі; забеспячэння супрацоўніцтва ў вырашэнні міжнародных праблем эканамічнага, сацыяльнага, культурнага і гуманітарнага характару; садзейнічання развіццю павагі правоў чалавека і асноўных свабод для ўсіх, без адрознення расы, полу, мовы і рэлігіі. У цяперашні час у яе ўваходзяць 192 дзяржавы.

**Арганізацыя Варшаўскага Дагавора (АВД)** — ваенна-палітычны саюз еўрапейскіх сацыялістычных краін пры вядучай ролі СССР, створаны ў 1955 г.

**Арганізацыя вызвалення Палесціны (АВП)** — арганізацыя, створаная рашэннем Лігі арабскіх дзяржаў у 1964 г. з мэтай стварэння незалежнай арабскай палесцінскай дзяржавы і прадастаўлення законных правоў арабскаму насельніцтву.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

**Арганізацыя Паўночнаатлантычнага Дагавора (НАТО)** (англ. North Atlantic Treaty Organization) — буйнейшы ў свеце ваенна-палітычны блок, створаны ў 1949 г., які мае на мэце забеспячэнне стрымлівання любой формы агрэсіі ў адносінах да тэрыторыі дзяржаў-членаў НАТО ці абарону ад яе.

**Ваенна-прамысловы комплекс** — сукупнасць навукова-даследчых, выпрабавальных арганізацый, дзяржаўных і прыватных кампаній, якія выконваюць распрацоўку і займаюцца вытворчасцю ваеннай і спецыяльнай тэхнікі і ўзбраенняў.

**Валюнтарызм** — адвольныя рашэнні ў галіне палітыкі, эканомікі, культуры, якія не ўлічваюць аб'ектыўныя ўмовы і навукова абгрунтаваныя рэкамендацыі.

**Галоснасць** — палітыка максімальнай адкрытасці дзейнасці дзяржаўных устаноў і свабоды інфармацыі, асноўны кампанент палітыкі перабудовы, якая праводзілася ў СССР у другой палове 1980-х гг.

**Глабалізацыя** (франц. global — усеагульны, ад лац. globus — шар) — комплекснае, сістэмнае, нарастаўчае адзінства сучаснага свету, абумоўленае неабходнасцю вырашэння эканамічных і іншых сусветных праблем (экалагічная, дэмаграфічная праблемы, пераадоленне эканамічнай і культурнай адсталасці, асваенне калязямной прасторы, вырашэнне энергетычнага, сыравіннага, харчовага і іншых крызісаў), уключаючы захаванне сацыяльных, эканамічных і індывідуальных правоў і свабод асобы.

**Глабальныя праблемы чалавецтва** — сукупнасць эканамічных і сацыяпрыродных праблем, ад вырашэння якіх залежыць сацыяльны прагрэс чалавецтва і захаванне цывілізацыі.

**Дамініён** — дзяржава ў складзе Брытанскай Імперыі, якая прызнавала кіраўніком дзяржавы англійскага караля (каралеву), якога прадстаўляў генерал-губернатар.

**Дысідэнт** — чалавек, палітычныя погляды якога істотна разыходзяцца з афіцыйна ўсталяванымі ў краіне, дзе ён жыве, палітычны іншадумец.

**Дыскрымінацыя** (ад лац. discriminatio — рознасць) — адрозніванне ці прыніжэнне правоў людзей па якой-небудзь прыкмеце; абмежаванне ў правах адных людзей у адносінах да іншых.


Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Дэкаланізацыя** — працэс ліквідацыі каланіялізму, які актыўна пачаўся пасля Другой сусветнай вайны.

**Дэсталінізацыя** — працэс ліквідацыі наступстваў культу асобы і сталінскай палітычнай сістэмы, які праводзіўся ў СССР у другой палове 1950-х — пачатку 1960-х гг.

**Дэфолт** — адмаўленне дзяржавы ад абавязацельстваў па выплатах знешніх і ўнутраных даўгоў краіны.

**Еўракамунізм** — палітыка і тэарэтычнае абгрунтаванне дзейнасці шэрага камуністычных партый Заходняў Еўропы (асабліва французскай, італьянскай, іспанскай і брытанскай) у 1970-я і 1980-я гг., якія крытыкавалі кіраўніцтва КПСС у сусветным камуністычным руху, канцэпцыю дыктатуры пралетарыяту і недахоп палітычных свабод у краінах, што прынялі савецкую мадэль сацыялізму.

**Еўрапейская эканамічная супольнасць (ЕЭС)** — міжнародная арганізацыя, што існавала з 1957 па 1993 г., створаная для ажыццяўлення эканамічнай інтэграцыі Бельгіі, Германіі, Галандыі, Італіі, Люксембурга і Францыі. Зрэдку называецца «Агульным рынкам». Пазней да ЕЭС далучыліся Вялікабрытанія, Данія, Ірландыя (з 1973), Грэцыя (з 1981), Іспанія, Партугалія (з 1986). Мэта ЕЭС — стварэнне адзінай эканамічнай прасторы шляхам павышэння ўзроўню эканамічнага развіцця яе ўдзельнікаў. Дасягненне мэт, пастаўленых ЕЭС (з 1986 — Еўрапейская супольнасць), прывяло да прыняцця Маастрыхцкага дагавора аб Еўрапейскім Саюзе.

**Еўрапейскі Саюз (Еўрасаюз, ЕС)** — эканамічнае і палітычнае аб'яднанне 27 дзяржаў Еўропы. Саюз быў юрыдычна замацаваны Маастрыхцкім дагаворам (1992). З дапамогай стандартызаванай сістэмы законаў, якія дзейнічаюць ва ўсіх краінах саюза, створаны агульны рынак, які гарантуе свабодны рух людзей, тавараў, капіталу і паслуг, уключаючы адмену пашпартнага кантролю ў межах Шэнгенскай зоны, у якую ўваходзяць як краіны-члены, так і іншыя еўрапейскія дзяржавы. Сямнаццаць краін саюза ўвялі ў абарачэнне адзіную валюту — еўра.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Ідэалогія** (грэч. idea — тое, што бачна, і logos — слова) — сістэма палітычных, прававых, маральных, філасофскіх і іншых поглядаў і ідэй, у якіх усведамляюцца і ацэньваюцца адносіны людзей да рэчаіснасці, сістэма поглядаў і ідэй той ці іншай палітычнай плыні ці партыі, у якіх адлюстроўваюцца інтарэсы розных слаёў грамадства.

**Інтэграцыя** (лат. integratio — аднаўленне, дапаўненне, ад integer — цэлы) — працэс узаемнага прыстасавання, пашырэнне эканамічнага і вытворчага супрацоўніцтва, аб'яднанне нацыянальных гаспадарак дзвюх ці больш дзяржаў, высокая форма інтэрнацыяналізацыі гаспадарчага жыцця, якая вядзе да фарміравання адзінага гаспадарчага комплексу.

**Інфармацыйнае (постіндустрыяльнае) грамадства** — чалавечае грамадства, якое дасягнула ўзроўню развіцця, пры якім галоўным сектарам эканомікі становіцца вытворчасць ведаў, а прамысловая вытворчасць пераводзіцца на высокія тэхналогіі.

**Карупцыя** (ад лац. corruptio — подкуп) — подкуп службовых асоб, выкарыстанне службовай асобай сваіх паўнамоцтваў у мэтах асабістай выгады, якое супярэчыць заканадаўству і маральным устаноўкам.

**Карыбскі крызіс** — абвастрэнне міжнароднай сітуацыі ў 1962 г., выкліканае рэзкім супрацьстаяннем СССР і ЗША па прычыне размяшчэння савецкіх ракет сярэдняй далёкасці на Кубе.

**Касмапалітызм** — светапогляд «сусветнага грамадзянства», які ставіць агульначалавечыя інтарэсы і каштоўнасці вышэй за інтарэсы асобнай нацыі.

**Краіны «трэцяга свету»** — краіны на стадыі развіцця, якія вызваліліся ад каланіяльнай залежнасці.

**Культ асобы** — узвялічванне адной асобы (як правіла, дзяржаўнага дзеяча) сродкамі масавай інфармацыі, у творах мастацтва, дзяржаўных дакументах, законах.

**«Курс Нэру»** — тэорыя і практыка пабудовы ў Індыі «грамадства сацыялістычнага ўзору».



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Макартызм** — рух у грамадскім жыцці ЗША з канца 1940-х да канца 1950-х гг., які суправаджаўся абвастрэннем антыкамуністычных настрояў і палітычнымі рэпрэсіямі супраць іншадумцаў.

**Масавая культура** — культура, папулярная і пераважаючая сярод шырокіх слаёў насельніцтва ў дадзеным грамадстве, для якой характэрны пэўныя стандарты, арыентацыя на масавага спажыўца, відовішчнасць і даступнасць.

**Навукова-тэхнічная рэвалюцыя** — карэннае якаснае пераўтварэнне вытворчых сіл чалавецтва, якое пачалося ў сярэдзіне XX ст., якасны скачок у структуры і дынаміцы развіцця вытворчых сіл, карэнная перабудова тэхнічных асноў матэрыяльнай вытворчасці на асновеператварэння навукі ў вядучы фактар вытворчасці.

**Неакаланіялізм** — сістэма нераўнапраўных эканамічных і палітычных адносін, якая навязвалася суверэнным краінам Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі, накіраваная на захаванне эксплуатацыі і залежнасці гэтых краін.

**Неакансерватызм** (англ. neoconservatism) — мадэль эканамічнага развіцця, якая ўзнікла ў сярэдзіне 1970-х гг., характэрная для вядучых краін Захаду. Неакансерватызм прадугледжвае шырокае распаўсюджванне традыцыйных заходніх каштоўнасцей — дэмакратыі, лібералізму, правоў чалавека. У галіне эканамічнага развіцця абапіраецца выключна на самарэгулюемую рыначную эканоміку, абмежаванне ролі дзяржавы, зніжэнне дзяржаўных расходаў.

**Неафашызм** — рух, прадстаўлены праварадыкальнымі арганізацыямі, якія ў палітычных і ідэйных адносінах з’яўляюцца пераемнікамі фашысцкіх арганізацый, распушчаных пасля Другой сусветнай вайны, і праяўляюць схільнасць да палітычнага экстрэмізму, выкарыстоўваюць тэрарыстычныя формы дзейнасці.

**«Новая ўсходняя палітыка»** — палітыка ўрада ФРГ у 1970-я гг., накіраваная на прызнанне існуючых межаў і супрацоўніцтва з усходнееўрапейскімі краінамі, уключаючы ГДР.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**«План Маршала»** — праграма аднаўлення і развіцця Еўропы пасля Другой сусветнай вайны шляхам аказання ёй эканамічнай дапамогі з боку ЗША.

**Перабудова** — сукупнасць палітычных і эканамічных змен, якія праводзіліся ў СССР у 1986 — 1991 гг. Завяршылася абвастрэннем крызісу ва ўсіх сферах жыцця грамадства, ліквідацыяй улады КПСС і распадам СССР.

**Прыватызацыя** (ад лац. privatus — прыватны) — перадача ці продаж дзяржаўнай уласнасці прыватнай асобе ці групе асоб.

**Разрадка міжнароднай напружанасці** — палітыка, накіраваная на зніжэнне агрэсіўнасці супрацьстаяння краін сацыялістычнага і капіталістычнага лагераў у адносінах да палітычных працэсаў ва ўзаемаадносінах СССР і ЗША з канца 1950-х да канца 1970-х гг. З сярэдзіны 1980-х гг., пасля кароткачасовага выбуху канфрантацыі, звязанага з увядзеннем савецкіх войск у Афганістан, курс на разрадку напружанасці зноў стаў пануючым у міжнароднай палітыцы дзвюх звышдзяржаў. Яе асноўныя элементы: гатоўнасць вырашаць спрэчныя пытанні мірнымі сродкамі, неўмяшанне ва ўнутраныя справы, давер, павага незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржаў, раўнапраўе, узаемавыгаднае супрацоўніцтва.

**Рух недалучэння** — міжнародная арганізацыя, якая аб’ядноўвае 118 дзяржаў свету на прынцыпах няўдзелу ў ваенных блоках. Афіцыйна створана 25 дзяржавамі на Бялградскай канферэнцыі ў верасні 1961 г.

**Рэферэндум** — форма непасрэднага волевыяўлення грамадзян, якая выражаецца ў галасаванні па найбольш значных пытаннях агульнадзяржаўнага, рэгіянальнага ці мясцовага маштабу.

**Савет эканамічнай узаемадапамогі (СЭУ)** — міжурадавая эканамічная арганізацыя, створаная ў 1949 г. па рашэнню эканамічнай нарады прадстаўнікоў Балгарыі, Венгрыі, Польшчы, Румыніі, СССР і Чэхаславакіі.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Садружнасць Незалежных Дзяржаў (СНД)** — міждзяржаўнае аб'яднанне, створанае ў 1991 г. з мэтай развіцця раўнапраўнага і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва народаў і дзяржаў у галіне палітыкі, эканомікі, культуры, адукацыі, аховы здароўя, аховы навакольнага асяроддзя, навукі, гандлю, у гуманітарнай і іншых галінах, садзеяння шырокаму інфармацыйнаму абмену.

**Стагнацыя** — стан эканомікі, які характарызуецца застоем вытворчасці і гандлю на працягу доўгага перыяду і суправаджаецца павелічэннем колькасці беспрацоўных, зніжэннем заработнай платы і ўзроўню жыцця насельніцтва.

**Стратэгічная абаронная ініцыятыва** — доўгатэрміновая праграма, абвешчаная прэзідэнтам ЗША Р. Рэйганам у 1983 г., асноўнай мэтай якой з'яўлялася стварэнне сістэмы супрацьракетнай абароны (ПРА) з элементамі касмічнага базіравання, што выключае ці абмяжоўвае магчымае паражэнне наземных і марскіх цэлей з космасу.

**Сусветная сістэма сацыялізму** — блок дзяржаў, у якіх устанавілася савецкая мадэль сацыялізму. Першай краінай, якая стала на шлях сацыялізму пасля СССР, была Манголія. Пасля Другой сусветнай вайны сацыялістычнымі сталі Албанія, Балгарыя, Венгрыя, В'етнам, ГДР, Кітай, Польшча, Румынія, Паўночная Карэя, Чэхаславакія, Югаславія. У 1955 г. на сацыялістычны шлях развіцця стала Камбоджа, у 1959 г. — Куба, у 1975 г. — Лаос. У канцы 1980-х гг. у склад сусветнай сістэмы сацыялізму ўваходзілі 15 дзяржаў, якія займалі 26,2 % тэрыторыі зямнога шара і налічваюць 32,3 % сусветнага насельніцтва.

**Транснацыянальная карпарацыя (ТНК)** (англ. transnational corporation, TNC) — буйная фірма (ці аб'яднанне фірм розных краін), якая мае замежныя актывы (капіталаўкладанні) і аказвае прыкметны ўплыў на якую-небудзь сферу эканомікі (ці некалькіх сфер) у міжнародным маштабе. ТНК рэалізуе значную частку сваёй прадукцыі за мяжой; яе даччыныя прадпрыемствы і філіялы знаходзяцца ў замежных краінах; уласнікі гэтай фірмы з'яўляюцца рэзідэнтамі (грамадзянамі) розных краін.



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

**Тэакратыя** — форма дзяржаўнага кіравання, пры якой улада засяроджана ў руках духавенства ці кіраўніка царквы.

**Тэтчэрызм** — палітыка кансерватыўнага ўрада Вялікабрытаніі ў 1979 — 1990 гг., якая суправаджалася прыватызацыяй прадпрыемстваў і галін эканомікі, манетарызмам у фінансава-эканамічнай сферы, згортваннем сацыяльных праграм.

**«Халодная вайна»** — глабальная геапалітычная, эканамічная і ідэалагічная канфрантацыя паміж СССР і яго саюзнікамі, з аднаго боку, і ЗША і іх саюзнікамі — з другога, якая доўжылася з сярэдзіны 1940-х да пачатку 1990-х гг.

**Хрушчоўская «адліга»** — неафіцыйная назва перыяду ў гісторыі СССР з сярэдзіны 1950-х да сярэдзіны 1960-х гг., які характарызаваўся ва ўнутрыпалітычным жыцці СССР адноснай дэмакратызацыяй палітычнага і грамадскага жыцця пры захаванні марксісцка-ленінскай ідэалогіі і адміністрацыйна-каманднай сістэмай кіравання.

**Хунвэйбіны** — члены створаных у 1966 г. атрадаў студэнцкай і школьнай моладзі ў Кітаі, адны з найбольш актыўных удзельнікаў «культурнай рэвалюцыі».

**Шокавая тэрапія** — радыкальныя, тэрміновыя меры па аздараўленню эканомікі, якія суправаджаюцца непажаданымі наступствамі, такімі, як рост цэн, інфляцыя, зніжэнне ўзроўню занятасці і г.д.

Адукацыя і выхаванне



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

# СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


**Раздзел I.**

**Асаблівасці развіцця ЗША і краін Еўропы**

Американские президенты: 41 исторический портрет от Джорджа Вашингтона до Билла Клинтона. Ростов-на-Дону; М., 1997.

*Броган, Х.* Джон Кеннеди. Ростов-на-Дону, 1997.

Великобритания: эпоха реформ / Под ред. А. А. Громыко. М., 2007.

*Голдман, А.* Джон Леннон. М., 2004. (ЖЗЛ)

*Ежов, В.* Аденауэр. М., 2003. (ЖЗЛ)

*Медведев, Д. Л.* Тэтчер: Неизвестная Мэгги. М., 2009.

*Молчанов, Н. Н.* Генерал де Голль. М., 1972.

Музыка наших дней. Современная энциклопедия. Аванта+. М., 2002.

*Смирнов, В. П.* Франция в XX веке: учебное пособие. М., 2001.

*Согрин, В. В.* Политическая история США. М., 2001.

*Согрин, В. В.* Президенты и демократия. Американский опыт. М., 1998.

**Раздзел II.**

**Гісторыя СССР і Расійскай Федэрацыі**

*Андриянов, В. И.* Косыгин. М., 2004. (ЖЗЛ)

*Бурлацкий, Ф. М.* Вожди и советники: О Хрущеве, Андропове и не только о них… М., 1990.

*Волкогонов, Д. А.* Семь вождей: Галерея лидеров СССР: В 2 кн. Кн. 2: Леонид Брежнев, Юрий Андропов, Константин Черненко. Михаил Горбачев. М., 1996.




Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

*Горелик, Г. Е.* Андрей Сахаров. М., 2010. (ЖЗЛ)

*Лихачев, Д. С.* Русская культура. М., 2000.

*Медведев, Р.* Юрий Андропов. М., 2007. (ЖЗЛ)

Советская внешняя политика в годы «холодной войны» / Под ред. Л. Н. Нежинского. М., 1995.

*Согрин, В. В.* Политическая история современной России. 1985 — 2001: от Горбачева до Путина. М., 2001.

*Хрущев, Н. С.* Воспоминания: Избранные фрагменты. М., 1997.

## Раздзел III.
## Краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі

*Агаев, С. Л.* Иран между прошлым и будущим. События, люди, идеи. М., 1987.

*Арешидзе Л. Г. и др.* Современная Япония: Политический справочник в схемах и таблицах. М., 2003.

*Гавриков Ю. П.* Фидель Кастро. Неистовый команданте Острова свободы. М., 2006.

*Джил, С. С.* Династия Ганди. Ростов-н/Д, 1997.

История Латинской Америки. Вторая половина XX века. М., 2004.

*Кормье, Ж.* Че Гевара. Ростов-н/Д, 1997.

Культура классической Японии: словарь-справочник. Ростов-на-Дону — Харьков, 2002.

*Лаврецкий, И. Р.* Эрнесто Че Гевара. М., 2002.

*Молодяков В. Э., Молодякова Э. В., Макарьян С. Б.* История Японии. XX век. М., 2009.

*Панцов А. В.* Мао Цзэдун. М., 2007. (ЖЗЛ)

*Селищев А. С., Селищев Н. А.* Китайская экономика в XXI веке. СПб., 2004.

*Усов, В. Н.* Дэн Сяопин и его время. М., 2009.

## Раздзел IV.
## Міжнародныя адносіны і глабальныя праблемы свету

Арабо-израильские войны. Арабский взгляд. М., 2008.

*Белл, Д.* Грядущее постиндустриальное общество: опыт социального прогнозирования. М., 1999.



Адукацыя і выхаванне

Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

*Гаджиев, К. С.* Введение в геополитику. М., 2002.

*Дугин, А.* Основы геополитики. М., 2001.

*Меддоуз, Д. Х.* Пределы роста / Д. Х. Меддоуз, Д. Л. Меддоуз, И. Рэндерс, В. В. Беренс. М., 1991.

*Тоффлер, Э.* Третья волна. Пер. с англ. М., 2002.

*Уткин, А. И.* Правда об Ираке, или Битва в Месопотамии. М., 2007.

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

# ЗМЕСТ

Ад аўтараў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Уводзіны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 4
§ 1. Асноўныя тэндэнцыі развіцця краін свету пасля Другой сусветнай вайны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 4

**Раздзел I. АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ ЗША І КРАІН ЕЎРОПЫ**

§ 2. Фарміраванне і крызіс«грамадства ўсеагульнага дабрабыту» ў краінах Захаду . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12
§ 3. Постіндустрыяльнае грамадства ў развітых краінах Захаду . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 18
§ 4. Злучаныя Штаты Амерыкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25
§ 5. Федэратыўная Рэспубліка Германія і Германская Дэмакратычная Рэспубліка . . . . . . . . . . . . . . 33
§ 6. Вялікабрытанія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 42
§ 7. Францыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
§ 8. Італія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56
§ 9. Краіны Паўночнай Еўропы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 63
§ 10. Краіны Усходняй Еўропы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
§ 11—12. Культура краін ЗША і Еўропы. Лад жыцця насельніцтва . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 78
Урок абагульнення . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 92

**Раздзел II. ГІСТОРЫЯ СССР І РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ**

§ 13. СССР у 1945 — 1953 гг. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 95
§ 14. СССР у 1953 — 1964 гг. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 102



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

§ 15. СССР у сярэдзіне 1960-х — пачатку 1980-х гг. . . . . . . . . . 111
§ 16. Распад СССР і ўтварэнне СНД . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 119
§ 17—18. Расійская Федэрацыя і СНД . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 128
§ 19. Навука і культура ў СССР і Расійскай Федэрацыі . . . . 139
Урок абагульнення . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 149

**Раздзел III. КРАІНЫ АЗІІ, АФРЫКІ І ЛАЦІНСКАЙ АМЕРЫКІ**

§ 20. Распад каланіяльнай сістэмы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 151
§ 21. Кітай у 1945 — 1978 гг. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 159
§ 22. Кітайская Народная Рэспубліка (1979 — 2012) . . . . . . . 168
§ 23. Японія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 175
§ 24. Індыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 183
§ 25. Краіны мусульманскага свету . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 192
§ 26. Краіны Лацінскай Амерыкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 202
Урок абагульнення . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 212

**Раздзел IV. МІЖНАРОДНЫЯ АДНОСІНЫ І ГЛАБАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ СВЕТУ**

§ 27. Фарміраванне біпалярнага свету (1945 — 1950-я гг.) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 213
§ 28. Супрацьстаянне паміж Усходам і Захадам (1960 — 1970-я гг.) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 221
§ 29. Міжнародныя адносіны ў 1980-я гг. — пачатку XXI ст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 229
§ 30. Глабальныя праблемы чалавецтва . . . . . . . . . . . . . . . . . . 236
Урок абагульнення . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 244

Храналагічная табліца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 246
Гістарычны слоўнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 251
Спіс рэкамендаванай літаратуры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 259

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ



Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |


Вучэбнае выданне

**Космач** Генадзь Аркадзьевіч
**Кошалеў** Уладзімір Сяргеевіч
**Краснова** Марына Аляксееўна

# Сусветная гісторыя Навейшага часу, 1945 г. — пачатак XXI ст.

Вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання

Рэдактары *М. Н. Гальпяровіч, Н. У. Матусевіч*
Мастак вокладкі *К. К. Шастоўскі*
Мастацкія рэдактары *У. А. Малахаў, М. Н. Гальпяровіч*
Камп'ютарны набор *Н. А. Пяткоўская*
Камп'ютарная вёрстка *В. Ю. Лагун*
Карэктар *Г. А. Шалюта*

Падпісана ў друк 07.12.2012. Фармат $70 \times 90^1/_{16}$.
Папера афсетная № 1. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 19,31. Ул.-выд. арк. 15,0. Тыраж 17 350 экз. Заказ .

РУП «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне».
ЛИ № 02330/639 ад 31.01.2012. Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск.

ААТ «Паліграфічны камбінат імя Якуба Коласа».
ЛП № 02330/0150496 ад 11.03.2009. Вул. Чырвоная, 23, 220600, г. Мінск.


АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ
Правообладатель "Адукацыя і выхаванне"